Роберт Льюіс Стывенсан

ВОСТРАЎ СКАРБАЎ

Раман



Мастак У. В. ГЛАДКЕВІЧ



МІНСК «ЮНАЦТВА» 1993

ББК 84.4Вя
С 88

Пераклад з англійскай мовы
А. М. АСТАШОНКА

Для малодшага школьнага ўзросту

Мастак У. В. ГЛАДКЕВІЧ

Пераклад зроблены з выдання:
Stevenson R. L. Treasure Island. Moscow:
Foreign Languages Publishing House. 1963.

Много рискованных приключений приходится пережить юному герою Джиму Хоукинсу в путешествии на таинственный Остров Сокровищ. И главное сокровище, которым овладевает он в итоге,— доверие и благодарность друзей, вера в добрых людей и настоящую мужскую дружбу.

С $\frac{4804010100-016}{М 307 (03)-93}$ 124—90

ISBN 5-7880-0428-4

© А. М. Асташонак.
Пераклад на беларускую мову, 1993
© У. В. Гладкевіч. Афармленне. 1993



ЧАСТКА ПЕРШАЯ



СТАРЫ ПІРАТ



РАЗДЗЕЛ I

Стары марскі пёс у карчме «Адмірал Бенбоў»

Сквайр[1] Трэлані, доктар Ліўсі ды іншыя джэнтльмены папрасілі мяне напісаць падрабязную гісторыю нашага падарожжа на Востраў Скарбаў, ад самага пачатку да канца, не ўтойваючы нічога, апроч месцазнаходжання вострава, адкрыць якое яшчэ нельга, бо там дагэтуль захоўваецца так і не вывезеная намі вялікая частка скарбаў. І вось нарэшце, у 17.. годзе ад нараджэння Хрыстова, бяруся я за пяро і згадваю той дзень, калі ў бацькавай карчме «Адмірал Бенбоў»[2] знайшоў сабе прытулак стары загарэлы марак з шаблевым шнарам на шчацэ.

Я памятаю, быццам гэта было ўчора, як, цяжка ступаючы, дайшоў ён да нашых дзвярэй, як везлі за ім на каламажцы ягоны марацкі куфар. Быў гэта высокі, дужы, грузны, цёмны з твару мужчына. Над каўняром ягонага зашмальцаванага сіняга каптана тырчала набраклая дзёгцем коска. Рукі ў яго былі шурпатыя і рубчастыя, пазногці — чорныя, паламаныя, а памянёны ўжо

---

[1] Сквайр — дваранскі тытул у Англіі.

[2] Адмірал Бенбоў — англійскі адмірал канца XVII ст.





шнар на шчацэ — брудпаватага барвова-бялёсага колеру. Памятаю, як незнаёмец, пасвістваючы, агледзеў нашую бухту дый загарланіў раптам старую матроскую песню, якую пасля гэтак часта спяваў:

Пятнаццаць чалавек на куфры мерцвяка —
Ё-го-го, і бутэлька рому!

Старэчы ягоны голас быў брынклівы, вісклівы — рыпеў, усё роўна як рычаг кабестана[1].

Потым марак пастукаў кульбаю ў нашыя дзверы — зноў уражанне было такое, што ў ягоных руках быў нейкі карабельны рычаг. Калі бацька выйшаў, незнаёмец груба запатрабаваў шклянку рому. Атрымаўшы яе, ён стаў павольна, з выглядам знаўцы, смакаваць кожны глыток, паглядваючы то на скалы, то на шыльду над дзвярыма нашай карчмы.

— Зручная бухта,— сказаў ён нарэшце.— Неблагое месца для карчмы. Шмат народу, прыяцель?

Бацька адказаў, што, на жаль, народу якраз небагата.

— Ну што ж,— сказаў марак,— гэтая каюта акурат для мяне. Гэй, хлопец! — крыкнуў ён чалавеку з каламажкаю.— Каці сюды ды памажы ўцягнуць мой куфар... Я пажыву тут трохі,— зноў павярнуўся ён тварам да нас.— Чалавек я просты. Ром, вяндліна і яешня — вось і ўсё, што мне трэба. Ды яшчэ вунь тая скала, з якой відаць караблі ў моры... Як мяне зваць? Можаце зваць мяне капітанам... Бачу, бачу, чаго вы хочаце!

Ён кінуў на ганак тры ці чатыры залатыя манеты.

— Калі я іх пражыву, можаце прыйсці і сказаць,— дадаў ён, сурова, па-начальніцку, зірнуўшы на бацьку.

І праўда, хоць вопратка ў незнаёмца была

[1] Кабестан — прылада для падымання карабельнага якара.






непаглядная, а мова грубая, ён не выдаваў на звычайнага матроса. Хутчэй за ўсё ён быў падобны да штурмана ці шкіпера, які прызвычаіўся камандаваць і мог лёгка даць волю свайму кулаку. Чалавек з каламажкаю распавёў нам, што марак прыбыў учора раніцаю на паштовых у «Гатэль караля Георга» і распытваў там пра ўсе заезныя дамы на ўзбярэжжы. Калі яму пахвалілі нашую карчму і сказалі, што яна месціцца наводшыбе, ён вырашыў спыніцца ў нас. Гэта было ўсё, што ўдалося нам даведацца пра новага пастаяльца.

Капітан — так мы і сталі яго зваць — быў чалавек маўклівы. Блукаў днямі вакол бухты або ўзбіраўся на скалы з меднай падзорнай трубою. Вечарамі ж сядзеў у гасцёўні, у самым куце ля агню, і піў слаба разбаўлены ром. Ніколі не адказваў, калі з ім пачыналі гаварыць. Адно паглядзіць люта на чалавека ды засвішча носам, усё роўна як карабельная сірэна ў тумане. Неўзабаве і мы, і нашыя наведнікі навучыліся не зважаць на яго. Кожнага дня, вярнуўшыся са шпацыру, ён распытваў, ці не праходзілі па нашай дарозе якія-небудзь маракі. Спачатку мы думалі, што яму не хапае кампаніі флоцкіх людзей, але ўрэшце пачалі разумець, што ён, наадварот, жадае быць як мага далей ад іх. Калі які-небудзь марак, дабіраючыся па ўзбярэжнай дарозе да Брыстоля, спыняўся ў «Адмірале Бенбоў», капітан спачатку разглядваў яго з-за дзвярное заслоны і толькі потым выходзіў у гасцёўню, непрыкметны, як мыш.

Я ведаў, чаму капітан так паводзіць сябе, бо ён сам прызнаўся мне, з кім не хацеў бы сустрэцца. Аднаго разу ён адвёў мяне ўбок і паабяцаў плаціць мне ў першы дзень кожнага месяца па чатыры срэбраныя пенсы, калі я буду «пільна-пільна сачыць, ці не з'явіцца дзе паблізу марак на аднойназе», і адразу ж паведамлю яму,






як толькі ўбачу такога. Калі пачынаўся месяц і я напамінаў яму пра абяцаныя грошы, ён адно соп, люта паглядваючы на мяне. Ды толькі праз тыдзень усё роўна, адумаўшыся, даваў мне чатыры пенсы і зноў загадваў «не прапусціць марака на адной назе».

Гэты аднаногі марак не выходзіў у мяне з галавы. Ён не пакідаў мяне ў спакоі нават у сне. Бурнымі начамі, калі вецер біў у сцены нашага дома, а ў бухце, дасягаючы верхніх скал, роў прыбой, якім мне толькі не сніўся гэты аднаногі — я перабачыў тысячу страшных, як чорт, маракоў. Нага ў яго была адрэзана то да калена, то да самага сцягна. Часам ён здаваўся мне пачвараю, у якой адна-адзіная нага расце з жывата. На гэтай адной назе ён ганяўся за мною, пераскокваючы цераз платы і канавы. Дорага каштавалі мне мае чатыры штомесячныя пенсы: платаю за іх былі начныя кашмары.

Ды які б страшны ні быў для мяне аднаногі марак, самога капітана я баяўся нашмат менш, чым усе іншыя людзі, што бывалі ў нас у карчме. У некаторыя вечары ён выпіваў столькі рому, што галава ў яго ішла ходырам, і тады ён падоўгу сядзеў у гасцёўні і спяваў свае старадаўнія дзікія, жорсткія марацкія песні, ні на кога не звяртаючы ўвагі. Здаралася і так, што ён запрашаў наведнікаў да свайго стала і, запатрабаваўшы ўсім рому, прымушаў бедных людзей, што дрыжалі ад спалоху, слухаць ягоныя аповяды пра марацкія прыгоды або падпяваць яму хорам. Сцены нашага дома сатрасаліся тады ад «ё-го-го, і бутэлька рому», бо ўсе запрошаныя стараліся перакрычаць адзін аднаго: кожны баяўся, што капітан застанецца незадаволены ім. У такім стане ён быў асабліва страшны: то стукаў кулаком па стале, патрабуючы раптам, каб усе змоўклі, то раз'юшваўся, калі ў яго пра што-небудзь пыталіся ці, наадварот, ні пра што не





пыталіся,— яму ўсё здавалася, што яго няўважліва слухаюць. І ніхто не мог выйсці з карчмы да тае пары, пакуль ён не пасунецца, перапіўшыся, зусім ужо сонны, да свайго ложка.

Але яшчэ больш, чым ён сам, палохалі людзей ягоныя аповяды, жудасныя гісторыі пра шыбеніцы, «шпацыр па дошцы» [1], штормы, пра далёкія астравы ў Новым Свеце з іхнімі разбойніцкімі гнёздамі і пра пірацкія геройствы. Мяркуючы па гэтых аповядах, жыццё ягонае прайшло сярод самых адчайных гіцляў, якіх сцярпеў калі-небудзь на моры бог. І лаянка, якой ён густа прыпраўляяў свае гісторыі, бянтэжыла нашых прастадушных вяскоўцаў не менш чым нечуваныя злачынствы, удзельнікам і сведкам якіх ён быў.


Бацька ўсё трывожыўся, што мы застанемся ўрэшце ні з чым, бо страцім усіх наведнікаў: хто захоча хадзіць да нас, каб калаціцца ўвесь час ад жаху? Аднак я мяркую, капітанава прысутнасць была хутчэй карысная нам. Людзі, вядома, баяліся нашага пастаяльца, ды ўжо назаўтра пасля перажытага страху іх зноў цягнула да старога марака: ён прынёс з сабою ў нашае ціхае вясковае жыццё нейкую прыемную трывогу. Сярод маладзейшых знайшліся нават і такія, што захапляліся ім. «Сапраўдны марскі воўк, наскрозь прасолены морам»,— казалі яны з павагаю. На іхнюю думку, дык менавіта такія людзі, як наш капітан, і зрабілі Англію ўладальніцаю мораў.

Але, з другога боку, мы сапраўды цярпелі праз яго страты. Праходзілі тыдзень за тыднем, месяц за месяцам, грошы, якія ён заплаціў нам, даўно ўжо былі выдаткаваныя, больш ён не

---

[1] «Шпацыр па дошцы» — спосаб пакарання ў піратаў. Асуджанага прымушалі ісці па непрыбітай дошцы, адзін канец якой выдаваўся ў мора.





даваў, а ў бацькі не хапала смеласці запатрабаваць іх. Варта было яму адно заікнуцца аб плаце, як капітан пачынаў сапці, пасля рыкаць, і бедны бацька выбягаў у спалоху з пакоя. Бачыў я, як пасля такіх сутычак ён ламаў сабе з адчаю рукі, і не сумняваюся, што ўсе гэтыя трывогі і страх, у якім ён пастаянна жыў, дужа паскорылі ягонае заўчаснае самотнае скананне.

За ўвесь час, які ён жыў у нас, капітан ні разу не пераадзеўся, хіба што змяніў панчохі, якія набыў у вулічнага гандляра — той завітаў неяк у нашую карчму. Адзін край ягонага капелюша абвіс, але капітан не зважаў на гэта, хоць пры моцным ветры хадзіць у такім капелюшы было вельмі нязручна. Памятаю, які падраны быў у яго каптан: колькі ён ні латаў яго наверсе, у сваім пакоі, каптан усё роўна ператварыўся ўрэшце ў рыззё. Ніякіх лістоў наш пастаялец ніколі не пісаў і ні ад кога іх не атрымліваў. Ніколі ні з кім, паўтараю, не загаворваў, хіба што калі быў зусім п'яны. І ніхто з нас не бачыў, каб ён адчыняў хоць калі-небудзь свой куфар.

Адзін-адзінюткі раз капітану насмеліліся запярэчыць, і то здарылася гэта ў апошнія дні, калі мой няшчасны бацька быў ужо пры смерці.

Неяк увечары да бацькі прыйшоў доктар Ліўсі. Ён агледзеў хворага, наспех з'еў абед, якім пачаставала яго маці, і прайшоў у гасцёўню выкурыць люльку, чакаючы, пакуль яму прывядуць каня. Конь застаўся ў селішчы, бо канюшні ў старым «Бенбоў» не было. Правёў доктара ў гасцёўню я і памятаю, як кінулася мне ў вочы ягоная непадобнасць да нашых наведнікаў — нязграбных вясковых гуляк. Модна адзеты, у беласнежным парыку, чарнавокі, з выдатнымі манерамі джэнтльмен, ён неяк асабліва адцяняў нашае пудзіла — бруднага, азызлага, змрочнага пірата, які насцябаўся таго дня рому і сядзеў цяпер, наваліўшыся локцямі на стол.





Раптам капітан зароў сваё вечнае:

Пятнаццаць чалавек на куфры́ мерцвяка —
Ё-го-го, і бутэлька рому!
Пі, і даканае цябе д'ябла рука —
Ё-го-го, і бутэлька рому!

Дарэчы, у той час я думаў, што «куфар мерцвяка» — гэта той самы куфар, што стаяў наверсе, у капітанавым пакоі. У маіх страшных снах я часта бачыў гэты куфар разам з аднаногім мараком. Але спакваля мы да таго прызвычаіліся да гэтае песні, што перасталі зусім зважаць на яе. Тым вечарам яна была навіною толькі для доктара і, як я заўважыў, не выклікала ў яго прыемнага ўражання. Ён якраз загаварыў са старым садоўнікам Тэйларам пра новы спосаб лячэння рэўматызму і, збянтэжаны дзікім ровам, перш чым распачаць гутарку, з гідкасцю паглядзеў на п'яніцу. Капітан тым часам, разгарачыўшыся, ударыў кулаком па стале. Гэта азначала, што ён патрабуе цішыні.

Усе ўмомант змоўклі, адзін толькі доктар спакойна працягваў сваю дабрадушную размову, часта пыхкаючы люлькаю. Капітан праняў яго сваім лютым позіркам, пасля зноў ударыў кулаком па стале, пачакаўшы трохі, глянуў на доктара яшчэ больш люта і ўрэшце зароў, непрыстойна лаючыся:

— Гэй, там, на палубе, маўчаць!

— Гэта вы мне, сэр? — спытаўся доктар.


— А каму ж? — зноў вылаяўся капітан.

— У такім разе, сэр, скажу вам адно,— адказаў доктар,— калі вы не кінеце гэтак піць, дык хутка пазбавіце свет ад аднаго з самых агідных нягоднікаў!

Капітан ашалеў ад злосці: ускочыў, выхапіў з кішэні і адкрыў свой матроскі складны нож. Правёўшы лязом па сваёй далоні, ён прахрыпеў, што ўгоніць нож праз доктара ў сцяну.

Доктар нават не зварухнуўся. І павярнуцца





да капітана не падумаў, загаварыў з ім цераз пляча, тым самым голасам, што і раней — можа, трохі гучней, каб усе маглі чуць яго, але спакойна і цвёрда:

— Калі вы зараз жа не схаваеце нож у кішэню, я клянуся сваім гонарам, вас павесяць пасля бліжэйшай сесіі нашага раз'язнога суда.

Капітан утупіўся ў доктара вачыма, але неўзабаве здаўся — схаваў нож і апусціўся на крэсла, як пабіты сабака, адно прабурчаў нешта.

— А зараз, сэр,— дадаў доктар,— раз ужо мне стала вядома, што ў маёй акрузе пасяліўся такі чалавек, як вы, я ўстанаўліваю за вамі самы пільны нагляд— і ўдзень і ўначы. Я тут не толькі доктар, але і суддзя. І калі да мяне дойдзе якаясьці скарга, хоць бы на тое, што вы некаму нагрубілі, я прыму самыя рашучыя меры, каб вам было вынесена заслужанае пакаранне. Я словамі на вецер не кідаюся.


Неўзабаве доктару падалі каня, і ён паехаў. Але капітан увесь вечар быў спакойны і ціхі і заставаўся такі яшчэ шмат вечароў.


РАЗДЗЕЛ II

Чорны Пёс з'яўляецца і знікае

Неўзабаве здарылася першая з тых загадкавых падзей, дзякуючы якой мы пазбавіліся нарэшце ад капітана. Але ж не пазбавіліся, як вы самі ўбачыце, ад ягонае спадчыны.

Стаяла сцюдзёная зіма з доўгімі траскучымі маразамі і бурнымі вятрамі. Ужо было відаць, што мой няшчасны бацька наўрад ці прычакаецца вясны. З кожным днём яму рабілася ўсё горш, упраўляцца з карчмою даводзілася мне і маці. Спраў у нас было не абабрацца, і мы амаль ужо не зважалі на нашага непрыемнага пастаяльца.





Была студзеньская халодная раніца. Бухта ажно пасівела ад намаразі. Невялікія хвалі лашчылі прыбярэжнае каменне. Сонца яшчэ не паспела ўзысці, адно кранула сваімі промнямі верхавіны скал і марскую далячынь. Але капітан пайшоў ужо на свой шпацыр: сёння ён прачнуўся раней звычайнага. Пад шырокімі крысамі ягонага падранага сіняга каптана калыхаўся танюткі корцік, пад пахаю была падзорная труба. Капялюш ён ссунуў на патыліцу. Памятаю, з ягонага рота ішла і клубілася, бы дым, пара. Я чуў, як злосна ён чмыхаў, агінаючы вялікую скалу,— напэўна, усё яшчэ не мог забыцца на сваю сутычку з доктарам Ліўсі.

Маці была наверсе, у бацькі, а я накрываў стол капітану на сняданак. Раптам дзверы карчмы адчыніліся, і ў гасцёўню ўвайшоў зусім незнаёмы мне чалавек.

У яго быў бледны твар, які блішчаў, быццам выпацканы салам. На левай руцэ ў яго не хапала двух пальцаў. І хоць на поясе ў чалавека і вісеў корцік, выгляд у яго быў не надта ваяўнічы. Я заўсёды пільна сачыў за кожным мараком, на адной назе ён быў ці на дзвюх, і незнаёмец дужа мяне збянтэжыў сваім раптоўным з'яўленнем. На флоцкага чалавека госць быў не вельмі падобны, і ўсё ж такі нешта ў ім падказвала мне, што ён — марак.


Я спытаўся, чаго ён хоча, і ён папрасіў рому. Я памкнуўся быў выйсці з пакоя, каб прынесці рому, але незнаёмец, сеўшы за стол, паклікаў мяне.

— Хадзі сюды, сынок,— сказаў ён, як толькі я спыніўся.— Падыдзі бліжэй.

Я ступіў крок.

— Гэты стол накрыты для майго таварыша, штурмана Білі? — спытаўся ён. На твары ў яго было нешта падобнае на ўсмешку.

Я адказаў, што не ведаю ніякага штурмана







Білі і што стол накрыты для нашага пастаяльца, якога мы ўсе завём капітанам.

— Ну што ж,— сказаў ён,— майго прыяцеля, штурмана Білі, можна называць і капітанам. Гэта справы не мяняе. У яго шнар на правай шчацэ, і ён вельмі пачцівы, асабліва калі вып'е. Вось ён які, мой штурман Білі. Заўважым, што і ў вашага капітана шнар на шчацэ і якраз на правай. Дык вось, я хацеў бы даведацца, ці тут ён цяпер, у гэтым доме, мой прыяцель Білі?

Я адказаў, што ён пайшоў гуляць.

— А па якой дарозе, сынок? Па якой дарозе пайшоў ён?

Я паказаў чалавеку скалу, на якой штодня бываў капітан, і сказаў, што ён хутка вернецца.

— А як хутка? — спытаўся госць.

Я адказаў і на гэтае, і яшчэ на два-тры падобныя пытанні.

— Думаю, мой прыяцель Білі ўзрадуецца мне, як выпіўцы,— сказаў нарэшце незнаёмец.

Аднак твар у яго пры гэтых словах быў пануры, і ў мяне былі ўсе падставы меркаваць, што сустрэча з нечаканым госцем будзе капітану не дужа прыемным сюрпрызам. Але я адразу ж сказаў сабе, што гэта не мая справа, да таго ж цяжка было што-небудзь зрабіць пры такіх абставінах. Незнаёмец уважліва сачыў за дзвярыма, прытаіўшыся ля ўвахода, нібыта кот, што пільнуе мыш. Я хацеў быў выйсці на двор, але ён адразу ж спыніў мяне. Паслухаўся я яго не з першага разу, і лаянка, якую я пачуў, была такая брыдкая, што я павярнуўся і, убачыўшы яго скажоны лютасцю сальны твар, спалохана адскочыў назад. Але як толькі я вярнуўся, незнаёмец зноў загаманіў са мною па-ранейшаму — ці то ліслліва, ці то насмешліва — і паляпаў мяне па плячы, сказаўшы, што я слаўны хлапчук і што ён адразу мяне ўпадабаў.

— Ведаеш, у мяне ёсць сынок,— разгаварыў-





ся госць,— дык вы падобныя як дзве кроплі вады. Ён — гонар майго бацькоўскага сэрца. Але для хлапчукоў галоўнае паслухмянасць. Паслухмянасць, сынок. Вось калі б ты паплаваў з Білі, мне б не давялося аклікаць цябе два разы. Білі ніколі не паўтараў загадаў. Іх не трэба было паўтараць тым, хто плаваў з ім... А вось і ён, мой прыяцель Білі, з падзорнай трубою пад пахаю, блаславі яго бог, ён! Давай схаваемся за дзвярыма, сынок, зробім Білі маленечкі сюрпрыз, блаславі яго бог, майго старога прыяцеля!

З гэтымі словамі ён загнаў мяне ў кут, за расчыненыя дзверы. Мне, як вы можаце здагадацца, стала страшна, асабліва калі я заўважыў, што незнаёмец сам баіцца сустрэчы з капітанам. Ён вызваліў рукаятку свайго корціка, выцягнуў яго трохі з ножнаў і ўвесь час рабіў нейкія дзіўныя рухі: можна было падумаць, што ён глытаў нейкі кавалак і той захрас у яго ў горле.

Нарэшце ў пакой уваліўся капітан, бразнуў дзвярыма і, не гледзячы па баках, рушыў да стала, дзе яго чакала снеданне.

— Білі! — сказаў незнаёмец, стараючыся надаць свайму голасу смеласць і цвёрдасць.

Капітан імкліва азірнуўся і апынуўся акурат перад намі. Загар адразу ж нібыта сышоў з ягонага твару, нос стаў сіні. У яго быў такі выгляд, быццам ён напаткаў раптам здань, або д'ябла, або яшчэ штосьці горшае, калі такое бывае, і, прызнаюся, мне стала яго шкада — такі ён быў цяпер стары і друзлы.


— Хадзі сюды, Білі... Ну няўжо ты не пазнаеш свайго старога карабельнага таварыша?.. Пазнаеш, Білі...— сказаў незнаёмец.

Капітан разявіў рот, усё роўна як яму не хапала паветра.

— Чорны Пёс! — вымавіў ён нарэшце.

— А хто ж яшчэ? — сказаў незнаёмец, трохі падбадзёрыўшыся.— Чорны Пёс прыйшоў на-





ведаць свайго старога карабельнага таварыша, што жыве цяпер у «Адмірале Бенбоў». Ах, Білі, Білі, колькі ж часу мінула з тае пары, як я страціў два свае кіпцюры! — узняў ён сваю знявечаную руку.

— Ну добра,— сказаў капітан.— Ты высачыў мяне — я перад табою. Кажы, чаго прыйшоў.

— Пазнаю цябе, Білі,— адказаў Чорны Пёс.— Твая праўда, прыяцель. Гэты слаўны хлапчук, які мне так спадабаўся, прынясе зараз мне шкляначку рому. Мы пасядзім з табою, калі хочаш, і пагамонім без хітрыкаў, па-простаму, як старыя карабельныя дружбакі.

Калі я вярнуўся з ромам, яны ўжо сядзелі за сталом, па адзін яго бок. Чорны Пёс сеў бліжэй да дзвярэй, на самым канцы лаўкі, і адным вокам пазіраў на свайго старога карабельнага дружбака, а другім — на дзверы.

Госць загадаў мне выйсці і пакінуць дзверы адчыненымі насцеж.

— Гэта каб ты, сынок, не падглядваў у замочную адтуліну,— растлумачыў ён.

Я пакінуў іх удвух і вярнуўся да стойкі.

Яшчэ доўга я, як ні ўслухоўваўся, не чуў нічога, апроч невыразнага гоману. Але спакваля галасы гучнелі, і нарэшце мне ўдалося разабраць некалькі слоў, перш за ўсё капітанаву лаянку.


І вось раптам капітан закрычаў:

— Не, не, не! І досыць пра гэта!

І потым зноў:

— Калі справа дойдзе да шыбеніцы, дык няхай усе на ёй боўтаюцца!

Урэшце пачуўся страшэнны выбух лаянкі, лаўка і стол з грукатам перакуліліся на падлогу, бразнула сталь клінкоў, нехта ўскрыкнуў ад болю — і тут я ўбачыў, як Чорны Пёс што было сілы нёсся да дзвярэй. Капітан гнаўся за ім, іхнія корцікі былі агаленыя, у Чорнага Пса з левага пляча цякла кроў. Каля самых дзвярэй



капітан замахнуўся корцікам, каб нанесці ўцекачу апошні, самы страшны ўдар, які, напэўна, рассек бы таго напалам, але корцік зачапіўся за нашу вялікую шыльду, на якой і дагэтуль бачны ўнізе, на раме, ягоны след.

На тым бойка і скончылася. Выскачыўшы на дарогу, Чорны Пёс, нягледзячы на сваю рану, памчаўся з такой хуткасцю, што не прайшло і паўхвіліны, як ён знік за ўзгоркам. А капітан застыў — глядзеў на шыльду, усё роўна як з'ехаў з глузду. Потым некалькі разоў правёў рукою па вачах і вярнуўся ў карчму.

— Джым,— загадаў ён,— рому!

Пры гэтых словах ён крыху пахіснуўся і абапёрся рукою аб сцяну.

— Вы ранены? — усклікнуў я.

— Рому! — паўтарыў ён.— Мне трэба ўцякаць адсюль. Рому, рому!

Я пабег па ром, але быў такі ўсхваляваны, што разбіў шклянку і запэцкаў граззю кран ад бочкі. І пакуль прыводзіў усё ў парадак, раптам пачуў грукат у гасцёўні. Пабег туды і ўбачыў, што капітан ляжыць на падлозе. Тае самае хвіліны маці, устрывожаная пачутымі крыкамі і калатнечаю, спусцілася ўніз. Мы прыўзнялі ўдваіх галаву капітана. Ён дыхаў вельмі гучна і цяжка. Вочы ў яго былі заплюшчаныя, твар пачырванеў.

— Божа мой, божа! — усклікнула маці.— Якая ганьба нашай карчме! І бацька хворы!

Нейкі час мы не ведалі, як дапамагчы капітану, і былі ўпэўненыя, што незнаёмец смяротна параніў яго. Я прынёс рому і паспрабаваў уліць яго капітану ў рот. Але ягоныя сківіцы былі сцятыя, усё роўна як жалезныя. На шчасце, тут расчыніліся дзверы і ўвайшоў доктар Ліўсі, які прыехаў наведаць бацьку.

— Доктар! — закрычалі мы.— Што нам рабіць? Куды ён ранены?

— Ранены? Лухта! — сказаў доктар.— Ён та-



кі ж ранены, як ты ці я. У яго ўдар, я яго папярэджваў. Вы, місіс Хоўкінс, вяртайцеся да мужа і, калі можна, нічога яму не кажыце. А я паспрабую ўратаваць гэтае тройчы нікому не патрэбнае жыццё. Джым, прынясі мне тазік.

Калі я вярнуўся з тазам, доктар ужо закасаў у капітана рукаў і агаліў яго дужую мускулістую руку, усю ў татуіроўках. Паміж плячом і локцем сінелі надпісы: «На ўдачу», «Спадарожнага ветру» і «Хай праўдзяцца мары Білі Бонса». Ля самага пляча была вытатуіравана шыбеніца, на якой матляўся чалавек. Татуіроўка, здалося мне, была зроблена з вялікім веданнем справы.

— Прароцкі малюнак,— заўважыў доктар.— А зараз, васпане Білі Бонс, калі гэта вашае імя, мы паглядзім, якога колеру вашая кроў. Джым,— звярнуўся ён да мяне,— ты не баішся крыві?

— Не, сэр,— адказаў я.

— Выдатна,— сказаў доктар,— тады трымай тазік.

Ён узяў ланцэт і ўскрыў вену.


Шмат выцекла ў капітана крыві, перш чым ён расплюшчыў вочы і абвёў нас цьмяным позіркам. Спярша ён пазнаў доктара і спахмурнеў, пасля заўважыў мяне і трохі супакоіўся. Затым раптам пачырванеў і, спрабуючы ўстаць, закрычаў:


— Дзе Чорны Пёс?

— Тут няма ніякага пса, апроч таго, што трызніцца вам,— сказаў доктар.— Вы пілі зашмат рому, і вось вас хапіў удар, як я папярэджваў. А мне прыйшлося супраць майго жадання выцягваць вас з магілы. Ну, містэр Бонс...

— Я не Бонс,— перапыніў капітан.

— Нічога,— сказаў доктар.— У мяне ёсць знаёмы пірат, якога завуць Бонсам, і я называю вас так дзеля сцісласці. Запамятайце добра, што я вам скажу: шклянка рому вас не заб'е, але калі вы вып'еце адну, вам захочацца яшчэ і яшчэ, і





клянуся маім парыком, калі вы не кінеце піць, то хутка памрэце. Вы гэта разумееце? Вернецеся на неба, як сказана ў Біблії. А цяпер паспрабуйце ўстаць. Я дапамагу вам дабрацца да ложка.

Мы ледзь усцягнулі капітана наверх і паклалі ў ложак. Ён быў амаль непрытомны.

— Дык памятайце,— сказаў доктар,— я кажу вам як ёсць: словы «ром» і «смерць» азначаюць для вас адно і тое ж.

Узяўшы мяне за руку, ён пайшоў да бацькі.

— Нічога страшнага,— сказаў ён, прычыніўшы дзверы.— Я выпусціў з яго столькі крыві, што ён супакоіцца надоўга. Праваляецца тыдзень у ложку, а гэта карысна і яму і вам. Але другога ўдару яму ўжо не перажыць.

РАЗДЗЕЛ III

Чорная метка

Апоўдні я зайшоў да капітана з халодным напоем і лекамі. Ён ляжаў у той самай паставе, у якой мы яго пакінулі, хіба што пасунуўся трохі вышэй. Ён здаўся мне вельмі слабым і адначасна ўзбуджаным.


— Джым,— сказаў ён,— ты адзін тут чаго-небудзь варты. Ты ведаеш: я заўсёды быў добры з табою. Кожны месяц я даваў табе чатыры срэбраныя пенсы. А цяпер ты бачыш, мой добры малец, мне блага і нікому я не патрэбны. Джым, ты прынясеш мне шкляначку рому, га?

— Доктар...— пачаў быў я.

Але ён пачаў лаяць доктара — слабым голасам, аднак, сярдзітым.

— Усе гэтыя лекары — швабры,— сказаў ён.— А ваш тутэйшы — ну што, што разумее ён





у мараках? Я бываў у такіх мясцінах, дзе горача, як у кіпені, дзе людзі так і падалі ад «Жоўтага Джэка»[1], а землятрусы гойдалі сушу, як марскую хвалю. Што твой доктар ведае пра такія мясціны? А я жыў там толькі ромам. Ромам! Ром быў мне і мясам, і вадою, і жонкаю, і сябрам. І калі я зараз не вып'ю рому, дык буду як стары карабель, выкінуты на бераг штормам, і мая кроў будзе на табе, Джым, і на гэтай швабры, на доктары.

І ён стаў брыдка лаяцца.

— Паглядзі, Джым, як дрыжаць мае рукі,— перастаўшы бэсціць доктара, стаў жаліцца ён.— Я не магу суняць іх. У мяне сёння аніводнай кроплі ў роце не было. Гэты доктар — дурань, я табе праўду кажу. Калі я не глытну рому, Джым, мне будуць мроіцца прывіды. Сёе-тое я ўжо бачыў, дальбог. Я бачыў старога Флінта, вунь там, у куце, у цябе за спінаю — бачыў ясна-ясна, як жывога. А калі мне мрояцца прывіды, я раблюся падобны да звера, чаго толькі не магу тады нарабіць! Твой доктар сам сказаў, што адна шклянка мяне не заб'е. Я дам табе залатую гінею[2] за адну шклянку, Джым.


Ён клянчыў усё больш настойліва і гэтак разышоўся, што я спалохаўся за бацьку: яму ў той дзень было асабліва блага і нельга было, каб ён хваляваўся. Да таго ж мяне падтрымлівалі доктаравы словы, што адна шклянка рому капітана не заб'е.

— Не трэба мне вашых грошай,— адказаў я: капітанава прапанова — гінея за шкляначку — абразіла мяне.— Заплаціце лепш тое, што вінныя бацьку. Я прынясу вам шклянку рому, але больш і не прасіце.

Калі я прынёс ром, ён схапіў шклянку і адразу ж прагна выпіў да дна.

---

[1] «Жоўты Джэк» — ліхаманка.
[2] Гінея — англійская манета (каля 10 рублёў).



— Мне адразу ж стала лепей, Джым,— сказаў ён.— Паслухай, доктар не казаў, колькі мне ляжаць у гэтай бярлозе?

— Прынамсі, тыдзень,— сказаў я.

— Тыдзень! — усклікнуў капітан.— Праклццце... Гэта немагчыма: яны паспеюць перадаць мне чорную метку. Яны ўжо пранюхалі, дзе я, гэтыя нікчэмныя людзі — свайго не змаглі зберагчы, дык цяпер на чужое квапяцца. Хіба гэтак робяць сапраўдныя маракі? Вось я: чалавек ашчадны, ніколі не раскідваўся грашыма і не збіраюся страчваць тое, што сам нажыў. Я зноў абвяду іх вакол пальца — я іх не баюся. Адчалю ад гэтага рыфа, і яны зноў застануцца з носам.

Гаворачы, ён стаў прыўзнімацца, абапіраючыся на маё плячо, так што я ледзь не закрычаў ад болю. Ягоныя ногі цяжка, бы калоды, апусціліся на падлогу. І голас у яго быў вельмі слабы. Цяжка было паверыць, што ён зможа хутка ачуняць, каб здзейсніць задуманае.

Сеўшы, капітан доўга не мог выгаварыць ні слова.

— Даканаў мяне гэты доктар,— нарэшце прамармытаў ён.— У вушах так і звініць. Дапамажы мне легчы...

Але не паспеў я працягнуць да яго руку, як ён зноў упаў у ложак і надоўга замаўчаў.


— Джым,— спытаўся ён нарэшце,— ты бачыў сёння таго марака?


— Чорнага Пса? — перапытаў я.

— Ага, сынок, Чорнага Пса,— узіраўся ў мяне капітан.

Я адказаў, што нікога чужога паблізу не было.

— Ён благі чалавек,— зноў загаварыў капітан,— але тыя людзі, што паслалі яго, яшчэ горшыя. Слухай: калі мне не ўдасца выбрацца адсюль і яны ўсунуць мне чорную метку, ведай, што ім патрэбны мой куфар. Тады сядай на ка-





ня — ты ж можаш ездзіць вярхом, ці ж не так? — тады сядай на каня і скачы да... А, цяпер мне ўжо ўсё роўна, скачы хоць да гэтай швабры, да доктара, і скажы яму, каб ён свіснуў усіх матросаў на палубу — усякіх там прысяжных і суддзяў — і накрыў бы маіх гасцей на борце «Адмірала Бенбоў», усю Флінтаву хеўру, усіх да аднаго, колькі іх яшчэ засталося ў жывых. Я быў у Флінта першым штурманам, так, першым штурманам, і я адзін ведаю, дзе знаходзіцца тое месца. Ён сам мне ўсё перадаў, калі ў Саване[1] ляжаў пры смерці, як цяпер вось я, ты сам бачыш... Але ты нічога не рабі, пакуль яны не прышлюць мне чорную метку ці пакуль ты зноў не ўбачыш Чорнага Пса або аднаногага марака. Яго, Джым, сцеражыся больш за ўсіх астатніх.

— А што гэта за чорная метка, капітан? — спытаўся я.

— Гэта выклік, хлопец. Запрашэнне паўстаць перад іхнім судом. Калі яны прышлюць, я табе скажу. Ты толькі ўпільнуй іх, Джым, і я раздзялю з табою ўсё папалам, слова гонару.

Ён пачаў загаворвацца, голас у яго слабеў. Я даў яму лекі, і ён прыняў іх, сказаўшы:

— Калі і меў які-небудзь марак патрэбу ў леках, дык гэта я.


Нарэшце ён заснуў, усё роўна як праваліўся ў сон, і я пакінуў яго аднаго.

Што б я рабіў, калі б усё ішло добра, не ведаю. Напэўна, расказаў бы пра ўсё доктару, бо страшэнна баяўся: раптам капітан пашкадуе, што адкрыўся, і прыкончыць мяне?.. Але здарылася так, што гэтым вечарам раптоўна памёр мой бедны бацька, і мы забыліся на ўсё астатняе. Мяне апанавалі нашае гора, наведванні суседзяў, пахаванне, гаспадарчы клопат, так што не было калі ні думаць пра капітана, ні баяцца яго.

---

[1] Савана — порт у Паўночнай Амерыцы.






Назаўтра ўранку ён сышоў уніз, нібыта і не быў хворы. Еў у звычайны свой час, але без усякага апетыту, і, баюся, выпіў лішняе, бо сам частаваўся ля стойкі. Ён пырхаў і соп так сярдзіта, што ніхто не насмеліўся спыніць яго. Увечары напярэдадні пахавання ён быў, як звычайна, п'яны. Гідка было чуць ягоную дзікую піррацкую песню ў нашым самотным доме. Але ён быў вельмі слабы, і мы баяліся, што ён можа памерці,— доктар быў у аднаго хворага за шмат міль адсюль, пасля смерці бацькі ён ні разу не завітваў да нас.

Капітан не толькі не папраўляўся, але яшчэ больш занядужваў. Праз сілу выходзіў да лесвіцы і, хістаючыся, чыкільгаў да стойкі і назад. Часам ён высоўваў нос за дзверы — падыхаць морам, але хапаўся пры гэтым за сцяну. Дыхаў ён цяжка і хутка, як чалавек, што ўзбіраецца на крутую гару. Ён больш не загаворваў са мною і, напэўна, забыўся на сваё нядаўняе прызнанне, але стаў, нягледзячы на сваю слабасць, яшчэ больш нястрыманы і раздражнёны. Напіваючыся, ён выцягваў корцік і клаў яго перад сабою на стол. Апанаваны сваімі думкамі і трызненнямі, ён амаль не заўважаў людзей. Аднаго разу — мы дужа здзівіліся — ён стаў лагодна насвістваць нейкую вясковую любоўную песеньку, якую, мабыць, спяваў юнаком, да таго як адправіўся ў мора.

Такія вось былі ў доме справы, калі назаўтра пасля пахавання — дзень быў пахмурны, туманны і марозны — гадзіны ў тры апоўдні я выйшаў на ганак. Я ўсё думаў і думаў пра бацьку.

І тут я ўбачыў на дарозе чалавека. Напэўна, гэта быў сляпы, бо ішоў ён вельмі павольна і намацваў кульбаю дарогу, а над ягонымі вачыма і носам вісеў зялёны шчыток. Згорблены праз старасць або хваробу, чалавек быў захутаны ў ірваны, падраны матроскі плашч з капюшонам —





вопратка хавала абрысы ягонага цела. Ніколі ў жыцці я не бачыў такога страшыдлы. Ён спыніўся непадалёк ад мяне і гучна прамовіў — нараспеў, гугнявым голасам, невядома да каго звяртаючыся:

— Ці не скажа які-небудзь дабрадзей беднаму сляпому, які страціў зрок, мужна абараняючы сваю бацькаўшчыну, Англію, няхай бласлаўляе бог караля Георга, куды я трапіў?

— Вы непадалёк ад карчмы «Адмірал Бенбоў», у бухце Чорнага Пагорка, добры чалавек,— сказаў я.

— Я чую голас,— сказаў стары,— малады голас. Дай мне руку, добры юнак, і правядзі мяне ў карчму.

Я працягнуў яму руку, і гэтая жудасная бязвокая істота, з такім ліслівым голасам, схапіла яе, нібыта абцугамі. Я так спалохаўся, што хацеў уцячы, але сляпы ўмомант прыцягнуў мяне да сябе.

— А зараз, хлопчык,— сказаў ён,— вядзі мяне да капітана.

— Сэр,— адказаў я,— дальбог, не магу.

— Вось як? — усміхнуўся ён.— Не можаш? Вядзі мяне зараз жа, ці я зламаю табе руку.


Тут ён павярнуў маю руку, што я ўскрыкнуў.

— Сэр,— сказаў я,— я за вас баюся. Капітан цяпер не такі, як заўсёды. Ён сядзіць, агаліўшы корцік. Адзін джэнтльмен...

— Жыва, марш! — перапыніў ён мяне.

Ніколі яшчэ я не чуў такога злога, халоднага і гідкага голасу. Гэты голас так напалохаў мяне, што я, скарыўшыся, адразу ж падпарадкаваўся сляпому і правёў яго ў гасцёўню, дзе сядзеў наш стары пірат, адурманены ромам. Сляпы ўчапіўся ў мяне жалезнымі пальцамі. Хватка ў яго была такая, што я пад ягоным цяжарам ледзь трымаўся на нагах.

— Вядзі мяне акурат да яго, і калі ён мяне





ўбачыць, крыкні: «Вось ваш сябра, Білі!» А калі не крыкнеш, я вось што зраблю.— І ён так сціснуў маю руку, што я ледзь не страціў прытомнасць. Я так баяўся сляпога жабрака, што зусім перастаў баяцца капітана і, адчыніўшы дзверы гасцёўні, выкрыкнуў дрыготкім голасам словы, якія загадаў мне пракрычаць незнаёмец.

Бедны капітан ускінуў вочы ўверх і ўмомант працверазіўся, як і не піў нічога. На твары ў яго быў не так страх, як смяротная пакута. Ён паспрабаваў устаць, але сілы ў яго, я думаю, ужо зусім не было.

— Нічога, Білі, сядзі дзе сядзіш,— сказаў жабрак.— Я не магу цябе бачыць, але чую, як дрыжаць твае рукі. Справа ёсць справа. Працягні сваю правую руку. Хлопчык, вазьмі яго руку і паднясі да маёй правай рукі.

Мы абодва падпарадкаваліся яму, і ■ ўбачыў, як ён пераклаў нешта са сваёй рукі, у якой трымаў кульбу, у капітанаву далонь, і тая адразу ж сціснулася ў кулак.

— Справа зроблена,— сказаў сляпы.

Пры гэтых словах ён выпусціў руку і з нечаканым спрытам упэўнена выскачыў з карчмы на дарогу. Я ўсё яшчэ стаяў нерухома, прыслухоўваючыся да стуку ягонае кульбы, які чуўся ўсё далей і далей ад нас.


Прайшло досыць шмат часу, перш чым мы з капітанам ачомаліся. І толькі цяпер я заўважыў, шт ўсё яшчэ трымаю яго за руку. У той самы момант ён вырваў яе і зірнуў на далонь.

— У дзесяць гадзін! — усклікнуў ён.— Засталося шэсць гадзін. Мы яшчэ абдурым іх!

Ён ускочыў, але адразу ж пахіснуўся і схапіўся за горла. Так ён стаяў, пахістваючыся, яшчэ некалькі імгненняў, а потым, нешта прахрыпеўшы, грымнуўся на падлогу.

Я адразу ж кінуўся да яго і паклікаў маці. Але было позна. Капітан памёр ад апаплексічнага






ўдару. І дзіўна: мне ніколі, дальбог, не падабаўся гэты чалавек, хоць апошнім часам я пачаў шкадаваць яго, але, убачыўшы капітана мёртвым, я зарыдаў. Гэта была другая смерць запар, якая здарылася ў мяне на вачах, і гора, нанесенае мне першаю, было яшчэ надта свежае ў маім сэрцы.

РАЗДЗЕЛ IV

Матроскі куфар

Не губляючы часу, я расказаў маці ўсё, што ведаў. Мажліва, мне трэба было расказаць ёй гэта раней. Цяпер мы былі ў вельмі цяжкім, небяспечным становішчы.

Частка грошай, што засталіся пасля капітана,— калі толькі ў яго былі якіясьці грошы,— бясспрэчна, павінна была адысці нам. Але наўрад ці ягоныя карабельныя таварышы, накшталт тых двух, што я бачыў, Чорнага Пса і сляпога жабрака, згадзіліся б адмовіцца ад сваёй здабычы, каб расплаціцца за нябожчыка. Капітанаў загад сесці на каня і скакаць да доктара Ліўсі я выканаць не мог: нельга было пакідаць маці адну, безабаронную. Пра гэта і думаць не прыходзілася. А заставацца дома мы, канечне, таксама не маглі, бо ўздрыгвалі нават тады, калі вуголле ў нашым ачагу падала на жалезны каласнік, баяліся цікання гадзінніка. Усюды нам чуліся чыесьці крокі, нібыта нехта набліжаўся да нас. Пры думцы аб тым, што на падлозе ляжыць мёртвы капітан, а недзе паблізу ходзіць агідны сляпы жабрак, які можа ў любую хвіліну вярнуцца, у мяне па скуры мурашкі прабягалі. Трэба было неадкладна нешта рабіць, і мы вырашылі нарэшце





выправіцца ў бліжэйшае селішча па дапамогу. Не марудзячы мы з непакрытымі галовамі кінуліся ў дарогу. Быў туманны марозны вечар.

Селішча ад нас не было відаць, але месцілася яно непадалёк, за некалькі сотняў ярдаў, на процілеглым беразе суседняе бухты. Мяне дужа ўсцешвала думка, што сляпы жабрак, выскачыўшы з нашага дома, рушыў у адваротны бок. Ішлі мы нядоўга, хоць часам спыняліся, каб прыслухацца. Але наўкол чуліся звыклыя гукі: гудзеў прыбой і каркалі ў лесе вароны.

У селішчы, калі мы туды прыйшлі, ужо запалілі свечкі, і я ніколі не забуду, з якой радасцю ўбачылі мы іхняе жаўтаватае ззянне ў вокнах. Але гэта было адзінае, што, крыху супакоіўшы, дапамагло нам, бо ніхто з вяскоўцаў, на іхні сорам, не згадзіўся пайсці з намі ў «Адмірал Бенбоў». Чым больш расказвалі мы, чаго баімся, тым больш кожны хінуўся да свайго кута. Імя капітана Флінта, мне дагэтуль не знаёмае, было добра вядомае многім вяскоўцам і наводзіла на іх жах. Некаторыя згадалі, як сёння, працуючы ў полі непадалёк ад нашае карчмы, убачылі на дарозе нейкіх падазроных людзей. Прыняўшы іх за кантрабандыстаў, вяскоўцы таропка рушылі дадому. Адзін нават бачыў у бухце, якую мы называем Логавам Кіта, люгер[1]. Пачуўшы пра капітанавых прыяцеляў, вяскоўцы дрыжалі ад страху. Знайшліся смельчакі, якія выбраліся з'ездзіць па доктара Ліўсі — але ніхто не хацеў дапамагчы нам абараніць карчму.

Кажуць, што баязлівасць — заразлівая, аднак спрэчкі і пярэчанні, наадварот, могуць зрабіць чалавека смелым. Калі ўсе выгаварыліся, маці дакляравала, што зусім не збіраецца губляць грошы, якія належаць яе асірацеламу сыну.

— Вы можаце баяцца колькі хочаце,— ска-

[1] Люгер — невялікае паруснае судна.





зала яна,— мы з Джымам не баімся. Мы вернемся тою ж дарогаю, што і прыйшлі. Ганьба вам, дужым і шыракаплечым мужчынам з сэрцамі куранят! Мы адчынім куфар, няхай нам прыйдзецца памерці праз гэта. Я буду ўдзячная вам, місіс Крослі, калі вы дазволіце мне ўзяць вашую кайстру, каб пакласці ў яе нашы крэўныя грошы.


Я, вядома, сказаў, што пайду разам з маці, і ўсе закрычалі, што мы з глузду з'ехалі, аднак ніхто з мужчын так і не выбраўся правесці нас. Мне далі зараджаны пісталет ды абяцалі трымаць напагатове асядланыя коні, каб мы маглі ўцячы, калі рабаўнікі пагоняцца за намі. А адзін хлопец паскакаў да доктара прасіць узброенай дапамогі.


Сэрца маё так і калацілася, калі мы выправіліся ў нашую небяспечную дарогу. Вечар, як я ўжо сказаў, быў халодны. Узыходзіла поўня. Яна ўжо ўзнялася над даляглядам і чырванела ў тумане, з кожнай хвілінаю ўсё ярчэй. Нас ужо няцяжка было прыкмеціць, і мы нячутна краліся ўздоўж плота. Не сустрэўшы па дарозе нічога страшнага, дабраліся нарэшце да «Адмірала Бенбоў».

Увайшоўшы ў дом, я адразу ж зачыніў дзверы на засаўку. Цяжка дыхаючы, стаялі мы ў цемрадзі, адны ў пустым доме, дзе астываў нябожчык. Затым маці прынесла свечку, і, трымаючыся за рукі, мы ўвайшлі ў гасцёўню. Капітан ляжаў у той самай паставе, у якой мы яго пакінулі,— на спіне, з расплюшчанымі вачыма, з адкінутай рукою.

— Апусці шторы, Джым,— прашаптала маці.— Яны могуць сачыць за намі праз акно. А зараз,— сказала яна, калі я апусціў шторы,— трэба знайсці ключы ад куфра. Але хацела б я ведаць, хто асмеліцца дакрануцца да яго,— кіўнула яна на нябожчыка і ледзь не ўсхліпнула.

Я ўкленчыў. На падлозе каля рукі капітана





ляжаў малюпасенькі папяровы кружок, выпацканы з аднаго боку чымсьці чорным. Не было сумнення, што гэта і ёсць **чорная метка.** Я схапіў яе і заўважыў, што на другім яе баку напісана вельмі прыгожым, ясным почыркам: «Даём табе тэрмін да дзесяці вечара».

— Яны прыйдуць у дзесяць, мама,— сказаў я.

І ў той самы момант стаў біць наш стары гадзіннік. Ад гэтага раптоўнага бою мы ажно скалануліся. Аднак мы і ўзрадаваліся, бо было яшчэ толькі шэсць гадзін.

— Ну, Джым,— сказала маці,— шукай ключ.

Я абшнарыў капітанавы кішэні адну за адной. Некалькі дробных манет, напарстак, ніткі і тоўстая іголка, надкусаны з краю кавалак тытуню, нож з крывой ручкаю, кішэнны компас, крэсіва — вось і ўсё, што я знайшоў. Я ўжо стаў адчайвацца.

— Можа, на шыі? — сказала маці.


Пераадолеўшы гідлівасць, я разарваў каўнер капітанавай кашулі. І праўда, на прасмоленай вяровачцы, якую я адразу ж перарэзаў знойдзеным нажом, вісеў ключ. Гэтая ўдача абнадзеіла нас, і мы паспяшаліся падняцца наверх, у той цесны пакой, дзе так доўга жыў капітан і дзе з дня ягонага з'яўлення стаяў куфар.

Звонку гэта быў звычайны матроскі куфар. На накрыўцы віднелася літара «Б», выпаленая гарачым жалезам. Вуглы былі пацёртыя і збітыя. Стары, мабыць, быў куфар.

— Дай ключ,— сказала маці.

Замок паддаваўся туга, аднак ёй удалося адамкнуць яго, і яна імгненна адкінула накрыўку.

На нас моцна патыхнула тытунём і дзёгцем. Зверху ляжаў добры, рупліва вычышчаны і адпрасаваны касцюм, як заўважыла маці, ні разу яшчэ не надзяваны. Падняўшы яго, мы ўбачылі



процьму розных рэчаў: квадрант[1], конаўку, некалькі кавалкаў тытуню, два вельмі прыгожыя пісталеты, срэбраны злітак, старадаўні іспанскі гадзіннік, некалькі забавак, не дужа каштоўных, пераважна замежных, два компасы ў меднай аправе і пяць-шэсць вычварных вест-індскіх ракавінак. Потым я часта думаў: навошта капітан, чалавек, які жыў такім небяспечным, злачынным жыццём, цягаў за сабою, бадзяючыся, гэтыя ракавінкі?

Але нічога каштоўнага, апроч срэбранага злітка і забавак, мы не знайшлі. А нам былі патрэбны грошы і толькі грошы. На самым сподзе ляжаў стары марскі плашч, збялелы ад салёнае вады. Маці нецярпліва адкінула яго, і мы ўбачылі апошняе, што ляжала ў куфры: загорнуты ў цырату пакет, накшталт пачка папер, і палатняную торбу, у якой, мяркуючы па звоне, было золата.

— Я пакажу гэтым разбойнікам, што я сумленная жанчына,— сказала маці.— Вазьму толькі тое, што ён мне вінен, і ані фарцінга[2] болей. Трымай кайстру!

І яна пачала адлічваць грошы, якія быў вінен нам капітан, перакладваючы іх з торбы ў кайстру ў маіх руках. Гэта забрала ў нас багата часу: манеты былі самых разнастайных чаканак і краін: і дублоны[3], і луідоры[4], і гінеі, і піястры, і яшчэ нейкія невядомыя мне. Гіней было мала, а маці ўмела лічыць толькі іх.

Калі яна ўжо адлічыла палову таго, што быў вінен нам нябожчык, я раптам схапіў яе за руку, бо пачуў у ціхім марозным паветры гук, ад якога ў мяне валасы сталі дыбам,— пастукванне куль-


---

[1] Квадрант — старадаўні прыбор для вымярэння вышыні нябесных цел.

[2] Фарцінг — англійская манета.

[3] Дублон і піястр — старадаўнія іспанскія манеты.

[4] Луідор — французская манета.





бы па мёрзлай дарозе. Стук гучнеў, і мы прыслухоўваліся, затаіўшы дыханне. Пасля нехта пастукаў у дзверы карчмы, затым стаў паварочваць дзвярную ручку, бразнуўшы засаўкай,— спрабаваў увайсці. Запала цішыня — знерухомелі мы, сціх і той, хто быў на ганку. Нарэшце зноў пачулася пастукванне кульбы. Як мы ўзрадаваліся: гук аддаляўся, і ўрэшце яго не стала чуваць.

— Мама,— сказаў я,— бяры ўсё, і бяжым адсюль.

Я быў перакананы, што зачыненыя на засаўку дзверы здаліся сляпому падазронымі, і стаў баяцца, што ён прывядзе сюды ўсю хеўру. Але як усё ж такі добра, што я дадумаўся зачыніць дзверы на засаўку!


Аднак маці, нягледзячы на страх, не згаджалася ўзяць ніводнай манетаю болей, чым належала, і ў той самы час упарта адмаўлялася ўзяць меней. Яна казала, што яшчэ няма сямі гадзін, што ў нас процьма часу, а яна ведае свае правы і нікому не саступіць іх. Спрачалася са мною да тае пары, пакуль мы раптам не пачулі працяглы ціхі свіст — недзе ўдалечыні, на ўзгорку.

Тут ужо маці перастала ўпарціцца.

— Я вазьму тое, што паспела адлічыць,— сказала яна, ускочыўшы на ногі.

— А я прыхаплю і гэта, каб было напоўніцу,—сказаў я, беручы загорнуты ў цырату пачак папер.

Праз хвіліну мы былі ўжо ўнізе. Свечка засталася ля пустога куфра. Я адчыніў дзверы, і мы выйшлі на дарогу. Нельга было губляць ні хвіліны. Туман хутка рассейваўся, поўня залівала святлом узгоркі, і толькі ў глыбіні лагчыны і ля дзвярэй карчмы клубілася смуга, усё роўна як дзеля таго, каб дапамагчы нам непрыкметна знікнуць. Але ўжо на палове дарогі да селішча, трохі вышэй, ля падножжа ўзгорка, мы непазбежна трaплялі ў паласу святла поўні.





І гэта было не ўсё: мы раптам пачулі чыесьці хуткія крокі. Азірнуўшыся, мы ўбачылі дрыготкі агеньчык, што набліжаўся да нас — нехта нёс ліхтар.

— Сынок,— раптам сказала маці,— бяры грошы і бяжы. Я зараз самлею...

«Мы загінулі абое»,— падумаў я. Як праклінаў я баязлівасць вяскоўцаў, як сердаваў на сваю бедную маці — і за яе сумленнасць, і за яе сквапнасць, за яе нядаўнюю смеласць, і цяперашнюю слабасць!

На шчасце, мы праходзілі каля нейкага мастка. Я дапамог маці — яна хісталася — сысці ўніз, да берага. Раптам яна ўздыхнула і прытулілася да мяне. Не ведаю, адкуль у мяне ўзялася сіла, але я пацягнуў маці ўздоўж берага пад масток. Баюся толькі, што зрабіў я гэта груба. Масток быў нізенькі, і рухацца пад ім можна было толькі на карачках. Я папоўз далей, пад арку, а маці засталася амаль уся навідавоку. Да карчмы было некалькі крокаў.

РАЗДЗЕЛ V

Канец сляпога

Цікаўнасць мая пераважыла страх, на месцы мне не сядзелася. Я асцярожна вылез у лагчыну і схаваўся за кустом ракіты. Адсюль я добра бачыў дарогу перад дзвярыма карчмы. Ледзь я заняў свой назіральны пункт, як з'явіліся ворагі — сем ці восем чалавек. Яны хутка набліжаліся, гучна і бязладна стукаючы чаравікамі. Чалавек з ліхтаром бег наперадзе ўсіх. За ім, трымаючыся за рукі, імкліва крочылі трое. Нават у тумане я разгледзеў, што сярэдні ў гэтым «трыо» — сля-





пы жабрак. Неўзабаве я пачуў ягоны голас і ўпэўніўся, што не памыляўся.

— Ламайце дзверы! — крыкнуў ён.

— Есць, сэр,— адгукнуліся на загад двое ці трое і кінуліся ў атаку на дзверы «Адмірала Бенбоў». Чалавек з ліхтаром апынуўся ззаду. Ля самых дзвярэй яны спыніліся і пачалі шэптам раіцца: мабыць, іх здзівіла, што дзверы не былі зачыненыя. Але паўза была кароткая, бо сляпы зноў стаў выкрыкваць загады. Ягоны нецярплівы, раз'юшаны голас гучнеў і рабіўся ўсё больш вісклівы.

— У дом, у дом! — крычаў ён, праклінаючы сваіх людзей за марудлівасць.

Чацвёра ці пяцёра адразу ж падпарадкаваліся яму і ўвайшлі ў карчму, двое засталіся на дарозе разам з жудасным жабраком. Запала цішыня. Раптам з карчмы пачуўся крык:

— Білі мёртвы! — Адчувалася, што гэта дужа ўразіла чалавека.

Але сляпы зноў вылаяў людзей у карчме за тое, што яны марнуюць час.

— Абшукайце яго, гнюсныя гультаі! Астатнія наверх — браць куфар!

Людзі ў карчме застукалі чаравікамі па даўно не рапараваных прыступках, і ўвесь дом задрыжаў ад іхняга тупату. Затым зноў пачуліся здзіўленыя галасы. Акно ў капітанавым пакоі расчынілася насцеж, і ўніз са звонам пасыпаліся аскепкі разбітага шкла. З акна высунуўся чалавек, у святле поўні было добра відаць ягоныя плечы і галаву.

— Гэй, П'ю,— закрычаў ён сляпому,— нас апярэдзілі! Нехта ўжо вывернуў куфар!

— А тое на месцы? — зароў П'ю.

— Грошы тут.

— Гараць яны гарам! — ажно закалаціўся сляпы.— Ці ёсць Флінтавы паперы?

— Папер не відаць,— адказаў чалавек у акне.



— Гэй вы, там, унізе! — зноў крыкнуў сляпы.— Гляньце, ці няма іх у Білі!

Другі чалавек, напэўна, адзін з тых, хто застаўся ўнізе абшукваць труп капітана, з'явіўся ў дзвярах карчмы.

— Яго паспелі абшнарыць да нас,— сказаў ён,— нічога не пакінулі.

— Гэта людзі з карчмы. Той шчанюк! Шкада, што я не выкалаў яму вочы! — крыкнуў П'ю.— Яны былі тут зусім нядаўна. Калі я хацеў увайсці, дзверы былі зачыненыя на засаўку. Шукайце іх, хлопцы, шукайце ўсюды, дзе можна!

— Твая праўда, П'ю! Яны пакінулі тут запаленую свечку,— сказаў чалавек у акне.


— Шукайце іх ва ўсіх кутках! Перакапайце ўвесь дом! — закрычаў П'ю, стукаючы кульбаю па дарозе.


Тады ў нашай старой карчме пачаўся сапраўдны гармідар. Усюды чуліся грукат і бегатня. Яны ламалі мэблю і бразгалі дзвярыма ўверсе і ўнізе так, што да мяне ажно даносілася ад скал рэха гэтага пагрому. Ды ўсё дарма: людзі выскоквалі адзін за адным з карчмы і дакладвалі, што не знайшлі нас нідзе.

І тут удалечыні зноў пачуўся той самы свіст, што так напалохаў маці і мяне, калі мы лічылі нябожчыкавы манеты. На гэты раз ён прагучаў двойчы. Тады я падумаў, што гэтым свістам сляпы склікае сваіх людзей на штурм карчмы, але цяпер я заўважыў, што свіст даносіцца аднекуль са схілу ўзгорка з боку селішча, і здагадаўся, што гэта сігнал, якім вартавы папярэджвае піратаў аб небяспецы.

— Гэта зноў Дэрк,— сказаў адзін.— Двойчы! Трэба змывацца, хлопцы.

— Змывацца? — крыкнуў П'ю.— Ёлупні! Дэрк заўсёды быў дурань і баязлівец, няма чаго яго слухаць! Яны недзе тут, паблізу, не маглі ж яны ўцячы далёка. Трэба накрыць іх. Шукай-





це ж, псы, шукайце ўсюды! Чорт! — усклікнуў ён.— Былі б у мяне вочы!

Гэты крык трохі падбадзёрыў дваіх — яны сталі шныпарыць паміж дрэвамі ў гаі, але без асаблівае ахвоты, ледзь варушыліся. Відалася, што яны больш думалі пра тое, як уцячы, чым як знайсці нас. Астатнія застылі ў разгубленасці пасярод дарогі.

— У вас у руках тысячы, а вы, ёлупні, ні жывыя ні мёртвыя! Вы станеце багацейшыя за караля, калі знойдзеце гэтую паперу! І яна тут, [redacted] вы ледзь поўзаеце! Сярод вас не знайшлося ніводнага, хто асмеліўся б перадаць Білі чорную метку. Гэта зрабіў [redacted] — сляпы! І праз вас я губляю цяпер сваё шчасце! Я павінен гніць у жабрацтве і выпрошваць пенсы на шкляначку рому, замест таго каб раз'язджаць у карэтах!


— Кінь, П'ю, у нас жа дублоны,— буркнуў адзін.

— А паперу яны, мусіць, прыхавалі,— сказаў другі.— Бяры грошы, П'ю, і перастань вар'яцець.

П'ю і праўда нібыта звар'яцеў. Апошнія пярэчанні канчаткова раз'юшылі яго. У прыпадку лютае злосці ён кінуўся на сваіх таварышаў і пачаў біць іх сваёй кульбаю направа і налева.

Тыя, у сваю чаргу, адказвалі яму лаянкаю і жудаснымі пагрозамі і спрабавалі вырваць з ягоных рук кульбу.

Гэтая бойка была нам уратаваннем. Пакуль яны біліся і сварыліся, з узгоркаў, з боку селішча, данёсся конскі тупат. Амаль у тое ж самае імгненне дзесьці за агароджаю бліснуў агеньчык і грымнуў пісталетны стрэл. Гэта быў апошні сігнал трывогі. Піраты кінуліся ў розныя бакі — адны да мора, па беразе бухты, другія ўверх, па адхоне ўзгорка. Праз паўхвіліны на дарозе застаўся адзін П'ю. Яны кінулі яго — можа, апанаваныя панічным страхам, забыліся на тавары-



ша, а можа, адпомсцілі яму за лаянку і пабоі. Застаўшыся адзін, сляпы шалёна стукаў кульбаю па дарозе і клікаў таварышаў. Урэшце ён збіўся з дарогі і кінуўся ў накірунку да селішча. Бег за некалькі крокаў ад мяне і крычаў:

— Джоні, Чорны Пёс, Дэрк...— Ён называў і іншыя імёны.— Вы ж не кінеце старога П'ю, таварышы, не кінеце ў бядзе!

Конскі тупат тым часам набліжаўся, ужо можна было разгледзець пяць ці шэсць верхнікаў. Яны нesліся што было сілы па адхоне ўзгорка.

Тут сляпы зразумеў, што ідзе не туды, куды трэба. Ускрыкнуўшы, ён павярнуўся і пабег да прыдарожнае канавы, куды адразу ж і скаціўся. Але ўмомант ускочыў і, зусім ужо страціўшы розум, выкараскаўся на дарогу — якраз пад ногі каню, што скакаў паперадзе ўсіх.

Верхнік спрабаваў уратаваць яго, але было позна. Адчайны енк сляпога быццам разарваў начную цемрадзь. Конскія капыты змялі і раздушылі яго. П'ю ўпаў на бок, павольна перакуліўся на спіну і больш ужо не рухаўся.

Я ўскочыў на ногі і гукнуў верхнікаў. Яны спыніліся, напалоханыя гібеллю жабрака. Я адразу ж пазнаў іх. Хлопец, які скакаў ззаду, быў падлетак з селішча, што абраўся выправіцца па доктара Ліўсі. Астатнія былі ахоўнікі з мытні[1], якіх хлопец сустрэў па дарозе.


Як я даведаўся, чуткі пра нейкі люгер у Логаве Кіта і раней даходзілі да мытнага наглядчыка містэра Данса. Дарога да Логава Кіта праходзіла ля нашае карчмы, і вось менавіта дзякуючы гэтай выпадковасці мы з маці ўратаваліся ад непазбежнае смерці.

П'ю быў забіты напавал. Маці маю аднеслі ў селішча. Там ёй далі панюхаць араматычнае солі, апырскалі яе халоднай вадою, і яна ачнулася.

---

[1] Мытня — таможня.





Нягледзячы на пераживы страх, яна ўсё скардзілася, што не паспела ўзяць з капітанавых грошай належную суму.

Тым часам містэр Данс, не марудзячы, паскакаў са сваімі людзьмі ў Логава Кіта. Але, спускаючыся па схоне, ахоўнікі спешыліся і асцярожна вялі коней за аброць, а то і зусім падтрымлівалі іх. Ды яшчэ і засады баяліся. І, натуральна, калі яны дабраліся нарэшце да бухты, судна паспела падняць якар, хоць і было яшчэ непадалёк ад берага. Данс гукнуў уцекачоў. У адказ яму пачуўся голас, які раіў яму трымацца далей ад месцін, асветленых поўняю, калі ён не хоча пачаставацца свінцом — і адразу ж ля ягонага пляча прасвісцела куля. Неўзабаве судна знікла за мысам. Як расказваў містэр Данс, ён адчуваў сябе, стоячы на беразе, усё роўна як рыба, выкінутая з вады. Ён адразу ж паслаў чалавека ў Б... перадаць, каб выслалі ў мора кутэр[1].

— Ды марна ўсё гэта,— сказаў ён.— Яны ўцяклі, ужо не дагоніш. Зрэшты,— дадаў ён,— я рады хоць бы таму, што наступіў на мазоль пану П'ю.

(Я паспеў ужо ўсё яму расказаць.)

Разам з містэрам Дансам я вярнуўся ў нашую карчму. І не расказаць, які там быў рэзрух! Шукаючы мяне і маці, ашалелыя піраты нават сарвалі са сцяны гадзіннік. І хоць, апроч капітанавай торбы з грашыма і некалькіх срэбраных манет з нашае касы, яны нічога з сабою не забралі, я адразу зразумеў, які страшны быў нанесены нам удар.

Містэр Данс нічога не мог зразумець.


— Кажаш, яны ўзялі грошы? Дык што ж яшчэ яны шукалі? Можа, яшчэ якія-небудзь грошы?

— Не, сэр, не грошы,— адказаў я.— Тое, што

---

[1] Кутэр — аднамачтавае судна.





яны шукалі, ляжыць у мяне ў бакавой кішэні. Па праўдзе кажучы, я хацеў бы пакласці гэтую рэч у больш бяспечнае месца.

— Слушна, Хоўкінс, слушна,— сказаў Данс.— Дай яе мне, калі хочаш.

— Я думаў аддаць яе доктару Ліўсі,— сказаў я.

— Слушна! — згадзіўся ён.— Абсалютна слушна! Доктар — джэнтльмен і суддзя. Мабыць, і мне самому трэба было б з'ездзіць да яго ці да сквайра і далажыць пра ўсё. Што ні кажы, а сляпы памёр. Я зусім не шкадую гэтага прайдзісвета, але могуць знайсціся людзі, якія ўзваляць віну на мяне, наглядчыка. Ведаеш што, Хоўкінс? Калі хочаш, я вазьму цябе з сабою.

Я падзякаваў яму, і мы пайшлі ў селішча, дзе стаялі коні. Пакуль я развітваўся з маці, усе ўжо селі ў сёдлы.

— Догер,— сказаў містэр Данс аднаму з ахоўнікаў,— у цябе добры конь, пасадзі гэтага хлопца да сябе за спіну.

Толькі я сеў ззаду гэтага Догера і ўзяўся за ягоны пояс, наглядчык загадаў рушыць, і атрад імкліва паскакаў да дома доктара Ліўсі.

РАЗДЗЕЛ VI

Капітанавы паперы


Мы несліся стрымгалоў. Калі мы спыніліся ля доктаравага дома, ужо цямнела.


Містэр Данс сказаў мне саскочыць з каня і пастукацца ў дзверы. Догер падставіў стрэмя, каб мне было зручней сысці.

На стук выйшла служанка.

Я спытаўся, ці дома гаспадар.

— Не,— адказала служанка.— Ён вярнуўся ў абед, а цяпер пайшоў вячэраць да сквайра.





— Едзем туды,— сказаў містэр Данс.

Да сквайравай сядзібы было недалёка. Я нават не стаў садзіцца ў сядло, бег побач з канём, трымаючыся за стрэмя.

Ад паркавае брамы скакалі бязлістымі прысадамі, якія ўжо залівала святло поўні. Нарэшце містэр Данс саскочыў з каня і павёў мяне ў сквайраў дом. Нас адразу ж упусцілі туды.

Слуга павёў нас па доўгім, засланым дыванам калідоры ў кабінет гаспадара. Уздоўж сцен спрэс стаялі кніжныя шафы, на кожнай з іх быў бюст. Сквайр і доктар Ліўсі сядзелі ля каміна і курылі люлькі.


Я ніколі не бачыў сквайра так блізка. Гэта быў высокі мужчына, больш за шэсць футаў ростам, мажны, з тоўстым суровым тварам, які агрубеў і абветрыўся ў доўгіх падарожжах. У яго былі чорныя рухавыя бровы, што выдавалі не злы, але фанабэрысты і гарачы характар.

— Праходзьце, містэр Данс,— сказаў ён паблажліва-высакамерна.— Добры вечар!

— Добры вечар, Данс,— сказаў доктар і кіўнуў галавою.— Добры вечар, сябра Джым. Якім спадарожным ветрам занесла вас сюды?

Наглядчык выцягнуўся ў фрунт і выклаў усе нашыя прыгоды, нібыта завучаны ўрок. Бачылі б вы, як шматзначна пераглядваліся доктар і сквайр у час ягонага расказу! Нават перасталі курыць, з такой цікаўнасцю слухалі. А калі яны пачулі, як мая маці адправілася ўначы назад у карчму, доктар ляпнуў сябе па ляжцы, а сквайр крыкнуў: «Брава!» — і разбіў сваю доўгую люльку аб краты каміна. Містэр Трэлані (так, калі вы памятаеце, звалі сквайра) ужо даўно пакінуў свой фатэль і расхаджваў па кабінеце, а доктар сцягнуў з галавы свой напудраны парык, нібыта так яму было лепей чуваць. Дзіўна было бачыць яго без парыка, з коратка астрыжанымі чорнымі валасамі.





Нарэшце містэр Данс скончыў свой аповяд.

— Містэр Данс,— сказаў сквайр,— вы годны чалавек. А прыкончыўшы гэтага гнюснага, крыважэрнага злачынцу, вы, сэр, здзейснілі высакароднейшы акт — такіх прайдзісветаў трэба душыць, як прусакоў... Хоўкінс, бачу, таксама хлопец, якіх пашукаць. Пазвані ў той званочак, Хоўкінс. Містэру Дансу трэба выпіць трохі піва.

— Значыцца, Джым,— сказаў доктар,— тая штука, якую яны шукалі, цяпер у цябе?

— Вось,— працягнуў я яму загорнуты ў цырату пакет.

Доктар агледзеў яго з усіх бакоў. Было відаць, што доктару карціць ускрыць скрутак, але, замест таго каб зрабіць гэта, ён спакойна паклаў яго сабе ў кішэню.

— Сквайр,— сказаў ён,— калі Данс вып'е піва, яму прыйдзецца вярнуцца да сваіх службовых абавязкаў. А Джым Хоўкінс заначуе ў мяне. З вашага дазволу, я папрашу зараз падаць яму халоднага паштэту на вячэру, няхай хлопец паесць.

— Вядома, будзьце ласкавы,—сказаў сквайр.— Хоўкінс сёння не тое заслужыў.

Перада мною на адным з маленькіх столікаў паставілі вялікую порцыю галубінага паштэту. Я быў галодны як воўк і павячэраў з вялікім задавальненнем. Тым часам Данс, выслухаўшы багата новых ухвал, развітаўся і выйшаў.

— Ну, сквайр? — сказаў доктар.


— Ну, доктар? — сказаў сквайр.

— У адзін момант, во як! — засмяяўся доктар.— Думаю, вы чулі пра гэтага Флінта?

— Ці чуў я пра Флінта?! — усклікнуў сквайр.— Вы пытаецеся, ці чуў я пра яго? Гэта быў самы крыважэрны пірат з усіх, хто плаваў калі-небудзь па моры. Чорная Барада[1] перад ім

[1] Чорная Барада — знакаміты пірат.





дзіцёнак. Іспанцы так баяліся яго, што, прызнаюся вам, сэр, часам [redacted] ганарыўся тым, што ён англічанін. Аднаго разу каля Трынідада бачыў я ўдалечыні верхавінкі ягоных ветразяў, але наш капітан забаяўся і адразу ж павярнуў назад, у Порт-оф-Спэйн[1]. Назад, сэр.

— Я таксама чуў пра яго. Тут, у Англіі,— сказаў доктар.— Ды вось пытанне: [redacted] ці былі ў яго грошы?

— Грошы?! — ускрыкнуў сквайр.— Ці вы не чулі, што расказваў Данс? Чаго маглі шукаць гэтыя гіцлі, як не грошай? Што ім трэба, апроч грошай? З-за чаго, апроч грошай, сталі б яны рызыкаваць сваёй шкурою?

— Хутка мы даведаемся, з-за чаго яны ёю рызыкавалі,— адказаў доктар.— Вы так запаліліся, што слова мне сказаць не даяце. Вось што хацеў бы [redacted] высветліць: дапусцім, тут, у мяне ў кішэні, ключ, з дапамогаю якога можна даведацца, дзе Флінт схаваў свае скарбы. Ці вялікія яны?

— Ці вялікія, сэр? — зноў ускрыкнуў сквайр.— Дык слухайце! Калі толькі гэты ключ у нас, я неадкладна шукаю ў Брыстолі добрае судна, бяру з сабою вас і Хоўкінса і выпраўляюся на пошукі гэтых скарбаў, няхай на тое спатрэбіцца год!

— Выдатна,— сказаў доктар.— А зараз, калі Джым не супраць, ускрыем гэты скрутак.

І ён паклаў скрутак перад сабою на стол.


Пакет быў надзейна зашыты. Доктар дастаў сваю скрынку з інструментамі і разрэзаў ніткі хірургічнымі нажніцамі. У пакеце былі дзве рэчы: сшытак і запячатаны канверт.

— Спярша паглядзім сшытак,— прапанаваў доктар.

Ён ласкава паклікаў мяне да сябе, і я ўстаў

---

[1] **Порт-оф-Спэйн** — галоўны горад вострава Трынідад у Карыбскім моры. (Цяпер сталіца дзяржавы Трынідад і Табага.)



з-за стала, за якім вячэраў, каб прыняць удзел у раскрыцці таямніцы. Доктар пачаў гартаць сшытак, сквайр і я з цікаўнасцю глядзелі праз ягонае плячо. Першая старонка была ў нейкіх крамзолях. Выдавала на тое, што выводзілі іх ад няма чаго рабіць або дзеля спробы пяра. Быў тут і той надпіс, які капітан вытатуіраваў у сябе на руцэ — «Хай здзейсняцца мары Білі Бонса», і іншыя, накшталт гэтага — «Містэр У[1]. Бонс, штурман». «Досыць рому», «Ля Палм-Кі[2] ён атрымаў усё, што яму належала». Былі і іншыя надпісы, пераважна з аднаго слова, не зразумелыя мне. Мяне вельмі зацікавіла, што за чалавек быў той, хто «атрымаў усё, што яму належала», і што менавіта належала яму. Можа, удар нажом у спіну?

— З гэтай старонкі багата не выведаеш,— сказаў доктар.


Дзесяць — дванаццаць наступных старонак былі запоўнены малазразумелымі бухгалтарскімі запісамі. У пачатку радка стаяла дата, у канцы — грашовы вынік, як звычай у бухгалтарскіх кнігах. Але замест усялякіх тлумачэнняў у прамежку стаяла толькі розная колькасць крыжыкаў. Напрыклад, 12 чэрвеня 1745 года была запісана сума ў семдзесят стэрлінгаў, але ўсе тлумачэнні таго, адкуль яна магла ўзяцца, былі заменены шасцю крыжыкамі. Зрэшты, зрэдку дадавалася назва мясцін, напрыклад — «Насупраць Каракаса», ці проста пазначалася шырата і даўгата, напрыклад — «62°17′20″» або «19°2′40″».

Запісы вяліся на працягу амаль дваццаці гадоў. Запрыходаваныя сумы ўсё павялічваліся. У самым канцы, пасля пяці-шасці закрэсленых падлікаў, падводзіўся вынік, і ўнізе было падпісана: «Доля Бонса».

---

[1] У.—Уільям. Білі — памяншальнае ад Уільям.

[2] Палм-Кі — невялікі востраў ля берагоў Фларыды.



— Нічога не разумею,— сказаў доктар.

— Усё ясна, як дзень! — усклікнуў сквайр.— Перад намі прыходная кніга гэтага гнюснага сабакі. Крыжыкамі пазначаюцца затопленыя караблі і абрабаваныя гарады. Лічбы абазначаюць долю гэтага душагуба, а там, дзе ён баяўся памыліцца, ён рабіў тлумачэнні. «Насупраць Каракаса», напрыклад. Гэта значыць, што насупраць Каракаса быў зроблены напад на нейкае няшчаснае судна. Божа, супакой душы тых бедных маракоў, што даўно ператварыліся ў каралы!

— Слушна! — сказаў доктар.— Вось што значыць быць падарожнікам! Слушна! І доля яго расла, як вы бачыце, бо ён павышаўся ў чыне.

Нічога больш у гэтым сшытку не было, апроч назваў некаторых мясцін, запісаных на чыстых аркушах, і табліцы для пераводу англійскіх, французскіх і іспанскіх грошай у хадавую манету.

— Ашчадны чалавек! — усклікнуў доктар.— Гэтага не аблічыш.


— А зараз,— сказаў сквайр,— паглядзім, што тут.

Канверт быў запячатаны ў некалькіх месцах. Пячаткі ставіліся напарсткам. Магчыма, тым самым, які я знайшоў у капітана ў кішэні. Доктар асцярожна зламаў пячаткі, і на стол выпала карта нейкага вострава, з указанымі каардынатамі, з абазначэннем глыбінь мора ля берагоў, з назваю скал, заліваў і мысаў — словам, тут было ўказана ўсё, што можа спатрэбіцца, каб, нічым не рызыкуючы, падысці да вострава і кінуць якар.

Востраў меў дзевяць міль у даўжыню і пяць у шырыню. Сваімі абрысамі ён нагадваў тлустага дракона, які ўзняўся на дыбы. Мы заўважылі дзве гавані, дзе можна было перачакаць шторм, і пагорак пасярэдзіне вострава, названы «Падзорная Труба».

На карце было шмат дадатковых надпісаў,





зробленых пазней, але больш за ўсё кідаліся ў вочы тры крыжыкі, зробленыя чырвоным атрамантам[1], — два ў паўночнай частцы вострава і адзін у паўднёва-заходняй. Каля гэтага крыжыка тым самым чырвоным атрамантам дробным, выразным почыркам, зусім непадобным на капітанавы крамзолі, было напісана:

«Галоўная частка скарбаў тут».

На адваротным баку карты былі тлумачэнні, зробленыя той самай рукою:

«Высокае дрэва на плячы Падзорнай Трубы, накірунак да Пн. ад Пн.-Пн.-У.

Востраў Шкілета У.-Пдн.-У. і на У. Дзесяць футаў.

Зліткі срэбра ў паўночнай яміне. Адшукаеш яе на схоне ўсходняга пагорка, за дзесяць сажняў[2] на поўдзень ад чорнай скалы, калі стаць да яе тварам.

Зброю лёгка знайсці ў пясчаным пагорку на Пн. краі Паўночнага мыса, кіруючыся на У. і на чвэрць румба да Пн.

Д. Ф.».


І ўсё. Мне гэтыя запісы здаліся зусім незразумелымі, але, нягледзячы на ўсю іх сціспласць, сквайр і доктар не знаходзілі сабе месца ад радасці.

— Ліўсі, — сказаў сквайр, — вам трэба неадкладна кінуць вашую вартую жалю практыку. Заўтра я еду ў Брыстоль. Праз тры тыдні... не, праз два... не, праз дзесяць дзён у нас будзе лепшае судна, сэр, і самая адборная каманда ва ўсёй Англіі. Хоўкінс пойдзе юнгаю... З цябе, Хоўкінс, атрымаецца выдатны юнга... Вы, Ліўсі, — карабельны доктар, я — адмірал. Мы возьмем з сабою Рэдрута, Джойса і Хантэра. Спадарожны вецер

---

[1] Атрамант — чарніла.
[2] Марскі сажань — 6 футаў (182 см).





хутка дамчыць нас да вострава. Адшукаць там скарбы будзе не дужа цяжка. А пасля ў нас будзе столькі грошай, што мы зможам купацца ў іх, кідаць іх, гуляючы, бы каменьчыкі, у ваду...

— Трэлані,— перапыніў яго доктар,— я плыву з вамі. Будзьце ўпэўнены: мы з Джымам спраўдзім ваш давер. Але ёсць чалавек, якому ■ баюся даверыцца.

— Хто? — усклікнуў сквайр.— Назавіце гэтага пса, сэр!

— Вы,— адказаў доктар,— таму што вы не ўмееце трымаць язык за зубамі. Не мы адны ведаем пра гэтыя паперы. Піраты, што разнеслі ўначы карчму, як бачыце, народ вельмі смелы, як і тыя, што засталіся на судне, ёсць і яшчэ ў іх сябрукі, можаце не сумнявацца, дык яны зробяць усё, што ў іх сілах, каб завалодаць скарбамі. Мы нідзе не павінны хадзіць паасобку, пакуль не выйдзем у мора. Я застануся тут разам з Джымам да ад'езду, ■ вы бярыце Джойса і Хантэра і адпраўляйцеся з імі ў Брыстоль. І, самае галоўнае, мы нікому і слова сказаць не павінны пра нашую знаходку.

— Ліўсі,— адказаў сквайр,— ваша праўда, як заўсёды. Я буду нямы як магіла.






ЧАСТКА ДРУГАЯ



КАРАБЕЛЬНЫ КУХАР




РАЗДЗЕЛ VII

Я еду ў Брыстоль

Падрыхтоўка да плавання забрала нашмат больш часу, чым думаў сквайр. Ніводны з нашых першапачатковых планаў не ажыццявіўся, нават намер доктара Ліўсі не развітвацца са мною: яму прыйшлося выправіцца ў Лондан шукаць доктара, які замяніў бы яго ў нашых мясцінах у час плавання. У сквайра было багата работы ў Брыстолі. А [redacted] жыў у ягоным маёнтку пад наглядам старога егера Тома Рэдрута, амаль як зняволены, і марыў аб невядомых астравах і марскіх прыгодах. Я правёў над картаю шмат гадзін і вывучыў яе на памяць. Седзячы ля каміна ў пакоі аканома[1], [redacted] падплываў у мроях да вострава з розных бакоў, даследаваў кожны ягоны вяршок, тысячы разоў узбіраўся на высокі пагорак, названы Падзорнай Трубою, і любаваўся адтуль дзіўнымі, усё новымі і новымі краявідамі. Іншы раз востраў кішэў дзікунамі, і мы адбіваліся ад іх, іншы раз на ім жылі ў незлічонай колькасці адны драпежнікі, і мы ўцякалі ад іх. Ды толькі ўсе гэтыя ўяўныя прыгоды аказаліся дробязнымі ў параўнанні з той дзіўнай і трагічнай эпапеяй, якая адбылася на самай справе.

---

[1] **Аканом** — чалавек, які кіраваў у маёнтку гаспадаркаю.



Праходзіў тыдзень за тыднем. Нарэшце мы атрымалі ліст, адрасаваны доктару Ліўсі, з прыпіскаю на канверце:

«Калі доктар Ліўсі яшчэ не вярнуўся, канверт ускрыць Тому Рэдруту ці маладому Хоўкінсу».

Разарваўшы канверт, мы прачыталі — дакладней, я прачытаў, бо егер разбіраў адно друкаваныя літары,— наступнае важнае паведамленне:

«Гатэль «Стары якар», Брыстоль, 1 сакавіка 17.. года.

ДАРАГІ ЛІЎСІ!

Не ведаю, дзе вы цяпер, у маёнтку ці ўсё яшчэ ў Лондане, і пішу адначасна і туды і сюды.

Карабель куплены і падрыхтаваны. Ён стаіць на якары і гатовы зараз жа выйсці ў мора. Лепшага судна і ўявіць сабе немагчыма — ім можа кіраваць дзіцёнак. Водазмяшчэнне — дзвесце тон. Назва — «Іспаньёла».

Дастаць яе дапамог мне стары дружбак Блэндлі, надзіва спрытны дзелавы чалавек. Гэты галубок працаваў на мяне, як раб. Зрэшты, кожны ў Брыстолі дапамагаў мне, варта толькі было намякнуць, што мы выпраўляемся па скарбы...»


— Рэдрут,— сказаў я, спыніўшыся,— доктару Ліўсі гэта зусім не спадабаецца. Значыцца, сквайр усё-такі не стрымаў свайго слова. А кляўся доктару, што будзе нямы як магіла...

— Няўжо ты думаеш,— прабурчаў Том,— што ён будзе маўчаць, каб дагадзіць нейкаму доктару Ліўсі? Сквайр — гэта сквайр.

Я не стаў нічога тлумачыць і пачаў чытаць далей:

«Блэндлі сам адшукаў «Іспаньёлу», і дзякуючы яго спрытнасці яна дасталася нам амаль за нішто. У Брыстолі ёсць людзі, якія цяр-





пець не могуць Блэндлі. Гэтыя нахабы сцвярджаюць, быццам ён шчыруе толькі дзеля сваёй выгады, быццам «Іспаньёла» належыць яму самому і ён прадаў яе мне неверагодна дорага. Відавочны паклёп. Ніхто, аднак, не асмельваецца адмаўляць, што мы займелі выдатнае судна.

Словам, карабель дастаўся лёгка. Праўда, рабочыя абсталёўваюць яго марудна, але з часам усё будзе даведзена да ладу. Нашмат больш прыйшлося паклапаціцца, падбіраючы каманду.

Я хацеў наняць чалавек дваццаць — на выпадак сустрэчы з дзікунамі, піратамі ці праклятым французам[1]. Я ўжо з сіл выбіўся, пакуль знайшоў паўтузіна матросаў, але потым лёс злітаваўся і паслаў чалавека, які вырашыў усю гэтую справу.

Я выпадкова разгаварыўся з ім у порце. Выявілася, што ён вопытны марак. Жыве цяпер на сушы, мае сваю карчму. Ён ведае ўсіх брыстольскіх маракоў. Жыццё на сушы сапсавала яму здароўе, і ён хоча зноў пайсці ў мора і шукае месца карабельнага кухара. Ён выйшаў тым ранкам у порт, сказаў ён мне, каб падыхаць марскім паветрам.


Такая любоў да мора дужа кранула мяне, дый вы, упэўнены, адчулі б тое ж самае. Мне стала яго шкада, і я адразу ж прапанаваў яму стаць нашым кухарам. Завуць яго Цыбаты Джон Сільвер. У яго няма аднае нагі, але для мяне гэта найлепшая рэкамендацыя, бо ён страціў яе ў славу бацькаўшчыны, пад сцягамі бессмяротнага Хоўка[2]. І ўявіце сабе, ён не атрымлівае пенсіі. У які жахлівы час мы жывём!

Вось, сэр, я думаў, што знайшоў кухара,

---

[1] У XVII—XVIII стагоддзях Англія ваявала з Францыяй, Галандыяй, Іспаніяй. Адсюль варожасць некаторых персанажаў рамана да французаў, галандцаў, іспанцаў.

[2] Хоўк — англійскі адмірал таго часу.



а выявілася, знайшоў усю каманду. Разам з Сільверам мне ўдалося за некалькі дзён падабраць экіпаж з сапраўдных, вопытных, прасоленых акіянам маракоў. Праўда, знешнасць у іх не надта прывабная, але затое, мяркуючы па іхніх тварах, усе яны — людзі адчайнае смеласці. Перакананы, з такімі мы можам уступіць у бой хоць з фрэгатам.

Цыбаты Джон параіў мне нават адлічыць двух з нанятых мною раней шасці-сямі чалавек. Ён умомант давёў мне, што яны — прэсназодныя швабры, з якімі рызыкоўна звязвацца, калі ідзеш у такое плаванне.


Пачуваю сябе выдатна, ем, як бык, сплю, як бервяно, і ўсё ж я не буду па-сапраўднаму шчаслівы да тае пары, пакуль мае старыя марачкі не затупаюць вакол шпіля[1]. У мора! Чорт з імі, са скарбамі! Мора, а не скарбы, кружыць мне галаву. Так што, Ліўсі, прыязджайце хутчэй, не губляйце аніводнае гадзіны, калі паважаеце мяне.

Адпусціце маладога Хоўкінса развітацца з маці. Пашліце разам з ім Рэдрута, а потым няхай абодва, не марудзячы, вяртаюцца ў Брыстоль.

P. S. Забыўся паведаміць вам, што Блэндлі, які, дарэчы, абяцаў паслаць нам на дапамогу другі карабель, калі мы не вернемся да жніўня, знайшоў нам выдатнага капітана. Капітан гэты, на жаль, упарты што чорт, але ва ўсіх іншых адносінах яму проста цаны няма. Цыбаты Джон Сільвер адшукаў вельмі добрага штурмана, па імені Эроў. Я ж знайшоў боцмана, які ўмее граць на ражку. Як бачыце, на нашай сяброўцы «Іспаньёле» ўсё будзе, як на сапраўдным ваенным караблі.

---

[1] **Шпіль** — калаўрот, на які наматваецца якарны канат.



Забыўся напісаць вам, што Сільвер — чалавек нябедны. Як [redacted] даведаўся, у яго ёсць рахунак у банку, і зусім не маленькі. Карчму сваю ён перадае на час падарожжа жонцы. Яна ў яго не белае расы, і такім старым халасцякам, як мы з вамі, можна дараваць здагадку, што менавіта жонка, [redacted] не толькі благое здароўе гоніць яго ў мора.

Д. Т.

P. P. S. Хоўкінс можа прабавіць адзін вечар у сваёй маці.


Д. Т.».


Няцяжка ўявіць, як расхваляваў мяне гэты ліст. Я месца сабе не знаходзіў ад радасці і ўсім сэрцам пагарджаў старым Рэдрутам, які адно бурчаў і скуголіў. Любы малодшы егер з задавальненнем паехаў бы замест яго. Але сквайр хацеў, каб ехаў ён, [redacted] сквайрава жаданне было ягоным слугам законам.

Назаўтра раніцай мы абодва выправіліся пешкі ў «Адмірал Бенбоў». Маці мая пачувала ўжо сябе зусім добра, і настрой у яе быў неблагі. Са смерцю капітана кончыліся ўсе яе непрыемнасці. Сквайр адрамантаваў за свой кошт наш дом, падарыў нам сякую-такую мэблю, у тым ліку адмысловы фатэль, каб маці было больш зручна сядзець за прылаўкам, наняў ёй у памочнікі хлопчыка, які павінен быў выконваць усе мае ранейшыя абавязкі.

Толькі ўбачыўшы гэтага хлопчыка ў карчме, я ўпершыню адчуў, што надоўга расстаюся з родным домам — дагэтуль я думаў адно пра блізкія прыгоды. Я заліўся слязьмі, гледзячы на няўклюду, які замяніў мяне. Баюся, я быў жорсткі з ім: ён не паспеў яшчэ прызвычаіцца да свайго месца, і я кпіў з яго пасля кожнае прамашкі.

Мінула ноч, і назаўтра, пасля абеду, мы з Рэдрутам зноў выйшлі на дарогу. Я развітаўся з маці, з бухтаю, каля якой жыў ад самага





нараджэння, з дарагім старым «Адміралам Бенбоў» — хаця, нанова пафарбаваны, ён ужо быў меней любы майму сэрцу. Згадаў я ўрэшце і капітана, які так часта гуляў па гэтым беразе, ягоны трохвугольны капялюш, шабельны шнар на шчацэ і медную падзорную трубу. Мы рушылі ў дарогу — і нарэшце мой дом стаў нябачны.

Ужо цямнела, калі мы селі каля «Гатэля караля Георга» ў паштовы дыліжанс. Мяне ўціснулі паміж Рэдрутам і нейкім старым тоўстым джэнтльменам. Нягледзячы на хуткую язду і холад, я адразу ж заснуў. Мы імчаліся то ўверх, то ўніз, спыняліся на станцыях, а я спаў як забіты, пакуль Рэдрут не разбудзіў мяне нарэшце штурхалём у бок. Я расплюшчыў вочы. Мы стаялі перад вялікім будынкам на гарадской вуліцы.


— Дзе мы? — спытаўся я.

— У Брыстолі,— сказаў Том.— Вылазь.

Містэр Трэлані жыў у карчме непадалёк ад докаў — гэта каб назіраць за работамі на нашай «Іспаньёле». На вялікую маю радасць, нам прыйшлося ісці па ўзбярэжжы досыць доўга, міма мноства караблёў самых розных памераў, тыпаў, краін. На адным працавалі і спявалі, на другім матросы высока над маёй галавою віселі на канатах, якія знізу здаваліся мне танюткімі, бы павуцінкі. Хоць п і пражыў усё жыццё на беразе мора, але тут яно здзівіла мяне так, быццам ■ ўбачыў яго ўпершыню. Усюды пахла дзёгцем і соллю. Я разглядваў розныя фігуркі на насах караблёў, якія вярнуліся з акіянскіх прастораў, старых маракоў, што бадзяліся па беразе — з завушніцамі ў вушах, з завітымі бакенбардамі, з прасмоленымі коскамі. А іх няўклюдная паходка! Калі б замест іх мне паказалі каралёў ці архіепіскапаў, я ўзрадаваўся б нашмат менш.

Я таксама адпраўляюся ў мора! На шхуне,





з боцманам, які грае на дудцы, з матросамі, якія носяць коскі і спяваюць флоцкія песні! Я адпраўляюся ў мора, і паплыву да невядомага вострава шукаць захаваныя там у зямлі скарбы!

У гэтых салодкіх марах я і прайшоў усю дарогу да вялікае карчмы, дзе нас сустрэў сквайр Трэлані, адзеты ў сіні мундзір, якія носяць зазвычай марскія афіцэры. Ён выходзіў з дзвярэй, шырока ўсміхаючыся, пераvальваючыся — старанна пераймаў марацкую паходку.

— Вось і вы! — усклікнуў ён.— А доктар яшчэ ўчора ўвечары прыбыў з Лондана. Выдатна, уся каманда на месцы!

— О, сэр,— закрычаў я,— калі ж мы адплываем?

— Калі мы адплываем? — перапытаў сквайр.— Заўтра.


РАЗДЗЕЛ VIII


Пад шыльдаю «Падзорная Труба»

Калі я паснедаў, сквайр даў мне запіску да Джона Сільвера ў карчму «Падзорная Труба», растлумачыўшы мне, як знайсці яе: ісці ўздоўж докаў, пакуль не ўбачыш маленькую таверну з вялікай трубою замест шыльды.

Я ўзрадаваўся, што змагу яшчэ раз паглядзець на караблі і матросаў, і адразу ж рушыў у дарогу. З цяжкасцю прабіраючыся скрозь натоўп, які сабраўся на прыстані, паміж фургонамі і пакамі, я знайшоў нарэшце карчму.

Яна была сапраўды невялікая, але досыць утульная: шыльда нядаўна пафарбаваная, на вокнах — чыстыя чырвоныя фіранкі, падлога пасыпаная найчысцейшым пяском. Выходзіла карчма на дзве вуліцы. Абое дзвярэй былі расчыненыя насцеж, і ў нізкім пакоі было досыць светла, нягледзячы на клубы тытунёвага дыму.





За столікамі сядзелі пераважна маракі. Яны так гучна гаварылі між сабою, што я спыніўся ля дзвярэй, не рашаючыся ўвайсці.

Пакуль я стаяў там, з бакавога пакоя выйшаў чалавек. Я адразу зразумеў, што гэта і ёсць Цыбаты Джон. Яго левая нага была аднятая па самае сцягно. Ён трымаў пад левым плячом мыліцу і надзвычай спрытна карыстаўся ёю, падскокваючы, як птушка, на кожным кроку. Гэта быў вельмі высокі і дужы мужчына, з шырокім, як кумпяк, бледным і плоскім, але разумным і вясёлым тварам. З выгляду настрой у яго быў выдатны. Пасвістваючы, ён хадзіў паміж столікаў, жартаваў, паляпваў па плячы некаторых наведнікаў, напэўна, сваіх улюбёнцаў.

Шчыра кажучы, прачытаўшы пра Цыбатага Джона ў сквайравым лісце, я з жахам падумаў, ці не той гэта аднаногі марак, якога я так пільнаваўся ў старым «Бенбоў». Але варта было мне зірнуць на гэтага чалавека, як усе мае сумненні зніклі. Я бачыў капітана, бачыў Чорнага Пса, бачыў сляпога П'ю і меркаваў, што ведаю, як выглядаюць піраты. Гаспадар карчмы, акуратны і зычлівы, быў зусім не падобны да іх.

Я набраўся смеласці, пераступіў цераз ганак і рушыў да Сільвера. Абапершыся на мыліцу, той гаманіў з наведнікам.

— Містэр Сільвер, сэр? — спытаўся я, працягваючы яму запіску.


— Ён самы, хлопчык,— сказаў ён.— Мяне завуць Сільвер. А хто ты будзеш?

Убачыўшы сквайраў ліст, ён, як здалося мне, нават уздрыгнуў.

— О,— усклікнуў ён, працягваючы мне руку,— я ўжо зразумеў. Ты — наш новы юнга. Рады цябе бачыць.

І ён моцна сціснуў маю руку ў сваёй шырокай далоні.





У гэты самы момант нейкі чалавек, які сядзеў у далёкім ад мяне куце, ускочыў з месца і рвануўся да дзвярэй. Дзверы былі побач з ім, і ён умомант знік. Але ягоная таропкасць кінулася мне ў вочы, і я адразу пазнаў яго. Гэта быў трохпалы марак з азызлым тварам, той самы, што прыходзіў да нас у карчму.

— Гэй,— закрычаў я,— трымайце яго! Гэта Чорны Пёс!

— Пляваць мне на тое, як яго зваць! — закрычаў Сільвер.— Але ён уцёк і не заплаціў мне за выпіўку. Гары, бяжы і злаві яго!

Адзін з наведнікаў, які сядзеў непадалёк ад дзвярэй, ускочыў і кінуўся наўздагонку.

— Быў бы гэта хоць сам адмірал Хоўк, я ўсё роўна прымусіў бы яго заплаціць! — крычаў Сільвер.

Потым, адпусціўшы раптам маю руку, ён спытаўся:

— Як яго завуць? Ты сказаў — Чорны... а як далей?

— Чорны Пёс, сэр! — сказаў я.— Хіба містэр Трэлані не расказваў вам пра тых піратаў, што былі ў нас? Ён з іхняй хеўры.

— Што?! — закрычаў Сільвер.— У маёй карчме!.. Бэн, бяжы і дапамажы Гары дагнаць яго... Дык ён адзін з тых гіцляў, гэты Пёс? Гэй, Морган, ты, здаецца, піў разам з ім? Хадзі сюды.

Чалавек, якога ён назваў Морганам — стары, сівы, загарэлы марак,— пакорліва падышоў да яго, жуючы тытунёвую жвачку.


— Ну, Морган,— сказаў Цыбаты Джон,— ці бачыў ты калі-небудзь раней гэтага Чорнага... як яго... Чорнага Пса?

— Ніколі, сэр,— адказаў Морган, пакланіўшыся.

— І нават імені яго не чуў?

— Не, сэр.





— Тваё шчасце, Морган! — усклікнуў Сільвер.— Калі ты станеш цягацца з прайдзісветамі, нагі тваёй не будзе ў маёй карчме! Пра што ён з табою гаварыў?

— Толкам не памятаю, сэр,— адказаў Морган.

— І ты можаш называць галавою тое, што ў цябе на плячах? Ці гэта ў цябе юферс[1]? — закрычаў Цыбаты Джон.— Ён толкам не памятае! Можа, ты і паняцця не маеш, з кім размаўляў? Ну, выкладвай, пра што ён табе плёў — плаванні, караблі, капітаны?.. Ну? Пра што?

— Мы гаварылі пра тое, як працягваюць людзей пад кілем[2],— адказаў Морган.

— Вось як? Ды пра што ладнае можаш ты гаварыць! Ох, Том, Том... Ну, сядай на месца, дурань...

Калі Морган сеў, Сільвер па-прыяцельску нахіліўся да майго вуха — гэта дужа ўсцешыла маё самалюбства — і прашаптаў:

— Найсумленнейшы хлопец гэты Том Морган, але дурань з дурняў. А зараз,— загаварыў ён гучна,— паспрабуем згадаць, што ж гэта за Чорны Пёс... Не, ніколі не чуў пра такога... Але, здаецца,недзе бачыў... А... ён, бывала, заходзіў сюды... з нейкім сляпым жабраком...


— Але, са сляпым! — закрычаў я.— Я і сляпога гэтага ведаў, яго звалі П'ю.

— Правільна! — усклікнуў Сільвер, цяпер ужо вельмі ўсхваляваны.— П'ю! Менавіта так яго і звалі. І выдаваў ён на цёртага хлопца. Калі гэты Чорны Пёс трапіць нам у рукі, капітан Трэлані будзе дужа задаволены. У Бэна добрыя ногі, мала хто з маракоў бегае хутчэй

---

[1] Юферс — блок для нацягвання тросаў.

[2] Працягванне пад кілем (бэлькі пасярэдзіне дна карабля ад носа да кармы) — від пакарання ў англійскім флоце ў XVIII стагоддзі.



за Бэна. Бэн яго дагоніць, няма пра што і казаць!.. Дык ён гаварыў пра тое, як працягваюць маракоў пад кілем?.. Во будзе, як мы працягнем яго самога...

Гаворачы, Сільвер увесь час скакаў на сваёй мыліцы, стукаў кулаком па сталах і так шчыра абураўся, што пераканаў бы нават суддзю ці паліцэйскага. Але сустрэча з Чорным Псом абудзіла мае ранейшыя падазрэнні, і цяпер я ўважліва сачыў за кухарам.

Нарэшце вярнуліся тыя двое маракоў, якіх Сільвер паслаў даганяць Чорнага Пса. Цяжка дыхаючы, яны сказалі, што ўцекачу ўдалося знікнуць у натоўпе. І Сільвер пачаў лаяць іх так люта, што я канчаткова ўпэўніўся: ён не мае з гэтым Чорным Псом ніякіх агульных спраў.

— Слухай, Хоўкінс, — сказаў ён, — для мяне гэтая гісторыя можа дрэнна скончыцца, разумееш? Што падумае пра мяне капітан Трэлані? Гэты чортаў галандзец сядзеў у маёй карчме і жлукціў мой ром! Потым прыходзіш ты і кажаш, што ён з іхняй хеўры, а я даю яму адчаліць перад самымі маімі ілюмінатарамі[1]. Ну, Хоўкінс, падтрымай мяне перад капітанам! Ты малады, але разумны, цябе не падманеш. Я гэта адразу ўбачыў, толькі ты ўвайшоў. Дык растлумач капітану: што я мог зрабіць? Мне ж не дагнаць на сваёй кавяле гэтага гіцля. Вось калі б я быў першакласны марак, як некалі, ён бы ад мяне нікуды не дзеўся, я б насадзіў яго на ражон умомант, але цяпер...


Ён раптам змоўк і шырока разявіў рот, быццам згадаў нешта.


— А грошы! — крыкнуў ён. — За тры шклянкі! Чорт, пра грошы ж я і забыўся!

Упаўшы на лаўку, ён зарагатаў і рагатаў да

---

[1] Ілюмінатары — круглыя вокны ў борце карабля. Тут Сільвер мае на ўвазе ўласныя вочы.





тае пары, пакуль слёзы не пацяклі ў яго па шчаках. Ён так смяяўся, што і я не вытрымаў і зарагатаў разам з ім, а неўзабаве ўся карчма задрыжала ад рогату.

— Я хоць і стары, а якое марское цяля разыграў! — сказаў ён нарэшце, выціраючы шчокі.— Бачу, Хоўкінс, мы з табою будзем добрай параю. Я ж цяпер быў не лепшы за юнгу... Аднак трэба ісці: справа ёсць справа, хлопцы. Надзену сваю старую трохвуголку і пайду разам з табою да капітана Трэлані далажыць яму пра ўсё, што здарылася. А справа сур'ёзная, Хоўкінс, і трэба прызнацца, ні мне, ні табе гонару тут няма. Няма! Ні мне, ні табе, нас абодвух абдурылі. Аднак як ён мяне, чорт лазаты, абвёў вакол пальца з гэтымі грашыма!


Ён зноў зарагатаў, ды так, што я, хоць і не бачыў тут нічога смешнага, зноў міжволі засмяяўся разам з ім.

Мы пайшлі па ўзбярэжнай. Было з ім вельмі цікава. Сільвер расказваў пра кожны карабель, міма якога мы праходзілі, паведамляючы мне, якія ў яго снасці, колькі ён можа падняць грузу, з якой ён краіны, тлумачыў, што робіцца ў порце: адно судна разгружаюць, другое нагружаюць, а вунь тое, трэцяе, выходзіць зараз у мора. Расказваў ён мне і розныя вясёлыя гісторыі пра караблі і маракоў, перасыпаў сваю гутарку марскімі слоўцамі і паўтараў іх па некалькі разоў, каб я запамятаў іх. Я ўпэўніваўся патроху, што лепшага марака цяжка знайсці.

Нарэшце мы прыйшлі ў карчму «Гатэля караля Георга». Сквайр і доктар Ліўсі пілі піва, закусваючы падсмажанымі скібачкамі белага хлеба. Яны збіраліся схадзіць на шхуну — паглядзець, як ідуць работы.

Цыбаты Джон расказаў ім усё, што здарылася ў ягонай карчме з пачатку да канца, вельмі жыва і цалкам праўдзіва.





— Так яно і было, га, Хоўкінс? — перапытваў ён у мяне раз-пораз, і я пацвярджаў ягоныя словы.

Сквайр і доктар вельмі шкадавалі, што Чорнаму Псу ўдалося ўцячы. Але што можна было зрабіць цяпер? Выслухаўшы іхнія ўхвалы, Цыбаты Джон узяў мыліцу і рушыў да выхада.

— Камандзе быць на караблі ў чатыры гадзіны дня! — крыкнуў сквайр яму ўздагонку.

— Ёсць, сэр! — адказаў кухар ужо ў дзвярах.

— Ну, сквайр,— сказаў доктар Ліўсі,— шчыра кажучы, я не дужа ў захапленні ад большасці вашых набыткаў, але мушу сказаць, што Сільвер мне даспадобы.

— Хлопец што трэба,— задаволена адгукнуўся сквайр.

— А цяпер Джым пойдзе з намі на шхуну, ці ж не так? — прапанаваў доктар.

— Вядома,— сказаў сквайр.— Вазьмі свой капялюш, Хоўкінс, і пойдзем глядзець наш карабель.

РАЗДЗЕЛ IX

Порах і зброя

«Іспаньёла» стаяла досыць далёка ад берага, і, каб дабрацца да яе, мы былі вымушаны ўзяць лодку і лавіраваць паміж іншых караблёў. Перад намі вырасталі то аздоблены фігуркаю нос, то карма. Канаты караблёў рыпелі над нашым кілем і звешваліся ў нас над галовамі.

Нарэшце мы ступілі на борт, дзе нас вітаў штурман містэр Эроў, стары марак, касавокі і загарэлы, з завушніцамі ў вушах. Паміж ім і сквайрам былі, мабыць, самыя блізкія, прыяцельскія адносіны, але з капітанам, як я хутка заўважыў, сквайр, пэўна, не ладзіў.





Капітан быў чалавек змрочны. Здавалася, усё на судне раздражняе яго.

Неўзабаве ён выклаў сквайру прычыны сваёй незадаволенасці. Як толькі мы спусціліся ў каюту, з'явіўся матрос і сказаў:

— Сэр, капітан Смолет хоча пагаварыць з вамі.

— Заўжды гатовы,— адказаў сквайр.— Папрасі яго ўвайсці.

Тут выявілася, што капітан ішоў услед за сваім паслом. Ён адразу ж увайшоў у каюту і зачыніў за сабою дзверы.

— Ну, што скажаце, капітан Смолет? — спытаўся сквайр.— Спадзяюся, усё ў парадку і шхуна гатовая да адплыцця?

— Вось што, сэр,— загаварыў капітан,— я буду шчыры, нават рызыкуючы пасварыцца з вамі. Мне не падабаецца гэтая экспедыцыя. Мне не падабаюцца вашы матросы. Мне не падабаецца мой памочнік. Вось і ўсё — коратка і ясна.

— Можа, сэр, вам не падабаецца і шхуна? — спытаўся сквайр, і я заўважыў, што ён раззлаваўся.


— Я нічога не магу сказаць пра яе, сэр, пакуль не ўбачу яе ў плаванні,— адказаў капітан.— Здаецца, збудавана яна няблага, але больш я не магу сказаць нічога.

— Тады, сэр,— раз'юшваўся сквайр,— можа, вам не падабаецца ваш гаспадар?

Але тут умяшаўся доктар.

— Чакайце,— сказаў ён,— чакайце. Так усё хіба што сваркаю скончыцца. Капітан сказаў нам і дужа шмат, і дужа мала, і я маю права папрасіць у яго тлумачэння. Вы сказалі, вам не падабаецца наша экспедыцыя. А чаму?

— Мяне запрасілі, сэр, каб я вёў судна туды, куды пажадае гэты джэнтльмен,— паказаў капітан на сквайра,— але не назвалі мэты падарожжа. Выдатна, я ні аб чым не распытваў. Але



неўзабаве я пераканаўся, што самы апошні матрос ведае пра мэту падарожжа больш за мяне. Мне здаецца, гэта ненармальна. А вам?

— Мне таксама,— сказаў доктар.

— Затым я даведаўся,— працягваў капітан,— што мы выпраўляемся на пошукі скарбаў. Пачуў я пра гэта, заўважце, ад сваіх падначаленых. А пошукі скарбаў — справа нялёгкая. Гэта ўвогуле не мой канёк, і я не адчуваю ніякае любові да падобных заняткаў, асабліва тады, калі гэтыя заняткі — сакрэтныя, а сакрэт — выбачайце, містэр Трэлані! — выбалбаталі папугаю.

— Папугаю Сільвера? — спытаўся сквайр.

— Не, гэта прымаўка такая,— адказаў капітан.— Яна азначае, што сакрэт перастаў быць сакрэтам. Мне здаецца, вы, джэнтльмены, недаацэньваеце ўсю цяжкасць тае справы, за якую ўзяліся, і [redacted] скажу вам, што думаю пра гэта: вас чакае барацьба не на жыццё, а на смерць.


— Ваша праўда,— адказаў доктар,— мы дужа рызыкуем. Але вы памыляецеся, мяркуючы, што мы не ўсведамляем небяспекі. Вы сказалі, што вам не падабаецца наша каманда. Хіба мы нанялі дрэнных матросаў?

— Не падабаюцца яны мне, сэр,— адказаў капітан.— І думаю, набіраць каманду павінен быў я.

— Магчыма,— сказаў доктар.— Майму сябру, бадай, трэба было набіраць каманду разам з вамі. Гэта прамашка, запэўніваю вас, але не наўмысная. І вам не падабаецца містэр Эроў?

— Не падабаецца, сэр. Я веру, што ён добры марак, але ён залішне распускае каманду, каб быць добрым памочнікам. Штурман павінен трымацца ў баку ад матросаў і не павінен піць з імі.

— Вы хочаце сказаць, што ён п'яніца? — ускрыкнуў сквайр.





— Не, сэр,— адказаў капітан.— Я толькі хачу сказаць, што ён задужа фамільярны з матросамі.

— А зараз,— спытаўся доктар,— скажыце нам, нічога не ўтойваючы, чаго вы ад нас хочаце?

— Вы цвёрда вырашылі ісці ў гэтае плаванне, джэнтльмены?

— Неадменна,— адказаў сквайр.

— Выдатна,— сказаў капітан.— Калі вы дагэтуль цярпліва слухалі мяне, хоць я і казаў рэчы, даказаць якія не мог, дык паслухайце і далей. Порах і зброю складваюць у насавой частцы судна[1]. Між тым ёсць цудоўнае памяшканне пад вашай каютаю. Чаму б не захоўваць іх там? Гэта першае. Потым, вы ўзялі з сабою чатырох слуг. Некага з іх, як мне сказалі, таксама хочуць размясціць у насавой частцы. Чаму б не пасяліць іх каля вашай каюты? Гэта другое.

— Ёсць трэцяе? — спытаўся містэр Трэлані.

— Ёсць,— сказаў капітан.— Занадта ўжо шмат балбочуць.

— Згодны. Занадта,— згадзіўся доктар.

— Скажу вам толькі тое, што чуў на свае ўласныя вушы,— працягваў капітан.— Кажуць, нібыта ў вас ёсць карта нейкага вострава. Нібыта на карце крыжыкамі пазначаны месцы, дзе захаваны скарбы. Нібыта гэты востраў знаходзіцца...

Тут ён абсалютна дакладна назваў шырату і даўгату нашага вострава.


— Я не называў іх ніводнаму чалавеку! — усклікнуў сквайр.

— Матросы ведаюць іх, сэр,— сказаў капітан.

— Гэта вы, Ліўсі, прагаварыліся! — закрычаў сквайр.— Ці ты, Хоўкінс!

---

[1] У насавой частцы судна размяшчаліся матросы.



— Цяпер ужо ўсё роўна, хто,— сказаў доктар.

Я заўважыў, што ні доктар, ні капітан не паверылі містэру Трэлані, як ён ні крычаў. Я таксама тады не паверыў, бо ведаў, што сквайр сапраўды не ўмеў трымаць язык за зубамі. Але цяпер я думаю, што містэр Трэлані казаў усё-такі праўду і што матросы і без нас ведалі, дзе знаходзіцца востраў.

— Не ведаю, джэнтльмены,— працягваў капітан,— у каго з вас захоўваецца гэтая карта, але я настойваю, каб доступ да яе не мелі ні я, ні містэр Эроў. Інакш я буду прасіць вас звольніць мяне.


— Разумею,— сказаў доктар.— Па-першае, вы хочаце, каб не было лішняе балбатні. Па-другое, каб зброя і порах, што маюцца на борце, былі размешчаны ў кармавой частцы судна і каб там пасялілі слуг. Іншымі словамі, вы баіцеся бунту.

— Сэр,— сказаў капітан,— я не буду крыўдзіцца, але не хачу, каб вы прыпісвалі мне словы, якіх я не гаварыў. Нельга апраўдаць капітана, які вырашыў выйсці ў мора, калі ў яго ёсць падставы баяцца бунту. Я ўпэўнены, што містэр Эроў сумленны чалавек. Многія матросы таксама сумленныя людзі. Можа, усе яны сумленныя людзі. Але я адказваю за бяспеку карабля і за кожнае чалавечае жыццё на борце. І бачу, што многае робіцца не так, як трэба было б, і прашу вас прыняць меры перасцярогі або звольніць мяне. Вось і ўсё.

— Капітан Смолет,— пачаў доктар, усміхаючыся,— вы чулі байку пра гару, якая нарадзіла мыш? Даруйце мне, але вы нагадалі мне гэтую байку. Калі вы ўвайшлі ў каюту, я гатовы быў паклясціся маім парыком, што вы запатрабуеце ў нас нашмат болей.

— Вы вельмі здагадлівы, доктар,— сказаў ка-





пітан. — Увайшоўшы сюды, я хацеў патрабаваць разліку, бо ў мяне не было аніякай надзеі, што містэр Трэлані згодзіцца выслухаць хоць адно маё слова.

— І не слухаў бы! — крыкнуў сквайр. — Каб не Лі́ўсі, я адразу паслаў бы вас к чорту. Але я ўсё-такі выслухаў вас і зраблю ўсё, што вы хочаце. Аднак думаю я пра вас ужо горш.

— Гэта вы як хочаце, сэр. Потым вы зразумееце, што я выканаў свой абавязак, — сказаў капітан і выйшаў.

— Трэлані, — сказаў доктар, — насуперак сваім першым уражанням я пераканаўся, што вы запрасілі на карабель двух сумленных людзей: капітана і Джона Сільвера.

— Наконт Сільвера згодны, — усклікнуў сквайр, — а вось паводзіны гэтага зануды і хлуса я лічу нявартымі мужчыны, марака і, ва ўсякім разе, англічаніна!

— Добра, — сказаў доктар, — пабачым.

Калі мы выйшлі на палубу, матросы ўжо пачалі перацягваць зброю і порах, спяваючы сваё «ё-го-го!». Капітан і містэр Эроў аддавалі загады.

Мне вельмі спадабалася, як нас размясцілі па-новаму. Усю шхуну пераабсталявалі. На карме ў былой задняй частцы сярэдняга трума было цяпер шэсць кают, якія злучаліся запасным праходам па левым борце з камбузам[1] і бакам[2]. Спачатку яны прызначаліся для капітана, містэра Эроў, Хантэра, Джойса, доктара і сквайра. Цяпер дзве з іх аддалі Рэдруту і мне, а містэр Эроў і капітан уладкаваліся на палубе, у сходным тамбуры[3], які быў так пашыраны з абодвух бакоў,

[1] Ка́мбуз — карабельная кухня.
[2] Бак — узвышэнне ў пярэдняй частцы карабля.
[3] Сходны та́мбур — памяшканне, у якое выходзіць трап (лесвіца, што вядзе ў трум).



што мог сысці за карабельную рубку[1]. Ён, вядома, быў цеснаваты, але ўсё ж у ім памясціліся два гамакі. Здавалася, нават штурман быў задаволены такім размяшчэннем. Магчыма, ён таксама не давяраў камандзе. Зрэшты, гэта ўсяго толькі маё меркаванне, бо, як вы хутка ўбачыце, ён нядоўга пабыў на шхуне.

Мы старанна працавалі, перацягваючы порах і абсталёўваючы нашыя каюты, калі нарэшце з берага прыплылі ў шлюпцы апошнія матросы і разам з імі Цыбаты Джон.

Кухар узабраўся на судна са спрытнасцю малпы і, як толькі заўважыў, што мы робім, крыкнуў:

— Гэй, прыяцелі, што здарылася?

— Пераносім бочкі з порахам, Джон,— адказаў адзін матрос.

— Навошта, халера?! — закрычаў Сільвер.— Мы ж прапусцім гэтак ранішні адліў!

— Мой загад! — абарваў яго капітан.— А вы, мілы чалавек, ідзіце ў камбуз, каб матросы маглі павячэраць.

— Слухаю, сэр,— адказаў кухар.

І, дакрануўшыся рукою да пасмы валасоў на лбе, нырнуў у дзверы камбуза.

— Вось гэта чалавек! — сказаў капітану доктар.

— Магчыма, сэр,— адказаў Смолет.— Асцярожней, асцярожней, хлопцы!

Тут капітан пабег да матросаў. Яны кацілі бочку з порахам. Раптам ён заўважыў, што я стаю і гляджу на вяртлюжную пушку[2], усталяваную ў сярэдняй частцы карабля — медную дзевяціфунтоўку, і адразу ж наляцеў на мяне.

---

[1] Рубка — узвышэнне на палубе судна для кіравання.

[2] Вяртлюжная пушка - пушка, якая паварочваецца на спецыяльнай устаноўцы - вяртлюзе.



— Гэй, юнга,— крыкнуў ён,— марш адсюль! Ідзі да кухара, ён дасць табе работу.

Спяшаючыся на кухню, я пачуў, як ён гучна сказаў доктару:

— Я не пацярплю, каб у мяне на судне былі ўлюбёнцы!

Дальбог, у гэтую хвіліну [redacted] цалкам згадзіўся са сквайрам, што капітан — зануда, і ўзненавідзеў яго.

РАЗДЗЕЛ X

Плаванне

Сумятня працягвалася ўсю ноч. Мы перацягвалі рэчы з месца на месца. Шлюпка няспынна прывозіла з берага сквайравых сяброў, накшталт містэра Блэндлі, якія прыплывалі пажадаць містэру Трэлані добрага плавання і шчаслівага вяртання. У «Адмірале Бенбоў» мне ніколі не прыходзілася працаваць так шмат уначы, і я ўжо стаміўся як сабака, калі перад самым золкам зайграў на дудцы боцман і каманда стала падымаць якар.


Зрэшты, калі б я нават стаміўся ўдвая болей, і то б не пайшоў з палубы, гэтак было мне цікава. Адрывістыя каманды, рэзкі гук дудкі, мітусня на палубе ў цьмяным святле карабельных ліхтароў — усё гэта было ў маім жыцці ўпершыню.

— Гэй, Кумпяк, зацягні песню! — крыкнуў адзін матрос.

— Старую! — крыкнуў другі.

— Ну, добра,— сказаў Цыбаты Джон, які стаяў тут жа, на палубе, з мыліцаю пад пахаю, і заспяваў гэтак добра знаёмую мне песню:

— Пятнаццаць чалавек на куфры мерцвяка...





Уся каманда падхапіла хорам:

— Ё-го-го, і бутэлька рому!

Пры апошнім «го» матросы дружна націснулі на вымбоўкі шпіля[1].

Я адразу ж згадаў наш стары «Адмірал Бенбоў». Мне здалося, нібыта да хору далучыўся голас нябожчыка капітана.

Хутка якар быў падняты і замацаваны на носе. З яго капала вада. Вецер раздзьмуў ветразі. Зямля і караблі, што акружалі «Іспаньёлу», сталі аддаляцца. І перш чым я лёг у ложак, каб паспаць хоць гадзінку, наша шхуна пачала сваё плаванне да Вострава Скарбаў.


Не стану апісваць падрабязнасці нашае вандроўкі. Яна была вельмі ўдалая. Карабель нам дастаўся ўзорны, каманда — вопытная, капітан выдатна ведаў сваю справу. Але перш чым мы дасягнулі Вострава Скарбаў, здарыліся дзве-тры падзеі, вартыя згадкі.

Спярша высветлілася, што містэр Эроў нашмат горшы, чым думаў пра яго капітан. Ён не меў у матросаў ніякага аўтарытэту, і яго ніхто не слухаў. Але гэта яшчэ не самае горшае. Праз дзень-два пасля адплыцця ён стаў з'яўляцца на палубе з мутнымі вачыма і пачырванелым тварам, язык у яго заплятаўся. Па ўсім было відаць, што ён піў. Раз-пораз яго прыходзілася з ганьбаю гнаць у каюту. Ён часта падаў і разбіваў сабе твар ці руку, а здаралася, дзень пры дні ляжаў у сябе ў ложку не ўстаючы. Бывала, вядома, што дзень-два ён хадзіў амаль цвярозы і тады спраўляўся сяк-так са сваімі абавязкамі.

Мы ніяк не маглі зразумець, дзе ён дастае сабе выпіўку. Гэта была нейкая непадуладная разгадцы таямніца. Мы сачылі за ім, але

[1] Вымбоўкі шпіля — рычагі калаўрота для пад'ёму якара.





так нічога і не высачылі. Калі мы пыталіся ў яго пра гэта ў лоб, ён, калі быў п'яны, адно рагатаў, а калі быў цвярозы, урачыста кляўся, што ніколі ў жыцці не піў нічога, апрача вады.

Як штурман ён быў нікуды не варты і дрэнна ўплываў на сваіх падначаленых. Было відаць, што ён хутка кончыць, і таму ніхто не здзівіўся, не засмуціўся, калі аднае цёмнае, бурнае начы ён знік з карабля.

— Зваліўся за борт, — вырашыў капітан. — Што ж, джэнтльмены, гэта пазбавіла нас ад неабходнасці закоўваць яго ў кайданы.


Аднак мы засталіся без штурмана. Трэба было вылучыць на ягонае месца каго-небудзь з каманды. Выбралі Джоба Эндэрсана. Яго па-ранейшаму называлі боцманам, але цяпер ён выконваў штурманскія абавязкі.

Містэр Трэлані, які шмат плаваў раней і няблага ведаў мора, таксама спатрэбіўся ў гэтай справе — стаяў у добрае надвор'е на вахце. Другі боцман, стары Ізраэль Хэндс, быў старанны і вопытны марак, якому можна было даручыць амаль любую работу.

Ён, між іншым, сябраваў з Сільверам, пра якога я раскажу больш падрабязна — чаму, вы зразумееце трохі пазней.

Матросы называлі яго Кумпяком. Ён прывязваў сваю мыліцу вяроўкаю да шыі, каб рукі ў яго былі вольныя. Варта было паглядзець, як ён, упіраючыся мыліцаю ў сцяну, пагойдваючыся разам з караблём, гатаваў, нібыта стаяў на цвёрдай зямлі! Яшчэ цікавей было бачыць, як спрытна і хутка прабягаў ён у бурлівае надвор'е па палубе, хапаючыся за канаты, працягнутыя для яго спецыяльна ў найбольш шырокіх месцах. Матросы называлі гэтыя канаты «завушніцамі Цыбатага Джона». Сільвер то трымаўся за гэтыя «завушніцы», то карыстаўся мыліцаю, то цягнуў яе за сабою на вяроўцы.





Усё ж матросы, якія плавалі з ім раней, шкадавалі, што ён ужо не той, які быў.

— Наш Кумпяк не просты чалавек,— казаў мне другі боцман.— У маладосці ён быў шкаляром і, калі захоча, можа гаварыць, як кніга. А які ён смелы — леў перад ім нішто, перад нашым Цыбатым Джонам! Я бачыў сам, як на яго напалі малойчыкі і ён, без зброі, схапіў іх і стукнуў галовамі лоб у лоб усіх чатырох!

Уся каманда паважала кухара і нават падпарадкоўвалася ўсім яго загадам. Ён умеў пагаварыць з кожным, кожнаму мог дагадзіць. Са мною ён быў нязменна добры, заўсёды радаваўся, калі я заходзіў у камбуз, які ён трымаў у надзвычайнай чысціні. Посуд у яго заўсёды быў акуратна развешаны і начышчаны да бляску. У куце, у клетцы, сядзеў папугай.

— Заходзь, Хоўкінс,— казаў ён мне,— заходзь, пагамані з Джонам. Нікому я не рады так, як табе, сынок. Сядай і слухай, што робіцца. Вось Капітан Флінт... я назваў майго папугая Капітанам Флінтам у гонар знакамітага пірата... дык вось, Капітан Флінт прадказвае, што нашае плаванне закончыцца ўдачаю... Ці ж не так, Капітан?

І папугай пачынаў з неверагоднай хуткасцю паўтараць:

— Піястры! Піястры! Піястры!


І паўтараў, пакуль не выбіваўся з сілы і пакуль Джон не накрываў ягоную клетку насоўкаю.


— Гэтай птушцы,— казаў ён,— напэўна, гадоў дзвесце, Хоўкінс,— на папугаяў смерці няма. Хіба што д'ябал пабачыў за свой век столькі зла, колькі мой папугай. Ён плаваў з Інглэндам, з праслаўленым капітанам Інглэндам, піратам. Пабываў на Мадагаскары, на Малабары[1], у Сурыname[2],

---

[1] Малабар — вобласць на паўднёва-заходнім узбярэжжы Індыі.

[2] Сурынам — дзяржава ў Паўднёвай Амерыцы.





на Правідэнсе[1], у Порта-Бэла[2]. Бачыў, як вылоўліваюць груз з затанулых галеонаў[3]. Вось калі ён навучыўся крычаць «піястры!». Нічога дзіўнага: таго дня вылавілі трыста пяцьдзесят тысяч піястраў, Хоўкінс! Ён прысутнічаў пры нападзе на віцэ-караля Індыі непадалёк ад Гоа[4]. А выдае на дзіцёнка... Але ты панюхаў пораху, ці ж не так, Капітан?

— Паварочвай на другі галс[5]! — крычаў папугай.

— Ён у мяне выдатны марак,— казаў кухар і частаваў папугая кавалачкамі цукру, якія даставаў з кішэні.

Папугай дзёўб краты клеткі і лаяўся самымі брыдкімі словамі.

— З кім павядзешся, ад таго і набярэшся,— разводзіў рукамі Сільвер.— Гэтая бедная, старая нявінная птушка лаецца як тысяча чарцей, але яна не разумее, што прамаўляе. Яна б лаялася і перад самім богам.

З гэтымі словамі Джон так урачыста дакрануўся да сваёй пасмы на лбе, што я палічыў яго ў гэты момант найвысакароднейшым чалавекам на свеце.

Адносіны паміж сквайрам і капітанам Смолетам па-ранейшаму былі нацягнутыя. Сквайр, не таячыся, гаварыў пра капітана пагардліва. Капітан, са свайго боку, ніколі не загаворваў са сквайрам, а калі містэр Трэлані пытаўся ў яго пра штонебудзь, то адказваў рэзка, коратка, суха. Аднак ён вымушаны быў прызнацца, што, як відаць, памыляўся, калі кепска гаварыў пра каманду: мно-

---

[1] Правідэнс — востраў у Індыйскім акіяне.

[2] Порта-Бэла — порт у Панаме.

[3] Галеоны — іспанскія караблі, на якіх перавозілі золата з Амерыкі ў Іспанію.

[4] Гоа — тэрыторыя Індыі на ўзбярэжжы Аравійскага мора.

[5] Галс — кірунак руху судна адносна ветру.







гія матросы неслі службу проста бездакорна, нараканняў не заслугоўваў ніхто — у капітана не магло быць ніякіх довадаў на карысць сваёй ранейшай высновы. А ў шхуну ён літаральна ўлюбіўся.

— Яна слухаецца руля, як добрая жонка мужа, сэр. Але,— сказаў ён неяк,— дадому мы яшчэ не вярнуліся, і нашая вандроўка мне па-ранейшаму не падабаецца.

Тут сквайр павярнуўся да капітана спінаю і стаў хадзіць па палубе, задраўшы падбародак дагары.

— Яшчэ трохі,— сказаў ён,— і гэты чалавек канчаткова выведзе мяне з сябе.


Нарэшце нам прыйшлося перанесці буру, якая лішні раз пацвердзіла вартасці «Іспаньёлы».

Каманда, здавалася, была задаволеная. Нічога дзіўнага ў тым не было. Па-мойму, з тае пары, як Ной упершыню выйшаў у мора, ні на адным судне не песцілі гэтак матросаў. Карысталіся любым прэтэкстам, каб выдаць ім двайную порцыю грогу. Варта было сквайру пачуць, што ў каго-небудзь з матросаў дзень нараджэння, як адразу ж усіх частавалі пудзінгам. На палубе заўсёды стаяла бочка з яблыкамі, каб кожны, хто пажадае, мог частавацца імі, калі яму ўздумаецца.

— Нічога добрага з гэтага не будзе,— казаў капітан доктару Ліўсі.— Гэта адно псуе іх, робіць іх нахабамі. Можаце мне паверыць.

Аднак бочка з яблыкамі, як вы ўбачыце, дужа дапамагла нам. Толькі дзякуючы ёй мы былі своечасова папярэджаны аб небяспецы і не загінулі ад рук здраднікаў.

Вось як гэта здарылася. Мы ішлі спачатку супраць пасатаў, каб выйсці на вецер да нашага вострава — дакладней я сказаць не магу,— а цяпер ішлі да яго па ветры. Удзень і ўначы ўзіраліся мы ўдалячынь, спадзеючыся ўбачыць вост-





раў на гарызонце. Згодна з падлікамі, нам заставалася плыць менш як суткі. Або сёння ўначы, або самае позняе заўтра перад поўднем мы павінны былі ўбачыць Востраў Скарбаў. Мы трымалі курс на поўдзень — паўднёвы захад. Дзьмуў роўны вецер на траверсе[1]. Мора было спакойнае. «Іспаньёла» неслася наперад, хвалі апырсквалі яе бушпрыт[2]. Усё ішло як мае быць. Усе былі ў выдатным гуморы, усе радаваліся заканчэнню першае паловы нашага плавання.

Калі зайшло сонца і работа мая была закончана, я, ідучы да свайго ложка, падумаў раптам, што няблага было б з'есці яблык. Я хутка ўскочыў на палубу. Вахтавыя стаялі на носе і глядзелі ў мора. Рулявы, назіраючы за надветраным[3] вуглом ветразей, ціхенька пасвістваў. Стаяла цішыня, чулася толькі, як разразаў наш карабель ваду.


Выявілася, што ў бочцы толькі адзін яблык. Каб дастаць яго, прыйшлося лезці ў бочку. Апынуўшыся там у цемрадзі, закалыханы пляскам вады і мерным пагойдваннем судна, я ледзь не заснуў. Раптам нехта цяжка апусціўся побач з бочкаю на палубу. Бочка трохі гайданулася: чалавек абапёрся аб яе спінаю. Я ўжо збіраўся быў выскачыць, як раптам гэты чалавек загаварыў. Я адразу пазнаў Сільвераў голас і вырашыў, перш чым ён паспеў сказаць некалькі слоў, не вылазіць з бочкі ні за што на свеце. Я ляжаў на дне, дрыжаў і ўслухоўваўся, задыхаючыся ад страху і цікаўнасці. Ужо з першых слоў я зразумеў, што жыццё ўсіх сумленных людзей на судне знаходзіцца ў мяне ў руках.


---

[1] Траверс — накірунак, перпендыкулярны курсу судна.

[2] Бушпрыт — брус, які выступае перад носам карабля.

[3] Надветраны бок — бок, на які дзьме вецер. Падветраны бок — процілеглы таму боку, на які дзьме вецер.





РАЗДЗЕЛ XI


Што я пачуў, седзячы ў бочцы з-пад яблыкаў

— Не, не я,— сказаў Сільвер.— Капітанам быў Флінт. А я быў кватармайстрам[1], бо ў мяне драўляная нага. Я страціў яе ў той самай справе, у якой стары П'ю страціў свае ілюмінатары. Мне ампутаваў яе вучоны хірург — ён вучыўся ў каледжы і ведаў усю латынь на памяць. А ўсё ж не адкруціўся ад шыбеніцы — яго павесілі ў Корса-Касле як сабаку сушыцца на сонейку... разам з іншымі. Гэта былі людзі Робэртса, і загінулі яны таму, што мянялі назвы сваіх караблёў. Сёння карабель называецца «Каралеўская фартуна», а заўтра як-небудзь інакш. А па-нашаму — як ахрысцілі судна, так яно і павінна заўсёды называцца. Гэта я вам кажу. Мы не мянялі назвы «Касандры», і яна шчасліва даставіла нас дадому з Малабара, пасля таго як Інглэнд захапіў віцэ-караля Індыі. Не мянялася назва і ў «Маржа», старога карабля Флінта, які да бартоў поўніўся крывёю, а золата на ім было столькі, што ён ледзь не пайшоў на дно.

— Эх,— пачуў я голас аднаго з самых маладых матросаў,— што за малайчына гэты Флінт!

— Дэвіс, кажуць, быў не горшы,— сказаў Сільвер.— Але я ніколі не хадзіў з ім у мора. Спярша я плаваў з Інглэндам, потым з Флінтам, а цяпер выйшаў вось сам. Я зарабіў дзевяцьсот фунтаў у Інглэнда і тысячы дзве ў Флінта. Гэта не так ужо і блага, як для простага матроса. Грошы ўкладзены ў банк. Не так цяжка зарабіць, як зберагчы... Дзе цяпер усе людзі Інглэнда? Не ведаю... А людзі Флінта? Пераважна тут, на караблі, і рады, калі ім даюць пудзінг, во як! Многія з іх

[1] Кватармайстар — чалавек, які адказвае на судне за запасы прадуктаў.



былі на беразе жабракамі. З голаду падыхалі! Стары П'ю, калі страціў вочы, а разам з імі і сорам, стаў пражываць тысячу дзвесце фунтаў у год, нібыта лорд з парламента. Дзе ён цяпер? Памёр і гніе ў зямлі. Але ўжо два гады назад яму не было чаго есці, прысягаю сваёй мазгаўнёю, ён жабраваў, краў, рэзаў глоткі — і ўсё-такі не мог пракарміцца, во як!..

— Вось і будзь піратам! — сказаў малады марак.

— Не будзь адно дурнем! — усклікнуў Сільвер.— Зрэшты, не пра цябе гаворка: ты хоць і малады, ды не дурны. Цябе вакол пальца не абвядзеш! Я гэта адразу прыкмеціў, як толькі ўбачыў цябе, і буду гаварыць з табою як з мужчынам.

Можаце сабе ўявіць, што я адчуваў, пачуўшы, як гэты стары жулік кажа другому тыя ж самыя ліслівыя словы, што казаў мне! Каб я мог, я яго зараз жа забіў бы!..


Тым часам Сільвер працягваў гаварыць, не падазраючы, што яго падслухоўваюць:


— Так заўсёды з джэнтльменамі ўдачы[1]. Жыццё ў іх цяжкае, яны рызыкуюць трапіць на шыбеніцу, але ядуць і п'юць, як баявыя пеўні, а з плавання вяртаюцца з сотнямі фунтаў замест тых медных пенсаў, з якімі выйшлі ў мора. Прапіць здабычу, прагуляць усё да апошняга — і зноў у мора ў адных кашулях. Але я раблю не так. Я ўкладваю ўсе свае грошы па частках у розныя банкі і нідзе не кладу занадта шмат, каб не ўзнікла падазрэнне. Мне пяцьдзесят гадоў, заўваж. Вярнуўшыся з гэтага плавання, я буду жыць, як сапраўдны джэнтльмен. Час ужо, кажаш? Ну што ж, я і дагэтуль нядрэнна жыў. Меў усё, што хацеў, мякка спаў і смачна еў. Хіба што ў моры бывала нялёгка. А як я пачаў? Матросам, як ты.

— Але ж усе вашыя сабраныя раней грошы

---

[1] Джэнтльмены ўдачы — піраты.





прападуць,— сказаў малады матрос.— Як вы пакажацеся ў Брыстолі пасля гэтага плавання?

— А дзе, па-твойму, цяпер мае грошы? — спытаўся Сільвер насмешліва.

— У Брыстолі, у банках, і іншых месцах, — адказаў матрос.

— Яны былі там,— сказаў кухар.— Яны былі там, калі мы падымалі якар. Але цяпер мая старая ўжо ўзяла іх адтуль. «Падзорная Труба» прададзена разам з арандаваным участкам, кліентураю і ўсімі снасцямі, а старая таксама адчаліла і чакае мяне ў дамоўленым месцы. Я сказаў бы табе, дзе, бо давяраю табе, але, баюся, астатнія пакрыўдзяцца, што я не сказаў і ім.


— А старой сваёй вы давяраеце? — спытаўся матрос.


— Джэнтльмены ўдачы,— адказаў кухар,— рэдка давяраюць адзін аднаму. І правільна робяць. Хто паспрабуе адпусціць канат, каб стары Джон грымнуўся, нядоўга пажыве ў адным са мною свеце... Адны баяліся П'ю, другія — Флінта, а мяне баяўся сам Флінт. Баяўся мяне і ганарыўся мною. Каманда ў яго была адчайная. Сам чорт і той не рашыўся б пусціцца з ёю ў мора. Ты мяне ведаеш, я выхваляцца не стану, я зычлівы і вясёлы чалавек, сам бачыш, але калі я быў кватармайстрам, старыя Флінтавы піраты слухаліся мяне як авечкі. Парадак на судне ў старога Джона быў што трэба!

— Скажу вам шчыра,— прызнаўся малады матрос,— да гэтай размовы, Джон, справа вашая была мне не зусім даспадобы. Але цяпер вось вам мая рука, я згодны.

— Ты смелы хлопец і кемлівы,— адказаў Сільвер і з такім імпэтам паціснуў працягнутую руку, што бочка мая загойдалася.— З цябе выйдзе такі выдатны джэнтльмен удачы, якога я яшчэ не бачыў!

Патроху я пачынаў разумець іхнюю мову.





«Джэнтльменамі ўдачы» яны называлі піратаў.

Я апынуўся сведкам апошняга раздзелу ў гісторыі пра тое, як угаворвалі сумленнага матроса ўступіць у разбойніцкую хеўру — мажліва, апошняга сумленнага матроса на ўсім судне. Але я адразу ж пераканаўся, што гэты матрос не адзіны. Сільвер ціхенечка свіснуў, і каля бочкі прысеў яшчэ нехта.

— Дзік ужо наш,— сказаў Сільвер.

— О, я ведаў, што Дзік будзе наш,— пачуў я голас другога боцмана, Ізраэля Хэндса.— Ён не дурань, гэты Дзік.

Нейкі час ён моўчкі жаваў тытунь, потым сплюнуў і загаварыў з Сільверам:


— Скажы, Кумпяк, доўга мы будзем круціцца, як падбітая шлюпка? Клянуся сваімі вантробамі, я ўжо сыты па горла капітанам! Хопіць яму камандаваць мною! Я хачу жыць у ягонай каюце, хачу іхніх прысмакаў і пойла.

— Ізраэль,— сказаў Сільвер,— твой цэбар каштуе вельмі нядорага, бо ў ім ніколі не было мазгоў. Але слухаць ты можаш, вушы ў цябе вялікія. Дык вось што ■ табе скажу: ты будзеш спаць, як і спаў, у кубрыку, будзеш есці простую ежу, будзеш паслухмяны, ветлівы і цвярозы як шкельца да тае пары, пакуль я не скажу табе, што рабіць далей. Даверся ва ўсім мне, сынок.

— Хіба я адмаўляюся? — прабурчаў Хэндс.— Я адно пытаюся: калі?

— Калі, трасца на цябе? — зароў Сільвер.— Добра, я скажу табе калі. Як мага пазней — вось калі! Капітан Смолет першакласны марак і дзеля нас саміх жа вядзе карабель. У сквайра і доктара карта, але хіба я ведаю, дзе яны хаваюць яе? І ты не ведаеш. Дык вось, няхай сквайр і доктар знойдуць скарбы і дапамогуць нам пагрузіць іх на судна, а тады ўжо мы паглядзім — прысягаю сваёй мазгаўнёю! Калі б я быў упэўнены ў такім га-





ландскім быдле, як вы, дык даў бы капітану мажлівасць давесці нас назад да паловы шляху.

— Чаму ж так,— здзівіўся Дзік,— мы і самі, я думаю, неблагія маракі.

— Неблагія матросы, ты хочаш сказаць,— паправіў яго Сільвер.— Мы ўмеем круціць руль, але хто вылічыць курс? На гэта ніхто з вас няздольны. Была б мая воля, я дазволіў бы капітану давесці нас назад хоць бы да пасата[1], тады б ведаў, прынамсі, што плывеш правільна і што не прыйдзецца выдаваць па лыжачцы прэснай вады ў дзень. Але я ведаю, што вы за народ! Прыйдзецца пакончыць з імі на востраве, ледзь толькі яны перацягнуць скарбы на судна. А шкада! Але вам бы толькі хутчэй дабрацца да пойла. Шчыра кажучы, у мяне сэрца баліць, калі я думаю, з кім выйшаў у мора.

— Ну-ну, Цыбаты! — крыкнуў Хэндс.— З табой ніхто не спрачаецца.

— Хіба мала я бачыў вялікіх караблёў, якія загінулі нізашто? Хіба мала я бачыў такіх малойчыкаў, якіх павесілі сушыцца на сонейку? — усклікнуў Сільвер.— А чаму? А ўсё таму, што спяшаліся, спяшаліся, спяшаліся... Паслухайце мяне: я сёе-тое бачыў у моры. Калі б вы ўмелі кіраваць караблём і змагацца з ветрам, то ўсе даўно б ужо каталіся ў карэтах. Але куды вам! Ведаю вас. Нажлукціцеся рому — і на шыбеніцу.


— Усім вядома, Джон, што ты накшталт капелана[2],— запярэчыў Хэндс.— Але ж былі і іншыя, яны не горш за цябе маглі кіраваць караблём і любілі гульнуць. Не строілі з сябе камандзіраў, самі весяліліся і іншым не заміналі.

— Так,— сказаў Сільвер.— А дзе яны цяпер? Такі быў П'ю — і памёр жабраком. І Флінт быў

---

[1] Пасаты — паветраныя плыні ў тропіках над акіянам.

[2] Капелан — святар на флоце.



такі — і памёр ад рому ў Саване. Так, гэта былі прыемныя людзі, вясёлыя... Толькі дзе яны цяпер?

— Што мы зробім з імі,— спытаўся Дзік,— калі яны трапяць нам у рукі?

— Вось гэты чалавек мне даспадобы! — з павагаю ўсклікнуў кухар.— Дзельны хлопец. Што ж, па-твойму, трэба з імі зрабіць? Высадзіць іх на які-небудзь пустынны бераг? Так зрабіў бы Інглэнд. Ці зарэзаць усіх, як свіней? Так зрабіў бы Флінт ці Білі Бонс.

— Была ў Білі такая манера,— сказаў Ізраэль.— «Мёртвыя не кусаюцца»,— казаў ён. Цяпер ён сам мёртвы і можа праверыць сваю прымаўку на ўласным вопыце... Калі хто і быў у гэтых справах майстрам, дык гэта Білі...


— Праўду кажаш,— сказаў Сільвер.— Білі быў на гэтыя справы мастак. Але ■ чалавек добры, я джэнтльмен... Аднак, бачу я, тут справа сур'ёзная. А справа ёсць справа, хлопцы. І я галасую — забіць. Мне зусім не хочацца, каб да мяне, калі я стану членам парламента і буду раз'язджаць у карэце, уваліўся, як чорт да мніха, адзін з гэтых танканогіх зануд. Трэба чакаць часу, але калі ён настане, справу мы зробім хутка і дбайна.


— Джон,— усклікнуў боцман,— ты герой!

— Скажаш так, Ізраэль, калі ўбачыш мяне ў справе,— сказаў Сільвер.— Я патрабую толькі аднаго: уступіце мне Трэлані. Я хачу ўласнымі рукамі адсекчы яго цялячую галаву... Дзік,— дадаў ён раптам,— будзь ласкавы, хлопчык, скокні ў бочку і дастань мне яблык, нешта ў горле сушыць.

Можаце ўявіць сабе мой жах! Я выскачыў бы і кінуўся ўцякаць, калі б у мяне хапіла сілы, але сэрца маё і ногі не слухаліся мяне. Дзік ужо ўстаў быў на ногі, як раптам яго спыніў Хэндс:

— Чакай, Дзік. І хочацца табе смактаць гэтую гніль, Джон! Дай нам лепш рому.





— Дзік,— сказаў Сільвер,— я табе давяраю. Там у мяне прыхавана бочка. Вось табе ключ. Нацадзі конаўку і прынясі.

Як я ні быў запалоханы, а адразу ж падумаў, што, напэўна, Сільвер і даваў містэру Эроў ром, які пагубіў яго.

Як толькі Дзік адышоў, Ізраэль пачаў нешта шаптаць кухару на вуха. Я пачуў усяго толькі некалькі слоў, але гэтага было дастаткова:

— Ніхто з астатніх не згаджаецца.

Значыцца, на караблі яшчэ заставаліся верныя нам матросы!

Калі Дзік вярнуўся, усе трое ўзялі па чарзе конаўку і выпілі: адзін «за шчасце», другі «за старога Флінта», а Сільвер нават праспяваў:

За вецер здабычы, за вецер удачы!
Каб з вамі павек мы не зналі нястачы!

У бочцы стала светла. Я глянуў уверх і ўбачыў, што ўзняўся месяц, які пасерабрыў круйс-марс[1] і надзьмуты фок-зэйл[2]. І ў той самы момант з вахты пачуўся голас:

— Зямля!

РАЗДЗЕЛ XII

Ваенная нарада


Палуба загрымела ад тупату. Я чуў, як людзі выбягалі з кают і кубрыка. Выскачыўшы з бочкі, я праслізнуў за фок-зэйл, павярнуў да кармы, выйшаў на адкрытую палубу і разам з Хантэрам і доктарам Ліўсі пабег на надветраную скулу[3].

---

[1] Круйс-марс — назіральная пляцоўка на бізань-мачце (кармавой мачце судна).

[2] Фок-зэйл — ніжні прамы ветразь фок-мачты (першай мачты судна).

[3] Скула — месца найбольш крутога выгіну борта, які пераходзіць у насавую ці бартавую частку.





Тут сабралася ўся каманда. Туман са з'яўленнем месяца адразу рассеяўся. Мы ўбачылі ўдалечыні на паўднёвым захадзе два нізкія пагоркі, паміж імі было прыкладна дзве мілі, а за імі бачны быў трэці, вышэйшы, яшчэ ахутаны шэрым туманам. Усе тры былі правільнай канічнай формы.

Я глядзеў на іх быццам у сне, бо не паспеў яшчэ ачомацца пасля толькі што перажытага жаху. Затым пачуў голас капітана Смолета, які аддаваў загады. «Іспаньёла» стала больш крута да ветру, курс яе праходзіў на ўсход ад вострава.

— Хлопцы,— спытаўся капітан, калі ўсе яго загады былі выкананы,— ці бачыў хто з вас гэтую зямлю раней?


— Я бачыў, сэр,— сказаў Сільвер.— Мы бралі тут прэсную ваду, калі я служыў кухарам на гандлёвым судне.


— Здаецца, стаць на якар зручней усяго з поўдня, за гэтым маленькім астраўком? — спытаўся капітан.

— Так, сэр. Гэты астравок называецца Востравам Шкілета. Раней тут заўсёды спыняліся піраты, і адзін матрос з нашага карабля ведаў усе назвы, якія піраты далі тутэйшым мясцінам. Вунь тая гара, на поўначы, завецца Фок-мачтаю. З поўначы на поўдзень тут тры гары: Фок-мачта, Грот-мачта і Бізань-мачта, сэр. Але Грот-мачту — тую высокую гару, што пакрыта туманам,— часцей называюць Падзорнай Трубою, бо піраты рабілі на ёй назіральны пост, калі стаялі тут на якары і рапаравалі свае караблі. Яны тут часцей за ўсё рапаравалі караблі, прашу прабачэння,сэр.

— У мяне ёсць карта,— сказаў капітан Смолет.— Паглядзіце, ці той гэта востраў?

Калі карта трапіла Цыбатаму Джону ў рукі, вочы ў яго заблішчалі, але, як толькі ён зірнуў на яе, агонь у іх адразу ж згас. Гэта была не тая карта, якую мы знайшлі ў куфры Білі Бонса, а





яе дакладная копія — з усімі назвамі, з абазначэннямі пагоркаў і глыбінь, але без трох чырвоных крыжыкаў і дадатковых паметак. Аднак, нягледзячы на расчараванне, Сільвер стрымаўся і нічым не выдаў сябе.

— Так, сэр,— сказаў ён,— востраў гэты самы. Ён вельмі добра намаляваны. Цікава было б даведацца, хто мог намаляваць гэтую карту... Піраты — народ непісьменны... А вось і стаянка капітана Кіда — так называў яе і мой таварыш матрос. Тут моцнае паўднёвае цячэнне. Потым ля заходняга берага яно паварочвае на поўнач. Вы правільна зрабілі, сэр,— працягваў ён,— што пайшлі ў круты бейдэвінд[1]. Калі вы хочаце ўвайсці ў бухту і крэнгаваць карабель[2], лепшага месца для стаянкі вам тут не знайсці.


— Дзякую,— сказаў капітан.— Калі мне будзе патрэбна дапамога, я зноў звярнуся да вас. Можаце ісці.

Я быў дужа ўражаны тым, як спакойна Сільвер прызнаўся ў тым, што знаёмы з востравам. Шчыра кажучы, я спалохаўся, калі ўбачыў, што ён падыходзіць да мяне. Канечне, ён не ведаў, што я сядзеў побач з ім у бочцы і чуў усё, што ён казаў. І ўсё ж я адчуваў жах перад ягонымі жорсткасцю, двудушшам, велізарнай уладаю над камандаю і ледзь не скалануўся, калі ён паклаў мне руку на плячо.

— Неблагое месца гэты востраў,— сказаў ён.— Неблагое месца для хлопчыка. Будзеш тут купацца, лазіць на дрэвы, паляваць на дзікіх коз. І сам паскачаш па гарах, нібыта каза. Дальбог, гледзячы на гэты востраў, я і сам раблюся маладым і забываюся на сваю драўляную нагу. Добра быць хлапчуком і мець на нагах дзесяць пальцаў,

[1] Бейдэвінд — курс судна, калі вугал паміж носам карабля і ветрам меншы за 90°.

[2] Крэнгаваць карабель — пакласці яго на бок для рапарацыі бакоў і кіля.



можаш мне паверыць! Калі ты захочаш пайсці і пазнаёміцца з востравам, скажы старому Джону, і ён згатуе табе закуску на дарогу.

І, ляпнуўшы мяне па-сяброўску па плячы, ён некуды пайшоў.

Капітан, сквайр і доктар гутарылі пра нешта на шканцах[1]. Я хацеў як мага хутчэй перадаць ім усё, аб чым даведаўся. Але я баяўся перапыніць пры ўсіх іхнюю размову. Я хадзіў вакол іх, думаючы, як мне лепш загаварыць з імі, як раптам мяне паклікаў доктар. Ён забыўся ўнізе сваю люльку і хацеў паслаць мяне па яе — курыў ён вельмі шмат, амаль няспынна. Падышоўшы да яго настолькі блізка, што ніхто не мог мяне чуць, я хутка прашаптаў:

— Доктар, мне трэба з вамі пагаварыць. Няхай капітан і сквайр спусцяцца ў каюту, а потым паклічаце мяне пад якім-небудзь прэтэкстам. У мяне жахлівыя навіны.

— Дзякуй, Джым, гэта ўсё, пра што я хацеў даведацца,— сказаў доктар наўмысна гучна, зрабіўшы выгляд, нібыта ён спытаўся толькі што ў мяне об нечым.

Потым ён павярнуўся да сквайра і капітана. Яны па-ранейшаму размаўлялі вельмі спакойна, не павышаючы голасу, ніхто з іх нават не прысвіснуў, але я зразумеў, што доктар перадаў ім маю просьбу. Неўзабаве капітан загадаў Джобу Эндэрсану выклікаць усю каманду на палубу.

— Хлопцы,— сказаў капітан, звяртаючыся да матросаў,— я хачу сказаць вам некалькі слоў. Вы бачыце перад сабою зямлю. Гэта той востраў, да якога мы плылі. Усе мы ведаем, які шчодры чалавек містэр Трэлані. Ён спытаўся ў мяне, ці добра працавала ўвесь гэты час каманда, і я адказаў, што кожны матрос старанна выконваў свае

[1] Шканцы — месца паміж грот-мачтаю і бізань-мачтаю.



абавязкі і што мне ніколі не прыходзілася жадаць, каб вы неслі сваю службу лепей. Вось чаму мы — містэр Трэлані, я і доктар — пойдзем зараз у каюту выпіць за вашае здароўе і вашую ўдачу, а вам дадуць грогу, каб вы маглі выпіць за нашае здароўе і ўдачу. Калі хочаце ведаць маю думку, то мяркую, што сквайр, частуючы нас, лішні раз паказвае сябе сапраўдным джэнтльменам. Прапаную крыкнуць у ягоны гонар «ура».

Не было нічога дзіўнага ў тым, што ўсе закрычалі «ўра». Але прагучала яно так сардэчна і дружна, што, прызнаюся, у той момант я не хацеў верыць, што гэтыя людзі збіраюцца нас забіць.

— Ура капітану Смолету! — зароў Цыбаты Джон, калі першае «ўра» змоўкла.

І гэтым разам «ура» было падхоплена ўсімі.

Калі агульнае свята было ў поўным разгары, капітан, сквайр і доктар спусціліся ў каюту. Трохі пазней мне перадалі, што мяне выклікаюць да іх.

Калі я ўвайшоў, яны сядзелі за сталом. Перад імі стаяла бутэлька іспанскага віна і талерка з разынкамі. Доктар курыў, трымаючы свой парык на каленях, а гэта, я ведаў, азначала, што ён хвалюецца.

Кармавы ілюмінатар быў адчынены, бо ноч была вельмі цёплая. Ярка свяціў месяц.


— Ну, Хоўкінс,— сказаў сквайр,— ты хацеў нам нешта паведаміць. Распавядай.


Я коратка расказаў ім усё, што ведаў. Яны не перапынялі мяне, пакуль я не кончыў. Слухалі яны нерухома, не адрываючы ад мяне вачэй.

— Сядай, Джым,— сказаў доктар.

Яны пасадзілі мяне за стол, налілі мне шклянку віна, насыпалі ў далонь разынак, і ўсе трое па чарзе выпілі за маё здароўе, шчасце і смеласць.

— Мушу згадзіцца, капітан,— сказаў сквайр,— што я памыляўся. Прызнаю сябе аслом і чакаю вашых загадаў.





— Я такі ж самы асёл, сэр,— сказаў капітан.— Упершыню бачу каманду, якая збіраецца бунтаваць, але нічым сябе не выдае. З іншай камандаю я даўно здагадаўся б аб усім і прыняў бы меры перасцярогі. Але гэтая перахітрыла мяне.

— Дазвольце з вамі не згадзіцца, капітан,— сказаў доктар.— Вас перахітрыў Джон Сільвер. Што ні кажы, а гэта асоба.

— Але было б лепш, калі б гэтая асоба віселa на рэі[1],— сказаў капітан.— Аднак, джэнтльмены, усе гэтыя размовы цяпер марныя. З усяго сказанага я зрабіў сякія-такія высновы і, з дазволу містэра Трэлані, выкладу іх вам.

— Вы тут капітан, сэр, рабіце тое, што лічыце неабходным! — велічна прамовіў сквайр.

— Па-першае,— заявіў містэр Смолет,— мы павінны працягваць усё, што пачалі, бо дарогі да адступлення ў нас няма. Варта мне толькі заікнуцца пра вяртанне, як яны ўмомант узбунтуюцца. Па-другое, у нас яшчэ ёсць час — прынамсі, да тае пары, пакуль мы адшукаем скарбы. Па-трэцяе, сярод матросаў засталіся яшчэ верныя нам людзі. Рана ці позна нам прыйдзецца ўступіць з гэтай хеўраю ў бой. Я прапаную не падаваць выгляду, што мы ведаем пра іхнюю задуму, а напасці на іх першымі, калі яны менш за ўсё будуць гэтага чакаць. Мне здаецца, мы можам разлічваць на вашых слуг, містэр Трэлані?

— Як на мяне самога,— заявіў сквайр.


— Іх трое,— сказаў капітан.— Мы ўтраіх ды Хоўкінс — вось ужо сем чалавек. А на каго можна разлічваць з каманды?

— Мабыць, на тых, каго Трэлані наняў сам, без дапамогі Сільвера,— сказаў доктар.

— Не,— запярэчыў сквайр.— Я і Хэндса наняў сам, а між тым...

---

[1] Рэя — папярэчны брус на мачце, да якога прымацоўваюць ветразі.



— Я таксама думаў, што Хэндсу можна давярацць,— прызнаўся капітан.

— Падумаць толькі, што ўсе яны англічане! — усклікнуў сквайр.— Дальбог, сэр, мне хочацца ўзарваць увесь карабель!

— Дык вось, джэнтльмены,— працягваў капітан,— гэта ўсё, што я магу прапанаваць. Мы павінны чакаць зручнага выпадку. Згодны, што гэта не надта лёгка. Лягчэй было б напасці на іх зараз жа. Але мы не можам нічога зрабіць да тае пары, пакуль не будзем ведаць, хто з каманды застаўся нам верны. Быць пільнымі і чакаць.

— Найвялікшую карысць можа прынесці нам зараз Джым,— сказаў доктар.— Матросы пры ім вальнейшыя, а ён — хлопец пільны.

— Хоўкінс, я разлічваю на цябе,— дадаў сквайр.


Шчыра кажучы, я вельмі баяўся, што не спраўджу іхняга даверу. Але акалічнасці склаліся такія, што мне сапраўды прыйшлося ўратаваць ім жыццё.



ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ



МАЕ ПРЫГОДЫ НА ВОСТРАВЕ



РАЗДЗЕЛ XIII

Як пачаліся мае прыгоды на востраве


Калі ўранку я выйшаў на палубу, востраў здаўся мне зусім іншым, чым учора. Хоць вецер і сціх, за ноч мы ўсё ж зусім наблізіліся да вострава і цяпер стаялі ў штылі, за паўмілі ад нізкага ўсходняга берага. Большую частку вострава пакрываў цёмны лес. Ягоная амаль суцэльная шэрань перабівалася сям-там у лагчынах жаўцізною пясчанага берага альбо зелянінаю нейкіх высокіх, падобных на сосны, дрэў, якія раслі то паасобку, то купамі. Яны падымаліся над узроўнем лесу, але агульны выгляд вострава быў усё ж вельмі аднастайны і змрочны. На вяршыні кожнае гары тырчалі вострыя голыя скалы. Дзіўныя абрысы былі ў гэтых гор! Падзорная труба была метраў на трыста—чатырыста вышэйшая за астатнія горы і здавалася самай незвычайнай: стромкія адхоны і зрэзаная плоская вяршыня рабілі яе падобнаю на п'едэстал пад статую.

Акіян так моцна гойдаў «Іспаньёлу», што вада хвастала ў шпігаты[1], ростры[2] біліся аб бло-

---

[1] Шпігаты — адтуліны ў борце на ўзроўні палубы для сцёку вады.

[2] Ростры — драўляны насціл на палубе для шлюпак і снасцей.



кі[1], і ўвесь карабель скакаў, стагнаў і трашчаў усё роўна як цацачны. Я ўчапіўся рукою ў бакштаг[2]: свет, здавалася, перакуліўся. За час падарожжа я паспеў прызвычаіцца да мора і добра сябе пачуваў, калі карабель бег па хвалях, але калі ён, як цяпер, стаяў на якары і адначасна круціўся ў вадзе, быццам бутэлька, мне рабілася блага, асабліва ўранку, на пусты страўнік.

Не ведаю, што на мяне паўплывала — ці то гойданка, ці то гэты шэры, змрочны лес, дзікія голыя камяні, грукат прыбою, што біў аб круты бераг,— але сэрца маё ахапіў смутак. І сонца ззяла горача і ярка, і птушкі лёталі вакол, з крыкамі ловячы ў моры рыбу, і, увогуле, любы чалавек, натуральна, узрадаваўся б, убачыўшы зямлю пасля такога доўгага плавання, аднак я з першага позірку ўзненавідзеў Востраў Скарбаў.

Паколькі ветру не было, мы мусілі спусціць шлюпкі, верпаваць[3] шхуну тры-чатыры мілі, абагнуць мыс і ўвесці яе ў вузкі праліў за Вostравам Шкілета.

Я сеў у адну з шлюпак, хоць мне ў ёй не было чаго рабіць. Сонца пякло няшчадна, і матросы ўвесь час бурчалі, праклінаючы цяжкую працу. Нашай шлюпкай камандаваў Эндэрсан. Замест таго каб стрымліваць астатніх, ён сам бурчаў і лаяўся гучней за ўсіх.

— Нічога,— сказаў ён і зноў вылаяўся.— Хутка ўжо канец.


«Дрэнная прыкмета»,— падумаў я. Дагэтуль матросы працавалі старанна і ахвотна. Але варта

---

[1] Блокі — бярвёны, на якіх трымаюцца ростры.

[2] Бакштаг — нацягнуты канат, які падтрымлівае мачту з кармавога боку.

[3] Верпаваць — весці карабель з дапамогаю малога якара — верпа; верп перавозяць на шлюпках, а потым падцягваюць да яго судна.



было ім убачыць востраў, як дысцыпліна адразу ж аслабла.

Цыбаты Джон стаяў не адыходзячы каля рулявога і дапамагаў яму весці карабель. Ён ведаў праліў, як уласную далонь, і зусім не бянтэжыўся, калі бачыў, што глыбіня пры прамерах была большая за пазначаную на карце.


— Гэты вузкі праход прарыты акіянскім адлівам,— сказаў ён.— Адліў паглыбляе яго кожнага разу, як рыдлёўка.


Мы спыніліся ў тым самым месцы, дзе на карце быў намаляваны якар. Трэць мілі аддзяляла нас ад галоўнага вострава, і трэць мілі — ад Вострава Шкілета. Дно было чыстае, пясчанае. Загрукатаў, падаючы, наш якар, і з лесу хмараю ўзняліся птушкі, з гвалтам закружылі над вершалінамі, але праз якую хвіліну зноў схаваліся ў галлі і змоўклі.

Праліў быў выдатна закрыты з усіх бакоў. Ён губляўся ў густым лесе, які пачынаўся ля самае вады. Бераг быў плоскі. А ўдалечыні амфітэатрам уздымаліся горы. У праліў упадалі дзве балоцістыя рачулкі, што рабіла яго падобным да ціхае сажалкі. Кідалася ў вочы ядавітая яркасць раслін каля гэтых рачулак. З карабля не было відаць ні пабудовы, ні частаколу — дрэвы засланялі іх цалкам, і, каб не карта, можна было б падумаць, што мы — першыя людзі, якія наведалі гэты востраў з тае пары, як ён узняўся з акіяна.

Усё вакол нібыта застыла. Цішыню парушаў адзін толькі аддалены гул прыбою, які разбіваўся аб скалы ў другім канцы вострава. І пах тут стаяў нейкі дзіўны, затхлы — пах прэлага лісця і драўнянае гнілі. Я заўважыў, што доктар усё прынюхваецца і моршчыцца, нібыта яму трапілася тухлае яйка.

— Не ведаю, ці ёсць тут скарбы,— сказаў ён,— але клянуся сваім парыком, ліхаманка ёсць пэўна.





Паводзіны каманды, якія ўстрывожылі мяне ў шлюпцы, яшчэ больш пагоршыліся, калі мы вярнуліся на карабель. Матросы бадзяліся па палубе і пра нешта перагаворваліся. Загады, нават самыя дробязныя, яны выслухоўвалі панура і выконвалі вельмі неахвотна. Сумленных матросаў таксама, напэўна, ахапіла зараза непакорлівасці — незадаволенасць была агульная. Небяспека бунту павісла над нашымі галовамі, як навальнічная хмара.

Але не толькі мы, насельнікі каюты, прыкмецілі гэтую небяспеку. Цыбаты Джон з усяе сілы стараўся падтрымаць парадак, пераходзячы ад аднае групы матросаў да другой, то ўгаворваў, то сам падаваў прыклад. Ён са скуры лез, намагаючыся быць паслужлівым і пачцівым. Калі аддаваўся які-небудзь загад, Сільвер першы з вясёлым крыкам кідаўся на сваёй драўляшцы выконваць яго.

— Ёсць, сэр!

А ўсміхаўся ўжо ён кожнаму.

Калі ж не было чаго рабіць, ён спяваў песні, адну за адною, каб не так кідалася ў вочы панурасць каманды.

З усяго, што адбывалася ў гэты злавесны дзень, найперш непакоілі нас хітрыкі Цыбатага Джона.

Мы сабраліся ў каюце на нараду.

— Сэр,— сказаў капітан,— калі я аддам хоць адзін загад, на нас кінецца ўвесь карабель. Вы бачыце, сэр, што робіцца. Мне грубяць на кожным кроку. Калі я адкажу на грубасць, нас разарвуць на шматкі. Калі ж я не зраблю гэтага, Сільвер можа западозрыць, што мы аб чымсьці здагадваемся, і гульня будзе намі прайграная. А мы зараз можам разлічваць толькі на аднаго чалавека.

— На каго? — спытаўся сквайр.

— На Сільвера, сэр,— адказаў капітан.— Ён





не менш нас з вамі хоча парадку. Гэта ў іх прыхамаць такая, і, калі яму даць мажлівасць, ён угаворыць іх не бунтаваць да часу. Я прапаную даць яму такую мажлівасць. Адпусцім матросаў на бераг пагуляць. Калі яны выправяцца ўсе разам, мы захопім карабель. Калі ўсе застануцца, мы запромся ў каюце, і няхай бог дапаможа тым, на чыім баку праўда. Калі ж на востраў паплыве толькі частка каманды, то, паверце мне, Сільвер даставіць усіх назад на карабель паслухмянымі як авечкі.

Мы згадзіліся з капітанам. Пасля раздалі надзейным людзям зараджаныя пісталеты, расказалі пра ўсё Хантэру, Джойсу і Рэдруту. Яны не дужа здзівіліся і паставіліся да нашага паведамлення нашмат спакайней, чым мы чакалі. Затым капітан выйшаў на палубу і звярнуўся да каманды.

— Хлопцы! — сказаў ён.— Сёння шмат прыйшлося папрацаваць, і мы ўсе страшэнна стаміліся. Прагулка на бераг нікому не пашкодзіць. Шлюпкі спушчаны. Хто хоча, няхай адпраўляецца ў іх на бераг. За паўгадзіны да захаду сонца я дам стрэл з гарматы.

Напэўна, гэтыя дурні вырашылі, што знойдуць скарбы адразу ж, як толькі высадзяцца на бераг. Усю іхнюю панурасць быццам рукою зняло. Яны так гучна закрычалі «ўра», што ў далёкіх гарах пачулася рэха, а спалоханыя птушкі зноў закружлялі над стаянкаю.


Капітан быў вельмі абачлівы і адразу ж пайшоў у каюту, каб Сільвер мог камандаваць адплыццём. Дый ці мог капітан павесці сябе інакш? Не прытварыўся ж бы ён зусім ужо някемлівым, калі б застаўся на палубе?


Усё было ясна як дзень. Капітан быў Сільвер, і за ім стаяла вялікая каманда мяцежнікаў. А сумленныя матросы — неўзабаве выявілася, што былі і такія,— павялі сябе вельмі неразумна.




55
50
75
80







Магчыма, зрэшты, што і іх усіх настроілі супраць нас завадатары піратаў, адных больш, іншых менш, але заходзіць надта далёка ім не хацелася. Адна справа — непаслухмянасць, бурчанне і лайдацтва і зусім іншая — захоп карабля і забойства ні ў чым не вінаватых людзей.

Нарэшце каманда раздзялілася так: шасцёра засталіся на караблі, а астатнія трынаццаць, у тым ліку і Сільвер, пачалі рассаджвацца ў шлюпках.

Тут я і рашыўся на адзін з тых адчайных учынкаў, якія пазней уратавалі нас ад смерці. Я разважаў так: мы не можам захапіць карабель, раз Сільвер пакінуў на борце шэсць сваіх чалавек. З другога боку, раз іх засталося ўсяго толькі шасцёра, значыцца, на караблі я зараз патрэбны не буду і мне можна выправіцца на бераг. Я ўмомант пералез цераз борт і спусціўся ў насавы люк бліжэйшае шлюпкі, якая амаль адразу ж і адчаліла.

Ніхто не звярнуў на мяне ўвагі, толькі пярэдні грабец сказаў:

— Гэта ты, Джым? Трымай галаву ніжэй.


Але Сільвер, які сядзеў у другой шлюпцы, уважліва ўгледзеўся ў нашую і гукнуў мяне, каб упэўніцца, што гэта і праўда я. Вось тут я і пачаў шкадаваць, што паплыў.

Шлюпкі памчаліся да берага наперагонкі. Але тая шлюпка, у якую сеў я, адчаліла першая. Яна была лягчэйшая, грабцы ў ёй падабраліся самыя лепшыя, і мы апярэдзілі другую шлюпку. Ледзь толькі нос нашае шлюпкі дакрануўся да берага, як я ўхапіўся за галіну, выскачыў і кінуўся ў гушчар. Сільвер і ягоныя таварышы засталіся ярдаў[1] за сто ззаду.

— Джым, Джым! — крычаў аднаногі.

---

[1] **Ярд** — асноўная адзінка даўжыні ў англійскай сістэме мер, роўная 91,44 см.



Але, вядома, я не звярнуў на ягоны крык ніякае ўвагі. Падскокваючы, ламаючы кусты, ныраючы ў траву, я бег, пакуль не выбіўся з сілы.

РАЗДЗЕЛ XIV


Першы ўдар


Задаволены, што ўцёк ад Цыбатага Джона, я развесяліўся і стаў з цікаўнасцю разглядваць незнаёмую мясцовасць.

Спярша я трапіў у балота, зараслае вербамі, трыснягом і нейкімі дрэвамі невядомае мне пароды. Потым я выйшаў на ўзлесак адкрытае пясчанае раўніны, каля мілі даўжынёю, дзе раслі нейкія скручаныя, крывыя дрэвы, падобныя на дубы, але са светлым лісцём, як у вярбы. Паміж імі сустракаліся сосны. Удалечыні было відаць двухгаловую гару, абедзве яе дзіўныя скалістыя вяршыні ззялі на сонцы.

Упершыню ў жыцці я адчуў радасць вандроўніка-даследчыка. Востраў быў ненаселены. Матросы, якія прыплылі сюды са мною, засталіся далёка ззаду, і мне ніхто не мог тут сустрэцца, апроч дзікіх звяроў. Я асцярожна прабіраўся скрозь гушчар. Усюды мне траплялiся якія-небудзь невядомыя расліны і кветкі. То тут, то там я натыкаўся на змей. Адна з іх сядзела ў расколіне каменя. Яна ўзняла галаву і зашыпела на мяне. Уражанне было такое, што перада мною круціцца нейкая юла. Адкуль мог я ведаць, што гэта грымучая змяя, укус якой смяротны?

Нарэшце я ўвайшоў у гушчар дрэў, падобных на дубы. Пазней я даведаўся, што іх называюць вечназялёнымі дубамі. Яны раслі на пяску, вельмі нізкія, як кусты цёрну. Іх вузлаватыя галіны вычварна выгіналіся, лісце густа перапляталася, бы саламяная страха. Зараснікі, усё вы-





шэйшыя і гусцейшыя, спускаліся з пясчанага адхону да шырокага, зарослага трыснягом балота, праз якое працякала адна з тых дзвюх рачулак, што ўпадалі ў праліў. Ад спякоты над балотам уздымалася задушлівая пара, і абрысы Падзорнае Трубы дрыжалі ў смузе.

Раптам зашамацеў чарот. З краканнем узляцела дзікая качка, за ёю другая, і неўзабаве над усім балотам павісла вялізная хмара птушак, якія з крыкам кружлялі ў паветры. Я адразу ж падумаў, што па балоце ідзе нехта з нашых маракоў, і не памыліўся: неўзабаве я пачуў удалечыні чыйсьці голас, які ўсё гучнеў — чалавек набліжаўся да мяне.

Я страшэнна спалохаўся, шмыгануў у бліжэйшы гай і затаіўся, як мыш.


Тут я пачуў другі голас, ■ затым зноў загаварыў першы, і цяпер ужо я пазнаў яго — гэта быў голас Сільвера. Гаварыў ён амаль не змаўкаючы, ягоны ж суразмоўца зрэдку нешта адказваў. Мяркуючы па галасах, гутарылі яны горача, амаль злосна, але слоў было не разабраць.


Нарэшце яны змоўклі і, напэўна, прыселі, бо птушкі спакваля супакоіліся і апусціліся ў балота.

Тут ■ падумаў, што не выконваю свайго абавязку. Раз ужо я такі дурны, што выправіўся на бераг разам з гэтымі гіцлямі, дык мушу, прынамсі, падслухаць, аб чым тут яны раяцца. Мой бясспрэчны абавязак — як мага бліжэй падкрасціся да іх, хаваючыся ў густой лістоце крывога, вузлаватага кустоўя.

Я мог дакладна вызначыць тое месца, дзе спыніліся піраты — і па іхніх галасах, і па мітусні некаторых птушак, якія ўсё яшчэ кружлялі над балотам, пэўна што над галовамі Сільвера і ягонага суразмоўцы.

Паволі, але ўпарта поўз я наперад. Нарэшце,





узняўшы галаву і зірнуўшы ў прасвет у лістоце, я ўбачыў на зялёным паплаўцы ля балота, пад дрэвамі, Цыбатага Джона і яшчэ аднаго марака. Яны стаялі адзін насупраць аднаго і гутарылі.

Спякота была страшэнная. Сільвер скінуў свой капялюш на зямлю, і [redacted] ўбачыў на яго вялікім, пульхным, бялёсым, у бліскучым поце твары нешта падобнае на мальбу.


— Прыяцель,— казаў ён,— ты для мяне чыстае золата. Чыстае золата, можаш ужо мне паверыць! Няўжо ты думаеш, [redacted] стаў бы клапаціцца за цябе, калі б не любіў цябе ўсім сэрцам? Усё ўжо зроблена — ты нічога не зменіш. Я тольк і таму і гавару з табою, што хачу ўратаваць тваю галаву. Калі б нашыя хлопцы даведаліся, пра што я з табою тут гаманю, як ты думаеш, Том, што б яны са мною зрабілі, га?

— Сільвер,— адказаў матрос, і я заўважыў, што твар у яго пачырванеў, [redacted] хрыплы, надсаджаны голас дрыжыць, як нацягнуты канат,— Сільвер, ты ўжо не малады чалавек і, здаецца мне, маеш сумленне, прынамсі, цябе ніхто не лічыць жулікам... У цябе ёсць грошы... багата грошай, нашмат больш, чым у іншых маракоў. І ты не баязлівец, калі [redacted] не памыляюся. Дык растлумач мне, чаму ты звязаўся з гэтымі гнюснымі пацукамі? Не, ты не можаш быць з імі заадно! І бог сведка: я хутчэй дам адсекчы мне руку, чым здраджу свайму абавязку...

Нарэшце я ўбачыў першага сумленнага матроса з нашае каманды!

І тут сюды данеслася вестка пра другога такога ж — далёка за балотам пачуўся чыйсьці гнеўны і пранізлівы крык, потым другі і, нарэшце, адчайны перадсмяротны енк. Рэха ў скалах Падзорнае Трубы адгукнулася некалькі разоў.

Сільвераў суразмоўца Том адразу ж змоўк,





уздрыгнуўшы, як прышпораны конь. А Сільвер нават вокам не маргнуў.

Уся армія балотных птушак чорнаю хмараю зноў узляцела ў неба.

Доўга яшчэ гэты перадсмяротны енк стаяў у маіх вушах, хоць наўкол зноў запала цішыня, якая парушалася толькі ляпаннем крылаў — птушкі спакваля апускаліся — ды грукатам прыбою ўдалечыні.

Цыбаты Джон стаяў, абапіраючыся на мыліцу, і глядзеў на Тома, як змяя, гатовая ўджаліць.

— Джон! — сказаў матрос, працягваючы яму руку.

— Рукі прэч! — закрычаў Сільвер, адскочыўшы на ярд назад з хуткасцю і спрытам акрабата.

— Добра, Джон, можаш не баяцца маіх рук,— сказаў Том.— Але, дальбог, толькі нячыстае сумленне прымушае цябе баяцца мяне. Іменем бога, прашу цябе, растлумач мне, што там здарылася?

— Што? — перапытаў Сільвер. Ён усміхнуўся, але не так шырока, як заўсёды, і вочы яго на велізарным твары сталі малюпасенькія, як вастрыі іголак, і зазіхацелі, як шкельцы.— Што здарылася? Здаецца мне, гэта Алан.

— Алан! — ускрыкнуў Том.— Няхай зямля яму будзе пухам — ён памёр як сапраўдны марак! А ты, Джон Сільвер... Мы доўга былі з табою таварышамі, але зараз ужо гэтаму не быць! Няхай я памру як сабака, але выканаю свой абавязак. Гэта ж вы забілі Алана, га?.. Дык забіце і мяне, калі можаце! Але я не баюся вас!

З гэтымі словамі Том павярнуўся да кухара спінаю і рушыў у накірунку да берага. Але далёка не адышоў: ускрыкнуўшы, Джон схапіўся за галіну, выхапіў з-пад пахі сваю мыліцу і з сілаю кінуў яе ўслед Тому. Мыліца трапіла не-



бараку вострым канцом у спіну паміж лапаткамі. Том узмахнуў рукамі і ўпаў.

Не ведаю, ці моцна ён быў паранены... Мяркуючы па гуку, у яго быў разбіты пазваночнік. Том не паспеў ачомацца: Сільвер без мыліцы, на адной назе, спрытна, што тая малпа, ускочыў на яго і двойчы ўсадзіў нож па самае дзяржанне ў безабароннага чалавека. Седзячы ў кустоўі, я чуў, як цяжка дыхаў забойца, наносячы ўдары.


Ніколі раней я не страчваў свядомасці, але тут увесь свет паплыў вакол мяне, як у тумане. І Сільвер, і птушкі, і вяршыня Падзорнае Трубы — усё кружылася і гойдалася. У вушах маіх звінела, дзінькала, чуліся нейкія далёкія галасы.

Калі я ачуняў, мыліца была ўжо ў гэтага монстра Сільвера пад пахаю, а капялюш на галаве. Перад ім нерухома ляжаў Том. Але забойца нават не зірнуў на яго — чысціў нож ад крыві пучком травы.

А вакол не змянілася анічога. Сонца няшчадна пякло і высокую вяршыню гары, і балота,— не верылася, што хвіліну назад у мяне на вачах быў забіты чалавек.

Джон засунуў руку ў кішэню, дастаў свісток і некалькі разоў вельмі гучна свіснуў. Я, канечне, не ведаў значэння гэтага сігналу, але ўва мне адразу ж абудзіўся страх. Сюды прыйдуць людзі. Заўважаць мяне. Яны ўжо забілі двух сумленных маракоў, чаму ж пасля Тома і Алана не стаць ахвяраю і мне?

Стараючыся нічым не выдаць сябе, я вылез з кустоўя і памчаўся назад у лес, у гушчар. Уцякаючы, я чуў, як перагаворваўся Сільвер са сваімі таварышамі — і ў мяне нібыта крылы выраслі. Я бег так хутка, як ніколі яшчэ ў жыцці. Нёсся, не разбіраючы дарогі, абы як мага далей адбегчы ад гэтых забойцаў. Выскачыў з гушчару — і тут мой страх стаў такі моцны, штоператварыўся нарэшце ў нейкі шалёны жах.



Што чакала мяне зараз?!. Хіба ж я асмелюся, калі на караблі стрэляць у гармату, сесці ў шлюпку разам з гэтымі злачынцамі, чые рукі яшчэ не высахлі ад чалавечае крыві? Хіба першы ж з іх, хто ўбачыць мяне, не скруціць мне шыю? Ды яны па адной ужо маёй адсутнасці зразумелі, што [redacted] баюся іх, а значыцца, пра ўсё здагадваюся.

«Усё скончана,— думаў я.— Бывай, «Іспаньёла»! Бывайце, сквайр, доктар, капітан! Я загіну альбо ад голаду, альбо ад рук піратаў».

Праз нейкі час [redacted] апынуўся ля падножжа невысокае гары з двухгаловай вяршыняю. У гэтай частцы вострава вечназялёныя дубы раслі не так густа і падобныя былі сваімі памерамі не на кусты, а на звычайныя лясныя дрэвы. Там-сям паміж імі можна было ўбачыць сосны вышынёю ў пяцьдзесят—семдзесят футаў[1]. Паветра тут было свежае і чыстае, зусім не такое, як унізе, ля балота.

Але тут мяне чакала іншая небяспека, і сэрца маё зноў сціснулася ад жаху.

РАЗДЗЕЛ XV

Астраўлянін

З абрывістага камяністага адхону, зашуршэўшы, падскокваючы між дрэў, пасыпаўся гравій. Я міжволі ўскінуў вочы ўверх і ўбачыў нейкую дзіўную істоту, якая імкліва скочыла за ствол сасны. Што гэта: мядзведзь, чалавек, малпа? Я паспеў прыкмеціць толькі нешта цёмнае і таўсматае і ў жаху застыў на месцы.

Абодва шляхі былі адрэзаныя: ззаду мяне пільнавалі забойцы, спераду — гэтая невядомая

---

[1] Фут — мера даўжыні, роўная 30,48 см.





пачвара. І адразу ж небяспека спазнаная здалася мілейшаю. Нават Сільвер не здаваўся мне ўжо такім страшным, як гэтае лясное адроддзе. Я павярнуўся і, азіраючыся, пабег назад у накірунку да шлюпак.

Але страшыдла, зрабіўшы вялікі крук, абагнала мяне і апынулася наперадзе. Вядома, я вельмі стаміўся, але калі б нават я быў зусім свежы, то ўсё роўна не змог бы ўцячы ад такога спрытнага ворага. Істота перабягала ад ствала да ствала з хуткасцю аленя. Рухалася яна на дзвюх нагах, па-чалавечы, аднак неяк дзіўна прыгіналася да зямлі, ледзь не складваючыся ўдвая,— я яшчэ такога ніколі не бачыў. І ўсё ж такі гэта пэўна быў чалавек, сумнявацца ўжо не прыходзілася.

Я згадаў усё, што чуў пра людаедаў, і сабраўся ўжо быў паклікаць на дапамогу. Аднак думка пра тое, што перада мною чалавек, няхай сабе і дзікі, трохі ўзбадзёрыла мяне — і мой страх перад Сільверам стаў ажываць. Я спыніўся, думаючы, як уцячы ад ворага, і раптам успомніў, што ў мяне ёсць пісталет. Тут да мяне вярнулася мужнасць, і я рашуча рушыў насустрач астраўляніну.

Ён хаваўся ад мяне, але як толькі ўбачыў, што я іду да яго, выйшаў з-за дрэва. Потым, нерашуча застыўшы на месцы, ступіў крок назад і раптам, на маё вялікае здзіўленне, укленчыў і ўмольна працягнуў да мяне рукі.

Я зноў спыніўся.

— Хто вы? — спытаўся я.

— Бэн Ган,— адказаў ён. Голас у яго быў хрыплы, рыпеў усё роўна як іржавы замок.— Я небарака Бэн Ган. Тры гады я не размаўляў ні з адным хрысціянінам.

Цяпер я бачыў, што гэта такі ж белы чалавек, як і я, і рысы ягонага твару былі, бадай, прыемныя. Праўда, скура так моцна загарэла на сонцы, што нават вусны ў яго пачарнелі. Светлыя вочы





дужа рэзка вылучаліся на цёмным твары. Ніколі яшчэ ў жыцці я не бачыў такога абарванца. На ім віселі ашмоткі старога ветразя і старое матроскае кашулі. Адна ануча злучалася [redacted] другою або медным гузікам, або прутком, або прасмаленым пакуллем. Адзінаю не надта падранаю рэччу ва ўсім яго, так бы мовіць, касцюме быў скураны пояс [redacted] меднай спражкаю.

— Тры гады! — усклікнуў я.— Вы пацярпелі крушэнне.

— Не, прыяцель,— сказаў ён,— мяне тут пакінулі.

Я чуў пра гэтае жахлівае пірацкае пакаранне: віноўніка высаджвалі на які-небудзь аддалены і пустынны востраў, з невялікім запасам пораху і куляў.

— Мяне пакінулі тут тры гады назад,— пачаў расказваць чалавек.— З таго часу [redacted] харчуюся казляцінай, ягадамі, вустрыцамі. Чалавек можа жыць усюды, дзе б ні апынуўся. Але каб ведаў ты, як знудзіўся я па хрысціянскай ежы! Ці няма ў цябе часам з сабою кавалачка сыру?.. Не?.. Ну вось, а я ўжо шмат доўгіх начэй бачу ў сне сыр на лустачцы хлеба... Прачынаюся, [redacted] сыру няма...

— Калі мне ўдасца вярнуцца на карабель,— сказаў я,— вы атрымаеце вялізную галоўку сыру.

Увесь гэты час ён абмацваў маю куртку, гладзіў мае рукі, разглядваў мае чаравікі і, змаўкаючы, па-дзіцячы радаваўся, што бачыць чалавека.

Але пачуўшы мае апошнія словы, ён неяк хітравата зірнуў на мяне:


— Калі табе ўдасца вярнуцца на карабель, так ты сказаў? А хто ж табе замінае?

— Ведама ж, не вы,— адказаў я.

— Вядома, не я! — усклікнуў ён.— А як цябе завуць, прыяцель?

— Джым,— сказаў я.

— Джым, Джым...— паўтараў ён з асалодаю.— Так, Джым, я жыў такім жыццём, што со-



рамна нават расказваць. Ці паверыў бы ты, гледзячы цяпер на мяне, што маці мая была прыстойная набожная жанчына?

— Цяжка паверыць,— згадзіўся я.

— Цяжка...— сказаў ён,— але яна і праўда была надзіва добрая жанчына. І я быў выхаваны, паслухмяны хлопчык. Так хутка паўтараў катэхізіс[1], што словы проста ліліся. І вось што з мяне выйшла, Джым, а ўсё таму, што з малых гадоў стаў хадзіць на стары могільнік гуляць у арлянку! З арлянкі пачалося — і пайшло-паехала! Маці казала, што я дрэнна скончу, так яно і выйшла! Добра, мабыць, што лёс закінуў мяне на гэты востраў. Я шмат думаў тут у адзіноце і раскаяўся. Цяпер ужо мяне не спакусіш выпіўкай! Вядома, я і цяпер бы крышачку выпіў, але самае каліва, не больш за напарстак, на шчасце... Я даў сабе слова выправіцца і не сыду з добрага шляху! А галоўнае, Джым,— азірнуўшыся, прашаптаў ён,— цяпер я багаты.

Тут я канчаткова пераканаўся, што нябога звар'яцеў у адзіноце. Напэўна, ён здагадаўся па маім твары, аб чым я падумаў, бо ён пачаў з імпэтам пераконваць мяне:

— Багаты, вельмі багаты, вер мне! І слухай, што я табе скажу: я зраблю з цябе чалавека, Джым! Ах, Джым, ты будзеш бласлаўляць лёс, што першы напаткаў мяне! Паглядзіш!


Раптам ягоны твар яшчэ больш пацямнеў, ён сціснуў маю руку і пагрозліва ўзняў палец.

— Скажы мне праўду, Джым: гэта не Флінтаў карабель? — спытаўся ён.

І тут я падумаў: гэты ж чалавек можа стаць нашым саюзнікам! І я адразу ж адказаў яму:

— Не, не Флінтаў. Флінт памёр. Але раз вы

[1] К а т э х і з і с — рэлігійная кніга, якая змяшчае кароткі выклад хрысціянскага веравучэння ў пытаннях і адказах.



хочаце ведаць праўду, вось вам праўда: на караблі ёсць некалькі старых сяброў Флінта, і для нас гэта вялікае няшчасце.

— А ці няма ў вас... аднаногага? — выкрыкнуў ён, задыхаючыся.

— Сільвера? — спытаў я.

— Сільвера! — падхапіў ён.— Так яго звалі!

— Ён у нас кок. І верхавод усёй хеўры.

Ён усё яшчэ трымаў мяне за руку і пры маіх гэтых словах ледзь не зламаў яе.

— Калі ты падасланы Цыбатым Джонам,— сказаў ён,— ■ прапаў... Але ці ведаеш ты, дзе знаходзішся?

Я адразу ж вырашыў, што мне рабіць, і расказаў яму ўсё — і пра нашае падарожжа, і пра цяжкае становішча, у якім мы апынуліся. Ён слухаў мяне вельмі ўважліва і, калі я кончыў, пагладзіў мяне па галаве.

— Ты добры хлопец, Джым,— сказаў ён.— Але цяпер вы ўсе завязаны мёртвым вузлом. Даверся ты Бэну Гану, і ён вас не падвядзе. Скажы, а як паставіцца сквайр да чалавека, які развяжа гэты вузел?


Я сказаў яму, што сквайр — самы шчодры чалавек ва ўсім свеце.


— Я, хлопец,— сказаў ён,— не збіраюся прасіць у яго месца брамніка, лёкайскую ліўрэю і ўсё такое. Гэтым мяне не спакусіш. Што хацеў бы я ведаць, Джым, дык гэта тое, ці згодзіцца ён аддаць мне хоць тысячу фунтаў, якія і без таго мае?

— Упэўнены, што дасць,— адказаў я.— Усе матросы павінны былі атрымаць сваю долю.

— А ён забярэ мяне з сабою? — спытаўся Ган, зазіраючы мне ў самыя вочы.

— А як жа? — усклікнуў я.— Сквайр — сапраўдны джэнтльмен. Апроч таго, калі мы пазбавімся ад злачынцаў, дапамога такога вопытнага марака, як вы, будзе нам вельмі патрэбная.






— Значыцца,— сказаў ён,— вы і праўда не пакінеце мяне тут.


Відаць было, што ён паверыў.

— А зараз вось што я табе раскажу,— пачаў ён.— Я быў на караблі ў Флінта, калі ён закапаў скарбы. З ім было яшчэ шэсць маракоў — дужых мужчын. Яны прабылі на востраве з тыдзень, а мы сядзелі на старым «Маржы». Нарэшце Флінт падаў сігнал і вярнуўся, але ў шлюпцы сядзеў адзін ён, і галава ў яго была абвязана сіняй хусткаю. Узыходзіла сонца. Ён быў бледны як смерць... а астатнія шасцёра былі забітыя... забітыя і пахаваныя... Як ён расправіўся з імі, так ніхто з нас ніколі і не даведаўся. А ён быў адзін супраць шасцёх!.. Білі Бонс быў у яго штурманам, а Цыбаты Джон — кватармайстарам. Яны спыталіся ў яго, дзе скарбы. «Можаце пайсці на бераг і пашукаць, калі хочаце,— адказаў ён.— Але, клянуся ўдачаю, карабель вас чакаць не стане». Вось як ён сказаў. А тры гады назад я плыў на іншым караблі, і мы ўбачылі гэты востраў. «Хлопцы,— сказаў я,— Флінт закапаў тут скарбы. Сыдзем на бераг і пашукаем». Капітан дужа раззлаваўся, але ўсе матросы заахвоціліся, і мы сталі каля гэтага берага. Дванаццаць дзён мы шукалі скарбы, і з кожным днём таварышы лаялі мяне ўсё больш, пакуль не вярнуліся аднае раніцы на судна. «А ты, Бэнджамэн Ган, заставайся тут! — сказалі яны.— Вось табе мушкет, жалязняк і лом. Шукай тут Флінтавы грошы!» Вось што яны сказалі. З тае пары, Джым, я вось ужо тры гады жыву тут і не трымаў у роце нармальнай хрысціянскай ежы. А зараз зірні на мяне: хіба я падобны да простага матроса? Не, скажаш ты. І я скажу, што не.

Тут ён неяк дзіўна падміргнуў мне адным вокам і моцна ўшчыкнуў мяне за руку.

— Так і скажы свайму сквайру, Джым: ён ніколі не быў падобны да простага матроса... Вось





як ты яму скажаш... Скажы яму, што Бэн тры гады сядзеў тут, на востраве, адзін, і ўдзень, і ўначы, і ў добрае надвор'е, і ў дождж, думаў, можа, часам аб малітве, іншы раз згадваў сваю старую маці, хоць яе даўно ўжо няма ў жывых — так і скажы яму. Але большую частку часу Ган... так вось і скажы... большую частку часу ён займаўся іншымі справамі. А сказаўшы гэта, ушчыкні яго вось так.— І ён зноў ушчыкнуў мяне па-сяброўску.— І вось што яшчэ ты яму скажы: Ган добры чалавек — так яму і скажы, Ган нашмат больш давярае джэнтльмену сапраўднаму, нашмат больш, чым джэнтльмену ўдачы, бо сам ён быў калісь піратам.

— Добра,— сказаў я.— Я нічога не зразумеў з таго, што вы мне гаварылі. Зрэшты, гэта цяпер і неважна, бо я ўсё роўна не ведаю, як мне вярнуцца на карабель.

— А,— сказаў ён,— кепскія твае справы, гэта ўжо пэўна. Але ў мяне ёсць лодка, якую я зрабіў уласнымі рукамі. Яна схавана пад белай скалою. Калі якая бяда, мы можам паплыць на ёй, як сцямнее... Чакай! — ускрыкнуў ён раптам.— Што гэта там такое?


Якраз у гэты самы момант на караблі грымнула гармата. Гулкае рэха падхапіла стрэл і разнесла яго па востраве. Між тым да захаду сонца заставалася сама меней гадзіна, калі не дзве.

— Пачаўся бой! — крыкнуў я.— За мною.

Я кінуўся да стаянкі карабля, забыўшыся на свой нядаўні страх. Побач са мною лёгка і спрытна бег астраўны палоннік.

— Лявей, лявей! — прыгаворваў ён.— Лявей, прыяцель! Бліжэй да дрэў! Вось у гэтым месцы я ўпершыню падстрэліў казу. Цяпер козы сюды не спускаюцца, бегаюць толькі там, наверсе, у гарах — баяцца Бэнджамэна Гана. А!.. Вось і могілкі.— Ён так і сказаў: «могілкі».— Бачыш пагоркі? Я прыходзіў сюды і зрэдчас





маліўся, калі думаў, што, можа, цяпер святая нядзелька. Гэта табе не капліца, але ўсё роўна хоць трохy больш урачыста. Ні капелана, ні бібліі, ні сцяга, але ўсё роўна Бэн Ган маліўся...

Ён усё балбатаў і балбатаў, не змаўкаючы, не чакаючы адказу, а я імчаўся з усяе сілы.

Пасля гарматнага стрэлу запала цішыня, а потым пачуўся залп — у справу пайшлі мушкеты.

І зноў стала ціха. А потым уперадзе над лесам, за чвэрць мілі ад нас, залунаў «Юніён Джэк»[1].

---

[1] «Юніён Джэк» — брытанскі дзяржаўны сцяг.





ЧАСТКА ЧАЦВЁРТАЯ



ЧАСТАКОЛ




РАЗДЗЕЛ XVI

Пра далейшыя падзеі апавядае доктар.

Як быў пакінуты карабель

Абедзве шлюпкі адчалілі ад «Іспаньёлы» а палове другой, або, кажучы па-марскому, калі прабіла тры склянкі. Капітан, сквайр і [redacted] сядзелі ў каюце і раіліся, што нам рабіць. Калі б дзьмуў хоць які вецер, мы б напалі зняцку на шасцярых мяцежнікаў, што засталіся на караблі, зняліся б з якара і выйшлі ў мора. Але ветру не было, а тут яшчэ прыйшоў Хантэр і паведаміў нам, што Джым Хоўкінс праслізнуў у шлюпку і адплыў разам з часткаю экіпажа на бераг.

Мы, вядома, ніколькі не сумняваліся ў Джыме, але вельмі за яго хваляваліся. Матросы, з якімі ён накіраваўся на бераг, былі такія раззлаваныя, што мы ўжо амаль не спадзяваліся ўбачыць Джыма жывым. Мы паспяшаліся на палубу. У пазах бурбалкамі выступала смала. У паветры смярдзела ад балотнае пары, і мяне ледзь не званітавала. У гэтым гнюсным праліве нас падсцерагалі ліхаманка і дызентэрыя. Шасцёра нягоднікаў змрочна пазіралі на нас з-пад ветразя на баку, дзе яны сядзелі. Шлюпкі стаялі на беразе



каля вусця нейкае рачулкі, і ў кожнай сядзеў матрос. Адзін з іх насвістваў «Лілібулеру»[1].

Чакаць больш было ўжо нельга, і мы вырашылі, што я паплыву з Хантэрам на разведку ў яліку[2].

Шлюпкі знаходзіліся справа ад карабля. А мы з Хантэрам накіраваліся да таго месца, насупраць якога на карце быў абазначаны частакол. Прыкмеціўшы нас, матросы, што вартавалі шлюпкі, замітусіліся. «Лілібулера» змоўкла. Я бачыў, як яны спрачаліся, рашаючы, напэўна, што ім рабіць. Калі б яны паведамілі пра нашае з'яўленне Сільверу, усё, мабыць, пайшло б інакш. Але, мяркую, яны атрымалі загад не пакідаць шлюпак ні ў якім выпадку і таму нарэшце спакойна ўселіся. Мы зноў пачулі «Лілібулеру».

Бераг у гэтым месцы трохі выгінаўся, утвараючы нешта накшталт невялікага мыса, і я кіраваў ялікам так, каб мыс засланіў нас ад матросаў у шлюпках. Я выскачыў на бераг і пабег з усяе сілы. Пад капялюш я падклаў шоўкавую насоўку, каб абараніць галаву ад спякоты. У кожнай руцэ ў мяне быў зараджаны пісталет.

Не прабег я і ста ярдаў, як натрапіў на частакол.

З-пад зямлі, амаль на самай вяршыні невялікага пагорка, біла празрыстая крыніца. Вакол гэтае крыніцы і стаяў высокі зруб — блакгауз[3]. У ім магло размясціцца чалавек сорак. У сценах былі байніцы для мушкетаў. Зруб быў абнесены на досыць вялікай ад яго адлегласці частаколам у шэсць футаў вышынёю, у якім не было ніякіх веснічак, ніводнае адтуліны. Зламаць частакол было вельмі цяжка, а схавацца за ім ад тых, хто

[1] «Лілібулера» — англійская жартоўная песня.

[2] Ялік — невялікая шлюпка з адной ці дзвюма парамі вёслаў.

[3] Блакгауз — ваеннае ўмацаванне з байніцамі, прыстасаванае для кругавой абароны.



сядзеў у блакгаузе,— немагчыма. Нападнікаў можна было расстрэльваць, што тых курапатак, няхай іх збярэцца ажно полк, былі б адно пільнымі вартавыя ды меўся запас правізіі.

Асабліва ўзрадаваўся я крыніцы. Хоць у каюце «Іспаньёлы» было таксама няблага — багата зброі, боепрыпасаў, правізіі, адмысловых він, але там мы не мелі аднаго — вады. Я ацэньваў вартасці гэтае крэпасці, як раптам пачуўся жудасны перадсмяротны енк. Не ўпершыню сутыкаўся я з смерцю — сам служыў калісь у войску Яго Вялікасці герцага Кэмбэрлэндскага[1] і атрымаў рану пад Фантэнуа[2],— але ад гэтага крыку ў мяне сціснулася сэрца. «Загінуў Джым!» — вырашыў я.

Шмат значыць — быць старым салдатам, але быць доктарам значыць нашмат болей. У нашай справе нельга было губляць аніводнае хвіліны, і я, умомант усё абдумаўшы, спешна вярнуўся на бераг і скочыў у ялік.

На шчасце, Хантэр быў выдатны грабец. Мы проста несліся па праліве. Неўзабаве лодка прычаліла да борта, і я падняўся на палубу.

Сябры мае былі ў шоку. Сквайр сядзеў белы, як папера, і перажываў з-за таго, што падверг нас такім небяспекам. Адзін з шасці матросаў, якія сядзелі на ба́ку, выглядаў не нашмат лепш.

— Гэты чалавек,— сказаў капітан Смолет, кінуўшы ў яго бок,— яшчэ не прызвычаіўся да такіх спраў. Ён ледзь не самлеў, калі пачуў крык. Яшчэ трохі — і ён будзе наш.

Я расказаў капітану пра свой план, і мы разам абмеркавалі яго.

Мы паставілі ў калідоры, паміж каютаю і бакам, старога Рэдрута, даўшы яму тры ці чатыры

[1] Герцаг Кэмбэрлэндскі — англійскі палкаводзец сярэдзіны XVIII стагоддзя.

[2] Фантэнуа — селішча ў Бельгіі, пад якім у 1745 годзе французскія войскі разбілі англа-галандскія.

зараджаныя мушкеты і фашынны цюфяк[1] для абароны.

Хантэр падвёў шлюпку да кармы, і мы з Джойсам сталі нагружаць яе порахам, мушкетамі, сухарамі, свінінаю. Апусцілі туды і бочачку з каньяком і маю каштоўную скрынку з лекамі.

Тым часам сквайр і капітан выйшлі на палубу. Капітан выклікаў другога боцмана, старшага сярод матросаў, што засталіся на караблі.

— Містэр Хэндс,— сказаў ён,— нас тут двое, і ў кожнага пара пісталетаў. Той з вас, хто падасць які-небудзь сігнал, будзе забіты.

Піратаў апанавала збянтэжанасць. Пашаптаўшыся, яны кінуліся да пярэдняга сходнага тамбура, збіраючыся, няма ніякага сумнення, напасці на нас з тылу. Але, наткнуўшыся ў вузкім праходзе на Рэдрута з мушкетамі, яны адразу ж кінуліся назад. Чыясьці галава высунулася з люка на палубу.

— Уніз, сабака! — крыкнуў капітан.

Галава знікла. Усе шасцёра, насмерць перапалоханыя, надоўга заціхлі.


Мы з Джойсам загрузілі ялік да самага верху, кідаючы ўсё як прыйдзецца. Потым спусціліся ў яго праз кармавы порт[2] і, вяслуючы з усяе сілы, панесліся да берага.

Другая наша ходка дужа занепакоіла вартавых на беразе. «Лілібулеры» мы ўжо не чулі. І перш чым мы перасталі іх бачыць, абагнуўшы мысок, адзін вартавы пакінуў сваю шлюпку і пабег у глыб вострава. У мяне мільганула думка скарыстацца гэтым і знішчыць іхнія шлюпкі, але я пабаяўся, што Сільвер з кампаніяй знаходзяцца непадалёк і што мы страцім усё, калі захочам задужа многага.

---

[1] Фашынны цюфяк — матрац з туга сцягнутых звязак хворасту; ужываецца пры наладжванні абарончых пазіцый.

[2] Порт — адтуліна ў борце.



Мы прычалілі да таго ж самага месца, што і мінулы раз, і ўтрох перанеслі ў блакгауз першую частку нашага грузу, перакідаўшы прыпасы цераз частакол. Вартавым пакінулі Джойса. Ён застаўся адзін, затое мушкетаў у яго было не менш як паўтузіна. А мы з Хантэрам вярнуліся да яліка і зноў узвалілі груз на спіну. Такім чынам, шчыруючы без перадыху, мы паступова перацягнулі ўвесь груз. Джойс і Хантэр засталіся ў блакгаузе, а я зноў, што было сілы, паплыў да «Іспаньёлы».

Мы вырашылі яшчэ раз нагрузіць ялік. Задума рызыкоўная, але не такая ўжо безразважная, як можа здацца. Піратаў, вядома, было больш, чым нас, але мы былі лепш узброеныя. Ніводзін з тых мяцежнікаў, што знаходзіліся цяпер на востраве, не меў мушкета, і перш чым яны паспелі б падысці да нас на адлегласць пісталетнага стрэлу, мы застрэлілі б прынамсі шасцярых.

Сквайр чакаў мяне ля кармавога акна. Настрой у яго прыкметна палепшыўся. Схапіўшы кінуты мною канец, ён падцягнуў ялік, і мы зноў сталі нагружаць яго свінінаю, порахам, сухарамі. Потым захапілі па адным мушкеце і па адным корціку для мяне, сквайра, Рэдрута і капітана. Астатнюю ж зброю і порах выкінулі за борт. Праліў тут быў два з паловаю сажні глыбінёю, і мы добра бачылі, як блішчыць пад сонцам сталь на чыстым пясчаным дне.

Пачаўся адліў, і шхуна павярнулася вакол якара. Мы пачулі галасы каля шлюпак на беразе, і хоць гэта і сведчыла, што Джойс і Хантэр, якія знаходзіліся ва ўсходнім ад шлюпак баку, піратамі яшчэ не заўважаныя, мы вырашылі паспяшацца.

Рэдрут пакінуў свой пост у калідоры і скочыў у ялік. Мы падвялі яго да другога борта, каб забраць капітана Смолета.

— Хлопцы,— гучна крыкнуў ён,— вы чуеце мяне?





З бака ніхто не адказаў.

— Я звяртаюся да цябе, Абрахам Грэй.

Зноў ні слова адказу.

— Грэй,— працягваў містэр Смолет, павысіўшы голас,— я пакідаю карабель і загадваю табе пайсці ўслед за тваім капітанам. Я ведаю, што, па сутнасці, ты чалавек неблагі, дый астатнія не такія ўжо кепскія хлопцы, якімі хочуць здацца. У мяне ў руцэ гадзіннік. Даю табе трыццаць секунд на тое, каб далучыцца да мяне.

Маўчанне.

— Ідзі ж, Абрахам,— зноў загаварыў капітан,— не прымушай нас марнаваць час. Кожная лішняя секунда пагражае смерцю і мне, і астатнім добрым джэнтльменам.

Пачалася глухая валтузня, пачуліся гукі ўдараў, і на палубу выскачыў Грэй. Шчака ў яго была парэзана нажом. Ён падбег да капітана, бы сабака, якому свіснуў гаспадар.

— Я з вамі, сэр,— сказаў ён.

Яны абодва скочылі ў ялік, і мы адчалілі.

Карабель мы пакінулі. Але да частаколу было яшчэ далёка.


РАЗДЗЕЛ XVII

Доктар працягвае свой аповяд

Апошняя ходка на яліку

Гэтая апошняя — пятая — ходка закончылася не так шчасліва, як папярэдняя. Па-першае, наша шкарлупіна была страшэнна перагружана. Пяцёра дарослых мужчын, ды прычым трое з іх, Трэлані, Рэдрут і капітан, ростам вышэйшыя за шэсць футаў — для нашага яліка гэта было не так ужо і мала. Дадайце сюды порах, свініну, торбы з





сухарамі. Нічога дзіўнага, што планшыр[1] на карме лізала вада. Некалькі разоў нас трохі залівала. Не паспелі мы адысці на сотню ярдаў, як мае штаны і фалды камзола прамоклі дашчэнту.

Капітан загадаў нам размясціць груз інакш, і ялік выраўняўся. І ўсё ж мы нават дыхаць баяліся, бо здавалася, што вось-вось ён перакуліцца.

Па-другое, быў адліў, стварылася моцная плынь, якая накіроўвалася да захаду, а потым збочвала да поўдня, у адкрытае мора, цераз той праход, па якім уранку ўвайшла ў праліў нашая шхуна. Наш перагружаны ялік магла перакуліць самая малая хваля адліву. Але горш за ўсё было тое, што плынь адносіла нас у бок ад накірунку да таго месца за мысам, дзе я прычальваў раней. Калі б мы не справіліся з плынню, то прысталі б да берага акурат каля дзвюх шлюпак, дзе кожнае хвіліны маглі з'явіцца піраты.

— Я не магу кіраваць на частакол, сэр,— сказаў я капітану. Я сядзеў за стырном, а Смолет з Рэдрутам, якія яшчэ не паспелі стаміцца, грэблі.— Плынь адносіць нас. Ці нельга прыналегчы на вёслы?

— Нас залье, калі мы прыналяжам,— сказаў капітан.— Пастарайцеся, калі ласка, сэр, трымаць рыхтык пасупраць плыні. Трымаць да самага канца.

Нас адносіла на захад да тае пары, пакуль я не накіраваў нос на ўсход, пад прамым вуглом да таго курсу, па якім мы павінны былі ісці.

— Гэтак мы ніколі не дабяромся да берага,— сказаў я.

— Калі пры любым іншым курсе нас зносіць, сэр, мы мусім трымацца гэтага курсу,— адказаў капітан.— Нам трэба ісці ўверх па плыні. Калі нас знясе, сэр,— працягваў ён,— у падветраны бок да частаколу, цяжка сказаць, дзе мы прыча-

---

[1] Планшыр — планка на верхнім краі борта.





лім, дый пірацкія шлюпкі могуць напасці на нас. А калі мы вытрымаем гэты курс, плынь аслабее, і мы зможам спакойна манеўраваць каля берага.

— Плынь ужо слабее, сэр,— сказаў Абрахам Грэй, які сядзеў на носе.— Можна трохі павярнуць да берага.

— Дзякуй, мой даражэнькі,— падзякаваў я яму, быццам паміж намі ніколі не было ніякіх непаразуменняў: мы ўсе моўчкі дамовіліся паводзіць сябе з ім так, нібыта ён быў з намі ад самага пачатку.

— Гармата! — раптам усхвалявана сказаў капітан.

Мы азірнуліся і з жахам убачылі, што пяцёра мяцежнікаў завіхаліся ля гарматы, сцягваючы з яе «куртку» — так называлі яны прасмолены парусінавы чахол, накінуты на яе. А мы ж пакінулі на караблі гарматны порах і ядры! Піратам няцяжка дастаць іх са склада — варта ўдарыць добра па дзвярах сякераю.

— Ізраэль быў у Флінта кананірам,— хрыпла сказаў Грэй.

Я направіў ялік прама да берага. Цяпер мы спраўляліся з плынню без асаблівае цяжкасці, хоць ішлі ўсё яшчэ не надта хутка. Але, павернуты да «Іспаньёлы» бортам, ялік быў цяпер выдатнай мішэнню.

Я не толькі бачыў, але і чуў, як гэты чырванаморды гад Хэндс з грукатам каціў на палубе ядро.

— Хто ў нас лепшы стралок? — спытаўся капітан.


— Вядома, містэр Трэлані,— адказаў я.

— Містэр Трэлані, застрэльце, калі ласка, аднаго з гэтых абармотаў. Калі можна, Хэндса, сэр,— сказаў капітан.

Трэлані, халодны, што сталь, агледзеў запал сваёй стрэльбы.

— Асцярожней, сэр! — крыкнуў капітан.—





Не перакуліце ялік! А вы ўсе будзьце напагатове і захавайце, страляючы, раўнавагу!

Сквайр узняў стрэльбу, Рэдрут з капітанам перасталі грэбці, усе мы перасунуліся да борта, каб утрымаць раўнавагу, і ўсё выйшла адмыслова: ялік не зачарпнуў аніводнае кроплі.

Піраты тым часам павярнулі гармату на вярт-люзе, і Хэндс, які стаяў з прыбойнікам[1] каля жарала, быў як на далоні. Аднак нам не пашанцавала. Калі Трэлані стрэліў, Хэндс нагнуўся, і куля, прасвісцеўшы над ім, трапіла ў ягонага суседа.

Ранены закрычаў, і ягоны крык падхапілі не толькі тыя, хто быў разам з ім на караблі,— пачулася мноства галасоў на беразе. Зірнуўшы туды, я ўбачыў піратаў, якія выбягалі з лесу да шлюпак.

— Яны зараз адчаляць,— сказаў я.


— Ходу! — крыкнуў капітан.— Ужо не важна, ці ўратуем мы ялік. Калі нам не ўдасца дабрацца да берага, мы прапалі.

— Адчальвае толькі адна шлюпка, сэр,— заўважыў я.— Астатнія пабеглі па беразе, мабыць, каб перарэзаць нам дарогу.

— Ім прыйдзецца папацець,— стрымана ацаніў небяспеку капітан.— Маракі на сушы, самі ведаеце, не дужа спрытныя. Не іх я баюся, а гарматы. Ім няцяжка будзе трапіць у нас: мая гармата б'е дакладна. Папярэдзьце нас, сквайр, калі ўбачыце запалены кнот, і мы скіруем убок.

Нягледзячы на цяжкі груз, ялік ішоў цяпер досыць ходка і амаль не набіраў вады. Нам заставалася яшчэ разоў трыццаць—сорак узмахнуць вёсламі, і мы дабраліся б да пясчанае водмелі каля дрэў, якую агаліў адліў. Пірацкае шлюпкі ўжо не трэба было баяцца, яна была за мыскам. Адліў, які нядаўна замінаў нам, цяпер замінаў нашым ворагам. Адзінай пагрозаю заставалася гармата.

[1] Прыбойнік — жалезны прэнт для забівання ядра ў дула гарматы.



— Няблага было б спыніцца і падстрэліць яшчэ аднаго,— сказаў капітан.

Але было ўжо відаць, што гармата вось-вось стрэліць. Піраты нават не глядзелі на свайго раненага таварыша, хоць ён быў яшчэ жывы — мы бачылі, як ён спрабаваў адпаўзці ўбок.

— Гатова! — крыкнуў сквайр.

— Стой! — як рэха адгукнуўся капітан і адразу ж разам з Рэдрутам стаў так моцна грэбці назад, што карма схавалася пад вадою. Грымнуў гарматны стрэл — той самы, які пачуў Джым: сквайраў стрэл да яго не данёсся. Дзе ўпала ядро, ніхто з нас не заўважыў. Мяркую, што яно прасвістала над нашымі галовамі і ўзняты ім вецер стаў прычынаю бяды, якая здарылася з намі: адразу ж пасля стрэлу наш ялік зачарпнуў кармою ваду і пачаў тануць. Глыбіня была невялікая, футы тры. Мы з капітанам сталі на дно адзін насупраць аднаго, астатнія трое акунуліся з галавою і вынырнулі, пырхаючы і аддыхваючыся.

Зрэшты, мы мала чым паплаціліся: усе засталіся жывыя і шчасліва дабраліся да берага. Праўда, запасы нашы засталіся на дне, і, што горш за ўсё, з пяці стрэльбаў не намоклі толькі дзве: я інстынктыўна ўзняў сваю стрэльбу над галавою, а ў капітана, чалавека вопытнага, стрэльба вісела за спінаю замком дагары. Тры астатнія стрэльбы апынуліся ў вадзе разам з ялікам.

У лесе, зусім ужо непадалёк, чуліся галасы. Піраты маглі не толькі адрэзаць нас ад частаколу, але і напасці на Хантэра з Джойсам, і мы не былі ўпэўненыя, ці змогуць яны ўтрымацца: Хантэр чалавек цвёрды, а вось Джойс... Гэта паслужлівы і ветлівы слуга, які выдатна чысціць шчоткаю адзежу, але для бою ён зусім непрыдатны.

Устрывожаныя, мы як мага хутчэй дабраліся да берага ўброд, кінуўшы на волю лёсу наш бедны ялік, у якім знаходзілася амаль палова ўсяго нашага пораху і ўсёй нашай правізіі.



РАЗДЗЕЛ XVIII

Доктар працягвае свой аповяд

Канец першага дня бою

Мы што ёсць сілы беглі праз лес, які аддзяляў нас ад частаколу, і з кожным крокам усё бліжэй і бліжэй чуліся галасы піратаў. Неўзабаве мы пачулі тупат іхніх ног і трэск галля. Яны прабіраліся скрозь гушчар.

Я зразумеў, што нас чакае сур'ёзны бой, і агледзеў сваю стрэльбу.

— Капітан,— сказаў я.— Трэлані б'е намёртва, але яго стрэльба глытнула вады. Дайце яму сваю.

Яны памяняліся стрэльбамі, і Трэлані, маўклівы і стрыманы, якім ён стаў ад самага пачатку непрыемных падзей, на момант спыніўся, каб праверыць зарад. Толькі цяпер я заўважыў, што ў Грэя няма ніякае зброі, і аддаў яму свой корцік. Усе мы ўзрадаваліся, калі ён папляваў на рукі, нахмурыў бровы і замахаў корцікам з такою сілаю, што лязо са свістам рассякала паветра. Кожны ўзмах корціка быў яскравым доказам таго, што Грэй будзе нам добрым саюзнікам.

Крокаў праз сорак мы выбраліся на ўзлесак і апынуліся перад частаколам, прыкладна ля сярэдзіны яго паўднёвага боку. Тым часам сямёра мяцежнікаў на чале з боцманам Джобам Эндэрсанам выскачылі з гучнымі крыкамі з лесу ля паўднёва-заходняга рогу частаколу.

Збянтэжаныя, яны спыніліся. Мы са сквайрам стрэлілі, не даўшы ім ачомацца. Хантэр і Джойс таксама стрэлілі з блакгауза. Чатыры стрэлы грымнулі амаль адначасна і паспяхова: адзін з ворагаў упаў, астатнія кінуліся за дрэвы.

Зарадзіўшы стрэльбы, мы пракраліся ўздоўж







частаколу паглядзець на мяцежніка, які ляжаў на зямлі. Ён быў забіты напавал, куля трапіла ў самае сэрца.

Поспех узрадаваў нас, як раптам у кустоўі шчоўкнуў пісталет, у мяне над вухам прасвістала куля, і нябога Том Рэдрут пахіснуўся і грымнуўся на зямлю. Мы са сквайрам стрэльнулі ў кусты, але зрабілі гэта наўдачу і, напэўна, зарады нашы прапалі марна. Зноў зарадзіўшы стрэльбы, мы кінуліся да Тома.

Капітан і Грэй ужо аглядалі яго. Я адразу ж зразумеў, што жыць яму засталося нядоўга.

Мабыць, нашыя стрэлы прымусілі мяцежнікаў адступіць, бо нам удалося без якойсьці перашкоды перацягнуць небараку-егера цераз частакол і занесці пад дах блакгауза.

Наш бедны стары таварыш! Ён не выказваў ніякага здзіўлення, ні на што не скардзіўся, нічога не баяўся і ніколі не бурчаў з самага пачатку нашых прыгод да гэтага моманту, калі мы паклалі яго ў зруб паміраць. Ён, як траянец, мужна ахоўваў калідор на «Іспаньёле», выконваў усе загады маўкліва, пакорліва і сумленна. Ён быў старэйшы ад усіх нас гадоў на дваццаць. І вось цяпер гэты панурлівы, стары адданы слуга паміраў на нашых вачах.

Сквайр укленчыў перад ім, цалаваў яму рукі і плакаў, як дзіця.

— Я паміраю, доктар? — спытаўся Рэдрут.

— Паміраеш, Том, дарагі мой...— сказаў я.


— Хацелася б мне паслаць ім перад смерцю яшчэ адну кулю,— абвёў ён нас вачыма.

— Том,— сказаў сквайр,— скажы, што ты мне ўсё даруеш...

— Ці прыстойна мне дараваць або не дараваць нешта свайму гаспадару? — адказаў ён.— Што ўжо будзе, тое будзе. Амінь!

Памаўчаўшы трохі, ён папрасіў, каб хто-небудзь прачытаў над ім малітву.





— Такі ўжо звычай, сэр,— дадаў ён, нібыта прасіў прабачэння, і неўзабаве сканаў.

Тым часам капітан — раней я звярнуў увагу, што ў яго неяк дзіўна ўздзьмуліся грудзі і адтапырваліся кішэні,— выклаў прыхаваныя ім самыя разнастайныя рэчы: брытанскі сцяг, Біблію, клубок вяровак, пяро, чарніла, судавы журнал і некалькі фунтаў тытуню. Потым ён адшукаў доўгую абструганую сасновую жэрдку і з дапамогаю Хантэра замацаваў яе над зрубам, на рагу. Затым, узабраўшыся на дах, прычапіў да жэрдкі і ўзняў сцяг. Рабіў ён усё гэта з відавочным задавальненнем.

Потым ён спусціўся і пачаў засяроджана перабіраць і пералічваць нашы запасы. Але зрэдку ўсё ж паглядваў на Тома, і калі той памёр, ён дастаў другі сцяг і накрыў ім нябожчыка.

— Не засмучайцеся так, сэр,— сказаў ён, паціскаючы сквайру руку.— Том памёр годна. Не трэба баяцца за лёс чалавека, забітага пры выкананні сваіх абавязкаў перад капітанам і гаспадаром. Святара и замяніць не магу, але гэта справы не мяняе.

Затым капітан адвёў мяне ўбок.

— Доктар Ліўсі,— спытаўся ён,— праз колькі тыдняў можа прыбыць нам на дапамогу карабель?

Я адказаў, што гэта справа не тыдняў, а месяцаў. Блэндлі вышле судна, калі мы не вернемся да канца жніўня. Ні раней, ні пазней.


— Вось і лічыце, калі карабель будзе тут,— сказаў я.

— Ну, сэр,— пачухаў капітан патыліцу,— у такім выпадку нам, які ні спрыяльны будзе лёс, прыйдзецца цяжка.

— Вы думаеце? — спытаўся я.

— Шкада, сэр, што ўвесь наш другі груз загінуў,— адказаў капітан.— Пораху і куль нам хопіць, а вось правізіі мала, вельмі мала.





У гэты момант высока над дахам блакгауза праляцела са свістам ядро. Упала яно недзе далёка за намі.

— Ого! — сказаў капітан.— Бамбардзіроўка! А пораху ў іх не так ужо і шмат.

Другі прыцэл быў больш удалы. Ядро пераляцела цераз частакол і ўпала перад блакгаузам, падняўшы віхор пяску.

— Капітан,— сказаў сквайр,— з карабля зруб не відаць. Яны, напэўна, цэляць у сцяг. Ці не спусціць нам яго?

— Спусціць сцяг? — ускрыкнуў капітан.— Не, сэр.

І мы адразу ж усе з ім згадзіліся.

Слаўны марскі звычай не дазваляе спускаць сцяг у час бою. Акрамя таго, гэтым мы паказвалі нашым ворагам, што зусім не баімся іхняй стралянiны.

Яны абстрэльвалі нас з гарматы ўвесь вечар. Адно ядро праносілася над дахам блакгауза, другое падала перад частаколам, трэцяе ўзрывала пясок ля самага зруба. Але піратам прыходзілася браць высокі прыцэл, і ядры страчвалі сілу і зарываліся ў пясок. Рыкашэту мы не баяліся. І хоць адно ядро прабіла ў нас дах і падлогу, мы хутка прызвычаіліся да абстрэлу і выдатна трымалі сябе ў руках.

— Ёсць у гэтым і нешта добрае,— заўважыў капітан.— У лесе паблізу ад нас, здаецца, не павінна быць піратаў. Адліў узмацніўся, і нашыя прыпасы, напэўна, цяпер наверсе. Ці няма ахвотнікаў збегаць па свініну?

Першыя абраліся зрабіць гэта Грэй і Хантэр. Узяўшы з сабою зброю, яны паралезлі цераз частакол. Але вылазка іх была марная. Піраты былі смялейшыя, чым мы чакалі, а можа, былі ўпэўненыя, што Хэндсава гармата прыкрые іх надзейна.

Пяцёра мяцежнікаў старанна вылоўлівалі прыпасы з яліка і перацягвалі іх у сваю шлюпку,



што стаяла непадалёк. Тым, што сядзелі ў шлюпцы, прыходзілася ўвесь час веславаць, бо плынь адносіла яе ўбок. Сільвер стаяў на карме і аддаваў загады. Ва ўсіх піратаў былі мушкеты, узятыя імі, мусіць, з якога-небудзь іхняга сховішча.

Капітан сеў на бервяно і пачаў запісваць у судавы журнал.

«Аляксандр Смолет — капітан, Дэвід Ліўсі — судавы доктар, Абрахам Грэй — памочнік цесляра, Джон Трэлані — уладальнік шхуны, Джон Хантэр і Рычард Джойс — ягоныя слугі і землякі,— вось і ўсе, хто застаўся верны свайму абавязку. З прыпасамі, якіх хопіць сама болей на дзесяць дзён, яны высадзіліся сёння на бераг і ўзнялі брытанскі сцяг над блакгаузам на Востраве Скарбаў. Томас Рэдрут, слуга і зямляк уладальніка шхуны, забіты мяцежнікамі. Джэймс Хоўкінс, юнга...»

Тут я задумаўся над лёсам беднага Джыма.

І раптам у лесе пачуўся чыйсьці крык.

— Нас нехта кліча,— сказаў Хантэр, які стаяў на варце.

— Доктар! Сквайр! Капітан! Эй, Хантэр, гэта ты? — пачулі мы зноў.

Я кінуўся да дзвярэй і ўбачыў Джыма Хоўкінса, які пералазіў цераз частакол. Было відаць, што нічога благога з ім не здарылася.

РАЗДЗЕЛ XIX

Зноў апавядае Джым Хоўкінс

Гарнізон у блакгаузе

Як толькі Бэн Ган убачыў брытанскі сцяг, ён спыніўся, схапіў мяне за руку і сеў.

— Ну,— сказаў ён,— там няйначай твае сябры.





— Не, я думаю, што там мяцежнікі,— сказаў я.

— Не! — усклікнуў ён.— На гэтым востраве, дзе нікога не бывае, апроч джэнтльменаў удачы, Сільвер падняў бы «Вясёлага Роджэра»[1], можаш мне паверыць. Не, гэта твае сябры. Мабыць, была бойка і яны адолелі Сільвераву кампанію. І цяпер яны тут, за гэтым старым частаколам. Яго паставіў некалі Флінт. Шмат гадоў таму. Эх, што за галава быў гэты Флінт! Толькі ром і мог яго зваліць. Нікога ён не баяўся, аднаго Сільвера. Сільвера ён пабойваўся.

— Ну што ж,— сказаў я,— раз за частаколам свае, трэба ісці туды.

— Чакай, хлопец,— спыніў мяне Бэн.— Не спяшай. Ты, здаецца, слаўны хлапчук, але ўсё ж толькі хлапчук. А Бэн Ган хітруга. Ніякай выпіўкай мяне туды не зацягнеш, за твой частакол, ніякай... Я павінен сам убачыць твайго сапраўднага джэнтльмена, і няхай ён дасць мне слова гонару. А ты не забудзь, што я табе сказаў: толькі — так і перадай яму — толькі пры асабістым знаёмстве магчымы давер. І ўшчыкні яго за руку.

І ён трэці раз ушчыкнуў мяне з тым самым шматзначным выглядам.

— А калі Бэн Ган вам спатрэбіцца, ты ведаеш, дзе яго можна знайсці. Там, дзе ты знайшоў яго сёння. І той, хто прыйдзе па яго, павінен трымаць у руцэ што-небудзь белае. І няхай ён прыйдзе адзін. Ты ім так і скажы: «У Бэна Гана ёсць на тое прычыны». Так і скажы.

— Добра,— сказаў я.— Здаецца, я вас зразумеў. Вы хочаце нешта прапанаваць, і вам трэба ўбачыцца са сквайрам ці доктарам. А знайсці вас можна будзе там, дзе і сёння. Гэта ўсё?

— А калі мяне можна знайсці тут?..— пагля-

---

[1] «Вясёлы Роджэр» — пірацкі сцяг з выявай чалавечага чэрапа.



дзеў ён мне ў вочы.— Скажы ім, што я прымаю з апоўдня да шасці склянак.

— Я ўсё зразумеў,— сказаў я.— Магу я ісці?

— А ты не забудзешся? — спытаўся ён трывожна.— Скажы яму, што толькі пры асабістым знаёмстве і што на тое ёсць свае прычыны. Свае прычыны, вось галоўнае. Я пагавару з ім як мужчына з мужчынам. А зараз можаш ісці, Джым.— Ён усё яшчэ трымаў мяне за руку.— Паслухай, Джым, а калі ты ўбачыш Сільвера, ты не прадасі яму Бэна Гана? Нават калі цябе прывяжуць да хваста дзікага каня? Дай слова, што не. А калі ўранку піратаў паменее, што ты пра гэта скажаш?..

Тут яго перапыніў грукат гарматнага стрэлу. Ядро пранеслася паміж дрэвамі і ўпала на пясок за сотню ярдаў ад нас. Мы кінуліся ў розныя бакі.

З гадзіну стралялі піраты па форце. Ядры пралятаді па лесе, вынішчаючы ўсё на сваім шляху. Я хаваўся то тут, то там, і ўсюды мне здавалася, што ядро ляціць якраз на мяне. Але ў канцы абстрэлу я ўзяў сябе ў рукі, хоць і не рашаўся яшчэ падысці да частаколу, ля якога ядры падалі найчасцей. Рухаючыся ў абход, я дабраўся нарэшце да дрэў, што раслі ля самага берага.

Сонца толькі што села, у лесе свістаў марскі брыз, ад якога шэрая паверхня бухты пакрывалася рабаціннем. Адліў агаліў шырокую пясчаную водмель. Пасля дзённае спякоты стала так халадна, што я, у сваім лёгкім камзоле, стаў нават дрыжаць.

«Іспаньёла» ўсё яшчэ стаяла на якары. Высока над ёю быў бачны «Вясёлы Роджэр». Над бортам бліснула чырвоная ўспышка, і гулкае рэха апошні раз разнесла па востраве грукат гарматнага стрэлу. Кананада скончылася.

І тут адразу ж з'явіліся піраты. Я ляжаў у кустах і назіраў за імі. На беразе, якраз насупраць частаколу, некалькі чалавек секлі нешта



сякерамі. Потым я даведаўся, што гэта быў наш ялік. Удалечыні, ля вусця рэчкі, палала ў лесе вялікае вогнішча. Паміж ім і караблём бесперапынна сноўдала шлюпка. Матросы, такія змрочныя ўранку, цяпер, вяслуючы, крычалі і смяяліся, як дзеці. Я здагадаўся па іхніх галасах, што яны напіліся рому.

Нарэшце я рашыўся накіравацца да частаколу. Я быў досыць далёка ад яго, на нізкай пясчанай касе, якая замыкала нашую бухту з усходу і даходзіла пры адліве да самага Вострава Шкілета. Узняўшыся, я ўбачыў далей на касе сярод нізкага кустоўя адзінокую, даволі высокую скалу дзіўнага белаватага колеру. Мне прыйшло ў галаву, што гэта і ёсць тая самая белая скала, пра якую казаў Бэн Ган, і што калі мне спатрэбіцца лодка, я буду ведаць, дзе яе знайсці.

Я ішоў па ўзлеску, пакуль не ўбачыў перад сабою задні, самы далёкі ад мора край частаколу. Неўзабаве мае сябры з радасцю абдымалі мяне.

Распавёўшы ім пра свае прыгоды, я агледзеўся. Блакгауз быў пабудаваны з неабчасаных сасновых бярвенняў — і сцены, і дах, і падлога, якая ў некаторых мясцінах на фут-паўтара ўзвышалася над пяском. Ля ўвахода меўся ганак, пад якім журчаў ручаёк. Вада сцякала ў вельмі арыгінальны штучны басейн: велізарны карабельны чыгунны кацёл з выбітым днішчам, закапаны ў пясок, як казаў капітан, па самую ватэрлінію.

Ніякіх рэчаў у форце не было, адно што ў куце ляжала каменная пліта для ачага з жалезнымі кратамі ў форме каша над ёю, усталяванымі, каб не даць агню выйсці за межы пліты.

Усе дрэвы на схонах пагорка, на якім стаяў форт, былі ссечаны, пэўна, на пабудову. Мяркуючы па пнях, тут загінуў адмысловы гай. Верхні слой глебы пасля знішчэння дрэў быў змыты і знесены дажджамі, усюды быў голы пясок. Толькі там, дзе выцякаў з катла ручаёк, раслі мох, па-





парацьі нізкае кустоўе. Непадалёк ад частаколу пачынаўся густы і высокі лес. Залішне блізка, сказалі мне, каб далей, дык лягчэй было б абараняцца. З боку сушы лес быў чыста сасновы, а спераду, з боку праліву, расло яшчэ багата вечназялёных дубоў.

Халодны вячэрні брыз, пра які я ўжо казаў, дзьмуў ва ўсе шчыліны груба складзенага зруба, пасыпаючы падлогу дробным пяском. Пясок трапляў нам у вочы, хрумсцеў на зубах, ён быў усюды — і ў паветры, і ў ежы, і ў вадзе. Дым — мы варылі крупяную кашу — выходзіў праз квадратную адтуліну ў даху і, перш чым знайсці сабе дарогу да выхада, распаўзаўся па ўсёй пабудове — мы бесперапынна кашлялі, слязіліся вочы.

Грэй, наш новы таварыш, сядзеў з перавязаным тварам — мяцежнікі, калі ён вырываўся ад іх, парэзалі яму шчаку. А стары Том Рэдрут, усё яшчэ не пахаваны, ляжаў, скарчанелы, ля сцяны, накрыты сцягам.


Калі б мы сядзелі склаўшы рукі, то хутка б нас апанавала роспач. Але капітан Смолет знайшоў справу кожнаму. Ён раздзяліў нас на дзве вахты. У адну трапілі доктар, Грэй і я, у другую — сквайр, Хантэр і Джойс. Мы вельмі стаміліся за дзень, але капітан паслаў дваіх у лес па дровы, а дваім загадаў капаць магілу Рэдруту. Доктар стаў кухарам, я стаяў ля дзвярэй на варце, а сам капітан памагаў усім і ўсіх падбадзёрваў.

Раз-пораз доктар падыходзіў да дзвярэй падыхаць паветрам і даць адпачыць пачырванелым ад дыму вачам і перакідваўся са мною двума-трыма словамі.

— Гэты Смолет,— сказаў ён мне,— нашмат лепшы за мяне. Калі я ўжо гэта прызнаў, Джым, значыцца, так яно і ёсць.

Другі раз ён спачатку памаўчаў, потым павяр-





нуў галаву і, уважліва паглядзеўшы мне ў вочы, спытаўся:

— Гэтаму Бэну Гану можна верыць?

— Не ведаю, сэр,— адказаў я.— Я не зусім упэўнены, што ён не хворы на галаву.

— Думаю, што хоць трохі ды хворы. Калі чалавек тры гады грыз пазногці на бязлюдным востраве, дык галава ў яго не можа застацца такая ж здаровая, як у цябе ці ў мяне. Такая ўжо ў чалавека натура — яму трэба быць з людзьмі. Дык кажаш, ён марыць пакаштаваць сыру?

— Так, сэр.

— Добра, Джым,— сказаў ён.— Паглядзі, як карысна быць ласуном. Ты, напэўна, бачыў маю табакерку? Але ж ты ні разу не бачыў, каб я нюхаў з яе тытунь. Дык вось, у ёй не тытунь, а кавалачак пармязану, сапраўднага італьянскага сыру. Вось мы і аддадзім яго Бэну Гану!

Перад вячэраю мы пахавалі старога Тома ў пяску, потым пастаялі трохі з непакрытымі галовамі на ветры.

Дроў з лесу нацягалі груду, аднак капітан застаўся незадаволены.

— Заўтра вы ў мяне папрацуеце як след,— сказаў ён, круцячы галавою.

Павячэраўшы вэнджанай свінінаю і выпіўшы па шклянцы гарачага грогу, капітан, сквайр і доктар адышліся ўбок абмеркаваць нашае становішча.

Але, відаць, нічога добрага ім у галаву не прыйшло. Правізіі ў нас было так мала, што мы павінны былі непазбежна памерці з голаду задоўга да прыбыцця дапамогі. Нам заставалася адно: забіць як мага больш піратаў, пакуль яны не спусцяць свой сцяг ці пакуль не выйдуць на «Іспаньёле» ў мора. З дзевятнаццаці іх ужо засталося пятнаццаць, прычым двое раненыя, а адзін, падстрэлены ля гарматы, калі не памёр, то прынамсі цяжка паранены. Кожны





раз, калі нам выпадзе магчымасць стрэліць у іх, мы павінны страляць, ратуючы ўласнае жыццё. Трэба быць вельмі пільнымі і памятаць: у нас ёсць два саюзнікі — ром і клімат.

Ром ужо рабіў сваю справу: паміж намі і піратамі было прыкладна паўмілі, але мы да позняе ночы чулі іхнія песні і крыкі. А доктар кляўся сваім парыком, што неўзабаве скажа сваё слова і клімат: піраты размясціліся непадалёк ад балота, лекаў не мелі ніякіх, і праз тыдзень палову з іх будзе трэсці ліхаманка.

— Так што,— сказаў доктар,— калі ім не ўдасца хутка расправіцца з намі, яны будуць рады вярнуцца на шхуну. У іх ёсць карабель, і яны, мяркую, зноў змогуць заняцца марскім разбоем.

— Гэта першы карабель, які мне прыйшлося страціць,— сказаў капітан Смолет.

Я страшэнна стаміўся. Доўга круціўся ў ложку, пакуль удалося заснуць, але потым спаў як забіты.

Усе ўжо даўно ўсталі, паснедалі і нацягалі багата дроў, калі я прачнуўся, разбуджаны гвалтам і крыкамі.

— Белы сцяг! — пачуў я.

І адразу ж нехта здзіўлена ўскрыкнуў:

— Сам Сільвер!


Я ўскочыў, працёр вочы і кінуўся да байніцы.

РАЗДЗЕЛ XX

Сільвер — парламенцёр

Сапраўды, да частаколу падышлі два чалавекі. Адзін з іх размахваў шматком белае тканіны, а другі — сам Сільвер — стаяў побач, захоўваючы поўны спакой.





Было яшчэ вельмі рана. Не памятаю ў сваім жыцці халаднейшае раніцы. Холад працінаў мяне да касцей. Неба было яснае, ззяла сонца, вершаліны дрэваў ружавелі ў ягоных промнях. Але ўнізе, там, дзе стаяў Сільвер са сваім спадарожнікам, быў густы цень. Каля іхніх ног клубіўся белы туман — начныя выпарэнні балота. Адразу ж згадалася прароцтва доктара Ліўсі: гэты балоцісты востраў з ягонымі начнымі халадамі і туманамі быў сапраўдным рассаднікам малярыі.

— Усе на свае месцы! — загадаў капітан.— Іду ў заклад, што гэта нейкія хітрыкі.— Затым ён крыкнуў піратам: — Хто ідзе? Стой, ці будзем страляць!

— Белы сцяг! — крыкнуў Сільвер.

Капітан выйшаў на ганак і стаў за прыкрыццём: ад гэтых людзей можна было ў любы момант чакаць подлага стрэлу. Азірнуўшыся, ён загадаў нам:

— Вахта доктара — да байніц! Вы, Ліўсі, займіце паўночны бок, Джым — усходні, Грэй — заходні. Другой вахце — зараджаць мушкеты. Барзджэй! І будзьце пільныя.

Потым ён зноў звярнуўся да мяцежнікаў:

— Чаго вы хочаце ад нас з вашым белым сцягам?

Гэтым разам адказаў не Сільвер, а ягоны спадарожнік:

— Капітан Сільвер, сэр, хоча падняцца да вас на борт, каб заключыць з вамі дамову! — крыкнуў ён.

— Капітан Сільвер? — спытаўся капітан.— Я такога не ведаю. Хто гэта?


Мы чулі, як ён дадаў напаўголаса:


— Ужо капітан? Хуткае павышэнне!

Цыбаты Джон адказаў сам:

— Гэта я, сэр. Каманда выбрала мяне капітанам пасля вашага дэзерцірства, сэр.— Ён зрабіў націск на слове «дэзерцірства».— Мы гатовыя







падпарадкавацца вам, але, вядома, на пэўных умовах, якія трэба абмеркаваць. А пакуль што, капітан Смолет, дайце мне слова гонару, што адпусціце мяне адсюль жывым і не пачняце страляць, перш чым я адыду ад частаколу.


— Сільвер,— адказаў капітан,— у мяне няма ніякага жадання размаўляць з вамі. Але калі вам так хочацца пагаварыць са мною, можаце ісці сюды. Аднак калі вы задумалі нейкую подласць, то не крыўдуйце на мяне.

— Досыць, капітан,— весела ўсклікнуў Цыбаты Джон.— Хопіць аднаго вашага слова. Я ведаю, што вы джэнтльмен і што на вашае слова можна паспадзявацца.

Мы бачылі, як чалавек з белым сцягам намагаўся ўтрымаць Сільвера. Нічога дзіўнага: капітан гаварыў не дужа ласкава. Але Сільвер адно засмяяўся ў адказ і ляпнуў яго па плячы, даючы знаць сваім выглядам, што думка пра небяспеку смешная яму. Ён падышоў да частаколу, спачатку перакінуў цераз яго сваю мыліцу, а потым вельмі хутка і спрытна пералез сам.

Мушу прызнацца: мяне так захапіла гэтая гутарка, што я забыўся на свае абавязкі вартавога. Я нават пакінуў свой пост і стаяў за капітанам, які сядзеў на ганку, паклаўшы локці на калені і ўпёршыся кулакамі ў падбароддзе, і глядзеў у стары чыгунны кацёл, спакойна насвістваючы «За мною, юнакі й дзяўчаты!».

Сільверу было страшэнна цяжка ўзбірацца па адхоне пагорка. На строме, сярод сыпучага пяску і шырокіх пнёў, ён са сваёй мыліцаю быў бездапаможны, як карабель на водмелі. Але ён цярпліва, моўчкі адолеў нялёгкі шлях, спыніўся перад капітанам і аддаў яму чэсць з найвялікшай вытанчанасцю. На ім быў ягоны лепшы касцюм: доўгі, да каленяў, сіні каптан з мноствам



медных гузікаў і ссунуты на патыліцу капялюш, абшыты тонкімі карункамі.

— Ну вось вы і тут, Сільвер,— сказаў капітан, узняўшы галаву.— Сядайце.

— Зрабіце ласку, пусціце мяне ў дом,— жаласліва папрасіў Цыбаты Джон.— Не дужа прыемна сядзець такім халодным ранкам на пяску.

— Калі б вы былі сумленным чалавекам, то сядзелі б цяпер у сваім камбузе. Самі вінаваты. Альбо вы мой кок — і тады заслугоўваеце годнага абыходжання, альбо вы капітан Сільвер, мяцежнік і пірат — і тады вас чакае хіба што шыбеніца.


— Досыць, капітан,— сказаў кухар, сядаючы на пясок.— Толькі потым вам прыйдзецца падаць мне руку, каб я мог падняцца... А вы тут, гляджу, няблага ўладкаваліся!.. А, тут і Джым! Добрай раніцы, Джым... Маё шанаванне, доктар! Ды вы тут усе ў зборы, нібыта шчаслівае сямейства, так сказаць...

— Калі ў вас ёсць што сказаць мне, Сільвер, кажыце,— перапыніў яго капітан.

— Слушна, капітан Смолет,— адказаў Сільвер.— Справа ёсць справа. Дык вось: добры манеўр зрабілі вы сёння ўначы, нічога не скажаш. Нехта з вас умее карыстацца гандшпугам[1]. Сёйтой з маіх хлопцаў быў проста ў шоку. Ды не сёйтой, а ўсе. І я сам, шчыра кажучы. Можа, толькі таму і прыйшоў сюды на перамовы. Але, капітан, вам не ўдасца паўтарыць гэта, клянуся ўдачаю! Мы выставім вартавых усюды і будзем менш выдаваць рому. Вы, мабыць, думаеце, што мы ўсе былі п'яныя як цапы? Я дык зусім быў цвярозы, адно стаміўся як сабака. Калі б я прач-

---

[1] Гандшпуг — драўляны ці металічны рычаг для пад'ёму і перасоўвання грузу на караблі.



нуўся на секунду раней, я б вас заспеў на месцы. Ён яшчэ быў жывы, калі я падбег да яго.

— Што далей? — як мага спакойней прамовіў капітан.

Усё, што казаў Сільвер, было для капітана загадкаю, але ён нічым сябе не выдаў. А я ўжо сёе-тое зразумеў. Мне прыйшлі на памяць апошнія словы Бэна Гана: «А калі ўранку піратаў паменее, што ты пра гэта скажаш?..» Напэўна, ён прабраўся ўначы ў пірацкі лагер, калі яны п'яныя валяліся ля агню. Я з радасцю падумаў, што цяпер у жывых засталося толькі чатырнаццаць нашыў ворагаў.

— Вось у чым справа,— сказаў Сільвер.— Мы хочам знайсці скарбы, і мы іх знойдзем. А вы, вядома, хочаце застацца жывыя. Карта ў вас, ці ж не так?

— Мажліва,— адказаў капітан.

— Я пэўна ведаю, што яна ў вас ёсць,— працягваў Цыбаты Джон.— І я не раіў бы вам так холадна гаварыць з чалавекам, гэта не прынясе вам ніякай карысці... Нам патрэбна вашая карта, вось і ўсё. А вам асабіста я зла не жадаю...

— Не трэба, Сільвер,— перапыніў яго капітан,— расказваць мне байкі. Мы дакладна ведаем, што вы збіраліся зрабіць. Але нас гэта мала турбуе — не выйдзе ў вас тое, што вы задумалі.

Капітан спакойна зірнуў на яго і стаў набіваць сваю люльку.

— Калі б Эйб Грэй...— пачаў быў Сільвер.

— Стоп! — закрычаў містэр Смолет.— Грэй нічога мне не казаў, і я ні аб чым яго не распытваў. Скажу болей: я з вялікім задавальненнем узарваў бы і вас, і яго, і ўвесь гэты пракляты востраў! Вось і ўсё, што я думаю пра вас і ўсю вашую хеўру.

Гэтая ўспышка, відаць, супакоіла Сільвера. Ён пачаў ужо быў злавацца, але стрымаўся.



— Як хочаце,— сказаў ён,— так і думайце, я вам тут замінаць не стану... Вы, здаецца, збіраецеся закурыць люльку, капітан. І я, з вашага дазволу, зраблю тое ж самае.

Ён набіў тытунём сваю люльку і закурыў. Яны доўга моўчкі сядзелі, то зазіраючы адзін аднаму ў твар, то зацягваючыся, то нагінаючыся ўперад, каб сплюнуць. Цікавае было відовішча, усё роўна як у тэатры.

— Дык вось,— пачаў нарэшце Сільвер,— нашы ўмовы: вы даяце нам карту, каб мы маглі знайсці скарбы, вы перастаяце падстрэльваць нявшчасных маракоў і раскавельваць ім галовы, калі яны спяць. Калі вы згаджаецеся, мы прапануем вам выбар. Пагрузіўшы скарбы, мы дазваляем вам вярнуцца на карабель, і я даю вам слова гонару, прысягаю, што мы высадзім вас дзе-небудзь на бераг. Калі вас гэта не задавальняе, бо многія мае матросы даўно точаць на вас зубы, можаце заставацца на востраве. Правізію мы падзелім з вамі, кожнаму чалавеку сваю долю, і я зноў прысягаю, што пашлю па вас першы стрэчны карабель. Усё не так ужо і блага. Лепшага вам не дамагчыся. Спадзяюся,— узвысіў ён голас,— усе вашы людзі чуюць, што я сказаў, бо сказанае аднаму — сказана ўсім.

Капітан Смолет узняўся і вытрас попел з люлькі ў далонь левай рукі.

— Усё? — спытаўся ён.

— Гэта маё апошняе слова, клянуся ўдачаю! — адказаў Джон.— Калі вы адмовіцеся, замест мяне загавораць нашы мушкеты.

— Выдатна,— сказаў капітан.— А зараз паслухайце мяне. Калі вы ўсе прыйдзеце сюды абяззброеныя па адным, я бяруся закаваць вас у кайданы, даставіць у Англію і перадаць справядліваму суду. Калі вы гэтага не зробіце, дык памятайце, што завуць мяне Аляксандр Смолет, што я стаю пад гэтым сцягам і што я ўсіх вас



адпраўлю на той свет. Скарбаў вам не знайсці. Адплыць адсюль на караблі вам не ўдасца: ніхто з вас не ўмее кіраваць караблём. Справіцца з намі вы таксама не зможаце: супраць аднаго Грэя было пяцёра вашых, і ён выслізнуў з іхніх рук. Ваш экіпаж на водмелі, капітан Сільвер, і вы не хутка сыдзеце з яе. Гэта апошняе добрае слова, якое вы чуеце ад мяне. Бог сведка, пры наступнай сустрэчы я ўсаджу вам у спіну кулю. А зараз прэч адсюль! Прэч! Паспяшайце, калі ласка.

Вочы ў Сільвера загарэліся. Ён вытрас попел са сваёй люлькі.

— Дайце мне руку, каб я мог падняцца! — крыкнуў ён.

— Не дам,— сказаў капітан.

— Хто дасць мне руку? — прароў Сільвер.

Ніхто з нас не паварушыўся. Брыдка лаючыся, Сільвер прапоўз да ганка, ухапіўся за яго і толькі тады змог падняцца. Ён адразу ж плюнуў у крыніцу.

— Вось што вы мне! — крыкнуў ён.— Адзін плявок! Праз гадзіну я падагрэю ваш стары блакгауз, як бочку рому. Смейцеся, смейцеся — прысягаю сваёй мазгаўнёю, праз гадзіну вы паіншаму засмеяцеся. Тыя з вас, хто застануцца жывыя, пазайздросцяць мёртвым!

І, зноў вылаяўшыся, ён зачыкільгаў па пяску. Разоў, можа, пяць спрабаваў ён пералезці цераз частакол — і падаў. Нарэшце яго перацягнуў матрос з белым сцягам, і яны ўмомант зніклі ў лесе.



РАЗДЗЕЛ XXI

Атака

Як толькі Сільвер знік, капітан, які ўвесь час не спускаў з яго вачэй, азірнуўся і заўважыў, што на пасту стаіць толькі адзін Грэй. Мы ўпершыню ўбачылі яго раз'юшаным.

— На месцы! — крыкнуў ён.

Мы кінуліся да байніц.

— Грэй,— сказаў ён,— я занясу тваё імя ў судавы журнал: ты выконваў свой абавязак, як сапраўдны марак... Містэр Трэлані, вы мяне здзівілі, сэр!.. А вы ж, доктар, насілі ваенны мундзір! Калі вы так служылі пры Фантэнуа, сэр, дык лепей бы вы не пакідалі свайго дома.


Доктарава вахта ўжо заняла сваё месца каля байніц, а сквайрава зараджала мушкеты. Усе мы пачырванелі — было сорамна.


— Сябры,— сказаў ён,— я сустрэў Сільвера залпам гармат усяго борта. Наўмысна раз'юшыў яго. Ён сказаў, што не пройдзе і гадзіны, як яны атакуюць нас. Іх болей, і гэта істотна, затое мы ў крэпасці, і хвіліну назад я мог бы сказаць, што ў нас добрая дысцыпліна. Не сумняваюся, што мы можам перамагчы іх, калі вы гэтага захочаце.

Потым ён абышоў усіх нас і сказаў, што цяпер усё ў парадку.

У дзвюх вузкіх сценах блакгауза — усходняй і заходняй — было толькі па дзве байніцы. А ў паўночнай — пяць. У нас было дваццаць мушкетаў на семярых. Мы склалі дровы ў чатыры штабелі, пасярэдзіне кожнае сцяны. Зладзілі, так бы мовіць, сталы. На кожным з іх пад рукою ў нас ляжалі, побач з боепрыпасамі і корцікамі, па чатыры зараджаныя мушкеты.

— Тушыце агонь,— сказаў капітан.— Дым есць вочы, а ўжо зусім не холадна.





Містэр Трэлані вынес з блакгауза жалезныя краты ачага і раскідаў вуголле на пяску.

— Хоўкінс яшчэ не снедаў... Джым, бяры свой сняданак і еш на пасту,— працягваў капітан Смолет.— Варушыся, хлопец, а то застанешся галодны. А ты, Хантэр, раздай усім грог.

Неўзабаве, падумаўшы, капітан расказаў нам свой план абароны.

— Доктар,— пачаў ён,— займіце пазіцыю ля дзвярэй. Будзьце ўважлівыя, але не выстаўляйцеся дужа ўперад. Стойце ў блакгаузе і страляйце адсюль... Хантэр, бяры ўсходнюю сцяну... А ты, Джойс,— заходнюю... Містэр Трэлані, вы лепшы стралок,— бярыце разам з Грэем паўночную, самую доўгую, з пяццю байніцамі. Гэта самы небяспечны бок. Калі ім удасца дабегчы да яго і яны пачнуць страляць у нас праз байніцы, справы нашы будуць дрэнныя... А мы з табою, Хоўкінс, стралкі няважныя, так што будзем зараджаць мушкеты і дапамагаць усім.

Ледзь толькі сонца ўзнялося над вершалінамі дрэў, стала цёпла і туман знік. Неўзабаве запякло так, што пясок гарэў пад нагамі, а на бярвеннях блакгауза выступіла растопленая смала. Мы скінулі камзолы, расшпілілі каўняры кашуль і закасалі рукавы. Кожны стаяў на сваім пасту, чакаючы нападу. Спякота рабілася бязлітасная.

Так прайшла гадзіна.

— Чорт! — сказаў капітан.— Так можна і замаркоціцца. Грэй, засвісці якую-небудзь песню.

Джойс першы адчуў, што атака пачнецца зараз.

— Дазвольце спытацца, сэр,— звярнуўся ён да капітана, нічым не выдаючы свайго хвалявання. — Калі я ўбачу каго-небудзь, я павінен страляць?

— Вядома! — крыкнуў капітан.

— Дзякуй, сэр,— адказаў Джойс усё гэтак жа спакойна.





Мы не прыкмецілі ніякае небяспекі, аднак пасля пытання Джойса насцеражыліся. Стралкі трымалі мушкеты напагатове, а капітан стаяў пасярэдзіне блакгауза, сціснуўшы вусны і нахмурыўшыся.

Прайшло некалькі секунд. Раптам Джойс прасунуў мушкет у байніцу і стрэліў. Не паспеў яшчэ гук яго стрэлу заціхнуць, як нас сталі абстрэльваць з усіх бакоў, залп за залпам. Некалькі куль трапіла ў блакгауз, але ўсярэдзіну не заляцела ніводная, і калі дым рассеяўся, у лесе зноў запала цішыня. Не зварухнулася ніводная галінка, не бліснула ніводнае дула — ворагі нічым не выдавалі сваю прысутнасць.

— Трапіў ты ў каго-небудзь? — спытаўся капітан.

— Не, сэр,— адказаў Джойс.— Здаецца, што не.


— Добра й тое, што праўду кажаш,— прабурчаў капітан.— Зарадзі ягоную стрэльбу, Хоўкінс... Як вам здаецца, доктар, колькі стрэлаў было на вашым баку?

— Магу адказаць дакладна,— сказаў доктар,— тры. Я бачыў тры ўспышкі — дзве побач і адну бліжэй да захаду.

— А колькі на вашым баку, містэр Трэлані? — спытаўся капітан.

Сквайру было цяжка адказаць: з паўночнага боку стралялі найбольш. Сквайр запэўніваў, што ўсяго было сем стрэлаў, а Грэй — што восем ці дзевяць. З усходу і захаду стрэлілі толькі па адным разе. Было відавочна, што напад рыхтаваўся з поўначы, а з іншых бакоў стралялі, каб адцягнуць нашую ўвагу. І ўсё ж капітан не адмяніў аддадзеных раней загадаў.

— Калі ім удасца пералезці цераз частакол,— сказаў ён,— яны могуць захапіць любую непрыкметную байніцу і перастраляць нас усіх, як пацукоў, ва ўласнай крэпасці.



Але часу для роздуму ў нас ужо не было. Раптам з паўночнага боку пачуўся гучны крык, і невялікі атрад піратаў, выскачыўшы з лесу, кінуўся да частаколу. У тое ж імгненне нас зноў пачалі абстрэльваць з усіх бакоў. У адчыненыя дзверы ўляцела куля і раскрышыла ў шчэпкі доктараў мушкет.

Нападнікі лезлі цераз частакол, што тыя малпы. Сквайр і Грэй адкрылі агонь. Трое піратаў зваліліся — адзін на тэрыторыі форта, двое за частакол. Праўда, адзін з іх, напэўна, толькі спалохаўся, а не быў паранены, бо адразу ж ускочыў і знік у лесе.

Двое ляжалі на зямлі, адзін уцёк, чатыром удалося пералезці цераз частакол. Сем ці восем астатніх — у кожнага з іх было, напэўна, па некалькі мушкетаў — няспынна стралялі з лесу, але марна — усе кулі траплялі ў сцены блакгауза.

Тыя чацвёра, што пералезлі цераз частакол, беглі з крыкамі да блакгауза. Тыя, што заселі ў лесе, таксама крычалі, падбадзёрваючы таварышаў. Нашы стралкі стралялі бесперастанку, але так спяшаліся, што ні ў кога не трапілі. Піраты ўмомант узабраліся на пагорак і напалі на нас.

У сярэдняй байніцы з'явілася галава Джоба Эндэрсана, боцмана.

— Бі іх! Бі іх! — зароў ён.

У тое ж імгненне другі пірат, схапіўшы за дула Хантэраў мушкет, вырваў яго, прасунуў у байніцу і ўдарыў Хантэра прыкладам з такой сілаю, што нябога грымнуўся ў непрытомнасці на падлогу. Тым часам трэці, абагнуўшы блакгауз, нечакана з'явіўся ў дзвярах і кінуўся з корцікам на доктара.

Мы апынуліся ў становішчы, у якім яшчэ некалькі імгненняў назад знаходзіліся нападнікі. Толькі што мы стралялі з блакгауза ў нічым не прыкрытых ворагаў, а цяпер самі былі безабарон-





ныя перад корцікамі піратаў. Блакгауз зацягнула парахавым дымам, і менавіта дзякуючы гэтаму мы засталіся жывыя. У вушах у мяне гудзела ад крыкаў, стогнаў і пісталетных стрэлаў.

— На вылазку, уперад, урукапашную! Корцікі! — закрычаў капітан.

Я схапіў са штабеля корцік. Нехта іншы, таксама хапаючы корцік, разануў мяне ім па суставах пальцаў, але я нават не адчуў болю. Я кінуўся ў дзверы, на сонечнае святло. Нехта іншы выскачыў услед за мною. Акурат перада мною доктар гнаў уніз па адхоне пірата. Я ўбачыў, як доктар адным ударам выбіў з яго рук корцік і паласнуў сваім пірата па твары.


— Вакол зруба, хлопцы, вакол зруба! — закрычаў капітан.

Нягледзячы на ўвесь гармідар, я адчуў перамену ў яго голасе.

Падпарадкоўваючыся машынальна загаду, я збочыў на ўсход, з узнятым корцікам абагнуў рог блакгауза і апынуўся сам-насам з Эндэрсанам. Ён зароў і занёс свой корцік над маёй галавою. Усё здарылася ўмомант: цясак бліснуў на сонцы, я, не паспеўшы нават адчуць страх, ухіліўся ад удару, заграз нагою ў мяккім пяску і, не утрымаўшы раўнавагу, пакаціўся ўніз па адхоне.

Калі я выскокваў з дзвярэй, іншыя піраты ўжо лезлі цераз частакол, каб пакончыць з намі. Адзін з іх, у чырвоным начным каўпаку, трымаючы корцік у зубах, ужо закідваў ногі, збіраючыся скочыць уніз. Я так хутка скаціўся па адхоне, што, калі я ўзняўся на ногі, пірат у чырвоным каўпаку ўсё яшчэ быў на частаколе, толькі побач з ім высунулася галава другога. І ўсё ж за гэты кароткі час усё вырашылася — мы перамаглі.

Грэй паклаў на месцы бамбізу-боцмана, калі той замахваўся на яго корцікам. Другі пірат быў застрэлены ў той момант, калі ён сам збіраўся стрэліць у байніцу. Ён скурчыўся на пяску ў пе-



радсмяротнай агоніі, у руках у яго дыміўся пісталет. Трэцяга закалоў доктар. З чатырох піратаў, якія пералезлі цераз частакол, у жывых застаўся толькі адзін. Кінуўшы свой корцік на зямлю, ён, ахоплены жахам блізкае смерці, караскаўся на частакол.

— Страляйце! Страляйце з блакгауза! — крычаў доктар.— А вы, хлопцы, назад у блакгауз!

Але марна крычаў ён: ніхто не стрэліў. Апошні нападнік пералез цераз частакол і знік разам з усімі ў лесе. Піраты страцілі пяць чалавек; чацвёра ляжалі на тэрыторыі форта, адзін за частаколам.

Доктар, Грэй і я кінуліся ў дзверы: піраты вось-вось маглі зноў адкрыць агонь.

Парахавы дым рассеяўся, і мы ўбачылі, якой цаною здабылі перамогу: Хантэр, непрытомны, ляжаў ля сваёй байніцы, Джойс, з прастрэленай галавою, застыў назаўжды, сквайр падтрымліваў капітана, абодва былі жудасна бледныя.

— Капітан ранены,— сказаў містэр Трэлані.


— Усе ўцяклі? — спытаўся капітан.

— Усе, хто мог,— адказаў доктар.— Але пяцярым ужо не бегаць ніколі!

— Пяцярым! — ускрыкнуў капітан.— Не так ужо і блага. У іх выбылі са строю пяцёра, у нас толькі трое. Цяпер нас чацвёра супраць дзевяці. Гэта лепш, чым было напачатку: сямёра супраць дзевятнаццаці[1].

---


[1] У жывых засталося толькі восем мяцежнікаў, бо чалавек, падстрэлены містэрам Трэлані на борце шхуны, памёр у той самы вечар. Але, натуральна, мы даведаліся пра гэта нашмат пазней. (Дж. Хоўкінс.)



ЧАСТКА ПЯТАЯ



МАЕ ПРЫГОДЫ НА МОРЫ




РАЗДЗЕЛ XXII

Як пачаліся мае прыгоды на моры

Мяцежнікі больш не атакавалі нас. Ніхто з іх нават не стрэліў з лесу. «Яны атрымалі свой паёк на сёння»,— сказаў капітан. Мы маглі спакойна перавязаць раненых і гатаваць абед. Кухарылі сквайр і я. Нягледзячы на небяспеку, мы шчыравалі на дварэ, але і там чулі жудасныя стогны доктаравых пацыентаў.

Раненых было трое: пірат, падстрэлены ля байніцы, Хантэр і капітан. Стан двух першых быў безнадзейны. Пірат неўзабаве памёр у час аперацыі, а Хантэр, нягледзячы на ўсе нашы намаганні, так і не апрытомнеў. Увесь дзень ён цяжка дыхаў, як Білі Бонс пасля сардэчнага ўдару. У нябогі былі зламаны рэбры, разбіты, пры падзенні, чэрап, і ўначы ён ціха, у непрытомнасці, памёр.

Капітан пакутаваў ад ран, але жыццё ягонае было ў бяспецы. Ніводны орган не быў моцна пашкоджаны. Эндэрсанава куля — першы стрэліў у містэра Смолета боцман — прабіла яму лапатку і закранула лёгкае. Другая куля трапіла ў лытку і пашкодзіла звязкі. Доктар запэўніваў, што капітан неадменна паправіцца, але на працягу некалькіх тыдняў яму нельга хадзіць, варушыць рукою і шмат гаварыць.



Выпадковы парэз на маім пальцы быў дробязны. Доктар Ліўсі заляпіў яго пластырам і ласкава тузануў мяне за вуха.

Пасля абеду сквайр і доктар селі каля капітана і сталі раіцца, як трымацца далей. Калі яны ўсё абмеркавалі, неўзабаве пасля поўдня доктар узяў капялюш і пісталеты, сунуў за пояс корцік, паклаў у кішэню карту, павесіў на плячо мушкет і, перабраўшыся цераз частакол з паўночнага боку, хутка знік ў лесе.

Мы з Грэем сядзелі ў процілеглым куце блакгауза, дзе не было чуваць, пра што ішла гаворка. Знікненне доктара збянтэжыла Грэя.

— Ну і ну! Ён што, звар'яцеў? — сказаў ён.

— Наўрад ці,— адказаў я.— Калі мы звар'яцеем, дык доктар Ліўсі будзе апошні.

— Бадай, што так, хлопец,— сказаў Грэй.— Але калі не з'ехаў з глузду ён, дык з'ехаў я.


— Думаю,— разважыў я,— у яго ёсць нейкі план. Мне здаецца, ён пайшоў убачыцца з Бэнам Ганам.

Як выявілася пазней, я не памыліўся.

Тым часам спякота ў зрубе стала нясцерпная, і ў галаву мне закралася сапраўды вар'яцкая думка. Я стаў зайздросціць доктару, які ішоў цяністым лесам, слухаў птушак, удыхаў смалісты пах соснаў, а я ўсё роўна як падсмажваўся ў гэтым праклятым пекле, дзе адзежа прылiпала да смалы, дзе ўсё было ў крыві, дзе, куды ні глянь, ляжалі мерцвякі. Агіда да нашае фартэцыі нарастала ўва мне і рабілася амаль такая ж моцная, што і страх, які выклікала задума пакінуць гэтую фартэцыю.

Я мыў падлогу, мыў посуд — і з кожнай хвілінаю адчуваў, як гэтая агіда і зайздрасць да доктара ўсё больш і больш апаноўваюць мяне. Нарэшце я выпадкова апынуўся каля торбы з сухарамі. Мяне ніхто не бачыў, і я наклаў сухароў у абедзве кішэні камзола.





Вы можаце назваць мяне дурнем. Вядома, я ішоў на безразважную, адчайную рызыку, але, рыхтуючыся ўцячы, я вырашыў зрабіць усё, што можна, каб адчуваць сябе ў найбольш магчымай бяспецы. Гэтыя сухары не дадуць мне памерці з голаду, прынамсі, два дні.

Затым я прыхапіў два пісталеты. Кулі і порах у мяне былі, і я адчуваў сябе выдатна ўзброеным.

План мой, па сутнасці, быў не такі ўжо і кепскі. Я хацеў пайсці на пясчаную касу, якая аддзяляла з усходу нашую бухту ад адкрытага мора, знайсці белую скалу, якую заўважыў учора ўвечары, і паглядзець, ці не пад ёю хавае Бэн Ган сваю лодку. Справа, па-мойму, была вартая. Але я ведаў пэўна, што пакінуць блакгауз мне не дазволяць, і вырашыў уцячы, калі мяне ніхто не будзе бачыць. Вядома, шлях, які я абраў для ажыццяўлення свайго намеру, быў благі, так што і намер мой нельга было адобрыць. Але ж я быў хлапчук і ўжо прыняў рашэнне.

А неўзабаве падвярнуўся зручны выпадак. Сквайр і Грэй рабілі капітану перавязку, і ніхто не звяртаў на мяне ніякае ўвагі. Я пералез цераз частакол і знік у лесе. Калі таварышы заўважылі, што мяне няма, я паспеў адысці далёка і не чуў ніякіх крыкаў.

Гэтая другая мая вар'яцкая выхадка была яшчэ горшая за першую, бо ў блакгаузе засталося толькі двое здаровых людзей, аднак, як і першая, яна дапамагала нам уратавацца.

Я накіраваўся напрасткі да ўсходняга берага вострава, бо не хацеў ісці па звернутым да мора баку касы: баяўся, каб мяне не прыкмецілі са шхуны. Ужо вечарэла, хоць сонца стаяла яшчэ высока. Няспынна грукатаў прыбой, высокі лес хваляваўся — дрыжэлі кожны лісток і галінка, а гэта азначала, што сёння марскі брыз мацнейшы як зазвычай. Хутка стала халадаць. Нарэшце я выйшаў на ўзлесак — перада мною распасцерла-



ся неабдымнае, залітае сонцам, сіняе, шумнае мора.

Я ніводнага разу не бачыў, каб мора каля Вострава Скарбаў было спакойнае. Нават у ясныя дні, калі сонца сляпіць вочы і паветра нерухомае, велізарныя валы з грукатам накочваюцца на бераг. Наўрад ці ёсць на востраве такая мясціна, дзе можна схавацца ад грукату прыбою.

Як усё ж такі хораша было мне тут, на беразе, пасля спякотнага блакгауза!

Нарэшце, вырашыўшы, што я зайшоў ужо досыць далёка на поўдзень, я асцярожна папоўз цераз густое кустоўе наверх, на хрыбет касы.


Ззаду ў мяне было мора, уперадзе — бухта. Брыз, усё роўна як стаміўшыся ад уласнае лютасці, сціхаў. Яго змянілі лёгкія паветраныя плыні з поўдня і паўднёвага ўсходу, якія неслі з сабою густы туман. У праліве, абароненым Востравам Шкілета, была ўсё такая ж нерухомая свінцовацьмяная вада, як і таго дня, калі мы сюды ўвайшлі. «Іспаньёла» ўся, ад верхавіны мачты да ватэрлініі, з абвіслым «Вясёлым Роджэрам», адбівалася ў вадзе быццам у люстры.

Каля карабля я ўбачыў ялік. На карме сядзеў Сільвер — я пазнаў бы яго з любое адлегласці. Ён гутарыў з двума піратамі, якія перагнуліся цераз борт карабля. У аднаго з іх на галаве тырчаў чырвоны каўпак. Гэта быў той самы мяцежнік, які пералазіў у час нападу цераз частакол. Размаўляючы, яны смяяліся, але паміж намі была прыкладна міля, і, вядома, я не мог разабраць аніводнага слова. Раптам я пачуў жудасны, нечалавечы крык. Я спалохаўся, але хутка пазнаў голас папугая. Мне нават здалося, што я разгледзеў стракатую птушку на руцэ ў Сільвера.

Неўзабаве ялік адчаліў і панёсся да берага, а пірат у чырвоным каўпаку разам са сваім таварышам спусціліся ў каюту.

Тым часам сонца схавалася за Падзорнай






Трубою, туман стаў гусцець, хутка цямнела. Я зразумеў, што, калі я хачу адшукаць лодку сёння, нельга губляць аніводнае хвіліны.

Белая скала была добра бачная скрозь зараснікі, але знаходзілася яна даволі далёка ад мяне, і я патраціў багата часу, каб дабрацца да яе. І папоўзаў жа я на карачках, прадзіраючыся скрозь кустоўе! Была ўжо амаль ноч, калі я дакрануўся рукамі да шурпатых бакоў скалы. Пад ёю знаходзілася невялікая лагчына, зарослая зялёным імхом і схаваная ад чалавечага вока пясчанымі дзюнамі і густым, нізкім кустоўем — прыкладна мне да калена. У яе глыбіні я ўбачыў шацёр з казіных шкур, падобны да тых, што возяць з сабою ў Англіі цыганы.

Я спусціўся ў лагчыну. прыўзняў край шатра — і знайшоў там лодку Бэна Гана. З усіх самаробных лодак, якія толькі бачыў калі-небудзь свет, гэтая была, перакананы, так бы мовіць, найсамаробнейшая. Крывабокая драўляная рама, абшытая казінымі шкурамі футраю ўсярэдзіну — вось і ўся лодка. Нават я ледзь умяшчаўся ў ёй, а як ужо яна ўтрымлівала дарослага чалавека, аднаму богу вядома. Усярэдзіне былі нізенькая лаўка, падстаўка для ног і вясло з дзвюма лопасцямі.

Ніколі раней я не бачыў плеценых рыбацкіх чаўноў, на якіх плавалі старажытныя брытанцы, але пазней мне ўдалося пазнаёміцца з некаторымі іхнімі ўзорамі, і, каб вы больш дакладна ўявілі сабе Ганаву лодку, скажу, што яна нагадвала самы першы і самы няўдалы з гэтых чаўноў. І ўсё ж лодка мела галоўную перавагу старажытнага чоўна: яна была лёгкая, і яе свабодна можна было пераносіць з месца на месца.

Думаеце, што, знайшоўшы лодку, я рушыў у блакгауз?.. Дзе там! У галаве ў мяне выспеў новы план, і я так загарэўся ім, што ніякі капітан Смолет не змусіў бы мяне адмовіцца ад яго. Я заду-



маў падплыць уначы да «Іспаньёлы» і перарэзаць якарны канат. Няхай плынь выкіне шхуну на бераг абы-дзе: я быў перакананы, што пасля ранішняга паражэння мяцежнікі збіраюцца падняць якар і выйсці ў мора. Гэтага нельга было дапусціць. Вахтавыя на караблі засталіся без шлюпкі, і я меркаваў, што здзейсню сваю задуму без асаблівае рызыкі.

Чакаючы, пакуль канчаткова сцямнее, я сеў на пясок і пачаў грызці сухары. Цяжка ўявіць сабе ноч, больш спрыяльную для ажыццяўлення майго плана. Усё неба зацягнула густым туманам. Калі згаслі апошнія сонечныя промні, Востраў Скарбаў ахутала суцэльная цемрадзь. Тады я нарэшце ўзваліў на плечы човен, выйшаў з лагчыны і, спатыкаючыся, рушыў да вады.

У змроку бачныя былі два агеньчыкі: піраты на балоце п'янствавалі каля свайго вогнішча, а на моры свяцілася кармавое акно карабля, павернутага да мяне носам,— так што гэта быў усяго толькі адбітак святла ў тумане.

Ужо пачаўся адліў, і паміж вадою і берагам агалілася шырокая паласа мокрага пяску. Я шмат разоў граз у ім па самыя лыткі, пакуль нагнаў ваду, якая на вачах адступала. Прайшоўшы некалькі крокаў уброд, я спрытна спусціў човен на ваду, кілем уніз.

РАЗДЗЕЛ XXIII

Ва ўладзе адліву

Кіраваць крывабокім і вяртлявым чоўнам не было ніякай магчымасці. Рабі з ім што хочаш, а ён усё круціцца ды круціцца. Сам Бэн Ган потым казаў, што плаваць на гэтым чоўне можа толькі той, хто «ўжо прызвычаіўся да ягонага нораву».





Вядома, я яшчэ не паспеў прызвычаіцца да гэтага нораву. Човен плыў у любым накірунку, апроч патрэбнага мне. Найчасцей ён паварочваў да берага, і калі б не адліў, я нізашто не дабраўся б да карабля. На шчасце, адліў падхапіў мяне і панёс акурат да «Іспаньёлы».

Спачатку я заўважыў пляму, чарнейшую за самую цемрадзь, потым разгледзеў абрысы корпусу і мачтаў, а праз імгненне (бо чым далей я заплываў, тым хутчэй гнаў мяне адліў) апынуўся каля якарнага каната і ўхапіўся за яго.

Ён быў нацягнуты, як цецiва — з такой сілаю імкнулася шхуна сарвацца з якара. Адліў пад яе днішчам віраваў: як горны струмень. Адзін удар майго нажа — і плынь панясе «Іспаньёлу» куды захоча.

Але я паспеў зразумець, што туга нацягнуты канат, калі яго перарэзаць адразу, ударыць мяне, як конскі капыт. Човен перакуліцца, і я пайду на дно.

Я спыніўся і стаў чакаць. Калі б не раптоўная ўдача, я, напэўна, адмовіўся б урэшце ад свайго намеру. Аднак лёгкі вецер, спачатку ўсходне-паўднёвы, потым паўднёвы,ператвараўся спакваля ў паўднёва-заходні. Наляцеў шквал і пасунуў «Іспаньёлу» супраць плыні. Канат, на маю вялікую радасць, аслабеў, і рука, якой я за яго трымаўся, пагрузілася на імгненне ў ваду.

Я зразумеў, што марудзіць нельга, выхапіў свой складны нож, адкрыў яго зубамі і стаў перарэзваць адно за адным валокны каната. Калі засталося перарэзаць усяго два валокны, канат зноў нацягнуўся, і я стаў чакаць наступнага парыву ветру.


З каюты ўвесь гэты час даносіліся гучныя галасы. Але я быў так заняты сваёй справаю, што зусім не зважаў на іх. Цяпер, ад няма чаго рабіць, я стаў прыслухоўвацца.

Я пазнаў голас другога боцмана, Ізраэля Хэн-









дса, таго самага, што быў некалі ў Флінта кананірам. А размаўляў з ім, напэўна, пірат у чырвоным каўпаку. Абодва былі п'яныя як цапы, але ўсё яшчэ пілі. Адзін з іх адкрыў кармавы ілюмінатар і, гідка крыкнуўшы, кінуў нешта ў ваду, мабыць, пустую бутэльку. Зрэшты, яны не толькі пілі, але і люта сварыліся. Лаянка сыпалася градам, і часам мне здавалася, што зараз яны пачнуць біцца. Аднак галасы рабіліся спакайнейшыя, сварка перапынялася, а потым зноў і зноў то ўспыхвала, то заціхала.

На беразе гарэла паміж дрэвамі вогнішча. Нехта спяваў там старую, нудную матроскую песню, падвываючы ў канцы кожнага радка. У час плавання я чуў яе шмат разоў. Яна была такая доўгая, што ніхто не мог праспяваць яе ўсю — не хапала цярпення. Я запамятаў з яе толькі некалькі слоў:

Усе семдзесят пяць не вярнуліся з мора —
Усіх праглынула марская прастора...


Я падумаў, што гэтая сумная песня дужа адпавядае настрою піратаў, якія панеслі ўранку такія жорсткія страты. Але неўзабаве ўбачыў: гэтыя людзі бяздушныя, што мора, па якім яны плаваюць.

Нарэшце падзьмуў брыз — шхуна рушыла да мяне. Я адчуў, што канат зноў аслабеў, і адным моцным ударам перарэзаў апошнія валокны.

На мой човен вецер не ўплываў ніяк, і я апынуўся раптам ля самага борта «Іспаньёлы». Шхуна павольна паварочвалася вакол уласнае восі — плынь круціла яе, як хацела.

Я грэб з усяе сілы, увесь час баючыся, што човен вось-вось перакуліцца. Але шхуна цягнула яго за сабою, і я ніяк не мог адплыць ад яе, павольна перасоўваючыся ад носа да кармы. Нарэшце «Іспаньёла» пачала аддаляцца, і я ўжо спадзяваўся, што пазбаўлюся ад небяспечнага





суседства, але раптам у рукі мне трапіў канец каната, які вісеў на карме. Я адразу ж ўхапіўся за яго.

Не ведаю, навошта я гэта зрабіў. Намеру не меў ніякага. Але калі канат апынуўся ў маіх руках і я пераканаўся, што ён прывязаны надзейна, мяне апанавала цікаўнасць, і я вырашыў зазірнуць у ілюмінатар каюты.

Беручыся рукамі за канат усё вышэй і вышэй, я прыўзняўся. Рызыка была вельмі вялікая: у любы момант човен мог перакуліцца.

Шхуна і човен хутка несліся па цячэнні. Мы параўняліся з вогнішчам на беразе. Карабель, як кажуць маракі, «загаварыў» — пачаў гучна рассякаць хвалі, і я, пакуль не зазірнуў у ілюмінатар, не мог зразумець, чаму вахтавыя не падымаюць трывогі. Стоячы ў хісткім чоўне, я мог хіба што зірнуць на момант у каюту, але аднаго кароткага погляду хапіла, каб зразумець усё: Хэндс і матрос, ухапіўшы адзін аднаго рукамі за горла, біліся не на жыццё, а на смерць.

Я апусціўся на лаўку. Яшчэ імгненне — і човен перакуліўся б. Перад вачыма ў мяне стаялі раз'юшаныя, барвовыя ад прыліву крыві твары піратаў у цьмяным святле закуранай лямпы. Я зажмурыўся, каб вочы зноў прывыклі да цемры.

На беразе нарэшце абарвалася бясконцая балада, і вясёлая кампанія зноў зацягнула сваё вечнае:

Пятнаццаць чалавек на куфры мерцвяка —
Ё-го-го, і бутэлька рому!
Пі, і дакапае цябе д'ябла рука —
Ё-го-го, і бутэлька рому!

Думаючы пра тое, што цяпер вытвараюць ром і д'ябал у каюце «Іспаньёлы», я адчуў раптам штуршок. Човен рэзка нахіліўся і змяніў курс. Хуткасць плыні надзіва моцна павялічылася.





Я расплюшчыў вочы. Вакол мяне іскрыліся лёгкім фасфарычным святлом дробныя шумныя хвалі. «Іспаньёла», за некалькі ярдаў ад якой несла мой човен, здавалася, таксама змяніла курс. Я цьмяна бачыў яе мачты ў цёмным небе. І чым больш я ўзіраўся, тым больш пераконваўся, што цяпер яе нясе ўжо на поўдзень.

Я азірнуўся, і ад страху сэрца маё закалацілася ў грудзях: цяпер вогнішча гарэла якраз у мяне за спінаю. Цячэнне крута збочыла ўправа і, набіраючы ўсё большую сілу, несла за сабою праз вузкі праліў у адкрытае мора і вялікую шхуну, і мой лёгкі, вяртлявы човен.

Раптам шхуна зрабіла яшчэ адзін рэзкі паварот, прынамсі, на дваццаць градусаў, і праз нейкі момант з карабля данесліся два п'яныя крыкі. Неўзабаве я пачуў, як піраты спускаюцца па трапе, і зразумеў, што яны перасталі біцца: бяда прымірыла абодвух.

Я лёг на дно майго кволага чоўна і даверыўся лёсу. Калі мы выйдзем з праліву, то трапім адразу ж у такія буруны, якія хутка пазбавяць мяне ад усялякага клопату. Я не так баяўся смерці, як пакутаваў праз тое, што прыходзіцца, скарыўшыся, чакаць яе надыходу, анічога не могучы змяніць.

Так я праляжаў некалькі гадзін. Хвалі шпурлялі мой човен ва ўсе бакі, абдавалі ўсяго мяне пырскамі, і кожная такая хваля магла абарваць маё жыццё. Але патроху мяне адолела стома. Я здранцвеў і, нягледзячы на жахлівасць майго становішча, заснуў. Мне сніліся родныя мясціны і стары «Адмірал Бенбоў».

РАЗДЗЕЛ XXIV

У чоўне


Калі я прачнуўся, ужо зусім развіднела. Я ўбачыў, што мяне нясе ўздоўж паўднёва-заходняга берага Вострава Скарбаў. Сонца ўжо ўзышло, але яго засланяла аграмадзіна Падзорнае Трубы, якая спускалася да мора непрыступнымі скаламі.

Буксірная Галава і пагорак Бізань-мачты былі ў мяне пад бокам: пагорак — голы і цёмны. Галава — акружаная скаламі, у сорак — пяцьдзесят футаў вышынёю, і вялізнымі грудамі камення. Ад мяне да вострава было сама болей чвэрць мілі. Я вырашыў веславаць да берага. Але неўзабаве быў вымушаны спыніцца: каля Галавы віравалі буруны. Высачэзныя шумныя хвалі адна за адной з грукатам уздымаліся ўверх, заліваючы рэшткі зруйнаваных часам скал, на якія я думаў быў узабрацца. Я зразумеў, што альбо загіну ў гэтых хвалях, альбо змарную астатнія сілы.

І не адно гэта палохала. На плоскіх, як сталы, скалах поўзалі нейкія пачвары, неверагодна буйныя. Было іх ці не з паўсотні. Яны раўлі, кідаліся ў ваду — у скалах разлягалася аглушальнае рэха. Гармідар стаяў такі, што хоць вушы затыкай.

Пазней я даведаўся, што гэта былі марскія львы, зусім бяскрыўдныя жывёлы. Але выгляд у іх быў страшны, бераг палохаў сваёй непрыступнасцю, прыбой з грукатам разбіваўся аб скалы — і мне зусім расхацелася плыць да вострава. Лепш ужо памерці з голаду ў моры, чым сустрэцца з такімі жахамі.

Тым часам я ўбачыў другі шлях да выратавання. На поўнач ад Буксірнае Галавы была доўгая жоўтая пясчаная водмель, якая агалялася ў час адліву, а яшчэ далей на поўнач быў другі мыс, пазначаны на нашай карце як Лясісты.



Ён увесь, да самае вады, зарос высокімі зялёнымі соснамі.

Я згадаў Сільверавы словы пра тое, што ўздоўж усяго заходняга берага Вострава Скарбаў цячэ на поўнач плынь. Зразумеўшы, што яна ўжо падхапіла мяне, я вырашыў абмінуць Буксірную Галаву, не марнуючы сіл, і паспрабаваць прыстаць да Лясістага мыса, які здаўся мне нашмат больш ветлівым.


На моры быў буйны зыб. З поўдня дзьмуў упарты ласкавы вецер, які дапамагаў мне плыць па цячэнні. Хвалі мерна падымаліся і апускаліся.

Калі б вецер быў парывісты, я даўно б патануў. Але і пры роўным ветры заставалася адно дзівіцца, які ж зручны і бяспечны мой маленечкі, лёгкі човен. Лежачы на дне і гледзячы па баках, я не раз бачыў над галавою блакітную вяршыню велізарнае хвалі. Здавалася, яна вось-вось накрые мяне — але мой човен, падскочыўшы, усё роўна як на спружынах, трохі прытанцоўваючы, узлятаў на грэбень і плаўна, нібыта птушка, апускаўся.

Патроху я так асмялеў, што нават паспрабаваў быў грэбці. Аднак маленечкае парушэнне раўнавагі адразу ж адбілася на паводзінах майго чоўна. Ледзь толькі я паварушыўся, як ён, страціўшы ранейшую плаўнасць, імкліва зляцеў з грэбеня і, узняўшы сноп пырскаў, зарыўся носам у наступную хвалю — у мяне ажно галава закружылася.

Мокры, перапалоханы, я зноў лёг на дно. Човен адразу ж утаймаваўся і асцярожна панёс мяне далей паміж хваль. Я канчаткова зразумеў, што грэбці нельга. Але як дабрацца да берага?

Мне стала страшна, аднак я не згубіў галавы. Спачатку я асцярожна вычарпаў з чоўна сваёй матроскай шапкаю ваду, затым, уважліва назіраючы за ходам чоўна, пастараўся зразумець, чаму ён так лёгка адольвае хвалі.



Я заўважыў, што кожная хваля, якая ўяўлялася з берага ці з борта карабля вялізнай роўнай і гладкай гарою, на самай справе больш падобная да шэрагу няроўных пагоркаў з вострымі вяршынямі, адхонамі і далінамі. Човен, калі ім не кіраваць, сам выдатна лавіраваў, кожнага разу знаходзячы шлях у далінах і пазбягаючы стромкіх адхонаў і высокіх вяршынь.

«Выдатна,— сказаў я сабе.— Трэба спакойна ляжаць і не парушаць раўнавагі. Але ў роўных мясцінах можна і падгрэбці да берага».


Так я і зрабіў. Лежачы на локцях у самай нязручнай паставе, я ўзмахваў зрэдку вяслом і накіроўваў човен да вострава. Гэта была нудная, марудная праца, і ўсё ж я дасягнуў пэўнага поспеху. Але, параўняўшыся з Лясістым мысам, я зразумеў, што непазбежна абміну яго — да берага было некалькі сотняў ярдаў. Я бачыў зялёныя вершаліны дрэваў, якія пагойдваў брыз, і адчуваў, што ўжо наступны мыс я не прапушчу. Сонца пякло бязлітасна, сляпіла вочы, вакол мяне расплываліся ў вадзе ягоныя незлічоныя адбіткі. Марская вада высыхала ў мяне на твары, нават вусны пакрыліся соллю. Перасохла горла, балела галава. А дрэвы былі так блізка, так вабілі сваім ценем! Але плынь імклівая пранесла мяне міма мыса. І тое, што я ўбачыў неўзабаве, змяніла ўсе мае планы.


Акурат насупраць мяне, сама больш за паўмілі, плыла пад усімі ветразямі «Іспаньёла». Несумненна, мяне заўважаць і падбяруць. Радавацца мне трэба ці засмучацца, я не ведаў — дапмала смага. Але доўга разважаць не давялося: неўзабаве мне засталося адно здзіўляцца.

«Іспаньёла» ішла пад гротам[1] і двума кліверамі[2]. Ветразі так і серабрыліся на сонцы —

---

[1] Грот — ніжні ветразь на грот-мачце.
[2] Клівер — касы ветразь перад фок-мачтаю.





прыгажосць была неверагодная. Калі я толькі ўбачыў шхуну, усе яе ветразі былі надзьмутыя і яна трымала курс на паўночны захад. Я падумаў, што людзі на борце вырашылі абагнуць востраў і вярнуцца на ранейшую стаянку. Затым шхуна ўсё больш і больш стала адхіляцца на захад, і я вырашыў, што мяне ўбачылі і хочуць падабраць. Але раптам яна павярнулася акурат супраць ветру і, бездапаможная, спынілася з абвіслымі ветразямі.

«Ну і дундукі! — сказаў я сабе.— Панапіваліся, мабыць, да бяспамяцтва».

Усыпаў бы ім капітан Смолет за такое кіраванне суднам!

Тым часам шхуна, пераходзячы з галса на галс, зрабіла поўны круг, праплыла хуткім ходам адну-дзве хвіліны — і зноў спынілася носам супраць ветру. І так некалькі разоў. Яна плыла то на поўнач, то на поўдзень, то на ўсход, то на захад, лопаючы ветразямі і кожнага разу вяртаючыся да таго курсу, які толькі што змяніла. Я зразумеў, што караблём ніхто не кіруе. Куды ж дзеліся людзі? Альбо яны ляжаць упокат п'яныя, альбо пакінулі судна. Калі я траплю на борт, то мне, можа, удасца вярнуць карабель ягонаму капітану.

Плынь несла човен і шхуну з аднолькавай хуткасцю, але шхуна так часта мяняла галсы, так часта спынялася, што зусім не прасоўвалася наперад. Калі б я мог усесціся ў чоўне і грэбці, я, несумненна, дагнаў бы яе. Тут мяне пацягнула да новых прыгод, а думка аб прэснай вадзе падвоіла авантурны сверб.

Я ўзняўся, і мяне адразу ж абдало з ног да галавы хваляю. Але цяпер гэта не пахіснула маёй рашучасці. Сабраўшыся з сіламі, я пачаў асцярожна грэбці ў накірунку да свавольнае «Іспаньёлы». Аднаго разу хваля так падкінула човен, што сэрца ў мяне страпянулася, нібыта



птушка. Я спыніўся і стаў вычэрпваць ваду. Нарэшце я ўсё ж такі прызвычаіўся трохі да чоўна і ўжо накіроўваў яго сярод бурлівых хваль так, што толькі зрэдку пыркі білі мяне па твары.

Я хутка даганяў шхуну і мог ужо разгледзець медзь румпеля[1], якая паблісквала пры паваротах. На палубе не было аніводнага чалавека. Мусібыць, мяцежнікі ўцяклі. А калі не, дык валяюцца п'яныя ў кубрыку — там я іх і запру, тады буду рабіць з караблём усё, што захачу.

А шхуна зноў пачала мяняць курс. Цяпер яна павярнула на поўдзень. Кожнага разу, калі «Іспаньёла» віляла ўбок, як ветразі трохі надзімаліся, і яна зноў ішла па ветры. Нічога горшага для мяне і быць не магло. Якая ні бездапаможная была «Іспаньёла» без людзей, што кіравалі б ёй, плынь і вецер усё ж аддалялі і аддалялі яе ад мяне.

Нарэшце мне пашчасціла: вецер на нейкі час сціх. Плынь павольна павярнула «Іспаньёлу» вакол сваёй восі. Я ўбачыў карму шхуны. Ілюмінатар каюты быў адчынены, на стале гарэла лямпа, хоць даўно ўжо разднела. Грот павіс, як сцяг. Пакараючыся плыні, шхуна запаволіла ход. Я трохі адстаў ад яе, але цяпер, прыклаўшы намаганні, мог зноў дагнаць.

Я быў ужо за нейкія сто ярдаў ад «Іспаньёлы», калі шхуна павярнула на левы галс і зноў імкліва панеслася па хвалях.

Спярша мяне ахапіў адчай, але неўзабаве я ўжо радаваўся: шхуна зрабіла круг і паплыла акурат на мяне, прайшла палову, потым дзве трэці, потым тры чвэрці адлегласці паміж намі. Я ўжо чуў шум буруна пад яе фарштэўнем[2]. Якою ж велізарнаю здавалася цяпер яна мне з майго малюпасенькага чоўна!

---

[1] Румпель — рычаг для кіравання стырном.

[2] Фарштэвень — край носа судна, працяг кіля.



І тут я ўцяміў, што мне пагражае. Часу на роздум ужо не заставалася. Каб уратавацца, трэба было дзейнічаць. Мяне ўзняло на вяршыню хвалі, калі нос шхуны прарэзаў суседнюю. Над галавою ў мяне навіс бушпрыт. Я ўскочыў на ногі і ўхапіўся за утлегар[1]. Чаўнок пайшоў пад ваду, адна мая нага апынулася паміж штагам[2] і брасам[3]. Я адчуў лёгкі штуршок знізу і зразумеў, што шхуна патапіла мой човен і зараз ужо мне з «Іспаньёлы» нікуды не ўцячы.

РАЗДЗЕЛ XXV

Я спускаю «Вясёлага Роджэра»

Толькі я ўзабраўся на бушпрыт, як клівер, хлопнуўшы, быццам гарматны стрэл, надзьмуўся і павярнуў на другі галс. Шхуна ўздрыгнула да самага кіля, але праз імгненне, хоць астатнія ветразі былі ўсё яшчэ надзьмутыя, клівер зноў хлопнуў і павіс.

Ад нечаканага штуршка я ледзь не зляцеў у ваду. Не марнуючы часу, я папоўз па бушпрыце і зваліўся галавою ўніз на палубу, трапіўшы на падветраны бок бака. Грот засланяў ад мяне частку кармы. На палубе, не мытай з дня мяцяжу і забруджанай слядамі,— анікога. Пустая бутэлька з адбітым рыльцам каталася ўзад і ўперад.

Раптам «Іспаньёла» зноў пайшла па ветры. Кліверы гучна хлопнулі ў мяне за спінаю, стырно зрабіла паварот, карабель зноў здрыгануўся,

---

[1] Утлегар — працяг бушпрыта.

[2] Штаг — снасць, якая падтрымлівае мачту.

[3] Брас — снасць, якую выкарыстоўваюць для павароту рэі.





гік[1] грота адкінуўся ўбок, шкот[2] зарыпеў аб блокі, і я ўбачыў карму.

Там былі абодва вахтавыя. Чырвоны Каўпак нерухома ляжаў на спіне, ашчэрыўшы зубы. Рукі ў яго былі раскінутыя, як у распятага. Ізраэль Хэндс сядзеў ля фальшборта[3], апусціўшы галаву на грудзі. Рукі бездапаможна звісалі ўніз. Твар быў белы, як сальная свечка.

Карабель уставаў на дыбы, нібыта ашалелы конь. Ветразі надзьмуваліся, пераходзілі з галса на галс, гікі рухаліся з такой сілаю, што мачта гучна стагнала. Раз-пораз нос уразаўся ў хвалю, і тады над фальшбортам узляталі снапы лёгкіх пырскаў. Самаробны крывабокі Ганаў човен лепш спраўляўся з хвалямі, чым гэты вялікі карабель з усімі ягонымі снасцямі. Але човен ляжаў ужо на дне мора.

Пры кожным скачку шхуны падскокваў і Чырвоны Каўпак. Але выраз ягонага твару не мяняўся: ён па-ранейшаму ўсміхаўся, ашчэрыўшы зубы. Жудаснае відовішча. А Хэндс скочваўся ўсё далей і далей ад мяне і апынуўся ўрэшце ля самага борта. Адна яго нага павісла над вадою. Цяпер я ўжо бачыў толькі адно яго вуха і пасму кучаравых бакенбардаў.

Тут я разгледзеў на палубе цёмныя палосы крыві і зразумеў, што ў п'янай бойцы піраты перарэзаліся паміж сабою.

Раптам карабель спыніўся на нейкі час, і Хэндс са стогнам адкаціўся на тое самае месца, у якім я яго ўбачыў, калі трапіў на шхуну. Гэты стогн знясіленага чалавека, увесь яго выгляд на імгненне выклікалі ўва мне спачуванне. Але я згадаў размову, якую падслухаў, седзячы ў боч-

---

[1] Гік — гарызантальная жэрдка, па якой нацягваецца ніжні край ветразя.

[2] Шкот — снасць для кіравання ніжнім канцом ветразя.

[3] Фальшборт — працяг борта вышэй палубы.



цы з-пад яблыкаў, усе Хэндсавы словы, і шкадоба прайшла.

Я падышоў да грот-мачты.

— Вось я зноў на шхуне, містэр Хэндс,— насмешліва сказаў я.

Ён з цяжкасцю расплюшчыў вочы, зірнуў на мяне, але такі быў п'яны, што не здзівіўся ані каліва, адно здолеў прамовіць:

— Брэндзі[1]!

Я зразумеў, што часу губляць нельга, і, праслізнуўшы пад гікам грота, спусціўся ў каюту.

Цяжка сабе ўявіць, які там быў рэзрух. Замкі ва ўсіх скрынях былі зламаныя. Піраты, напэўна, шукалі карту. Падлога была ўся ў нанесеным з балота брудзе. Белыя перагародкі, аздобленыя залатым багетам, мала не пачарнелі ад слядоў брудных нямытых рук. Дзесяткі пустых бутэлек перакочваліся, са звонам ударваючыся адна аб адну, з кута ў кут. Адна з медыцынскіх кніг доктара ляжала разгорнутая на стале. Палова лістоў было з яе вырвана. Побач з ёю па-ранейшаму чадзела лямпа.

Я зазірнуў у пограб. Бочак з выпіўкаю не было, на падлозе валялася безліч пустых бутэлек. Можна было не сумнявацца: з самага пачатку мяцяжу піраты аніразу не працверазіліся.


Пашнарыўшы, я ўсё ж знайшоў адну недапітую бутэльку брэндзі. Сабе я ўзяў трохі сухароў, сушаной садавіны, жменю разынак і кавалак сыру. Узняўшыся на палубу, я склаў усё гэта ля дастырна, далей ад Хэндса, каб ён не змог дастаць, напіўся вады і толькі тады працягнуў боцману бутэльку. Ён выпіў не менш як палову.


— Клянуся ўдачаю,— сказаў ён, адарваўшыся ад бутэлькі,— якраз гэта мне і было патрэбна!

Я ўсеўся ў куце і пачаў есці.

---

[1] Брэндзі — англійскі каньяк.





— Моцна паранены? — спытаўся я ў яго.

— Быў бы тут доктар,— усё роўна як прагаўкаў Хэндс,— я хутка б ачомаўся. Але сам бачыш, мне не шанцуе... А гэты пацук памёр,— дадаў ён, кінуўшы ў бок чалавека ў чырвоным каўпаку.— Дрэнны быў марак... А ты адкуль узяўся?

— Я прыбыў сюды,— сказаў я,— каб камандаваць караблём, містэр Хэндс. Лічыце мяне да наступнага загаду капітанам.

Ён змрочна паглядзеў на мяне, але нічога не сказаў. Шчокі ў яго трохі паружавелі, але выгляд быў хваравіты, і пры кожным скачку карабля ён валіўся на бок.

— Дарэчы,— працягваў я,— мне не падабаецца гэты сцяг, містэр Хэндс. З вашага дазволу, я яго спушчу. Лепей зусім без сцяга, чым з гэтым.

Я падбег да мачты, зноў праслізнуўшы пад гікам, тузануў патрэбную вяроўку, і спусціўшы праклятны чорны сцяг, выкінуў яго за борт.


— Божа, дапамагай каралю! — крыкнуў я, махаючы шапкаю.— Далоў капітана Сільвера!

Хэндс назіраў за мною пільна і з нейкай хітрынкаю ў вачах, хоць і не падымаў галавы.

— Я мяркую,— сказаў ён нарэшце,— я мяркую, капітан Хоўкінс, што вы былі б не супраць высадзіцца на бераг. Пагаворым пра гэта...

— Пагаворым,— сказаў я,— з вялікім задавальненнем, містэр Хэндс. Працягвайце.— І я зноў пачаў з апетытам есці.

— Гэты чалавек...— пачаў ён, слаба кінуўшы ў бок трупа.— Яго звалі О'Браян... смярдзючы ірландзец... Мы паставілі з ім ветразі і хацелі вярнуцца ў бухту. Але ён памёр... і смярдзіць, як гнілая вада ў труме... Не ведаю, хто павядзе зараз карабель... Без маіх загадаў табе з ім не справіцца. Паслухай, дай мне паесці і папіць, перавяжы рану старым шалікам ці хусткаю, і я пакажу табе ўсё, што трэба рабіць.



— Майце толькі на ўвазе,— сказаў я, — на стаянку капітана Кіда я вяртацца не збіраюся. Я хачу ўвесці карабель у Паўночную стаянку і там спакойна прыстаць да берага.


— Хай будзе па-твойму! — ускрыкнуў ён.— Хіба я такі ёлуп, каб не разумець, што я зрабіў свой ход і прамахнуўся і што перамога твая?.. Клянуся ўдачаю, я дапамагу табе весці карабель хоць да самага памоста маёй шыбеніцы!

Мне здалося, ён разумее, што кажа. Мы заключылі дамову. Праз тры хвіліны «Іспаньёла» ўжо ішла па ветры ўздоўж берага Вострава Скарбаў. Я спадзяваўся абагнуць Паўночны мыс і ўвайсці ў Паўночную стаянку да прыліву. Тады мы зможам спакойна падвесці «Іспаньёлу» да берага, дачакаемся спаду вады і высадзімся.

Я ўмацаваў румпель, сышоў уніз, адшукаў свой куфэрак і дастаў з яго мяккую шоўкавую насоўку — матчын падарунак. З маёй дапамогаю Хэндс перавязаў гэтай насоўкаю глыбокую крывавую рану на сцягне. Трохі паеўшы і выпіўшы яшчэ два-тры глыткі брэндзі, ён прыкметна павесялеў, сядзеў ужо, узняўшы галаву, гаварыў больш гучна і выразна — словам, зрабіўся зусім іншым чалавекам.

Дзьмуў спадарожны брыз. Шхуна неслася як птушка. Краявіды на беразе мяняліся з кожнай хвілінаю. Урэшце мы мінулі горную частку вострава і імчаліся ўздоўж нізкага пясчанага берага, зарослага рэдкімі карлікавымі соснамі, а неўзабаве абагнулі скалісты пагорак — самы паўночны край вострава.

Мне падабалася кіраваць караблём. Было радасна ад цудоўнага сонечнага надвор'я і маляўнічых краявідаў. Ежы і пітва цяпер у мяне хапала, і я ўжо не папракаў сябе за дэзерцірства — апраўданнем мне была атрыманая вялікая перамога. Усім я быў задаволены, хіба што



непакоіў боцман. Ён неадступна сачыў за мною кплівымі вачыма, і на твары ў яго расплывалася нейкая дзіўная ўсмешка. Былі ў ёй і пакута, і знямога. Але таілася за змрочнай грымасаю старога чалавека і штосьці з'едлівае, хітраватае, здрадніцкае. Я вёў карабель, а ён сачыў за мною, сачыў, сачыў...

РАЗДЗЕЛ XXVI

Ізраэль Хэндс

Вецер, усё роўна як стараючыся дагадзіць нам, стаў дзьмуць цяпер з захаду. Мы вельмі лёгка прайшлі адлегласць ад паўночна-ўсходняга канца вострава да ўваходу ў Паўночную стаянку. Але мы баяліся ўвайсці ў бухту, перш чым падымецца вышэй прыліў, бо не мелі якара. Трэба было чакаць. Боцман растлумачыў, як пакласці карабель у дрэйф, і неўзабаве я гэта зрабіў. Затым мы моўчкі селі на палубу і пачалі сілкавацца.

— Капітан,— сказаў ён з усё той жа непрыемнай усмешкаю,— тут ляжыць мой стары таварыш О'Браян. Ці не выкінеш ты яго за борт? Я чалавек не дужа далікатны і не адчуваю асаблівых пакут з-за таго, што адправіў яго на той свет, але, мне здаецца, ён не надта ўпрыгожвае карабель. Ты нязгодны?

— У мяне не хопіць сілы. Дый не падабаецца мне такая работа. Па-мойму, няхай ляжыць,— сказаў я.

— Што за няшчасны карабель гэтая «Іспаньёла», Джым! — працягваў Хэндс, падміргнуўшы.— Колькі людзей забіта на гэтай «Іспаньёле», колькі бедных маракоў загінула з тае пары, як мы пакінулі з табою Брыстоль! Ніколі не бачыў такога няўдалага плавання. Вось і О'Браян памёр — ён жа памёр, ці ж не так?





Дык вось, я чалавек непісьменны, а ты ўмееш чытаць і лічыць, скажы мне, мёртвы так і застанецца мёртвым ці ўваскрэсне калі-небудзь?

— Вы можаце забіць цела, містэр Хэндс, але толькі не дух,— гэта ўжо вы павінны ведаць,— адказаў я.— О'Браян цяпер на тым свеце і сочыць за намі адтуль.

— Як гэта крыўдна,— сказаў Хэндс,— здаецца, я змарнаваў час... Зрэшты, па-мойму, ад духаў вялікае шкоды няма. Я не баюся іх, Джым... Слухай, ты цяпер усё роўна без справы, зрабі ласку, спусціся ў каюту і прынясі мне... а, трасца на мяне!.. забыўся, аб чым хацеў цябе папрасіць... Ага, прынясі мне бутэлечку віна, Джым, гэтые брэндзі задужа моцны для мяне.

Ваганні боцмана здаліся мне ненатуральнымі, дый не паверыў я, што віно падабаецца яму больш за брэндзі. Гэта ўсяго толькі прэтэкст. Вядома, ён проста хоча, каб я пакінуў палубу. Але навошта яму гэта трэба, спрабаваў здагадацца я. Ён хавае ад мяне свае вочы, ягоны позірк блукае па баках, спыняецца то на небе, то на мёртвым О'Браяне. І ўвесь час усміхаецца, высунуўшы з рота кончык языка. Хітруга... Тут і дзіцёнак здагадаўся б, што ён нешта задумаў.

— Віна? — амаль адразу ж адказаў я.— Выдатна. Але якога — белага ці чырвонага?

— А ўсё роўна,— адказаў ён.— Абы мацнейшае было ды паболей...

— Добра... Я прынясу вам партвейну, містэр Хэндс. Але прыйдзецца яго пашукаць.

Трымаўся я спакойна, нічым не выдаючы сваю насцярожанасць. З такім безнадзейна тупым чалавекам зрабіць гэта было не надта цяжка.

Я збег уніз, стараючыся стукаць чаравікамі як мага гучней. Потым зняў іх, пракраўся на дыбачках па запасным калідоры ў кубрык, падняўся па трапе і выглянуў з пярэдняга тамбура.



Хэндс ніколі б не здагадаўся, што я назіраю за ім, аднак я ўсё роўна быў вельмі пільны. Зірнуўшы, я адразу ж упэўніўся ў сваіх падазрэннях.

Хэндс стаў на карачкі і досыць спрытна папоўз па палубе, хаця ягоная параненая нага, напэўна, моцна балела, бо пры кожным руху ён глуха стагнаў. Праз паўхвіліны ён дапоўз да вадасцёкавага жолаба і выцягнуў з-пад карабельнага каната, складзенага непадалёк бухтаю, доўгі нож ці, дакладней, кароткі кінжал, увесь у крыві. Пасля агледзеў яго, выставіўшы пры гэтым ніжнюю сківіцу, пакратаў рукою вастрыё і, сунуўшы нож за пазуху, папоўз назад да фальшборта.

Цяпер я ведаў усё. Ізраэль можа рухацца. Ён узброены. Раз ён выправаджваў мяне з палубы, значыцца, вырашыў забіць мяне. Што ён збіраецца рабіць, пакончыўшы са мною,— цягнуцца праз увесь востраў ад Паўночнае стаянкі да лагера піратаў на балоце ці страляць з гарматы, клічучы таварышаў дапамагчы яму,— гэтага я ўжо, канечне, уведаць не мог.

Я мог давяраць Хэндсу толькі ў тым, у чым нашы інтарэсы супадалі: мы абодва хацелі прывесці шхуну ў бяспечнае месца, адкуль яе можна было б вывесці ў патрэбны момант без асаблівае цяжкасці і рызыкі. Пакуль гэта яшчэ не зроблена, нападаць на мяне ён не стане.

Разважаючы, я не марнаваў часу: пракраўся назад у каюту, надзеў чаравікі, схапіў бутэльку віна і вярнуўся на палубу.

Хэндс ляжаў у той самай паставе, у якой я яго пакінуў, нібыта торба, прыжмурыўшы вочы, быццам так ужо аслабеў, што не мог глядзець на святло. Ён зірнуў на мяне, адбіў рыльца бутэлькі — было відаць, што рука ў яго тут напрактыкаваная,— і адпіў некалькі добрых глыткоў.

— За ўдачу! — сказаў ён, адарваўшыся ад бутэлькі.





Потым, перадыхнуўшы, Хэндс дастаў з кішэні плітку жавальнага тытуню і папрасіў мяне адрэзаць кавалачак.

— Зрабі ласку, адрэж,— сказаў ён,— а то ў мяне няма нажа, дый сіл не хопіць. Ах, Джым, я зусім занядужаў. Гэты кавалачак будзе, відаць, для мяне апошні. Мала мне, хлопец, засталося да спачыну...

— Добра,— сказаў я.— Адрэжу. Але на вашым месцы... пачуваючы сябе так блага, я пакаяўся б, як належыць хрысціяніну.


— Пакаяўся? — спытаўся ён.— У чым?

— Як — у чым? — усклікнуў я.— Вы не ведаеце, у чым вам каяцца перад смерцю?! Вы здрадзілі свайму абавязку. Пражылі ўсё жыццё ў граху, у хлусні і ў крыві. Ля вашых ног ляжыць забіты вамі чалавек. А вы пытаецеся, у чым каяцца! Маліце бога, містэр Хэндс, каб ён дараваў вам!

Я гаварыў залішне горача, бо думаў аб крывавым кінжале, схаваным у яго за пазухаю, кінжале, якім ён хацеў забіць мяне. А ён выпіў занадта шмат віна і адказваў мне надзіва красамоўна.

— Трыццаць гадоў я плаваў па морах,— сказаў ён,— нагледзеўся і добрага, і благога, і штыляў, і штормаў, і голаду, і панажоўшчыны, і багата чаго яшчэ, але, павер мне, аніводнага разу не бачыў, каб дабрадзейства прынесла чалавеку хоць якую карысць. Рацыя за тым, хто ўдарыў першы, мёртвыя не кусаюцца — вось і ўся мая вера. Амінь!.. Слухай,— сказаў ён раптам зусім іншым голасам,— досыць вярзці лухту. Прыліў падняўся ўжо высока. Выконвай мае каманды, капітан Хоўкінс, і мы выведзем шхуну ў бухту.

Нам і праўда заставалася прайсці не больш як дзве мілі. Аднак плыць было цяжка. Уваход у Паўночную стаянку быў не толькі вузкі і мел-



каводны, але і вельмі звілісты. Прыйшлося пашчыраваць. Але я быў добры падначалены, а Хэндс — выдатны лоцман. Мы так спрытна лавіравалі, абыходзячы мелі, што люба-дорага было паглядзець.

Ледзь толькі мы мінулі абодва мысы, як нас з усіх бакоў акружыла зямля. Лес на беразе Паўночнае стаянкі быў такі ж густы, як і на беразе Паўднёвай. Але сама бухта была даўжэйшая і вузейшая і хутчэй нагадвала вусце ракі, чым бухту. Акурат перад намі, у паўднёвым куце, мы ўбачылі напаўзгнілы каркас карабля. Гэта было вялікае трохмачтавае судна. Яно так доўга прастаяла тут, што водарасці абляпілі яго з усіх бакоў, а на палубе расло густое кустоўе, усё ў яркіх кветках. Сумнае было відовішча, але яно сведчыла, што бухта для стаянкі вельмі прыдатная.

— Паглядзі,— сказаў Хэндс,— вунь неблагая мясціна, каб прычаліць да берага. Чысты, гладкі пясок, ніколі ніякіх хваль, вакол лес, кветкі на тым беразе растуць, як у садзе.

— А шхуна, калі мы прычалім, не загразне на мелі? — спытаўся я.

— З мелі яе няцяжка будзе зняць,— адказаў Хэндс.— У час адліву працягні канат на той бераг, наматай яго на адну з тых вялікіх соснаў, канец цягні сюды і наматай на шпіль. Потым чакай прыліву. Калі прыйдзе прыліў, загадай усёй камандзе ўхапіцца разам за канат і цягнуць. І шхуна сама сыдзе з мелі, як лебедзь. А зараз, хлопец, будзь пільны. Мы ля той самай мелі, і шхуна ідзе якраз на яе. Трохі ўправа... так... прама... управа... трохі ўлева... прама... прама!

Ён аддаваў загады, якія я адразу ж дакладна выконваў.

— Кіруй да ветру, сынок! — крыкнуў ён раптам.








Я з усяе сілы налёг на стырно. «Іспаньёла» крута павярнулася і імкліва падышла да зарослага нізкім лесам берага.

Я так захапіўся ўсімі гэтымі манеўрамі, што зусім перастаў сачыць за боцманам. Мяне цікавіла адно: калі шхуна дакранецца днішчам да пяску. Забыўшыся пра небяспеку, што пагражала мне, я перагнуўся цераз правы фальшборт і глядзеў, як шуміць пад носам вада. І загінуў бы нават не пазмагаўшыся, калі б раптоўнае пачуццё трывогі не прымусіла азірнуцца. Можа, я пачуў якісьці шоргат ці заўважыў краем вока Хэндсаў цень, можа, гэта было нешта накшталт кашачага інстынкту, але я азірнуўся — і ўбачыў боцмана. Ён быў зусім ужо непадалёк ад мяне, з кінжалам у правай руцэ.

Я закрычаў ад жаху, а Хэндс зароў, як раз'ятраны бык, і кінуўся на мяне. Я адскочыў да носа і выпусціў з рук румпель, які адразу ж выпраставўся. Гэты вось румпель і ўратаваў мяне: ён ударыў боцмана ў грудзі, і Хэндс упаў.

Перш чым ён паспеў ускочыць на ногі, я выбег з кута, у які быў загнаны. Цяпер перада мною была ўся палуба, і я мог увільваць ад боцмана, як хацеў. Каля грот-мачты я спыніўся, выняў з кішэні пісталет, прыцэліўся і націснуў на курок. Хэндс ішоў на мяне. Курок шчоўкнуў, але пісталет не стрэліў: порах быў падмочаны. Я праклінаў сябе за нядбайнасць. Чаму я не перазарадзіў раней пісталет, часу ж хапала! Стой цяпер, быццам авечка перад мясніком.

Нягледзячы на рану, Хэндс рухаўся надзіва хутка. Сівыя валасы ўпалі на яго твар, чырвоны ад шалу і задышкі. Часу даставаць другі пісталет у мяне не было. Апроч таго, я быў упэўнены, што ён таксама падмочаны. Я разумеў адно: трэба не проста адступаць назад, а адскокваць убок, інакш Хэндс загоніць мяне на нос, як загнаў нядаўна на карму. Калі гэта яму ўдас-



ца, пякучы холад дзесяці вяршкоў акрываўленага кінжала стане маім апошнім пачуццём у жыцці на гэтым свеце. Я абхапіў рукамі грот-мачту, даволі тоўстую, і чакаў. Напружыўся кожны мускул.


Убачыўшы, што я збіраюся ўвільваць, Хэндс спыніўся. Нейкі час ён рабіў выгляд, што кінецца зараз на мяне. Ён паварочваўся то ў адзін бок, то ў другі — і я рабіў тое ж самае. Наш двубой выдаваў на гульню, у якую я часта гуляў дома сярод скал бухты Чорнага Пагорка. Але, вядома, тады сэрца ў мяне ніколі так не калацілася. І ўсё ж лягчэй было гуляць у гэтую гульню хлапчуку, а не старому мараку з параненым сцягном. Я трохі асмялеў і пачаў нават прыкідваць, чым гэтая гульня кончыцца. Вядома, я мог пратрымацца доўга, але надзеі на ўратаванне ў ёй пакуль што не меў.

Мы стаялі адзін насупраць аднаго. І тут «Іспаньёла» раптам урэзалася ў пясок. Ад штуршка яна моцна нахілілася на левы бок. Палуба ўстала пад вуглом у сорак пяць градусаў, праз жолабы хлынулі струмені вады — ля фальшборта з'явілася вялікая лужына.

Мы абодва страцілі раўнавагу і пакаціліся, амаль абняўшыся, да жолабаў. Мярцвяк, з раскінутымі, як і раней, рукамі, скамянелы, пакаціўся ўслед за намі. Я з такой сілаю ўдарыўся галавою аб боцманаву нагу, што ў мяне ляскнулі зубы. Але ўскочыць першаму ўдалося мне — на Хэндса наваліўся нябожчык. Бегаць па палубе было ўжо немагчыма, трэба было прыдумаць якінебудзь новы спосаб уратавання, прыдумаць, не марудзячы ні імгнення, бо вораг рыхтаваўся ўжо кінуцца на мяне. Я ўчапіўся за ванты бізаньмачты, палез ўверх і, пакуль не ўсеўся на салінгу[1], аніводнага разу не перавёў дыхання.

[1] Салінг — верхняя перакладзіна на мачце, якая складаецца з дзвюх частак.





Хуткасць уратавала мяне: пада мною, за паўфута ад ног, бліснуў кінжал. Раззлаваны і збянтэжаны, Хэндс глядзеў на мяне, разявіўшы рот.

Я атрымаў невялікую перадышку і, не губляючы часу, перазарадзіў пісталет, затым другі.

Хэндс назіраў за мною з бяссільнай злосцю. Ён пачаў разумець, што ягонае становішча дужа пагоршылася. Разважыўшы, ён з цяжкасцю ўхапіўся за ванты і, трымаючы кінжал у зубах, павольна папоўз уверх, стогнучы ад болю ў параненай назе. Пакуль ён прасунуўся на трэць адлегласці паміж намі, я меў ужо ў руках два зараджаныя пісталеты.

— Яшчэ крок, містэр Хэндс,— загаварыў я,— і я выб'ю з вас мазгі! Мёртвыя, як вы ведаеце, не кусаюцца,— дадаў я, усміхаючыся.

Ён адразу ж спыніўся. Па ягоным твары было відаць, што ён нешта абдумвае. Радуючыся сваёй перавазе, я зарагатаў.

Нарэшце, праглынуўшы камяк у горле, боцман выняў з рота кінжал. На твары ў яго была ўсё тая ж разгубленасць.

— Джым,— сказаў ён,— мы з табою здурнелі, хлопец. Нам трэба заключыць перамір'е. Я б прыкончыў цябе, каб не гэты штуршок. Але мне ніколі не шанцуе, ніколі... Мне трэба спусціць сцяг, як ні цяжка мне, старому мараку, здацца табе, карабельнаму юнзе.

Я ап'янеў ад ягоных слоў і радасна пасмейваўся, надзьмуўшыся, усё роўна як певень на плоце, але раптам Хэндс узмахнуў правай рукою — і нешта стралою прасвісцела ў паветры. Я адчуў удар і рэзкі боль. Плячо маё было прыцвічана да мачты. Ад жахлівага болю і нечаканасці — не магу сказаць, абдумана ці падсвядома,— я націснуў абодва куркі. Пісталеты стрэлілі і выпалі ў мяне з рук. Але ўпалі яны не адны: глуха крыкнуўшы, боцман выпусціў ванты і паляцеў уніз галавою ў ваду.

РАЗДЗЕЛ XXVII


«Піястры!»

Судна нахілілася так моцна, што мачты павіслі над вадою. Я сядзеў на салінгу, бы на кураседле, якраз над залівам. Хэндс, які ўзабраўся не так высока, быў бліжэй да палубы і ўпаў у ваду паміж мною і фальшбортам. Толькі адзін раз вынырнуў ён на паверхню ў крывавым шуме і навек пайшоў на дно. Калі вада супакоілася, я ўбачыў яго. Ён ляжаў на чыстым, светлым пяску ў цяні карабля. З мачты было нават відаць, як праплылі над ім дзве рыбкі. Хвалі пакалыхваліся, і часам здавалася, што ён варушыцца і спрабуе ўстаць. Але ж ён быў двойчы мярцвяк: і прастрэлены куляю ці кулямі, і захлынуўся вадою, стаўшы ежаю для рыб на тым самым месцы, дзе збіраўся прыкончыць мяне.

Мне хацелася ванітаваць, кружылася галава — нагадаў аб сабе перажыты страх. Гарачыя струменьчыкі крыві цяклі ў мяне па спіне і па грудзях. Кінжал, што прыцвічыў маё плячо да мачты, апякаў яго, як распаленае жалеза. Аднак не боль быў страшны — такі боль я мог перацярпець нават не застагнаўшы,— палохала думка, што я магу сарвацца з салінга ў гэтую спакойную зялёную ваду, туды, дзе ляжыць мёртвы боцман.

Я з такой сілаю ўчапіўся ў салінг рукамі, што адчуў боль у пальцах. Каб не бачыць вады, я заплюшчыў вочы. Патроху галава мая праяснілася, сэрца стала біцца спакайней, я зноў узяў сябе ў рукі.

Перш за ўсё я паспрабаваў выцягнуць кінжал. Аднак, або ён задужа глыбока ўвайшоў у мачту, або мяне падводзілі нервы, але зрабіць гэта ніяк не ўдавалася. Мяне ахапіла дрыготка. І, як ні дзіўна, менавіта яна і дапамагла. Кінжал




закрануў мяне, зачапіўшы толькі скуру, і, калі я задрыжаў, яна парвалася. Кроў пацякла яшчэ мацней, але затое я стаў вольны. Зрэшты, не: мае камзол і кашуля ўсё яшчэ былі прыцвічаны да мачты.

Ірвануўшыся, я вызваліўся зусім. На палубу я вярнуўся па вантах правага борта. Ніякая сіла не прымусіла б мяне спусціцца па тых самых вантах, з якіх нядаўна сарваўся Хэндс.

Я сышоў у каюту і паспрабаваў перавязаць рану. Боль быў вельмі моцны, усё яшчэ цякла кроў. Але рана была неглыбокая, бяспечная і не замінала рухаць рукою. Я агледзеўся. Карабель належаў цяпер мне аднаму, і я стаў думаць, як пазбавіцца ад апошняга пасажыра — мёртвага О'Браяна.

Я ўжо казаў, што мярцвяк скаціўся да самага фальшборта. Ён ляжаў там, як жудасная, нязграбная лялька: велізарная, такога ж росту, як жывы чалавек, але пазбаўленая фарбаў жыцця. Справіцца з нябожчыкам было няцяжка. За час маіх трагічных прыгод я ўжо прызвычаіўся да мерцвякоў і амаль перастаў іх баяцца. Я падняў яго за пояс, як торбу з вотруб'ем, і адным узмахам выпіхнуў за борт. Ён упаў з гучным усплёскам. З галавы зляцеў і паплыў чырвоны каўпак. Калі ўзнятая муць улеглася, я ўбачыў на дне і Хэндса, і О'Браяна. Яны ляжалі побач. Ірландзец, нягледзячы на маладыя гады, быў зусім лысы. Так атрымалася, што ягоная галава апынулася на каленях у Хэндса, чалавека, які яго забіў. Над імі праносіліся рыбкі.

Я застаўся на караблі адзін. Толькі што пачаўся адліў. Сонца стаяла ўжо так нізка, што цені соснаў заходняга берага перасеклі бухту і дасягнулі палубы. Падзьмуў вячэрні брыз, і хоць з усходу бухту прыкрываў пагорак з дзвюма вяршынямі, снасці пачалі гудзець, а ветразі — пагойдвацца і хлопаць.



Я ўбачыў, што судну пагражае небяспека. Я хутка згарнуў кліверы і апусціў іх на палубу. Але спусціць грот было нашмат цяжэй. Калі шхуна дала крэн, гік перакінуўся за борт, і ягоны канец з двума-трыма футамі ветразя апынуўся нават пад вадою. Становішча стала яшчэ больш небяспечнае. А задача была такая цяжкая, што я не рашыўся хоць да чаго-небудзь дакрануцца. Нарэшце я выняў нож і перарэзаў фалы[1]. Гафель[2] адразу апусціўся, і абвіслы ветразь паплыў па вадзе. Як я ні пнуўся, але з ніралам[3] нічога не мог зрабіць. Гэта было вышэй маіх сіл. Засталося адно: кінуць «Іспаньёлу» на волю лёсу, як быў кінуты я сам.

Тым часам бухту ахуталі прыцемкі. Апошнія сонечныя промні, прабіўшыся цераз лясны прагал, ззялі на ветразях шхуны, як каштоўныя камяні на каралеўскай мантыі. Халадала. Адліў набіраў сілу, і карабель усё больш клаўся на бок.

Я прабраўся на нос і зірнуў уніз. Пад носам было вельмі мелка, і я, учапіўшыся на ўсякі выпадак абедзвюма рукамі за канат, асцярожна пералез цераз борт. Вада ледзь даходзіла мне да пояса. Пясок быў шчыльны, зрыты хвалямі, і я шпарка выйшаў на бераг, пакінуўшы «Іспаньёлу» ляжаць на баку і паласкаць свой ветразь у вадзе. Сонца зайшло, і ў соснах шумеў брыз.


Нарэшце кончыліся мае марскія прыгоды, і кончыліся ўдала. Шхуна была вырвана з рук піратаў, і мы можам хоць заўтра выйсці на ёй у мора. Я думаў адно аб тым, каб як мага хутчэй вярнуцца дамоў, у блакгауз, і пахваліцца сваімі перамогамі. Вядома, мне трохі дастанецца за самавольную адлучку, але захоп «Іспаньёлы» пе-

---

[1] Фал — снасць, пры дапамозе якой падымаюць ветразі.

[2] Гафель — перакладзіна, да якой прымацоўваецца верхні край ветразя.

[2] Нірал — снасць для спуску ветразяў.



раважыць усё, і я спадзяваўся, што нават сам капітан Смолет прызнае: часу я не марнаваў.

Разважаючы такім чынам, у цудоўным гуморы, я рушыў да блакгауза, дзе мяне чакалі сябры. Я памятаў, што самая ўсходняя з рачулак, якія ўпадаюць у бухту капітана Кіда, пачынаецца ля двухгаловага пагорка, і збочыў налева, да гэтага пагорка, разлічваючы перайсці рачулку ў найвузейшым яе месцы. Лес быў досыць рэдкі. Ідучы па адхоне, я абагнуў неўзабаве край пагорка і перайшоў рэчку ўброд.


Гэта было тое самае месца, дзе я сустрэў Бэна Гана. Я насцеражыўся, пачаў пільна пазіраць па баках. Стала зусім цёмна. Прайшоўшы праз цясніну паміж дзвюма вяршынямі пагорка, я ўбачыў водбліск вогнішча. Я вырашыў, што астраўлянін, мабыць, гатуе сабе вячэру, і падзівіўся ягонай неасцярожнасці: раз бачу гэты вобліск я, дык як жа ён застанецца незаўважны ў пірацкім лагеры?

Цемра была непраглядная, і я з цяжкасцю знаходзіў дарогу. Двухгаловы пагорак ззаду і вяршыня Падзорнае Трубы справа былі маімі адзінымі арыенцірамі, але іхнія абрысы ўсё болей размываліся ў змроку. Цьмяна мігцелі рэдкія зоркі. Я натыкаўся на кусты і звальваўся ў пясчаныя ямы.

Раптам трохі развіднела. Я зірнуў уверх. Вяршыню Падзорнае Трубы заліло бледным святлом. Унізе я ўбачыў між дрэў нешта вялікае, серабрыстае і зразумеў, што ўзышоў месяц.

Ісці стала нашмат лягчэй, і я паскорыў хаду. Часам нават бег, так не цярпелася дабрацца хутчэй да частаколу. Але, трапіўшы ў гай, які акаляў наш форт, я зноў насцярожыўся і пайшоў больш павольна. Сумна закончыліся б мае прыгоды, калі б сябры прынялі мяне за ворага і пачалі страляць.

Месяц уздымаўся ўсё вышэй і вышэй. Ляс-





ныя прагалы былі залітыя святлом. Але акурат на маім шляху я заўважыў паміж дрэвамі нейкае ззянне; не падобнае да месяцовага. Гарачае, чырвонае, яно часам слабела. Я ніяк не мог зразумець, што ж гэта такое. Можа, гэта дагарала вогнішча.

Нарэшце я дабраўся да ўзлеску. Заходні край частаколу залівала святлом месяца, астатняя ж частка агароджы і сам блакгауз патаналі ў цемрадзі, прарэзанай сям-там доўгімі серабрыстымі палосамі. А за блакгаузам палала вялізнае вогнішча. Ягоны барвовы водбліск дужа адрозніваўся ад бледна-пяшчотнага водсвету месяца. Ля блакгауза не было ніводнага чалавека. Цішыню парушаў толькі вецер, які пакалыхваў галлё.

Я спыніўся, здзіўлены і, бадай, крыху напалоханы: мы ніколі не разводзілі вялікіх вогнішчаў, бо берaглі дровы па загаду капітана. Мяне працяў страх: ці ж не здарылася што з маімі сябрамі, пакуль я адсутнічаў?

Я прабраўся да ўсходняга краю форта, трымаючыся ўвесь час у цяні, і пералез цераз частакол у самым цёмным месцы.

Каб нічым не выдаць сябе, я апусціўся на карачкі і ціха папоўз да рага блакгауза. І нарэшце паспакайнеў, бо пачуў храп. Я яго зазвычай цярпець не магу, проста пакутую, калі нехта храпе побач у сне, але цяпер гучны і мірны храп сяброў здаўся мне музыкаю. Ён падзейнічаў на мяне так, як дзейнічае на моры ўпэўнены голас вахтавага: «Усё ў парадку!»

Але засмуціла другое: вартавы не выконвае свайго абавязку. Калі б цяпер да блакгауза падкраўся не я, а Сільвер са сваімі людзьмі, дык ніводзін з маіх сяброў ужо не ўбачыў бы золку. Мабыць, падумаў я, усё таму, што капітан ранены. І я зноў папракнуў сябе за тое, што пакінуў таварышаў у небяспецы, калі іх так мала, што цяжка нават падмяніць вартавога.



Я падышоў да дзвярэй і зазірнуў у блакгауз. Але там было гэтак цёмна, што я нічога не змог разгледзець. Апроч храпу чуліся яшчэ нейкія дзіўныя гукі, усё роўна як нешта пастуквала, хлопала.

Выцягнуўшы ўперад рукі, я ўвайшоў у блакгауз. «Лягу на сваё звычайнае месца,— падумаў я, усміхнуўшыся.— Але ж і насмяюся я ўранку, калі мяне заўважаць!»

Тут я спатыкнуўся аб чыюсьці нагу. Чалавек перавярнуўся на другі бок, прастагнаў, але не прачнуўся.

І тады ў цемнаце раптам пачуўся рэзкі крык:

— Піястры! Піястры! Піястры!..

Гэта быў Капітан Флінт, Сільвераў папугай! Ён крычаў без перадыху, адным і тым голасам, усё роўна як заведзены. Дык вось што гэта былі за дзіўныя гукі: нешта дзёўб і хлопаў крыламі папугай! Вось хто ахоўваў піратаў лепш за любога вартавога.

Пачуўшы пранізлівы крык птушкі, мяцежнікі прачнуліся і ўскочылі.

— Хто ідзе? — вылаяўшыся, закрычаў Сільвер.

Я кінуўся ўцякаць, але наляцеў на некага. Адштурхнуўшы аднаго, трапіў у рукі другога. Гэты ўжо ўхапіўся за мяне.

— Дзік, прынясі галаўню.


Нехта выбег з блакгауза і вярнуўся з галаўнёю.



ЧАСТКА ШОСТАЯ



КАПІТАН СІЛЬВЕР




РАЗДЗЕЛ XXVIII

У варожым лагеры

Барвовае святло галаўні разлілося па блакгаузе. І што ж [redacted] ўбачыў!.. Піраты захапілі блакгауз і ўсе нашыя запасы. І бочачка з каньяком, і свініна, і торбы з сухарамі стаялі, дзе і раней. Але найбольш жахнуўся я ад таго, што не заўважыў аніводнага палоннага. Усе мае сябры загінулі, падумаў я, і сэрца маё сціснулася. Чаму [redacted] не сустрэў смерць разам з імі!..

У жывых засталося толькі шасцёра піратаў, усе яны былі цяпер перада мною. Пяцёра, з чырвонымі, азызлымі тварамі, узняліся. Было відаць, што сон іх не працверазіў. Шосты адно прыўзняўся на локці. Ён быў бледны, што мярцвяк. Галава ў яго была перавязана акрываўленай анучаю. Я згадаў, што ў час пірацкае атакі мы падстрэлілі аднаго з нападнікаў, які потым знік у лесе. Напэўна, гэта ён і быў.

Папугай сядзеў на плячы ў Цыбатага Джона і чысціў дзюбаю пёры. Сам Сільвер быў бледны і змрочны, як ніколі. Ён усё яшчэ не зняў свайго файнага каптана, у якім прыходзіў да капітана на перамовы, але цяпер каптан быў выпацканы ў гліну і падраны калючкамі.



— Глядзі ты,— сказаў ён,— ды гэта Джым Хоўкінс, трасца на мяне!.. Зайшоў у госці! Заходзь, заходзь, хлопец, я табе заўсёды рады.

Сільвер усеўся на бочачку з брэндзі і пачаў набіваць тытунём люльку.


— Дай мне, Дзік, прыкурыць,— папрасіў ён. І, закурыўшы, дадаў: — Дзякуй, прыяцель. Можаш пакласці галаўню. А вы, джэнтльмены, кладзіцеся, не саромцеся. Вы зусім не абавязаны стаяць перад містэрам Хоўкінсам навыцяжку. Ён ужо нам прабачыць. Дык ты тут, Джым, у нас... Які прыемны сюрпрыз для беднага старога Джона! Я з першага позірку зразумеў, што ты спрытны хлопец, але цяпер бачу, ты проста герой.

Вядома, [redacted] ні слова не сказаў у адказ. Яны паставілі мяне ля самае сцяны. Я стараўся глядзець Сільверу ў вочы як мага спакайней, але сэрца маё агарнула роспач.

Сільвер, ані каліва не змяніўшыся з твару, зацягнуўся раз ці два і загаварыў зноў:

— Раз ужо ты, Джым, зайшоў да нас у госці, я скажу табе ўсё, што думаю. Ты заўсёды мне падабаўся, бо ў цябе на плячах галава. Гледзячы на цябе, я і сябе згадваю маладым і прыгожым. Я заўсёды хацеў, каб ты далучыўся да нас, атрымаў сваю долю скарбаў і памёр багатым джэнтльменам. І вось, сынок, ты прыйшоў. Капітан Смолет файны марак, я гэта заўсёды казаў, але вельмі ўжо налягае на дысцыпліну. «Абавязак ёсць абавязак»,— кажа ён,— і мае рацыю. А ты кінуў свайго капітана. Нават доктар незадаволены табою. «Няўдзячны нягоднік»,— так ён сказаў пра цябе. Словам, да сваіх ты ўжо не можаш вярнуцца. Яны цябе не хочуць бачыць, і, калі не хочаш збіраць трэцюю каманду, табе прыйдзецца далучыцца да капітана Сільвера.

Значыцца, зразумеў я, справы нашыя не такія ўжо благія: сябры засталіся жывыя. І хоць я гатовы быў паверыць Сільверу, што яны не мо-





гуць дараваць мне майго дэзерцірства, усё роўна вельмі ўзрадаваўся.

— Я ўжо не кажу пра тое, што ты ў нашых руках,— працягваў Сільвер,— ты гэта сам бачыш. Вось і ўсе мае довады. Я ніколі не бачыў вялікай карысці ў пагрозах. Калі табе даспадобы служба ў нас, далучайся самахоць. Ну, а калі не, Джым, ты можаш свабодна гэта сказаць. Свабодна, прыяцель, нічога не баючыся. Вось як я шчырую з табою, няхай мяне трасца возьме, калі я хітрую!

— Мне трэба адказваць? — спытаўся я дрыготкім голасам, бо адчуў у ягонай насмешлівай балбатні смяротную пагрозу. Шчокі ў мяне гарэлі, сэрца калацілася.

— Ніхто цябе не змушае, хлопец,— сказаў Сільвер.— Падумай як след. Спяшаць нам няма куды, у кампаніі з табою час праходзіць весела.

— Ну што ж,— сказаў я, трохі асмялеўшы,— раз мне трэба выбраць, на чыім баку быць, я маю права ведаць, што тут у вас адбываецца. Чаму вы тут і дзе мае сябры?

— Што адбываецца? — паўтарыў мае словы адзін з піратаў, змрочны, як хмара.— Хацеў бы я сам зразумець гэта!

— Заткніся, прыяцель, пакуль у цябе ні аб чым не пытаюцца! — раззлаваны, абарваў яго Сільвер і зноў спакойна і ветліва загаварыў са мною: — Учора ўранку, містэр Хоўкінс, да нас прыйшоў доктар Ліўсі з белым сцягам. «Вы засталіся на мелі, капітан Сільвер,— сказаў ён,— карабель знік». Пакуль мы пілі ром і спявалі песні, карабля не стала. Тут мы далі маху, нічога не скажаш. Ніхто з нас не глядзеў за караблём. Мы выбеглі на бераг, і, клянуся ўдачаю, наш стары карабель знік.У нас ледзь вочы не павылазілі. «Што ж,—сказаў доктар,— давайце заключаць дамову». Мы заключылі дамову — я ды ён,— і вось мы атрымалі вашыя запасы,



каньяк, блакгауз, дровы, якія вы так абачліва насеклі, усю, так сказаць, вашу шхуну, ад салінга да кільсана[1]. А яны пайшлі, і дзе яны цяпер, я не ведаю.

Ён зноў спакойна зацягнуўся.

— А калі ты думаеш, што цябе ўключылі ў дамову,— працягваў ён,— дык вось апошнія словы доктара. «Колькі вас засталося?» — спытаўся я. «Чацвёра,— адказаў ён.— Чацвёра, і адзін з іх ранены. А дзе гэты гіцаль Хоўкінс, не ведаю і ведаць не хачу,— сказаў ён.— Мы нават згадваць пра яго гідзімся». Вось што ён сказаў.

— Гэта ўсё? — спытаўся я.

— Усё, што табе трэба ведаць, сынок,— адказаў Сільвер.

— А зараз я мушу зрабіць выбар?

— Так, зараз ты мусіш зрабіць выбар,— сказаў Сільвер.

— Добра,— сказаў я.— Я не такі дурны і ведаю, на што іду. Рабіце са мною што хочаце, мне ўсё роўна. Занадта шмат смерцяў я ўбачыў з тае пары, як сустрэўся з вамі. Але спярша хачу вам сёе-тое расказаць,— працягваў я, хвалюючыся.— Становішча ў вас паганае: вы страцілі і карабель, і скарбы, і сваіх людзей. Гіблая ваша справа. І калі хочаце ведаць, хто ва ўсім вінаваты, дык ведайце: я. Я сядзеў у бочцы з-пад яблыкаў той ноччу, калі мы ўбачылі востраў, і чуў усё, што гаварылі вы, Джон, і ты, Дзік Джонсан, і Хэндс, які ляжыць цяпер на дне мора. І ўсё, што я падслухаў, я адразу ж расказаў. Гэта я перарэзаў у шхуны якарны канат, я забіў Хэндса, я адвёў шхуну ў такое месца, што вы ніколі яе не знойдзеце, ніхто з вас не знойдзе. Перамога за мною, а не за вамі, і я баюся вас не болей, чым мух. Можаце забіць мяне ці злітавацца,

---

[1] Кільсан — брус на дне карабля, які ідзе паралельна кілю.



ваша воля. Але скажу вам вось яшчэ што,і нічога больш: калі вы злітуецеся, я забудуся на ўсё, што было, і, калі вас будуць судзіць за пірацтва, паспрабую ўратаваць вас ад пятлі. Зараз вашая чарга выбіраць. Можаце забіць мяне, але гэта не прынясе вам ніякае карысці. Калі ж пакінеце ў жывых, я пастараюся, каб вы не трапілі на шыбеніцу.

Я змоўк. Я задыхаўся. Дзіўна, але ніхто з іх нават не зварухнуўся. Яны глядзелі на мяне як авечкі. Не дачакаўшыся адказу, я загаварыў зноў:

— Мне здаецца, містэр Сільвер, што вы тут лепшы чалавек. І калі я загіну, раскажыце доктару, што я памёр годна.


— Буду мець на ўвазе,— сказаў Сільвер такім дзіўным тонам, што я так і не зразумеў, ці то ён смяецца з мяне, ці то ўхваляе маю мужнасць.

— Не забудзьцеся...— выкрыкнуў стары марак з цёмным ад загару тварам, той самы Морган, якога я бачыў у карчме Цыбатага Джона ў брыстольскім порце,— не забудзьцеся, што гэта ён пазнаў тады Чорнага Пса!

— І гэта яшчэ не ўсё,— дадаў кухар.— Ён, трасца на яго, і ёсць той самы хлопец, што выцягнуў карту з куфра Білі Бонса. Нарэшце ты папаўся нам, Джым Хоўкінс!

— Пусціць яму кроў! — крыкнуў Морган, вылаяўся і ўскочыў з такой лёгкасцю, нібыта яму было дваццаць гадоў.

— На месца! — крыкнуў Сільвер.— Хто ты такі, Том Морган? Можа, ты думаеш, што ты тут капітан? Клянуся ўдачаю, я навучу цябе слухацца! Пасмей толькі пярэчыць! Апошнія трыццаць гадоў кожны, хто заступаў мне дарогу, кожны, ты чуеш, боўдзіла, трапляў альбо на рэю, альбо за борт, рыбам на пракорм. Не было яшчэ чалавека, які б не паладзіў са мною і ўбачыў назаўтра сонца! Запомні, Том Морган!



Том прыціх, але забурчалі астатнія.

— Том правільна кажа,— сказаў адзін.

— Хапіла з мяне камандзіраў! — дадаў другі.— І няхай мяне лепш павесяць, чым я дазволю табе вадзіць мяне за нос!

— Джэнтльмены,— зароў Сільвер,— хто з вас хоча мець справу са мною?

Ён па-ранейшаму сядзеў на бочцы. Падаўшыся ўперад, ён адвёў руку з люлькаю ўбок.


— Ну, чаго ж вам трэба? Кажыце, што думаеце. Ці ў вас мову адняло? Выходзь, хто хоча, я чакаю. Не дзеля таго я пражыў столькі гадоў, каб які-небудзь п'яны індык станавіўся мне ўпоперак дарогі. Вы ведаеце наш звычай, вы лічыце сябе джэнтльменамі ўдачы. Ну што ж, я гатовы. Няхай той, хто насмеліцца, выме свой корцік, і я, хоць і на мыліцы, убачу, якога колеру ў яго вантробы, перш чым згасне гэтая люлька!


Ніхто не паварушыўся, ніхто не прамовіў ніводнага слова.

— Вось так вы заўсёды,— працягваў ён, сунуўшы люльку ў рот.— Люба на вас паглядзець... Ад смеласці вы не памраце. Ці вы не разумееце англійскае мовы? Я ж тут капітан, і выбралі мяне вы. Я ваш капітан, бо разумнейшы за вас сама меней на цэлую марскую мілю. Вы не хочаце біцца са мною, як належыць джэнтльменам удачы. Тады, клянуся небам, вы павінны слухаць мяне! Мне падабаецца гэты хлапчук. Лепшага я ніколі не бачыў. Ён больш мужчына, чым пара такіх пацукоў, як вы, разам узятых. Дык слухайце, што я кажу вам: той, хто дакранецца да яго, будзе мець справу са мною.

Запала доўгае маўчанне.

Я, выпрастаўшыся, стаяў ля сцяны. Сэрца маё ўсё яшчэ калацілася, але мільганула надзея. Сільвер сядзеў спінаю да сцяны, скрыжаваўшы рукі, пыхкаў люлькаю і быў спакойны, як на казані ў царкве. Толькі вочы ў яго бегалі: ён упо-





тайкі назіраў за сваёй непакорлівай камандаю.

Піраты адышлі ў далейшы ад Сільвера кут і пачалі шаптацца. Часам яны азіраліся, і барвовае святло галаўні падала на іх узбуджаныя твары. Аднак паглядвалі яны не на мяне, а на Сільвера.

— Вы, здаецца, збіраецеся нешта сказаць? — спытаўся Сільвер і сплюнуў далёка перад сабою.— Дык гаварыце, а то зачакаўся.

— Прашу прабачэння, сэр,— пачаў адзін пірат.— Вы часта парушаеце нашы звычаі. Але ёсць звычай, які і для вас застаецца непахісны. Каманда незадаволена тым, як з ёй абыходзяцца, і ў яе ёсць свае правы, як і ў любой іншай каманды. Я, усе мы маем права сабрацца і пагаварыць. Прашу прабачэння, сэр, бо вы ўсё ж у нас капітан, аднак я хачу скарыстацца сваім правам і выйсці на раду.

Элегантна аддаўшы Сільверу чэсць, гэты высокі жаўтавокі матрос гадоў трыццаці пяці спакойна рушыў да дзвярэй і выйшаў. Астатнія выйшлі ўслед за ім. Кожны аддаваў Сільверу чэсць і мармытаў што-небудзь у сваё апраўданне.

— Згодна са звычаем,— сказаў адзін.

— На матроскую сходку,— прамовіў Морган.

Мы з Сільверам засталіся ўдвух ля галаўні.

Кухар адразу ж выняў з рота люльку.

— Слухай мяне, Джым,— прашаптаў ён ледзь чутна, але цвёрда.— Ты на валасок ад смерці і, што горш за ўсё, ад катавання. Яны збіраюцца разжалаваць мяне. Ты бачыў, як я за цябе заступаўся. Спачатку я не хацеў гэтага рабіць, але ты загаварыў і я перадумаў. Я быў у роспачы ад усіх няўдач, ад думкі пра шыбеніцу. Аднак, паслухаўшы цябе, я сказаў сабе: заступіся за Хоўкінса, Джон, і ён заступіцца за цябе. Ты — ягоная апошняя карта, Джон, а ён, клянуся небам,— твая апошняя карта! Паслуга за паслугу, вырашыў я. Я ўратую сабе сведку для суда, а ён — маю шыю.



Я пачынаў цьмяна разумець Цыбатага Джона.

— Вы хочаце сказаць, што прайгралі гульню? — спытаўся я.

— Менавіта так, клянуся д'яблам! — адказаў ён. — Раз няма карабля, застаецца адна шыбеніца. Я ўпарты, Джым, але, калі я не ўбачыў у бухце шхуны, я зразумеў: гульня скончылася. А гэта хеўра і іхняя рада — няхай раяцца... Усе яны ёлупы і баязліўцы. Я зраблю ўсё, што змагу, каб уратаваць цябе ад іх. Але слухай, Джым, паслуга за паслугу: ты ўратуеш Цыбатага Джона ад шыбеніцы

Я быў збянтэжаны: за які ж маленечкі шанц хапаецца ён, стары пірат, атаман!

— Я зраблю ўсё, што магу,— сказаў я.

— Значыцца, дамовіліся! — усклікнуў ён. — Лёгка ты выкруціўся, дый я, прысягаю небам, маю цяпер шанц.

Ён прачыкільгаў да галаўні і зноў прыкурыў.


— Зразумей мяне, Джым,— працягваў ён, вярнуўшыся.— У мяне яшчэ ёсць галава на плячах, і я вырашыў перайсці на сквайраў бок. Я ведаю, што ты схаваў карабель дзе-небудзь у бяспечнай бухце. Як ты гэта зрабіў, не ведаю, але я ўпэўнены, што з суднам нічога на здарылася. Хэндс і О'Браян — ёлупні. Я ніколі на іх надта не спадзяваўся. А зараз заўваж: я ў цябе ні пра што не пытаюся і іншым не дазваляю пытацца. Я ведаю правілы гульні і разумею, што прайграў. А ты такі малады — разам з табою мы будзем вялікай сілаю!


Ён нацадзіў у конаўку каньяку з бочачкі.

— Не хочаш пакаштаваць, прыяцель? — спытаўся ён.

Я адмовіўся.

— А я вып'ю трохі, Джым,— сказаў ён.— Наперадзе столькі ўсякага клопату, што трэба крыху разагрэцца. Дарэчы, аб клопаце. Навошта было доктару аддаваць мне гэтую карту, Джым?





Па маім шчыра здзіўленым твары Сільвер зразумеў, што распытваць мяне на гэты конт бескарысна.

— Так, ён аддаў мне сваю карту,— сказаў Цыбаты Джон.— За гэтым нешта стаіць, несумненна... нешта за гэтым тоіцца, Джым... благое ці добрае...

Ён зноў глытнуў каньяку і пакруціў сваёй вялікай галавою з выглядам чалавека, якога чакаюць непазбежныя беды.

РАЗДЗЕЛ XXIX

Зноў чорная метка

Сходка піратаў працягвалася яшчэ нейкі час. Нарэшце адзін з іх вярнуўся ў блакгауз і, насмешліва аддаўшы Сільверу чэсць, папрасіў дазволу ўзяць галаўню. Сільвер дазволіў, і пасланнік выйшаў, пакінуўшы нас абодвух у цемрадзі.

— Набліжаецца шторм, Джым,— сказаў Сільвер.

Ён зноў ужо звяртаўся да мяне па-прыяцельску.

Я падышоў да бліжэйшае байніцы і зірнуў на двор. Вогнішча амаль дагарала. Святла яно ўжо не давала ніякага, нічога дзіўнага, што змоўшчыкі і папрасілі галаўню. Яны згуртаваліся на адхоне пагорка на паўдарозе паміж блакгаузам і частаколам. Адзін з іх трымаў галаўню, другі ўкленчыў. Астатнія трохі нагнуліся, глядзелі, што ён робіць. У руках у яго былі адкрыты нож, лязо якога паблісквала ў святле месяца і галаўні, і нейкая кніга. Пакуль я гадаў, як магла трапіць у іхнія рукі кніга, піраты ўзняліся, і ўсе змоўшчыкі рушылі да блакгауза.

— Яны ідуць сюды,— сказаў я і вярнуўся на ранейшае месца, бо не хацеў, каб піраты заўважылі, што я падглядваю за імі: гэта было ніжэй маёй годнасці.

— Просім ласкава, прыяцель, няхай ідуць! — весела сказаў Сільвер.— У мяне ёсць чым іх сустрэць.

Дзверы расчыніліся, і пяцёра піратаў застылі ў нерашучасці на ганку, падштурхоўваючы адзін аднаго наперад.

У іншых абставінах было б забаўна назіраць, як павольна, баязліва, спыняючыся на кожным кроку і выцягнуўшы правую руку, заціснутую ў кулак, набліжаўся да Сільвера выбарны.

— Падыдзі бліжэй, прыяцель,— сказаў Сільвер,— не бойся, не з'ем. Давай, цюлень, што там у цябе? Я ведаю звычаі. Дэпутата не крану.

Узбадзёраны гэтымі словамі, пірат хутка падышоў да Сільвера і, сунуўшы нешта яму ў руку, таропка адбег назад да таварышаў.

Кухар глянуў на далонь.

— Чорная метка! Я так і думаў,— прамовіў ён.— Дзе вы ўзялі паперу?.. Чакайце!.. Што гэта?.. Ах вы, нясчасныя!.. Выразалі з Бібліі! Які гэта ёлуп дадумаўся?..

— Вось бачыце! — сказаў Морган.— Што я казаў? Нічога добрага з гэтага не выйдзе.


— Ну, цяпер гэта вам залічыцца,— працягваў Сільвер.— Вас усіх павесяць, можна не сумнявацца. Што за дурань прыхапіў з сабою Біблію?

— Дзік,— сказаў нехта.

— Дзік? Ну, прыяцель, маліся богу,— сказаў Сільвер.— Гіблая твая справа, можаш мне паверыць.

Але тут умяшаўся жаўтавокі бамбіза.

— Хопіць часаць языком, Джон,— сказаў ён.— Каманда, згодна з нашым звычаем, параіўшыся на сходцы, паслала табе чорную метку.



Перавярні яе, як патрабуе звычай, і прачытай напісанае. Тады і пагамонім.

— Дзякуй, Джордж,— сказаў Сільвер.— Ты ў нас заўсёды быў чалавек дзелавы і адмыслова ведаеш нашы звычаі, як бачу. Дык што ж тут напісана? Ага! «Звергнуты». Вось як. І почырк які выдатны, нібыта надрукована. Гэта ў цябе такі почырк, Джордж? Ды ты ж першы чалавек у камандзе! Я зусім не здзіўлюся, калі капітанам выберуць цябе. Будзь ласкавы, дай мне галаўню, а то люлька нешта не раскурваецца.

— Хопіць, Сільвер, дурыць нас! — сказаў Джордж.— Слухаць цябе можна доўга, аднак злазь з гэтай бочкі — ты ўжо не капітан — і не замінай нам. Мы будзем выбіраць новага капітана.

— А я думаў, ты і праўда ведаеш звычаі,— пагардліва запярэчыў Сільвер.— Але калі ты не ведаеш, дык я ведаю. Табе прыйдзецца пачакаць. Я яшчэ ваш капітан. Вы павінны выказаць мне абвінавачанні, [redacted] [redacted] мушу на іх адказаць. А пакуль што ваша чорная метка не даражэйшая за сухар. Паглядзім, што з гэтага выйдзе.


— Можаш не баяцца,— адказаў Джордж,— звычаяў мы не парушым. Мы дзейнічаем сумленна. Вось табе нашы абвінавачанні. Па-першае, ты праваліў усю справу. Супраць гэтага ты нічога не скажаш. Па-другое, ты дазволіў нашым ворагам выслізнуць з гэтай расткі. Навошта яны пакінулі блакгауз, не ведаю, але яны захацелі гэтага. Па-трэцяе, ты забараніў нам нагнаць іх. Ды мы цябе наскрозь бачым, Джон Сільвер, ты павёў двайную гульню, але нічога ў цябе не выйдзе. Па-чацвёртае, ты заступіўся за гэтага хлопца.

— Усё? — спакойна спытаўся Сільвер.

— Гэтага досыць,— адказаў Джордж.— Нас павесяць сушыцца на сонцы — і ўсё з-за тваіх пралікаў!

— А зараз паслухайце, што я адкажу на гэ-


95
90



тыя чатыры пункты. Буду адказваць па парадку. Вы кажаце, што я праваліў усю справу. Але вы ўсе ведаеце, чаго я хацеў. Калі б вы паслухаліся мяне, то былі б цяпер усе на «Іспаньёле» жывыя і здаровыя, і золата ляжала б у труме, клянуся ўдачаю! І хто перашкодзіў мне зрабіць усё так, як было трэба? Хто мяне прыспешваў, мяне, вашага законнага капітана? Хто ўручыў мне чорную метку ў першы дзень на гэтым востраве і пачаў гэтыя вар'яцкія скокі? Выдатныя скокі — і я танцую разам з вамі,— у іх такія ж каленцы, якія выкідваюць тыя скакуны, што матляюцца ў Лондане на шыбеніцы. Дык хто ўсё гэта пачаў? Эндэрсан, Хэндс і ты, Джордж Мэры! З гэтых баламутаў ты адзін застаўся жывы, і ў цябе хапае яшчэ нахабства лезці ў капітаны! У цябе, які ледзь не загубіў усіх нас! Не, прыяцель, дарма пнешся, прысягаю сваёй мазгаўнёю!


Сільвер змоўк. Па твары Джорджа і астатніх піратаў я адчуў, што гаварыў ён не марна.

— Гэта пункт першы! — усклікнуў абвінавачаны, выціраючы ўспацелы лоб.— Клянуся, мне моташна размаўляць з вамі! У вас няма ні розуму, ні памяці. Дзіўлюся толькі, як гэта вашыя маткі адпусцілі вас у мора. У мора!.. І вы яшчэ лічыце сябе джэнтльменамі ўдачы. Лепш бы вы сталі краўцамі, дальбог...

— Досыць, Джон,— сказаў Морган.— Адказвай на астатнія пункты.

— На астатнія? — усклікнуў Сільвер.— Астатнія таксама не лепшыя. Вы кажаце, нашая справа гіблая. Клянуся небам, вы нават не падазраяце, наколькі яна гіблая! Нам так мала засталося да шыбеніцы, што мая шыя ўжо пруцянее ад пятлі. Так і бачу, як мы матляемся ў кайданах, над намі кружляюць груганы, а маракі тыкаюць у нас пальцамі. «Хто гэта?» — пытаецца адзін. «Гэта Джон Сільвер. Я яго выдатна ведаў»,— адказвае другі. Вецер гойдае нас і разносіць лязг





кайданоў. Вось што чакае кожнага з нас з-за Джорджа Мэры, Хэндса, Эндэрсана і іншых ёлупняў! Нарэшце вас цікавіць пункт чацвёрты — гэты хлапчук. Няўжо вы, асліныя вашы галовы, не разумееце, што гэта заложнік?! Нам што, лепей ад таго стане, што мы яго прыкончым? Ён, можа, наша апошняя надзея.

Забіць яго? Не, сябры, я гэтага рабіць не стану! Зараз пункт трэці. Слухайце, калі хочаце што-небудзь зразумець. Можа, вам не патрэбны штодзённыя візіты доктара, які скончыў каледж? Табе, Джон, з тваім прадзіраўленым чэрапам, ці табе, Джордж Мэры — ты ж калоцішся ўжо ад ліхаманкі, і вочы жоўтыя, як лімон! Можа, вы не ведаеце, што хутка сюды павінен прыйсці на дапамогу другі карабель? Але ён неўзабаве прыйдзе, і вось тады нам і спатрэбіцца заложнік. Нарэшце пункт другі. Вы абвінавачваеце мяне ў тым, што я заключыў дамову. Дык вы ж самі на каленях упрошвалі мяне заключыць яе. Поўзалі перада мною, скуголілі... Вы б падохлі з голаду, калі б я не заключыў яе... Але ўсё гэта лухта. Паглядзіце — вось галоўнае!

І ён кінуў на падлогу аркуш паперы. Я адразу ж пазнаў яго: гэта была тая самая жоўтая карта з трыма чырвонымі крыжыкамі, якую я калісь дастаў з куфра Білі Бонса.


Збянтэжаны, я ніяк не мог уцяміць, чаму доктар аддаў яе Сільверу.

На піратаў гэтая карта падзейнічала яшчэ мацней. Яны накінуліся на яе, як каты на мыш. Яны вырывалі яе з рук у рукі, лаяліся, крычалі, смяяліся, бы дзеці. Можна было падумаць, што яны ўжо не толькі авалодалі золатам, але і вязуць яго на караблі без аніякіх перашкод.

— Так,— сказаў адзін,— гэта Флінтаў подпіс, можаце не сумнявацца. Д. Ф., а ўнізе мёртвы вузел — ён заўседы так падпісваўся.

— Усё гэта выдатна,— сказаў Джордж,—





але як мы вывезем скарбы, калі ў нас няма карабля?

Тут Сільвер ускочыў, трымаючыся рукою за сцяну.

— Я апошні раз папярэджваю, Джордж! — закрычаў ён.— Яшчэ адно слова, і я буду біцца з табою! Як?.. А адкуль [redacted] ведаю, як? Гэта ты мне павінен сказаць, як, ты і ўся твая кампанія, якая праваронiла маю шхуну, з тваёй дапамогаю, каб ты сперунеў! Але не, ад цябе разумнага слова не дачакаешся: у цябе ж розум,што ў прусака. Але размаўляць са мной пачціва ты абавязаны, а то я цябе навучу!

— Слушна! — сказаў стары Морган.

— Вядома, слушна! — падхапіў кухар.— Ты пакінуў нас без карабля, [redacted] я знайшоў скарбы — хто з нас двух больш заслугоўвае павагі? Але, клянуся небам, з мяне хопіць! Выбірайце ў капітаны каго хочаце, толькі не мяне!

— Сільвера! — зараўлі піраты.— Кумпяка назаўсёды! Кумпяка ў капітаны!


— Дык вось што вы цяпер заспявалі! — закрычаў кухар.— Джордж, табе, бачу, прыйдзецца пачакаць іншага выпадку. Тваё шчасце, што я незлапомны. Ніколі не помсціў. Але што, прыяцелі, рабіць з чорнай меткаю? Цяпер яна, здаецца, непатрэбная? Дзік запаскудзіў сваю Біблію, загубіў сваю душу — і ўсё марна.

— А можа, яна яшчэ прыдатная для прысягі? — спытаўся Дзік, якога, было відаць, дужа трывожыла здзейсненае ім блюзнерства.

— Біблія з адрэзанай старонкаю? — жахнуўся Сільвер.— Ці не звар'яцеў ты, хлопец? Ды ў ёй жа не больш святасці, чым у спеўніку!

— Няўжо яна такая спаганеная? — ускрыкнуў Дзік.

— Думаю, яе можна захаваць на ўсякі выпадак,— супакоіў яго нарэшце крыху Сільвер, пасля звярнуўся да мяне, падаючы чорную мет-





ку.— А вось гэта, Джым, вазьмі сабе на памяць.

Велічынёю метка была з крону[1]. Адзін яе бок быў белы — Дзік парэзаў самую апошнюю старонку Бібліі, на другой былі вершы з Апакаліпсіса. Я й дагэтуль памятаю два словы: «псы і забойцы». Тэкст быў увесь выпацканы сажаю, а на чыстым баку меткі было выведзена вуглем: «Звергнуты».

Цяпер гэтая чорная метка, аб якую я калісь адразу ж выпацкаў пальцы, ляжыць перада мною, але ад надпісу засталіся адно сляды драпін, як ад пазногця.

Так закончыліся падзеі гэтае ночы. Неўзабаве, выпіўшы рому, мы леглі спаць. Сільвер, помсцячы, прызначыў Джорджа Мэры вартавым, пригразіўшы яму смерцю, калі ён чаго-небудзь не ўгледзіць.

Я доўга не мог заснуць: думаў пра забітага мною чалавека, пра сваё небяспечнае становішча, і, перш за ўсё, пра тую адмысловую гульню, якую вёў Сільвер, адной рукою ўтрымліваючы мяцежнікаў, а другой хапаючыся за любы магчымы і немагчымы сродак, каб ўратаваць сваё нікчэмнае жыццё. Ён мірна спаў і гучна хроп, і ўсё ж маё сэрца сціскалася ад жалю, калі я, гледзячы на яго, думаў, якімі страшнымі небяспекамі ён акружаны і якая ганебная смерць чакае яго.

РАЗДЗЕЛ XXX

Пад слова гонару

Мяне разбудзіў, дакладней, усіх нас разбудзіў — я ўбачыў, як ускочыў спрасонку ля дзвярэй Джордж Мэры,— ясны, гучны голас, які данёсся з узлеску:

[1] Крона — срэбраная манета.





— Гарнізон, пад'ём! Доктар ідзе!

Гэта і праўда быў доктар. Як я ўзрадаваўся, пачуўшы ягоны голас! Але было і сорамна. Я парушыў дысцыпліну ў такім цяжкім для таварышаў становішчы, пакінуў іх адных — і чым усё гэта скончылася? А тым, што я ў палоне ў злачынцаў, якія ў любы момант могуць зрабіць са мною ўсё, што захочуць. Ну як я пагляджу зараз доктару ў твар?..

Доктар, напэўна, устаў яшчэ да золку, бо дзень толькі пачынаўся. Я падбег да байніцы і выглянуў. Ён стаяў унізе, па калена ў паўзучым тумане, як стаяў нядаўна тут Сільвер.

— А, доктар! Добрай раніцы, сэр! — усклікнуў Сільвер з ветлівай усмешкаю на твары.— Рана ж вы ўсталі! Але, як людзі кажуць, хто рана ўстае, таму бог дае... Джордж, ачомайся, сынок, і дапамажы доктару Ліўсі ўзняцца на борт... Усё ў парадку, доктар. Вашы пацыенты павесялелі.

Так ён сустракаў доктара, стоячы на вяршыні пагорка з мыліцаю пад пахаю, абапіраючыся рукою аб сцяну,— зусім ранейшы Джон Сільвер — і па голасе, і па манерах, і па смеху.

— У нас ёсць сюрпрыз для вас, сэр! — працягваў ён.— Адзін маленькі бадзяга, ха-ха! Новы пасажыр, сэр, і не абы-які! Спіць, як кватармайстар пасля раздачы пайка. Усю ноч побач з Джонам, борт да борта.

Доктар Ліўсі тым часам пералез цераз частакол і падышоў да кухара. Я чуў, як дрыжаў ягоны голас, калі ён пытаўся:

— Няўжо Джым?


— Ён самы,— адказаў Сільвер.

Доктар здранцвеў. Выдавала на тое, што ён не можа зварухнуцца з месца.

— Добра,— сказаў ён нарэшце.— Спярша справа, а потым будзем весяліцца. Так, здаецца, вы казалі, Сільвер? Агледзім спачатку хворых.

Доктар увайшоў у блакгауз і, холадна





кіўнуўшы мне, заняўся хворымі. Трымаўся ён спакойна, хоць не мог не ведаць, што ягонае жыццё сярод гэтых злачынцаў вісіць на валаску. Ён гаманіў з імі так, быццам яго запрасілі наведаць хворага ў паважную англійскую сям'ю. Мяркую, ягоныя паводзіны з піратамі моцна ўплывалі на іх. Яны самі паводзілі сябе з ім так, нібыта нічога не здарылася і ён па-ранейшаму іхні карабельны доктар, а яны — дысцыплінаваныя матросы.

— Табе лепей, прыяцель,— сказаў ён пірату з перавязанай галавою.— Іншы на тваім месцы не выжыў бы. У цябе галава, што той чыгунны кацёл... А як ты сябе пачуваеш, Джордж? Ды ты ўвесь жоўты! Пячонка не ў парадку. Ты прымаў лекі?.. Скажыце, ён прымаў лекі?

— Вядома, сэр, прымаў! — адгукнуўся Морган.

— Бачыце, з тае пары як я стаў доктарам у мяцежнікаў, ці, дакладней, турмовым доктарам,— сказаў доктар зычліва,— я лічу сваім абавязкам захаваць вас жывымі і здаровымі для караля Георга, блаславі яго бог, і для пятлі.


Піраты пераглянуліся, але моўчкі праглынулі доктараў жарт.

— Дзік блага сябе пачувае, сэр,— сказаў адзін.

— Блага? — спытаўся доктар.— Падыдзі, Дзік, пакажы язык. О, нічога дзіўнага, што яму кепска. Такім языком можна напалохаць і французаў. У яго таксама ліхаманка.

— Вось што здараецца з тымі, хто псуе святую кнігу,— сказаў Морган.

— Гэта здараецца з тымі, хто дурны, як асёл,— паправіў яго доктар.— З тымі, у каго не хапае розуму адрозніць свежае паветра ад заразнага, сухую зямлю ад гнюснага балота. Вельмі верагодна, ва ўсякім разе, я так думаю, вы ўсе схапілі малярыю, і міне багата часу, перш чым вы



ад яе пазбавіцеся. Атабарыцца на балоце!.. Сільвер, вы мяне проста здзівілі! Вы не такі дурань, як астатнія, але вы не маеце ніякага паняцця аб тым, як захаваць здаровымі сваіх падначаленых... Выдатна,— сказаў доктар, агледзеўшы пацыентаў і даўшы ім некалькі парад, якія яны выслухалі так уважліва і ўдзячна, што смешна было глядзець: ну чыста вучні дабрачыннае школы, а не заплямленыя крывёю піраты-мяцежнікі.— На сёння хопіць. А зараз, калі дазволіце, я хацеў бы пагаварыць з гэтым хлопцам.— Доктар кіўнуў у мой бок.

Джордж стаяў ля дзвярэй і моршчыўся, прымаючы нейкія лекі. Калі ён пачуў доктараву просьбу, твар у яго наліўся крывёю. Джордж павярнуўся да доктара і закрычаў, вылаяўшыся:

— Нізашто!

Сільвер ляпнуў далонню па бочцы.

— Маўчаць! — прароў ён і агледзеўся, нібыта леў.— Доктар,— працягваў ён пачціва,— я быў упэўнены, што вы захочаце пагаварыць з Джымам, бо ведаў: гэты хлопец вам даспадобы. Мы ўсе так удзячныя вам за вашую дабрыню і, як бачыце, так верым вам: п'ём вашыя лекі, што грог[1]. Зараз, доктар... Хоўкінс,— звярнуўся ён да мяне,— ты можаш даць мне слова юнага джэнтльмена,— бо ты джэнтльмен, хоць бацькі твае і бедныя людзі,— што нікуды не ўцячэш?


Я з радасцю даў яму гэтае слова.


— У такім разе, доктар,— сказаў Сільвер,— пералазьце цераз частакол. Калі вы пералезеце, я звяду Джыма ўніз. Ён будзе з аднаго боку частаколу, а вы — з другога, але гэта, упэўнены, не будзе вам замінаць. Усяго найлепшага, сэр! Перадавайце прывітанне сквайру і капітану Смолету.

Ледзь толькі доктар выйшаў, як піраты,

---

[1] Грог — алкагольны гарачы напой.





пераадолеўшы страх перад Сільверам, зноў абурыліся. Яны абвінавацілі Сільвера ў тым, што ён вядзе двайную гульню, хоча выгарадзіць сябе і здрадзіць таварышам. Словам, яны разгадалі ягоную задуму. Я ўжо не верыў, што яму ўдасца выкруціцца і на гэты раз. Але ён быў удвая разумнейшы за ўсіх іх, узятых разам, і ўчарашняя перамога дала яму вялікую ўладу над імі. Ён абазваў іх дурнямі і, можаце сабе ўявіць, заявіў, што без маёй размовы з доктарам нельга абысціся, тыкаў ім у нос карту і пытаўся: няўжо яны хочуць парушыць дамову ў той самы дзень, калі можна пачаць шукаць скарбы?

— Не, клянуся небам! — крычаў ён.— Прыйдзе час, і мы плюнем на гэтую дамову, але да тае пары я буду дагаджаць гэтаму доктару, няхай мне давядзецца чысціць яму боты ромам!


Ён загадаў развесці агонь, узяў мыліцу, паклаў руку мне на плячо і зачыкільгаў уніз, пакінуўшы піратаў у поўнай разгубленасці. Адчувалася, што на іх паўплывалі не так ягоныя довады, як настойлівасць.

— Цішэй, хлопец, цішэй,— сказаў ён мне.— Яны ўмомант кінуцца на нас усе разам, калі ўбачаць, што мы спяшаемся.

Мы паволі спусціліся па пясчаным адхоне да таго месца, дзе чакаў нас за частаколам доктар. Сільвер спыніўся.

— Не забудзьцеся, доктар, на гэты мой учынак,— сказаў ён.— І няхай Джым раскажа вам, як я ўратаваў яму жыццё і ўжо быў нізвергнуты за гэта. Калі чалавек так рызыкуе, як я, калі ён гуляе ў арлянку са смерцю, ён хоча пачуць хоць адно добрае слова! Майце на ўвазе, што цяпер гаворка ідзе не толькі пра маё жыццё, але і пра Джымава. Прашу вас, доктар, будзьце міласэрныя, дайце мне хоць якую надзею!

Цяпер, адышоўшы ад таварышаў і стоячы спінаю да блакгауза, Сільвер зрабіўся зусім



іншым чалавекам. Шчокі яго запалі, голас дрыжаў. Гэта быў амаль што мярцвяк.

— Няўжо вы баіцеся, Джон? — спытаўся доктар.

— Доктар, я не баязлівец. Не, я нават вось настолькі не баязлівец,— паказаў ён кончык пальца,— але прызнаюся шчыра: мяне калаціць пачынае ад думкі пра шыбеніцу. Вы чалавек добры і праўдзівы, лепшага я ніколі не бачыў! І вы не забудзецеся на ўсё добрае, што я зрабіў вам, хоць і благога было багата. Я адыходжу ўбок, бачыце, і пакідаю вас сам-насам з Джымам. Гэта ж вы таксама мне залічыце?

Кончыўшы, ён адышоў убок, якраз на такую адлегласць, каб не чуць нас, і пачаў насвістваць. Ён круціўся з боку ў бок, пазіраючы то на мяне, то на доктара, то на непакорлівых піратаў, якія валяліся на пяску, разводзячы агонь, то на блакгауз, адкуль яны выносілі свініну і хлеб на сняданак.

— Дык вось, Джым,— сумна сказаў доктар,— ты тут. Што пасееш, тое і пажнеш, мой хлопчык. Не буду сараманіць цябе. Скажу адно: калі б капітан Смолет быў здаровы, ты б не пасмеў уцячы. Ты зрабіў гэта, калі ён быў хворы і не мог за ўсім прасачыць, і, клянуся каралём Георгам, учынак твой несумленны!

Мушу прызнацца, што тут я заплакаў.

— Доктар,— сказаў я,— не ганьце мяне! Я сам сябе не раз асудзіў. Маё жыццё на валаску. Мяне б ужо не было ў жывых, калі б Сільвер не заступіўся за мяне. Доктар, паверце мне, смерці я не баюся, баюся адно катаванняў... Калі яны пачнуць катаваць мяне...

— Джым,— перапыніў мяне доктар, і я заўважыў, што голас у яго трохі змяніўся.— Джым, я гэтага не магу дапусціць. Давай уцячом! Пералазь цераз частакол.

— Доктар,— сказаў я,— я ж даў слова.





— Ведаю, ведаю! — ускліикнуў ён. — Што зробіш, Джым... Я вазьму гэты грэх на сябе... Не магу ж я пакінуць цябе тут! Ну, пералазь! Пералазь, Джым... Мы памчымся, як антылопы.

— Не, — адказаў я. — Вы б самі так не зрабілі. Ні вы, ні сквайр, ні капітан. І я таксама не зраблю гэтага. Сільвер даверыўся мне, я даў яму слова гонару і вярнуся назад. Але вы не даслухалі мяне, доктар. Калі яны пачнуць катаваць мяне, я не вытрымаю і скажу, дзе стаіць цяпер «Іспаньёла». Мне пашчасціла, доктар, і я адбіў у піратаў карабель, адбіў, многім рызыкуючы. Вы знойдзеце яго ля паўднёвага берага Паўночнай стаянкі. У час прыліву ён падымаецца на хвалі, у час адліву стаіць на мелі.

— Карабель! — ускліикнуў доктар.

Я коратка расказаў яму, што рабіў увесь гэты час, ён моўчкі выслухаў мяне.


— Гэта лёс, — заўважыў ён, калі я скончыў. — Кожны раз ты выратоўваеш нам жыццё. Дык няўжо ты можаш падумаць, што мы пакінем цябе ў бядзе? Колькі ж разоў ты нас выручаў!.. Ты раскрыў змову, знайшоў Бэна Гана, вярнуў нам цяпер карабель... Лепшае справы ты не зробіш за ўсе жыццё, нават калі пражывеш сто гадоў. А гэты Бэн Ган — хлопец, якіх пашукаць!.. Сільвер! — закрычаў ён. — Я хачу даць вам параду, — сказаў ён, калі кухар наблізіўся. — Не спяшайце надта шукаць скарбы.

— Сэр, я з усяе сілы буду старацца адцягнуць гэтую справу, — сказаў Сільвер. — Але, выбачайце, я магу ўратаваць жыццё і сабе і Джыму толькі пошукамі скарбаў, можаце мне паверыць.

— Добра, Сільвер, — адказаў доктар, — калі так — шукайце. Тады я дам вам другую параду: як будзеце шукаць скарбы, звярніце ўвагу на крыкі.

— Сэр, — сказаў Сільвер, — скажу вам як мужчына мужчыну: вы паведамілі мне ці залішне





шмат, ці залішне мала. Што вам трэба? Навошта вы пакінулі блакгауз? Навошта аддалі мне карту? Я гэтага не разумеў і не разумею. Аднак я выканаў усё, што вы мне прапанавалі зрабіць, хоць вы аніводным словам не далі мне ніякай надзеі. І вось цяпер зноў... Калі вы не хочаце растлумачыць мне ўсё, як ёсць, так і скажыце, і я выпушчу румпель.

— Не,— сказаў доктар задумліва,— я не маю права сказаць вам болей: гэта не мая тайна, Сільвер. Інакш, клянуся вам, я расказаў бы ўсё! Я і так настолькі далёка зайшоў у размове з вамі, што калі скажу яшчэ адно слова, то лепш мне і не паказвацца на вочы капітану. І ўсё ж я дам вам маленечкую надзею, Сільвер: калі мы абодва выберамся з гэтае воўчае ямы, я зраблю ўсё, што змагу, каб ратаваць вас ад шыбеніцы, хіба толькі мне не прыйдзецца ісці на клятвапарушэнне.

Твар у Сільвера заззяў.

— Нават родная маці не магла б усцешыць мяне болей, чым вы,— усклікнуў ён.

— Гэта першае, што я магу вам сказаць,— дадаў доктар.— А зараз другое: трымайце хлопца ля сябе, і калі спатрэбіцца дапамога, паклічце мяне. Я пастараюся вас выручыць, і тады вы ўбачыце, што я слоў на вецер не кідаю... Бывай, Джым.

Доктар пацiснуў мне руку, прасунуўшы сваю праз шчыліну ў частаколе, кіўнуў галавою Сільверу і хуткімі крокамі пайшоў да лесу.


РАЗДЗЕЛ XXXI

Пошукі скарбаў. Указальная страла Флінта

— Джым,— сказаў Сільвер, калі мы засталіся ўдвух,— я ўратаваў тваё жыццё, а ты — маё. І







[redacted] ніколі гэтага не забуду. Я ж бачыў краем вока, як доктар угаворваў цябе ўцячы. Што ты казаў, я не чуў, але бачыў, што ты адмовіўся. За гэта, Джым, [redacted] табе заўсёды буду ўдзячны. Пасля няўдалай атакі для мяне ўпершыню блiснула надзея — і даў яе мне ты. Скарбы, Джым, мы пачынаем шукаць усляпую, і гэта мне дужа не даспадобы. Але мы з табою будзем трымацца адзін аднаго і ўратуемся, нягледзячы ні на што.

Адзін з піратаў — тыя ўсё яшчэ завіхаліся ля агню — крыкнуў нам, што сняданак гатовы. Падышоўшы да іх, мы ўселіся на пяску ля агню і сталі есці гарачую свініну з сухарамі. Вогнішча было такое, што можна было б і быка падсмажыць. Падыходзілі да агню асцярожна і толькі з падветранага боку. Гэтаксама нерупліва расходвалі піраты і правізію: згатавалі свініны разы ў тры болей, чым было трэба. Адзін з іх, засмяяўшыся па-дурному, кінуў няз'едзеныя кавалкі ў агонь, які, заглытнуўшы незвычайнае паліва, запалаў яшчэ ярчэй. Ніколі ў сваім жыцці я не бачыў, каб людзі так бесклапотна жылі адным толькі сённяшнім днём. Усё яны рабілі абы-як, ні ў чым не былі ашчадныя, засыналі на варце. Яны былі здатныя адно на кароткую ўспышку імпэту, надоўга іх у справе не хапала.

Нават абачлівы Сільвер, які сядзеў убаку са сваім папугаем, аніразу не папракнуў іх за марнатраўства. Гэта вельмі мяне здзівіла, і калі ён загаварыў, я здагадаўся, што гэты спрытнюга хітруе, каб рассеяць падазрэнні піратаў.

— Ваша шчасце, прыяцелі,— сказаў Сільвер,— што ў вас ёсць Кумпяк, які заўсёды за вас думае. Я выведаў усё, што мне трэба. Карабель у іх, гэта пэўна. Дзе яны яго схавалі, я яшчэ не ведаю, але, калі ў нас будуць скарбы, мы абшнарым увесь востраў, і «Іспаньёла» зноў будзе наша. Ва ўсякім разе, хлопцы, у нас ёсць шлюпкі, а гэта ўжо перавага.





Ён гаварыў і гаварыў, набіваючы рот гарачай свінінаю. Вяртаў усёй кампаніі надзею і веру ў важака і адначасна, здалося мне, падбадзёрваў самога сябе.

— А наш заложнік,— працягваў ён,— няйначай, апошні раз спаткаўся са сваім любым старэйшым таварышам. З ягонай размовы з доктарам я ўведаў усё і вельмі ўдзячны яму за гэта. Але цяпер кончана. Калі мы пойдзем шукаць скарбы, я павяду яго за сабой на вяровачцы: ён нам такі ж дарагі, як і золата, і мы не будзем яго чапаць: як-небудзь яшчэ спатрэбіцца. А калі ў нас будуць і карабель, і скарбы, калі мы вясёлай кампаніяй выйдзем у мора, вось тады мы і пагамонім з містэрам Хоўкінсам як след, і ён пэўна атрымае сваю долю па заслугах.


Нічога дзіўнага, што цяпер піраты былі ў добрым гуморы. А мяне агарнула роспач. Калі план Сільвера, толькі што выкладзены ім, здзейсніцца, гэты двайны здраднік вагацца не стане. Няма ніякага сумнення, што ён, калі выпадзе шанц, паміж воляю і багаццем пірата і слабай надзеяй на ўратаванне ад пятлі выбера першае.

Але калі абставіны і вымусяць яго стрымаць дадзенае доктару слова, нам усё роўна пагражае смяротная небяспека. У любы момант падазрэнні гэтых гіцляў могуць пераважыць Сільвераву хітрасць, і тады нам прыйдзецца змагацца за свае жыцці — яму, калеку, і мне, хлапчуку,— супраць пяцярых дужых і раз'ятраных матросаў.

Дадайце да гэтае двайное небяспекі тайну, якой усё яшчэ былі ахінутыя дзеянні маіх сяброў. Чаму яны пакінулі форт? Чаму аддалі карту? Што азначаюць словы, якія доктар сказаў Сільверу: «Калі будзеце шукаць скарбы, звярніце ўвагу на крыкі?» Няма нічога дзіўнага, што сняданак не лез мне ў горла і што я панура пасунуўся ўслед за піратамі на пошукі скарбаў.

Цікава было б паглядзець на нас збоку: усе ў





выпацканых матроскіх робах, усе, апроч мяне, узброеныя да зубоў. Сільвер цягнуў дзве стрэльбы: адну на спіне, другую на грудзях. На поясе ў яго матляўся вялікі корцік, а ў кожнай кішэні шыракакрысага каптана ляжала па пісталету. У дадатак да ўсяго, на плячы ў яго сядзеў Капітан Флінт, які безупынна выкрыкваў розныя марскія слоўцы — сувязі паміж імі, ведама ж, не было ніякае. Мяне ж абвязалі за пояс вяроўкаю, і я пакорліва цягнуўся ўслед за кухарам, які трымаў канец вяроўкі то свабоднай рукою, то магутнымі зубамі. Словам, вёў ён мяне, усе роўна як нейкага дрэсіраванага мядзведзя.

Кожны што-небудзь цягнуў: адны — рыдлёўкі і ламы (мяцежнікі выгрузілі іх на бераг з «Іспаньёлы» ў першую чаргу), іншыя — свініну, сухары і брэндзі на абед. Я заўважыў, што ўсе прыпасы былі з нашага склада, і зразумеў, што ўначы Сільвер казаў праўду. Калі б ён не заключыў з доктарам дамовы, піратам, якія засталіся без карабля, прыйшлося б харчавацца падстрэленымі птушкамі і запіваць іх вадою, хоць ваду яны не надта любілі, а паляваць маракі не ўмеюць. І калі яны не запасліся нават ежаю, то пра порах і казаць не прыходзіцца.

Словам, гэтак вось экіпіраваныя, рушылі мы ўсе чарадою ў дарогу, нават пірат з разбітай галавою, якому лепш было б адляжацца. На беразе, да якога мы нарэшце дабрылі, стаялі дзве шлюпкі. Па іх таксама было добра відаць, якія ж нядбайнікі гэтыя горкія п'яніцы: лодкі ў брудзе, у адной — паламаная лаўка. Вырашылі размясціцца ў абедзвюх шлюпках, каб ні адна не прапала. Раздзяліўшыся на два атрады, мы нарэшце адчалілі ад берага.

Па дарозе пачалі спрачацца з-за карты. Чырвоны крыжык быў занадта вялікі і не ўказваў, вядома, зусім ужо дакладнага месца, а тлумачэнні на адваротным баку былі задужа цьмяныя.



Калі чытач памятае, у іх гаварылася наступнае:

«Высокае дрэва на плячы Падзорнае Трубы, накірунак да Пн. ад Пн.-Пн.-У.

Востраў Шкілета У.-Пдн.-У. і на У. Дзесяць футаў».


Перш за ўсё трэба было адшукаць высокае дрэва. Акурат перед намі якарная стаянка замыкалася пласкагор'ем у дзвесце—трыста футаў вышынёю, якое на поўначы злучалася ■ паўднёвым адхонам Падзорнае Трубы, ■ на поўдні пераходзіла ў скалістае ўзвышша пад назваю Бізань-мачта. На пласкагор'і раслі сосны — і нізкія, і высокія. То тут, то там сасна-веліканша ўзвышалася на сорак—пяцьдзесят футаў над суседнімі, і якое з гэтых дрэў Флінт назваў высокім, можна было вызначыць толькі на месцы з дапамогаю компаса.

Аднак не праплылі мы і паловы шляху, як кожны ўжо прыкмеціў «тое самае дрэва». Толькі Цыбаты Джон паціскаў плячыма і раіў пачакаць з рашэннямі, пакуль мы яшчэ не на месцы.

Па загаду Сільвера мы берaглі сілы і веславалі не надта хутка. Прайшло досыць шмат часу, перш чым мы высадзіліся ў вусці другое ракі, тае самае, што працякае па лясістым адхоне Падзорнае Трубы. Адтуль, збочыўшы налева, мы пачалі ўзбірацца да пласкагор'я.

Спачатку было цяжка ісці з-за багністае глебы і густое балотнае расліннасці. Але патроху пад'ём стаў страмчэйшы, глеба больш камяністая, расліннасць вышэйшая і радзейшая. Цяпер мы набліжаліся да лепшае часткі вострава. Замест травы па зямлі слаўся пахучы жаўтазель, квітнела кустоўе. Сярод зялёных зараснікаў мускатнага арэха ўзвышаліся там-сям барвовыя калоны высокіх соснаў, і таму мясціна была вельмі цяністая. Пах мускату змешваўся з пахам іглiцы, паветра было свежае, і дыхалася тут лёгка, хоць і прыпякала ўжо сонца.





Піраты ішлі веерам і весела перагукваліся між сабою. Усярэдзіне, трохі адстаўшы ад астатніх, чыкільгаў Сільвер, цягнучы мяне за сабою на вяроўцы. Яму было цяжка ўзбірацца па сыпучым жвіры. Часам мне прыходзілася падтрымліваць яго, інакш бы ён спатыкнуўся і пакаціўся ўніз па адхоне.

Так мы прайшлі нешта каля паўмілі і ўжо дабраліся да вяршыні, як раптам пірат, што ішоў з левага краю, пачаў крычаць, нечага спалохаўшыся. Усе пабеглі да яго.

— Ды не мог ён тут скарбы знайсці! — сказаў стары Морган, прабягаючы міма нас.— Мы ж не дайшлі да таго дрэва.

Вядома, ён знайшоў не скарбы: ля падножжа высокае сасны ляжаў чалавечы шкілет, аплецены густой павойнай травою, якая зрушыла з месца некаторыя дробныя косці. Сям-там на ім захаваліся рэшткі струхлелае адзежы. Я ўпэўнены, што ў кожнага з нас прабеглі па скуры дрыжыкі.


— Гэта марак,— сказаў Джордж Мэры, смялейшы за астатніх, ён падышоў да шкілета бліжэй і ўважліва разглядваў шматкі матэрыі.— Адзежа ў яго была марацкая.

— Вядома, марак,— сказаў Сільвер.— Мяркую, ты не спадзяваўся знайсці тут епіскапа. Але чаму ён так дзіўна ляжыць? Ненатуральна неяк...

Прыгледзеўшыся, я ўбачыў, што шкілет і праўда ляжаў у ненатуральнай паставе. Ён чамусьці — можа, у тым былі вінаватыя ўжо згаданыя травы, можа, птушкі, якія дзяўблі яго,— ляжаў навыцяжку, прамы, быццам страла. Ногі паказвалі ў адзін бок, рукі, узнятыя над галавою, нібыта ў гатовага нырнуць плаўца,— у другі.

— Здаецца, я ўцяміў,— сказаў раптам Сільвер.— Гэта компас! Вунь тырчыць, усё роўна як зуб, вяршыня Вострава Шкілета. Праверце па компасе, куды ўказвае шкілет.





Праверылі. Ён сапраўды ўказваў у бок Вострава Шкілета. Компас паказваў напрамак на ўсход — паўднёвы ўсход і на ўсход.

— Я так і думаў! — усклікнуў кухар.— Гэта ўказальная страла. Значыцца, там Палярная зорка, а вунь там вясёлыя грошыкі. Клянуся д'ябалам, у мяне ўсё халадзее ўсярэдзіне пры адной думцы аб Флінце. Гэта адзін з яго любых жартаў, я-то ўжо ведаю! Ён застаўся тут з шасцю маракамі і прыкончыў усіх. А з аднаго з іх змайстраваў сабе компас, каб сперунеў! Косці доўгія, валасы рыжыя... Ды гэта ж Алардайс!.. Ты памятаеш Алардайса, Том?

— Як не памятаць? — адказаў Морган.— Ён застаўся мне вінен, апроч таго, прыхапіў з сабою мой нож, калі адплываў на востраў.

— Значыцца, нож павінен быць дзе-небудзь тут,— сказаў другі пірат.— Флінт быў не такі чалавек, каб шнарыць у матроса ў кішэнях. Не маглі ж птушкі знесці!

— Праўду кажаш, хлапчына! — усклікнуў Сільвер.

— Але ж тут няма нічога,— сказаў Мэры, абмацваючы зямлю пад шкілетам.— Павінна ж была застацца хоць якая-небудзь манетка, ці табакерка. Падазрона ўсё гэта...

— Слушна! — згадзіўся Сільвер.— Нешта тут не так... Ох, сябры, быў бы Флінт жывы, не гуляць бы нам тут... Нас шасцёра, і тых было шасцёра, а засталіся ад іх адны косці...

— Я на ўласныя вочы бачыў яго мёртвым,— сказаў Морган.— Білі вадзіў мяне да яго. Ён ляжаў з медзякамі на вачах.

— Вядома, ён памёр,— пацвердзіў пірат з перавязанай галавою.— Але хто ўжо будзе бадзяцца па зямлі пасля смерці, дык гэта Флінт. Да чаго ж цяжка ён паміраў!

— Паміраў ён блага, нічога не скажаш,— дадаў другі.— То шалеў, то рому патрабаваў, то



пачынаў спяваць «Пятнаццаць чалавек на куфры мерцвяка». Апрача гэтай песні, хлопцы, ніколі нічога і не спяваў. І скажу вам па праўдзе, не люблю я яе з таго часу... Спякота стаяла страшэнная... Акно было адчынена. Спяваў ён што было сілы... то спяваў, то хрыпеў...

— Хадзем ужо! — сказаў Сільвер.— Досыць балбатаць. Ён памёр і не бадзяецца прывідам па зямлі, можаце не баяцца. А калі б і надумаў выйсці з магілы, дык не ўдзень, гэта ўжо напэўна... Хадзем, нас чакаюць дублоны.

Мы рушылі далей. Але хоць дзень і быў у самым разгары, піраты больш ужо не разыходзіліся веерам і гаварылі напаўголаса: з галавы не выходзіла жахлівае відовішча.

РАЗДЗЕЛ XXXII


Пошукі скарбаў. Голас у лесе

Усіх скаваў страх, і адпачыць было трэба, таму на вяршыні пласкагор'я зрабілі прывал.

Пласкагор'е было крыху нахіленае да захаду, і з тае мясціны, дзе мы спыніліся, адкрываўся від у абодва бакі. Уперадзе за вершалінамі дрэў мы бачылі Лясісты мыс, на які накатваўся прыбой. Ззаду было відаць не толькі праліў і Востраў Шкілета, але і — за касою і ўсходняй раўнінаю — прастору адкрытага мора. Акурат над намі ўзвышалася Падзорная Труба, зарослая рэдкімі соснамі. Там-сям віднеліся глыбокія прорвы. Цішыню парушалі адно аддалены грукат прыбою ды гудзенне процьмы ўсялякіх мошак. Пачуццё адзіноты яшчэ больш узмацнялася шырынёю навакольнае прасторы.

Сільвер пачаў рабіць па компасе вымярэнні.





— Тут тры высокія дрэвы,— сказаў ён,— і ўсе яны размешчаны па прамой лініі ад Вострава Шкілета. Здаецца мне, што «Плячо Падзорнай Трубы» — вось гэтая ўпадзіна. Зараз і дзіцёнак знайшоў бы скарбы. Думаю, няблага было б падсілкавацца спярша.

— Нешта не хочацца,— прабурчаў Морган.— Згадаўшы Флінта, які ўжо тут апетыт...

— Ох, сын мой, тваё шчасце, што ён памёр,— сказаў Сільвер.

— Але ж і пыса ў яго была — што ў д'ябла! — усклікнуў трэці пірат, і яго ажно перасмыкнула.— Сіняя-сіняя.

— Гэта ён ад рому ссінеў,— дадаў Мэры.— Дальбог, сінейшай ужо і не бывае, я-то ўжо бачыў...

Перад вачыма стаяў шкілет, ажываў у памяці Флінт, і піраты сталі размаўляць гэтак ціха, што перайшлі ўрэшце на шэпт, які амаль не парушаў ляснное цішыні. І раптам з бліжэйшага гаю нехта зацягнуў тонкім, рэзкім, пранізлівым голасам добра знаёмую песню:

Пятнаццаць чалавек на куфры мерцвяка,
Ё-го-го, і бутэлька рому!

Ніколі больш не бачыў я такога смяротнага жаху, як на твары ў гэтых піратаў. Усе шасцёра ажно ззелянелі. Адны ўскочылі на ногі, іншыя сутаргава схапіліся адзін за аднаго. А Морган аж папоўз па зямлі.

— Гэта Флінт! — закрычаў Мэры.

Песня абарвалася гэтаксама раптоўна, як і пачалася, быццам спеваку заціснулі рот. Дзень быў такі сонечны, ясны, а голас такі выразны, што я не мог зразумець, чаму мае спадарожнікі гэтак спалохаліся.

— Уперад! — сказаў Сільвер, які ледзь варушыў шэрымі, што той попел, вуснамі.— Гэтак справа не пойдзе. Трэба нешта рабіць. Дзіўна ўсё,





і голасу я не пазнаю, але іду ў заклад, той, хто так забаўляецца,— ніякі не нябожчык, а жывы чалавек.

Пакуль ён гаварыў, да яго вярнулася мужнасць, твар паружавеў. Гледзячы на Сільвера, астатнія таксама трохі ачомаліся, як раптам зноў пачуўся той самы голас. Але цяпер гэта была не песня, а крык, які гучаў недзе ўдалечыні і разлягаўся па расколінах Падзорнае Трубы невыразным рэхам.

— Дарбі Мак-Гроў! Дарбі Мак-Гроў! Дарбі Мак-Гроў! — роў нехта няспынна, пасля брыдка вылаяўся і завыў: — Дарбі, падай мне рому!

Піраты нібыта ўраслі ў зямлю, вочы ў іх ледзь не вылезлі на лоб. Голас даўно сціх, а яны стаялі здранцвелыя і з жахам глядзелі ўперад.

— Гіблая справа,— выціснуў з сябе адзін.— Трэба ўцякаць.

— Гэта былі яго апошнія словы! — прастагнаў Морган.— Апошнія словы перад смерцю.

Дзік дастаў сваю Біблію і пачаў апантана маліцца. Ён рос у набожнай сям'і, да таго як пайшоў у мора і звязаўся з піратамі.

Адзін толькі Сільвер не здаўся. У яго губы дрыжалі ад страху, але адступаць ён не збіраўся.

— На гэтым востраве ніхто, апроч нас, і не чуў пра Дарбі,— прамармытаў ён.— Ніхто, апроч нас...— Ён узяў сябе ў рукі і крыкнуў: — Гэй, хто там?.. Я прыйшоў сюды, каб выкапаць клад, і мяне не спыніць ніхто — ні чалавек, ні д'ябал. Я не баяўся Флінта, калі ён быў жывы, і, каб я сперунеў, не пабаюся яго і мёртвага! За чвэрць мілі ад нас ляжаць семсот тысяч фунтаў стэрлінгаў. Ніводны джэнтльмен удачы не павернецца кармою за крок ад такіх грошай з-за нейкага старога марака з сінім лычом, ды яшчэ й дохлага!

Але астатнія ані каліва не асмялелі, наадварот, непачцівыя словы, з якімі Сільвер звярнуўся да прывіда, адно ўзмацнілі іхні жах.







— Маўчы, Джон! — сказаў Мэры. — Не абражай здань!

Астатнім дык і зусім ад страху мову адняло. Яны ўжо і ўцякаць баяліся, цісnуліся адзін да аднаго, бліжэй да Сільвера, які трымаўся трохі смялей.

— Думаеце, гэта здань? Можа, й так, — сказаў ён. — Але я не разумею аднаго. Мы ўсе чулі рэха. А хіба ж бачыў хто-небудзь, каб у зданяў быў цень? Дык адкуль тады ўзяцца рэху, калі не можа быць ценю?.. Не, хлопцы, так не бывае...

Доказ не здаўся мне важкім. Але ніколі нельга загадзя прадказаць, што можа падзейнічаць на людзей забабонных. На маё здзіўленне, Джордж Мэры стаў пачуваць сябе нашмат больш упэўнена.

— Гэта слушна, — сказаў ён. — Ну і галава ж у цябе на плячах, Джон, нічога не скажаш!.. Усё ў парадку, хлопцы! Мы проста ўзялі няправільны галс, гэта пэўна. Як спярша, дык і праўда голас нібыта Флінтаў, вельмі падобны, і ўсё ж не такі... Хутчэй гэта голас... голас...

— Клянуся д'яблам, гэта голас Бэна Гана! — прароў Сільвер.

— Акурат ягоны! — ускрыкнуў Морган. Ён нарэшце прыўзняўся і ўкленчыў. — Гэта быў голас Бэна Гана!


— А якая розніца? — спытаўся Дзік. — І Флінт нябожчык, і Бэн Ган таксама.

Але старэйшыя піраты пагардліва паглядзелі на яго.

— Пляваць нам на Бэна Гана! — крыкнуў Мэры. — Жывы ён ці мёртвы, нам усё роўна!

Дзіўна было бачыць, як хутка падабраліся гэтыя людзі — з іхніх твараў сышоў страх. Неўзабаве яны ўжо спакойна гаманілі між сабою, адно прыслухоўваліся часам, ці не чуваць дзіўнага голасу. Але больш ужо ніхто не спяваў, не крычаў. Тады, узваліўшы зноў на плечы ўсю амуні-





цыю, яны рушылі далей. Уперадзе ішоў Мэры. Ён трымаў у руках Сільвераў компас і няспынна на яго паглядаў, каб не збіцца з лініі Вострава Шкілета. Мэры сказаў праўду: жывы Бэн Ган ці мёртвы, яго не баяўся ніхто.


Адзін толькі Дзік па-ранейшаму трымаў у руках сваю Біблію і спалохана азіраўся па баках. Сільвер нават здзекаваўся з ягонай набожнасці, што гэтак раптоўна абудзілася ў ім:

— Я ж казаў табе, што ты сапсаваў сваю Біблію. Няўжо ты думаеш, што здань спалохаецца Бібліі, на якой прысягнуць нават нельга? Ніза-што ў жыцці! — і, спыніўшыся на імгненне, ён шчоўкнуў пальцамі перад самым Дзікавым носам.

Аднак Дзіка ўжо нельга было супакоіць. Хутка я зразумеў, што ён цяжка захварэў. Ад спякоты, стомы і перажытага страху ліхаманка, прадказаная доктарам Ліўсі, узмацнілася.

На вяршыні амаль не было дрэў. Паміж соснамі, вялікімі і малымі, нават сярод зараснікаў мускатнага арэха і азалій, былі вялікія прагаліны, выпаленыя спякотным сонцам. Ісці стала нашмат лягчэй. Цяпер мы спускаліся ўніз, бо, як я ўжо сказаў, пласкагор'е было нахіленае да захаду. Ідучы на паўночны захад, мы набліжаліся да пляча Падзорнае Трубы. Унізе пад намі быў бачны шырокі заходні заліў, на хвалях якога не так даўно я гойдаўся ў Ганавым чоўне.

Нарэшце мы падышлі да першага высокага дрэва. Праверка па компасе паказала, што гэта не тая сасна, якую мы шукалі. Пераканаліся ў тым самым і ля другое сасны. Трэцяя падымалася над зараснікамі амаль на дзвесце футаў. Гэта была сапраўдная веліканша са ствалом у некалькі абхватаў. Пад яе ценем мог бы маршыраваць цэлы атрад. Безумоўна, гэтую сасну было добра відаць і з усходняга боку мора, і з заходняга, і яе можна было адзначыць на карце як мараходны знак.



Думка пра тое, што недзе на гэтай цяністай прагаліне закапаныя семсот тысяч стэрлінгаў, цалкам апанавала піратамі. Як сталі мроіцца грошы, дык зніклі ўсе трывогі. Загарэліся вочы, шпарчэйшыя сталі ногі: якое ж багацце побач, марылі ўжо піраты, якое бесклапотнае, шыкоўнае жыццё наперадзе!

Сільвер, падскокваючы, чыкільгаў на сваёй мыліцы. Ноздры ў яго раздзьмуліся. Калі мухі садзіліся на ягоны разгарачаны, потны твар, ён лаяўся, як вар'ят. Тузаючы вяроўку, кухар з лютай нянавісцю паглядваў на мяне. Было відаць, што ён ужо не хаваў сваіх думак — я мог чытаць іх, усё роўна як у кнізе. Апынуўшыся побач з золатам, Сільвер забыўся на ўсё — і на свае абяцанні, і на доктаравы перасцярогі. Цяпер ужо ў мяне не было ніякіх сумненняў, што ён спадзяваўся захапіць скарбы, затым знайсці ўначы «Іспаньёлу», перарэзаць усіх маіх таварышаў, не забыўшыся, вядома, і пра мяне, і выйсці ў мора, як і збіраўся рабіць раней,— з багаццем у руках і без аніякіх згрызот сумнення.

Усхваляваны гэтымі трывожнымі думкамі, я ледзь паспяваў за піратамі. Я вельмі часта спатыкаўся аб камяні, і тады Сільвер зноў і зноў кідаў на мяне красамоўны позірк. Дзік цягнуўся ззаду, мармытаў малітвы і лаяўся — яго ўжо калаціла. Ад гэтага я адчуваў сябе яшчэ больш няшчасным. А тут яшчэ мне стала ўяўляцца трагедыя, што разыгралася калісь на гэтым пласкагор'і. Бачыўся пірат з ссінелым тварам, які памёр у Саване, ён гарлапаніў сваю жудасную песню і патрабаваў рому. Гэта тут ён адзін забіў сваіх шасцярых памочнікаў, менавіта ў гэтым гаі, такім ціхім цяпер, гучалі некалі перадсмяротныя крыкі. Мне здавалася, што зараз я пачую такія ж енкі ў яве.

Мы выйшлі з зараснікаў.

— За мною, хлопцы! — крыкнуў Мэры.

Тыя, што ішлі ўперадзе, кінуліся бегчы.





Але не паспелі яны прабегчы і дзесяці ярдаў, як раптам спыніліся. Усчаўся гвалт. Сільвер скакаў на сваёй драўляшцы як ашалелы. Неўзабаве мы дагналі пярэдніх і спыніліся побач з імі.

Перад намі была вялікая яміна, выкапаная, напэўна, досыць даўно, бо яе краі ўжо абваліліся, а на дне расла трава. У яміне мы ўбачылі дзяржанне жалезняка і некалькі дошак ад скрыняў. На адной дошцы быў выпалены гарачым жалезам надпіс: «Морж» — назва карабля Флінта.

Мы ўсё зразумелі. Нехта апярэдзіў нас і выцягнуў адсюль скарбы — семсот тысяч фунтаў стэрлінгаў.

РАЗДЗЕЛ XXXIII

Падзенне важака

Мажліва, з тае пары, як існуе свет, людзі не перажывалі яшчэ такога краху. Усе шасцёра здранцвелі, яны ніяк не маглі паверыць сваім вачам. Першы ачомаўся Сільвер. Як імкнуўся ён да гэтых грошай, нёсся да іх толькі што бы ўтрапёны — і вось у адно імгненне прыйшоў канец усім ягоным спадзяванням і марам. Але ён не страціў розуму, хутка ўзяў сябе ў рукі і змяніў свой план, перш чым іншыя зразумелі, што засталіся ні з чым.

— Джым,— прашаптаў ён, працягваючы мне двухствольны пісталет,— будзь напагатове.

Затым ён паволі перайшоў на другі бок яміны і стаў насупраць піратаў. Пасля паглядзеў на мяне і кіўнуў, нібыта кажучы: «Становішча цяжкае» — не згадзіцца з ім было нельга. Цяпер ён зноў пазіраў на мяне па-прыяцельску, і мяне так абурыла гэтая раптоўная перамена, што я не ўтрымаўся і прашаптаў:





— Які ж вы здраднік!..

Але адказаць ён не паспеў. Піраты, з гвалтам і лаянкаю, адзін за адным скочылі ў яміну і пачалі разграбаць яе рукамі, адкідваючы дошкі ўбок. Морган знайшоў залатую манету. Ён падняў яе і выбухнуў самымі брыдкімі праклёнамі. Манета была ў дзве гінеі. Нейкі час піраты перадавалі яе з рук у рукі.

— Дзве гінеі! — зароў Мэры, кінуўшы манету Сільверу.— Гэта і ёсць твае семсот тысяч фунтаў, га?.. Ты, здаецца, мастак заключаць дамовы? Ты ж кажаш, што табе заўсёды ўсё ўдаецца, драўляная твая галава!

—Капайце, хлопцы, капайце,— сказаў Сільвер з халоднай усмешкаю.— Можа, і выкапаеце па два-тры земляныя арэхі. А я пагляджу.

— Земляныя арэхі! — ашалела крыкнуў Мэры.— Хлопцы, вы чулі? Кажу вам: ён ведаў усё загадзя. Гляньце яму ў вочы: ён усё ведаў!

— Эх, Мэры! — усміхнуўся Сільвер.— Зноў хочаш пралезці ў капітаны? Настырны ты, бачу я, хлопец.


Цяпер ужо ўсе, вядома, былі на баку Мэры. Піраты сталі вылазіць з яміны, раз'ятрана паглядаючы на нас. Але што добра, усе яны выбраліся на процілеглы бок.

Так стаялі мы, двое з аднаго боку яміны, пяцёра з другога, і ніхто не рашаўся нанесці першы ўдар. Сільвер нават не паварухнуўся. Абапіраючыся на мыліцу, ён спакойна назіраў за сваімі цяпер ужо ворагамі — ніколі яшчэ я не бачыў яго такім вытрыманым. Гэта і праўда быў вельмі смелы чалавек.

Нарэшце Мэры вырашыў пачаць з прамовы: трэба было раз'юшыць таварышаў дарэшты.

— Хлопцы! — сказаў ён.— Іх жа ўсяго двое: стары хрыч, што прывёў нас сюды на пагібель, і шчанюк, якога я даўно хачу прыдушыць. Цяпер мы...





Голас яго набіраў сілу. Мэры ўзняў руку, гатовы павесці сваю хеўру на нас, як раптам — бах! бах! бах! — у гушчары грымнулі тры мушкетныя стрэлы. Мэры паляцеў у яму дагары нагамі, пірат з перавязанай галавою, закруціўшыся ваўчком, упаў побач. Трое астатніх кінуліся ўцякаць.

У той самы момант цыбаты Джон стрэліў з абодвух ствалоў свайго пісталета ў Мэры, які выкарасквайся з ямы. Паміраючы, той зірнуў свайму забойцу ў твар.

— Вось мы і разлічыліся, Джордж,— сказаў Сільвер.

Тут з зараснікаў мускатнага арэха выйшлі доктар Ліўсі, Грэй і Бэн Ган. Мушкеты ў іх дыміліся.

— Уперад! — крыкнуў доктар.— Спяшайце, хлопцы! Трэба адрэзаць іх ад шлюпак.

І мы рушылі ўперад, прадзіраючыся скрозь кустоўе, якое даходзіла нам дзе-нідзе да грудзей.

Сільвер намагаўся не адстаць ад нас. Ён так узмахваў мыліцаю, што здавалася, мускулы на ягоных грудзях вось-вось разарвуцца. Як сказаў доктар, і здаровы чалавек не вытрымаў бы такога напружання. Калі мы дабеглі да адхону, Сільвер адстаў ад нас ярдаў на трыццаць і зусім знясілеў.


— Доктар,— крычаў ён,— гляньце! Не спяшайце!

Спяшацца і праўда не было куды: мы выскачылі на прагаліну і ўбачылі, што ўцекачы бягуць у бок Бізань-мачты — мы былі цяпер паміж піратамі і лодкамі і маглі спакойна перадыхнуць.

Цыбаты Джон, выціраючы з твару пот, павалі падышоў да нас.

— Сардэчна вам дзякуй, доктар,— сказаў ён.— Вы паспелі своечасова, а то б нам з Хоўкінсам цяжка прыйшлося... А, гэта ты, Бэн Ган! — угледзеўся Сільвер у астраўляніна.— Ты, я бачу, малайчына.





— Так, [redacted] Бэн Ган,— сумеўшыся, адказаў былы пірат, выкручваючыся перад Сільверам усё роўна як вугор. Ён доўга маўчаў, пасля спытаўся: — Як вы маецеся, містэр Сільвер?.. Здаецца, нябдага?

— Бэн, Бэн,— прамармытаў Сільвер,— падумаць толькі, як ты з мяне насмяяўся!

Доктар паслаў Грэя па кірку, якую кінулі, уцякаючы, піраты. Пакуль мы, не спяшаючы, спускаліся па адхоне да шлюпак, ён коратка расказаў пра невядомыя нам падзеі, галоўным героем якіх быў Бэн Ган. Сільвер слухаў гэты аповяд, як дзіця казку.


У час сваіх самотных блуканняў па востраве Бэн адшукаў шкілет, а пасля і скарбы. Гэта ён абабраў шкілет і выкапаў Флінтава золата. Заступ, дзяржанне якога мы ўбачылі ў яміне, быў ягоны. Ён перанёс скарбы на сваіх плячах з-пад сасны ў пячору двухгаловае гары ў паўночнаўсходняй частцы вострава. Закончыў Ган гэтую цяжкую шматдзённую працу ўсяко толькі за два месяцы да нашага з'яўлення на востраве.

Ган расказаў яму гэта ў той дзень, калі піраты напалі на форт. Назаўтра ўранку, убачыўшы, што карабель знік, доктар паўшоў да Сільвера, аддаў яму карту, цяпер ужо зусім непатрэбную, і саступіў блакгауз з усімі запасамі: у Ганавай пячоры было багата назапашанай ім салёнай казляціны. Дзякуючы гэтаму мае таварышы атрымалі магчымасць, нічым не рызыкуючы, перабрацца на двухгаловую гару, далей ад малярыйных балот, каб ахоўваць там скарбы.

— Вядома, я разумею, Джым,— сказаў доктар,— што з-за нашага перасялення ты апынешся ў цяжкім становішчы, але перш за ўсё я мусіў падумаць пра тых, хто выконваў свой абавязак. Урэшце, хто ж вінаваты ў тым, што цябе не было з намі?

Яшчэ праз дзень ён убачыў мяне ўранку ў па-





лоне ў піратаў. Не было ніякага сумнення, што, даведаўшыся пра знікненне скарбаў, піраты спаганяць злосць на мне. Таму ён пакінуў сквайра ахоўваць капітана, захапіў з сабою Грэя і Гана і рушыў напрасткі цераз востраў, да вялікае сасны. Убачыўшы па дарозе, што піраты іх абагналі, ён паслаў уперад Бэна Гана: я ўжо расказваў, як хутка ўмеў ён бегаць. Астраўлянін, ведаючы забабоны сваіх былых таварышаў, нагнаў на іх страху, а доктар і Грэй паспелі тым часам на месца і схаваліся ў зарасніку непадалёк ад яміны, перш чым туды прыйшлі піраты.

— Як добра,— сказаў Сільвер,— што са мною быў Хоўкінс! Каб не ён, мяне б пасяклі на шматкі, а вы, доктар, і пальцам не паварушылі б.

— Вядома! — усміхнуўся доктар.

Тым часам мы падышлі да нашых шлюпак. Адну з іх доктар разбіў кіркаю, каб яна не дасталася піратам, і ў другой мы ўсе паплылі вакол вострава да Паўночнае стаянкі.

Мы праплылі восем-дзевяць міль. Сільвер, нягледзячы на жудасную стому, сеў за вёслы і гроб нароўні з усімі. Мы выйшлі з праліву і апынуліся ў адкрытым моры. Быў штыль. Неўзабаве мы абагнулі паўднёва-ўсходні выступ вострава, той самы, які чатыры дні таму агінала «Іспаньёла».

Праплываючы міма двухгаловае гары, мы ўбачылі цёмнае жарало Ганавай пячоры і каля яго чалавека, які стаяў, абапёршыся на мушкет. Гэта быў сквайр. Мы памахалі яму насоўкамі і тройчы пракрычалі «ўра», прычым Сільвер крычаў гучней за ўсіх.

Прайшоўшы яшчэ тры мілі, мы ўвайшлі ў Паўночную стаянку і ўбачылі «Іспаньёлу». Яна насілася па вадзе: прыліў падняў яе з мелі. Калі б таго дня быў вецер ці калі б у Паўночнай стаянцы была такая ж моцная плынь, як у Паўднёвай, мы б маглі страціць свой карабель назаўжды, або



знайшлі б адны ягоныя рэшткі. Аднак, на шчасце, шхуна была цэлая, калі не лічыць парванага грота. Мы кінулі ў ваду, на глыбіню ў паўтары сажні, запасны якар. Потым паплылі на шлюпцы ў П'яную бухту — бліжэйшую да Ганавай скарбніцы. Там мы высадзіліся, а Грэя паслалі на «Іспаньёлу», каб ён сцярог карабель уначы.


Мы падняліся да пячоры па стромкім адхоне. Наверсе нас чакаў сквайр. Ён сустрэў мяне вельмі ветліва, слова не сказаў пра тое, што я ўцёк з блакгауза, не папракаў мяне, аднак і не хваліў. Але калі Сільвер пачціва аддаў яму чэсць, ён, абураны, пабарвавеў.

— Джон Сільвер,— сказаў ён,— вы гнюсны нягоднік і ашуканец. Жудасны нягоднік, сэр! Мяне ўгаварылі не праследаваць вас, і я абяцаў не рабіць гэтага. Але мерцвякі, сэр, вісяць у вас на шыі, як жорны на млыне!

— Сардэчны вам дзякуй, сэр,— адказаў Цыбаты Джон, зноў аддаючы яму чэсць.

— Не смейце мне дзякаваць! — крыкнуў сквайр.— З-за вас я парушаю свой абавязак. Адыдзіцеся ад мяне!

Мы ўвайшлі ў прасторную пячору. Паветра ў ёй было свежае. З-пад зямлі біла чысцюткая крыніца. Яна ўцякала ў невялікае возера, вакол якога расла папараць. Дно пячоры было пясчанае. Перад распаленым вогнішчам ляжаў капітан Смолет. А ў куце цьмяна ззяла гара залатых манет і зліткаў. Гэта былі Флінтавы скарбы — тыя самыя, дзеля якіх мы прайшлі такі доўгі і цяжкі шлях, дзеля якіх загінула семнаццаць чалавек з экіпажа «Іспаньёлы». А колькі чалавечых жыццяў, колькі пакут і крыві стаяла за гэтымі скарбамі! Колькі было патоплена выдатных караблёў, колькі закатавана добрых людзей, якіх прымушалі з завязанымі вачыма ісці па дошцы! Колькі стрэлаў, колькі хлусні і жорсткасці рабілася ў імя гэтых скарбаў!.. Ніводзін чалавек не мог бы, на-



пэўна, уявіць сабе ўсёй гэтай крывавай і бруднай, ахутанай тайнаю, эпапеі. Цяпер на востраве знаходзіліся тры чалавекі — Сільвер, стары Морган і Бэн Ган, якія бралі колісь у ёй удзел і спадзяваліся яшчэ атрымаць сваю долю.

— Уваходзь, Джым,— сказаў капітан.— Ты, па-свойму, можа, і добры хлопец, аднак не думаю, што калі-небудзь мы яшчэ выйдзем разам у мора: ты ж з пароды ўлюбёнцаў, робіш усё як хочаш... А, гэта вы, Джон Сільвер! Што прывяло вас да нас, чалавеча?

— Вярнуўся выконваць свае абавязкі, сэр,— адказаў Сільвер.

— А! — сказаў капітан і больш ужо не дадаў аніводнага слова.


Як выдатна павячэраў я ў той дзень з усімі маімі сябрамі! Якой смачнаю здалася мне салёная казляціна Бэна Гана! А запівалі мы яе добрым старым вінам з «Іспаньёлы»... Ніколі яшчэ, я думаю, свет не бачыў людзей, шчаслівейшых за нас! Сільвер сядзеў ззаду ўсіх, далей ад святла, але еў шмат, імкліва ўскокваў, калі трэба было што-небудзь падаць, і смяяўся нашым жартам разам з намі — словам, зноў стаў тым самым ласкавым, пачцівым і старанным кухарам, якім быў у час нашага плавання.

РАЗДЗЕЛ XXXIV

І апошні

Назаўтра ўранку мы ўзяліся за працу. Да берага была міля хады. Трэба было перацягнуць туды ўсё нашае золата і даставіць у шлюпцы — тры мілі да «Іспаньёлы» — на борт карабля. Цяжкая праца для такой жменькі людзей. Пра трох піратаў, якія бадзяліся недзе па востраве, мы думалі мала. Дастаткова было паставіць адна-





го вартавога на вяршыні пагорка, і мы маглі не баяцца раптоўнага нападу. Да таго ж мы меркавалі, што іхні ваяўнічы шал знік назаўжды.

Мы працавалі без адпачынку. Грэй і Бэн Ган адвозілі золата ў лодцы на шхуну, астатнія насілі яго на бераг. Звязвалі два залатыя зліткі вяроўкаю і ўзвальвалі іх адзін аднаму на плечы — больш аднаму чалавеку было не падняць. Мяне, як самага нядужага, пакінулі ў пячоры, дзе я насыпаў грошы ў торбы з-пад сухароў.

Як і ў куфры Білі Бонса, тут былі самыя разнастайныя манеты, але іх было так шмат, што, думаю, такой стракатай калекцыі я ўжо не ўбачу нідзе. Я з цікавасцю сартаваў іх. Англійскія, французскія, іспанскія, партугальскія манеты, гінеі і луідоры, дублоны і двайныя гінеі, муадоры[1] і цэхіны[2], манеты з выявамі ўсіх еўрапейскіх каралёў за апошнія сто гадоў, дзіўныя ўсходнія манеты, на якіх можна было ўбачыць ці то клубок вяровак, ці то шматок павуціння, манеты круглыя і квадратныя, манеты з дзіркаю пасярэдзіне, каб іх можна было насіць на шыі,— словам, тут былі сабраныя амаль усе тыпы манет, якія бачыў калі-небудзь свет. Іх было, пэўна, больш, чым лісця на прысадах сквайравай сядзібы ўвосень. У мяне ўжо ныла спіна і балелі пальцы.

Праходзіў дзень за днём, а нашай рабоце канца не было відаць. Кожны вечар мы адпраўлялі на карабель груды грошай, аднак у пячоры заставаліся груды не меншыя. І за ўвесь гэты час піраты аніводнага разу не патрывожылі нас.

Нарэшце — здаецца, на трэці вечар,— калі мы з доктарам падымаліся на пагорак, знізу, з непрагляднае цемры, вецер раптам данёс да нас ці то крык, ці то песню.

---

1 Муадоры — старадаўнія манеты.

2 Цэхіны — старадаўнія венецыянскія залатыя манеты.





— Даруй ім, божа, гэта піраты,— сказаў доктар.

— Усе п'яныя, сэр,— пачуў я за спінаю голас кухара.

Мы ні ў чым не абмяжоўвалі Сільвера, і, нягледзячы на нашую халодную да яго пагарду, ён зноў пачаў трымаць сябе з намі па-прыяцельску. Ён нібыта не заўважаў нашае знявагі і пяўся кожнаму дагадзіць. Ветлівая ўсмешка адданага слугі не сыходзіла з ягонага твару. Але, вядома, адносіны да яго не мяняліся — з сабакам нашмат лепш абыходзяцца. Толькі [redacted] і Бэн Ган ставіліся да яго лепей. Бэн Ган усё яшчэ трохі пабойваўся свайго былога кватармайстра, [redacted] [redacted] быў удзячны яму за сваё ўратаванне ад смерці, хаця, вядома, меў падставы думаць пра яго горш, чым хто іншы: бачыў [redacted] на падыходзе да яміны, што за пачуцці былі ў яго на твары.

Доктар рэзка адгукнуўся на Сільвераву заўвагу:


— А можа, яны хворыя і трызняць?..

— Слушна, сэр,— сказаў Сільвер,— але якая нам з вамі розніца?

— Мяркую, што наўрад ці вы прэтэндуеце на тое, каб [redacted] лічыў вас высакародным чалавекам, містэр Сільвер,— заўважыў, усміхнуўшыся, доктар,— і ведаю, што мае пачуцці здзіўляць вас. Але каб я быў сапраўды ўпэўнены, што хоць адзін з іх хворы і трызніць, я, нават рызыкуючы сваім жыццём, пайшоў бы да іх, каб аблегчыць ягоныя пакуты.

— Выбачайце, сэр, але вы зрабілі б вялікую памылку,— запярэчыў яму Сільвер.— Вы б страцілі вашае каштоўнае жыццё, вось і ўсё. Я цяпер на вашым баку і душою і целам і не хацеў бы, каб каманда страціла такога чалавека, як вы. Я бясконца вам удзячны. А гэтыя людзі нізашто не змаглі б стрымаць свайго слова. Больш таго, яны ніколі б не паверылі вашаму слову.






— Затое вы добра ўмееце трымаць сваё слова,— сказаў доктар.— Мы гэта ведаем.

Больш піраты і не аказваліся. Толькі аднойчы мы пачулі ўдалечыні мушкетны стрэл — напэўна, яны пачалі паляваць. Параіўшыся, мы вырашылі пакінуць іх на востраве, што вельмі ўзрадавала Бэна Гана. І Грэй сказаў, што так будзе лепш. Мы пакінулі ім вялікі запас пораху і куль, груду салёнае казляціны, трохі лекаў і іншых неабходных рэчаў, інструменты, адзежу, запасны ветразь, некалькі ярдаў вяровак і, па асаблівым жаданні доктара, вялікую порцыю тытуню.

Больш нам на востраве не было чаго рабіць. Карабель быў ужо нагружаны і золатам, і прэснай вадою, і, на ўсякі выпадак, рэшткамі салёнае казляціны. Нарэшце мы паднялі аднае раніцы якар і выйшлі з Паўночнае стаянкі. Над караблём быў той самы сцяг, пад якім мы абараняліся ад піратаў у форце.

Тут выявілася, што піраты сочаць за намі нашмат больш пільна, чым мы думалі. Плывучы пралівам, мы ўбачылі, калі набліжаліся да паўднёвага краю вострава, усіх траіх: яны стаялі на каленях на пясчанай касе і з мальбою працягвалі ў наш бок рукі. Ведама ж, нам было цяжка пакідаць іх на бязлюдным востраве, але мы баяліся, што калі возьмем іх на карабель, дык можам стаць ахвярамі новага мяцяжу. Дый жорстка везці на бацькаўшчыну людзей, якіх чакае там шыбеніца. Доктар пракрычаў ім, дзе шукаць пакінутыя намі запасы, але піраты адно малілі нас пашкадаваць іх і не даць ім памерці ў адзіноце.

Нарэшце, бачачы, што карабель адплывае, адзін з іх — не ведаю, хто,— з дзікім крыкам ускочыў на ногі, схапіў мушкет і стрэліў. Куля прасвістала над галавою ў Сільвера і прадзіравіла грот.




Мы схаваліся за фальшборт. Калі я вырашыў глянуць зноў на востраў, піратаў на касе ўжо не было, дый сама каса амаль знікла. А незадоўга да поўдня, на маю невымоўную радасць, знікла за даляглядам і самая высокая гара Вострава Скарбаў.

Нас засталося так мала, што матросам на караблі быў цяпер кожны, адзін толькі капітан ляжаў на матрасе і аддаваў загады. Ён паправіўся, але яму ўсё яшчэ быў патрэбны спакой. Мы трымалі курс на бліжэйшы порт Іспанскае Амерыкі, каб наняць новых матросаў: без іх мы плыць дамоў не асмельваліся. Вецер часта мяняўся і збіваў карабель з курсу, два разы мы былі ў шторме і, пакуль дабраліся да Амерыкі, знясілелі зусім.

Сонца ўжо садзілася, калі мы нарэшце кінулі якар у надзвычай прыгожай закрытай гавані. Нас адразу ж акружылі лодкі з неграмі, мулатамі і мексіканскімі індзейцамі, якія прадавалі нам гародніну і садавіну і былі гатовыя кожнае хвіліны ныраць за кінутымі ў ваду манетамі. Зычлівыя твары (пераважна чорныя), неверагодна смачныя ананасы, бананы і, галоўнае, агеньчыкі, якія пачалі запальвацца ў горадзе,— усё гэта было так прыгожа, так не падобна на змрочны, заліты крывёю Востраў Скарбаў! Доктар і сквайр вырашылі правесці вечар у горадзе і захапілі з сабою мяне. На беразе мы сустрэліся з капітанам англійскага ваеннага судна і цудоўна прабавілі вечар у яго на караблі. Вярнуліся мы на «Іспаньёлу», калі ўжо світала.

На палубе быў толькі адзін Бэн Ган, і, як толькі мы падняліся на борт, ён пачаў каяцца і біць кулакамі сабе ў грудзі: уцёк Сільвер. Ган прызнаўся, што сам дапамог яму сесці ў лодку, бо быў перакананы, што мы ўсе ў небяспецы, пакуль «на караблі застаецца гэты аднаногі д'ябал». Але гэта было не ўсё: кухар уцёк не з пу-



стымі рукамі. Ён непрыкметна праламаў перагародку і ўкраў невялікі мяшок з грашыма — прыкладна трыста — чатырыста гіней. Без іх яму, ведама ж, цяжка прыйшлося б у ягоных далейшых блуканнях.

Думаю, усе дзякавалі богу, што Сільвер нарэшце знік, і не шкадавалі тых грошай.

Каб не адымаць у вас шмат часу, скажу адно, што, наняўшы некалькі матросаў, мы шчасліва дабраліся да Брыстоля. «Іспаньёла» вярнулася якраз у той самы час, калі містэр Блэндлі падумваў ужо пра тое, каб паслаць нам на дапамогу другі карабель. З усяго экіпажа дамоў вярнуліся толькі пяцёра. «Пі, і даканае цябе д'ябла рука» — словы гэтыя спраўдзіліся на маіх вачах. Зрэшты, «Іспаньёла» ўсё ж была шчаслівейшая за той карабель, пра які спявалі піраты:

> Усе семдзесят пяць не вярнуліся з мора —
> Усіх праглынула марская прастора...

Кожны з нас атрымаў сваю долю скарбаў. Скарысталіся ёю хто як мог, адпаведна характару. Капітан Смолет больш не ходзіць у мора. Грэй не толькі збярог грошы, але і, вырашыўшы раптам дасягнуць у жыцці поспеху, вывучыўся і стаў штурманам і саўладальнікам выдатнага, добра абсталяванага судна, ажаніўся і мае дзяцей. Што ж да Бэна Гана, дык гэты, атрымаўшы сваю тысячу фунтаў, прагуляў іх за тры тыдні, ці, дакладней, за дзевятнаццаць дзён, бо на дваццаты вярнуўся да нас жабраком. Сквайр зрабіў з ім менавіта тое, чаго Бэн так баяўся: даў яму месца брамніка. Бэн жыве й дагэтуль, і сяброўе, а часам сварыцца з вясковымі хлапчукамі. У нядзелю ды іншыя святыя дні ён цудоўна спявае ў царкоўным хоры.

Пра Сільвера мы больш нічога не чулі. Агідны аднаногі марак назаўжды знік з майго жыцця. Мусібыць, ён адшукаў сваю старую негры-






цянку і жыве з ёю і Капітанам Флінтам, не наракаючы на лёс. Будзем спадзявацца на гэта, бо, я мяркую, ягоныя шанцы на лепшае жыццё на тым свеце — не дужа вялікія.

Астатняя частка клада — срэбра ў злітках і зброя — усё яшчэ ляжыць там, дзе закапаў яе Флінт. І, па-мойму, няхай сабе ляжыць. Цяпер ужо мяне нічым не завабіш на гэты пракляты востаў! Мне й дагэтуль сняцца па начах буруны, якія разбіваюцца аб ягоныя берагі, і я ўскокваю з ложка, калі чую хрыплы голас Капітана Флінта:

— Піястры! Піястры! Піястры!





ЗМЕСТ

Частка першая

СТАРЫ ПІРАТ

Раздзел I. Стары марскі пёс у карчме «Адмірал Бенбоў» — 6

Раздзел II. Чорны пёс з'яўляецца і знікае — 13

Раздзел III. Чорная метка — 21

Раздзел IV. Матроскі куфар — 28

Раздзел V. Канец сляпога — 34

Раздзел VI. Капітанавы паперы — 41

Частка другая

КАРАБЕЛЬНЫ КУХАР

Раздзел VII. Я еду ў Брыстоль — 50

Раздзел VIII. Пад шыльдаю «Падзорная Труба» — 56

Раздзел IX. Порах і зброя — 63

Раздзел X. Плаванне — 70

Раздзел XI. Што я пачуў, седзячы ў бочцы з-пад яблыкаў — 78

Раздзел XII. Ваенная нарада — 84

Частка трэцяя


МАЕ ПРЫГОДЫ НА ВОСТРАВЕ

Раздзел XIII. Як пачаліся мае прыгоды на востраве — 92

Раздзел XIV. Першы ўдар — 99

Раздзел XV. Астраўлянін — 104





Частка чацвёртая

ЧАСТАКОЛ

Раздзел XVI. Пра далейшыя падзеі апавядае доктар. Як быў пакінуты карабель — 114

Раздзел XVII. Доктар працягвае свой аповяд. Апошняя ходка на яліку — 119

Раздзел XVIII. Доктар працягвае свой аповяд. Канец першага дня бою — 124

Раздел XIX. Зноў апавядае Джым Хоўкінс. Ґарнізон у блакгаузе — 129

Раздзел XX. Сільвер — парламенцёр — 135

Раздзел XXI. Атака — 143

Частка пятая

МАЕ ПРЫГОДЫ НА МОРЫ

Раздзел XXII. Як пачаліся мае прыгоды на моры — 150

Раздзел XXIII. Ва ўладзе адліву — 155
Раздзел XXIV. У чоўне — 161
Раздзел XXV. Я спускаю «Вясёлага Роджэра» — 166

Раздзел XXVI. Ізраэль Хэндс — 172

Раздзел XXVII. «Піястры!» — 181

Частка шостая

КАПІТАН СІЛЬВЕР

Раздзел XXVIII. У варожым лагеры — 188

Раздзел XXIX. Зноў чорная метка — 196

Раздзел XXX. Пад слова гонару — 203


Раздзел XXXI. Пошукі скарбаў. Указальная страла Флінта — 210

Раздзел XXXII. Пошукі скарбаў. Голас у лесе — 218

Раздзел XXXIII. Падзенне важака — 225

Раздзел XXXIV. І апошні — 231





Стывенсан Р.

С 88 Востраў Скарбаў: Раман: Для малод. шк. узросту/Пер. з англ. мовы А. М. Асташонка; Маст. У. В. Гладкевіч.— Мн.: Юнацтва, 1993.— 239 с.: іл.

ISBN 5-7880-0428-4.

Стивенсон Р. Остров Сокровищ: Роман.

Шмат рызыкоўных прыгод даводзіцца перажыць юнаму герою Джыму Хоўкінсу ў падарожжы на таямнічы Востраў Скарбаў. І галоўны скарб, якім аваладвае ён у выніку,— давер'е і ўдзячнасць сяброў, вера ў добрых людзей і сапраўдная мужчынская дружба.

4804010100—016
С ——————— 124—90 **ББК 84.4Вя**
М 307(03)—93

Литературно-художественное издание

СТИВЕНСОН Роберт Льюис

ОСТРОВ СОКРОВИЩ

Роман

Минск, издательство «Юнацтва»
На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

СТЫВЕНСАН Роберт Льюіс

ВОСТРАЎ СКАРБАЎ

Раман

Загадчык рэдакцыі У. А. Марук.
Рэдактар У. І. Анісковіч
Мастацкі рэдактар Ю. Ц. Цярэшчанка
Тэхнічныя рэдактары З. Г. Сень, Н. П. Дасаева
Карэктары Л. С. Мануленка, Л. К. Паплаўская

Здадзена ў набор 03.05.90. Падпісана да друку 29.07.91. Фармат 70×100¹/₁₆. Папера афс. № 1. Гарнітура Звычайная новая. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 19,50. Ум. фарб.-адб. 118,3. Ул.-выд. арк. 12,71. Тыраж 12 000 экз. Зак. 511.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку.
220600, Мінск, Машэрава, 11.

Ліцэнзія ЛВ №7

Мінская фабрыка каляровага друку. 220115, Мінск, Каржанеўская, 20.
Дыяпазітывы тэксту падрыхтаваны Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінатам МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

